Я. К. Новік

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
# 1917—1945 гг.

Вучэбны дапаможнік для 10 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск «Народная асвета» 2012

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

УДК 94(476)”1917/1945”(075.3=161.3)
ББК 63.3(4Беи)я721
Н73

Аўтар метадычнага апарату *В. В. Гінчук*

Рэцэнзенты:

кафедра гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава» (кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры *В. У. Акуневіч*; дацэнт кафедры *М. М. Пархімовіч*); метадыст вышэйшай катэгорыі ўпраўлення вучэбна-метадычнай работы дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» *В. М. Вароновіч*; настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Мінская дзяржаўная лінгвістычная гімназія-каледж № 24» *І. Р. Драгавоз*; кандыдат гістарычных навук дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» *В. А. Белазаровіч*; доктар гістарычных навук, прафесар, рэктар установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна» *М. Э. Часноўскі*

**Новік, Я. К.**
Н73 Гісторыя Беларусі, 1917—1945 гг. : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / Я. К. Новік ; аўтар метадычнага апарату В. В. Гінчук. — Мінск : Нар. асвета, 2012. — 182 с. : іл.
ISBN 978-985-03-1913-5.

**УДК 94(476)”1917/1945”(075.3=161.3)**
**ББК 63.3(4Беи)я721**

**ISBN 978-985-03-1913-5**

© Новік Я. К., Гінчук В. В., 2012
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2012

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Як працаваць з вучэбным дапаможнікам

***Паважаныя дзесяцікласнікі!***

Перыяд айчыннай гісторыі, які вы пачынаеце вывучаць, насычаны шматлікімі гістарычнымі падзеямі, з’явамі, працэсамі. У 1917—1945 гг. істотныя змены адбываліся ва ўсіх сферах беларускага грамадства — эканамічнай, сацыяльнай, палітычнай, духоўнай. Беларускі народ у гэты перыяд разам з іншымі народамі СССР будаваў сацыялістычнае грамадства, са зброяй у руках мужна абараняў сваю Айчыну ад знешніх ворагаў. Дзякуючы плённай працы і энтузіязму людзей у 1920—1930-я гг. у БССР была створана буйная машынная вытворчасць, рэспублікай быў зроблены вялікі крок наперад у развіцці адукацыі, навукі і культуры.

Вучэбны дапаможнік «Гісторыя Беларусі, 1917—1945 гг.» пазнаёміць вас з важнейшымі падзеямі айчыннай гісторыі гэтага перыяду, дапаможа зразумець асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускага грамадства, іх прычыны і наступствы. Лепшаму засваенню вучэбнага матэрыялу будуць спрыяць пытанні і заданні пасля параграфаў, заданні для ўрокаў абагульнення па раздзелах, памяткі «Як вывучаць гісторыю», храналагічная табліца «Асноўныя падзеі гісторыі Беларусі: 1917—1945 гг.», «Слоўнік гістарычных паняццяў».

Пачынаць вывучэнне кожнага параграфа рэкамендуецца з адказаў на пытанні рубрыкі *«Успомніце»*, якія накіраваны на аднаўленне ў памяці ўжо вядомых гістарычных падзей. Звяртаем увагу, што для адказаў на пытанні гэтай рубрыкі спатрэбяцца веды, засвоеныя вамі на ўроках сусветнай гісторыі, грамадазнаўства, беларускай літаратуры.

Тэкст вучэбнага дапаможніка дзеліцца на асноўны (ён прадстаўлены ў параграфах) і дадатковы (да яго адносяцца рубрыкі «Гістарычная даведка», «Гэта цікава», «Гістарычны дакумент», «Дадатковы матэрыял»). Асноўныя даты і паняцці выдзелены ў тэксце параграфа асобым шрыфтам і прадстаўлены ў рубрыцы «Даты і паняцці, якія трэба ведаць», у храналагічнай табліцы і «Слоўніку гістарычных паняццяў» у канцы вучэбнага дапаможніка.

Прапанаваныя пасля кожнага параграфа пытанні і заданні дазваляюць праверыць, ці засвоены вамі вучэбны матэрыял па той ці іншай тэме. Крыніцай гістарычнай інфармацыі для адказаў на пытанні і заданні з’яўляецца не толькі тэкст параграфа, але і дадатковыя матэрыялы да яго, вытрымкі з гістарычных дакументаў, ілюстрацыі, картасхемы. Рэкамендуем звяртаць увагу на пытанні і заданні да вывучэння параграфа, тады работа з тэкстам будзе больш мэтанакіраванай.

Пры выкананні заданняў спатрэбіцца аналізаваць, сістэматызаваць, абагульняць вучэбны матэрыял, сінхранізаваць падзеі айчыннай, еўрапейскай і сусветнай гісторыі, параўноўваць гістарычныя факты, раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж імі, аргументаваць свой пункт гледжання, працаваць з рознымі крыніцамі



Правообладатель Народная асвета

гістарычнай інфармацыі. У гэтым вам дапамогуць парады памяткі «Як вывучаць гісторыю». Звяртаем увагу, што колькасць заданняў, якія выконваюцца вучнямі на ўроку і пры падрыхтоўцы дамашняга задання, рэгулюецца настаўнікам.

У гістарычнай навуцы існуюць розныя погляды на гісторыю Беларусі 1917—1945 гг. У літаратуры, сродках масавай інфармацыі вы можаце сустрэць вельмі супярэчлівыя (нават супрацьлеглыя) ацэнкі гістарычных падзей вывучаемага перыяду. Заданні рубрыкі «Ваша меркаванне» даюць вам магчымасць выказаць свае адносіны да вывучаемых падзей. Галоўным крытэрыем пры ацэнцы адказаў на такія пытанні з'яўляецца абгрунтаванасць выказанага меркавання. Напамінаем, што ацэнка мінулага павінна быць аб'ектыўнай і засноўвацца не на эмоцыях, а на рэальных гістарычных фактах, дакументах.

Немагчыма ведаць гісторыю Беларусі, не ведаючы гісторыі краю (вобласці, раёна, горада, вёскі), у якім вы жывяце. Шэраг заданняў вучэбнага дапаможніка арыентуе на падрыхтоўку паведамленняў з выкарыстаннем краязнаўчага матэрыялу, успамінаў людзей, якія былі ўдзельнікамі гістарычных падзей. У вучэбным дапаможніку маюцца таксама заданні для абагульняючых урокаў па тэме «Наш край».

Прапанаваны спіс літаратуры для дадатковага чытання дапаможа вам пашырыць веды па вывучаемым перыядзе айчыннай гісторыі, знайсці адказы на пытанні, якія зацікавілі падчас яе вывучэння.

Спадзяёмся, што работа з вучэбным дапаможнікам дазволіць вам усвядоміць месца і ролю Беларусі ў гістарычным працэсе, зразумець абумоўленасць сучасных падзей асаблівасцямі гістарычнага развіцця нашай краіны.

Жадаем поспехаў у вывучэнні айчыннай гісторыі!

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Раздзел I
## КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ. СТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

### § 1. СТАНОВІШЧА Ў БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ КАСТРЫЧНІКА 1917 г.

**Успомніце. 1.** Калі пачалася Першая сусветная вайна? **2.** Якімі былі вынікі ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ў 1915—1916 гг.? **3.** Якой была пазіцыя Часовага ўрада па праблемах міру і зямлі, па нацыянальным пытанні? **4.** Што такое федэрацыя, аўтаномія?

**Сацыяльна-эканамічная і палітычная сітуацыя ў Беларусі і на Заходнім фронце летам — восенню 1917 г. Пытанні нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі.** Сацыяльна-эканамічная і палітычная сітуацыя ў Беларусі і на Заходнім фронце летам — восенню 1917 г. была складанай і супярэчлівай. Працягвалася ненавісная народу Першая сусветная вайна. Тэрыторыя Беларусі па-ранейшаму падзялялася на дзве часткі лініяй фронту, якая праходзіла праз *Дзвінск — Смаргонь — Баранавічы — Пінск*. На захад ад лініі фронту гаспадарылі германскія акупанты. Цэнтральная і Усходняя Беларусь знаходзілася на ваенным становішчы, была прыфрантавой тэрыторыяй. Тут размяшчалася паўтарамільённая армія Заходняга фронту, а ў *Магілёве* знаходзілася Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага расійскай арміяй.

Ваеннае становішча і баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі не спрыялі развіццю яе эканомікі. За гады вайны аб'ём вытворчасці склаў каля 30 % даваеннага ўзроўню. Многія прадпрыемствы прыпынілі сваю дзейнасць. Павялічылася колькасць і вырас аб'ём вытворчасці толькі тых прадпрыемстваў, якія забяспечвалі армію вопраткай і абуткам, прадуктамі харчавання, зброяй, боепрыпасамі.

У заняпадзе была сельская гаспадарка. Яе валавая прадукцыя зменшылася амаль на 40 %, больш як напалову скарацілася пагалоўе жывёлы. Нягледзячы на тое што царскі ўрад яшчэ ў 1916 г. увёў так званую харчовую развёрстку, а Часовы ўрад — манаполію на хлеб і іншыя мучныя вырабы, пагроза голаду нарастала. У кастрычніку 1917 г. у Мінску выдавалі па 3 фунты хлеба (фунт = 0,4 кг) на чалавека на два тыдні. Яшчэ цяжэй з харчамі было ў павятовых гарадах. Не хапала паліва і прадметаў першай неабходнасці.

У 1917 г. на тэрыторыі Беларусі жыло прыкладна 7,5 млн чалавек. Каля 80 % усяго насельніцтва — гэта рабочыя, найбяднейшыя і сярэднія пласты сялянства; каля 20 % — памешчыкі і капіталісты. Інтэлігенцыя, чыноўнікі і духавенства складалі нязначную частку насельніцтва. Сярод памешчыкаў пераважалі прадстаўнікі рускай і польскай нацыянальнасцей, а сярод буржуазіі — яўрэйскай. Працэнт бе-



Правообладатель Народная асвета




Беларусь у гады Першай сусветнай вайны (1915—1917)

ларусаў сярод памешчыкаў і капіталістаў быў нязначны. Беларусамі па нацыянальнасці былі сельскія жыхары і невялікая колькасць гараджан.

Своеасаблівыя сацыяльна-класавая структура і нацыянальны склад беларускага грамадства абумовілі стварэнне партый і арганізацый рознай палітычнай арыентацыі. З сакавіка па лістапад 1917 г. у Беларусі і сярод бежанцаў-беларусаў дзейнічала каля 26 палітычных партый і арганізацый, у іх ліку 14 беларускіх на-



Правообладатель Народная асвета

цыянальных партый. Сярод іх *памешчыцка-клерыкальныя* (клерыкалізм — палітычны кірунак, які дамагаецца галоўнай ролі царквы і духавенства ў палітычным і культурным жыцці) партыі і арганізацыі — Беларускі саюз зямельных уласнікаў, Саюз беларускага праваслаўнага духавенства, Заходне-Рускае таварыства ў Петраградзе. Прадстаўнікі гэтых палітычных партый лічылі, што беларусы не з'яўляюцца самастойным этнасам, што яны ўяўляюць сабой адно з адгалінаванняў адзінага рускага народа.

Дзейнічалі таксама партыі *ліберальна-буржуазнай палітычнай арыентацыі* — Беларуская партыя народных сацыялістаў, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларускі народны саюз, Беларуская партыя аўтанамістаў і інш. Хоць у назвах гэтых партый былі словы «народныя сацыялісты», «народны саюз», «дэмакратыя», але нічога народнага, сацыялістычнага ў іх праграмах не было. Ліберальна-буржуазныя партыі адлюстроўвалі інтарэсы сярэдняй і дробнай буржуазіі, духавенства, чыноўніцтва, інтэлігенцыі, падтрымлівалі Часовы ўрад. Галоўнымі іх патрабаваннямі былі ***аўтаномія*** Беларусі ў межах Расійскай дэмакратычнай рэспублікі, навучанне ў школах на беларускай мове, перавод набажэнства на беларускую мову. Вырашэнне аграрнага пытання яны адкладвалі да склікання Устаноўчага сходу.

Найбольш уплывовай беларускай партыяй *рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку* летам — восенню 1917 г. з'яўлялася Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ). Акрамя Беларусі, арганізацыі Грамады функцыянавалі ў Петраградзе, Маскве, Кіеве, Адэсе, Калузе і іншых гарадах. БСГ падтрымлівала Часовы ўрад, заклікала сялян не захопліваць памешчыцкія землі, а чакаць, пакуль зямельнае пытанне вырашыць «краявы сейм аўтаномнай Беларусі». Яна вяла агітацыю за аўтаномію Беларусі ў складзе федэратыўнай Расійскай рэспублікі. Сваёй канчатковай мэтай БСГ абвяшчала «ўвядзенне сацыялістычнага парадку цераз развіццё класавай барацьбы і сацыяльную рэвалюцыю».

Восенню 1917 г. ад БСГ адкалолася частка рэвалюцыйна настроеных рабочых-беларусаў Петраграда і маракоў Балтыйскага флоту. Яны стварылі арганізацыю бальшавіцкага кірунку — Беларускую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю (БСДРП).

8—10 ліпеня 1917 г. у Мінску прайшоў другі з'езд беларускіх нацыянальных партый і арганізацый (першы з'езд адбыўся ў сакавіку 1917 г.). На з'ездзе замест скасаванага Беларускага нацыянальнага камітэта была створана *Цэнтральная рада беларускіх арганізацый*, якая з кастрычніка 1917 г. называлася *Вялікай беларускай радай*. Яна стала адзіным кіруючым органам беларускага нацыянальнага руху. Асноўнымі праграмнымі патрабаваннямі Рады былі дасягненне аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай Федэрацыі, развіццё нацыянальнай культуры і мовы, арганізацыя беларускага войска.

Летам — восенню 1917 г. ажывілася дзейнасць агульнарасійскіх партый — кадэтаў, меншавікоў і эсэраў. Актывізавалі сваю работу і яўрэйскія арганізацыі —



Правообладатель Народная асвета

Бунд, Яўрэйская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (ЯСДРП) і інш. Яны выступалі адзіным фронтам з меншавікамі і эсэрамі ў падтрымку Часовага ўрада.

На крайнім левым флангу палітычнага жыцця Беларусі знаходзіліся бальшавікі. У. Ленін у сваіх «красавіцкіх тэзісах» 1917 г. заклікаў не аказваць падтрымкі Часоваму ўраду, усю ўладу перадаць Саветам. Адзіную перадумову для выйсця з вайны і заключэння дэмакратычнага міру Ленін бачыў у перамозе сацыялістычнай рэвалюцыі. У. Ленін прапанаваў аб'яднаць усе банкі ў адзін і ўстанавіць дзяржаўны кантроль над ім, а таксама наладзіць кантроль з боку Саветаў за грамадскай вытворчасцю і размеркаваннем прадуктаў, канфіскаваць і нацыяналізаваць усе памешчыцкія землі.

Аднавілі сваю дзейнасць Палескі (у Гомелі) і Мінскі камітэты РСДРП(б), партыйныя арганізацыі ў Слуцку, Віцебску, Оршы, Рэчыцы і іншых гарадах. За гэты час былі створаны бальшавіцкія арганізацыі ў значнай частцы палкоў, дывізій і карпусоў Заходняга фронту. Бальшавікі Беларусі і Заходняга фронту ў жніўні 1917 г. прынялі актыўны ўдзел у барацьбе супраць Карнілаўскага мяцяжу, які меў на мэце ўстанаўленне ваеннай дыктатуры ў Расіі.

Пасля ліквідацыі мяцяжу ўплыў бальшавікоў Беларусі і Заходняга фронту на масы значна ўзрос. У верасні 1917 г. услед за ***«бальшавізацыяй»*** Петраградскага і Маскоўскага Саветаў быў «бальшавізаваны» і Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Узрос уплыў бальшавікоў у Саветах іншых гарадоў Беларусі. Кіруючыся рашэннямі VI з'езда РСДРП(б) (ліпень — жнівень 1917 г.), бальшавікі Беларусі і Заходняга фронту лічылі найбліжэйшай задачай здзяйсненне сацыялістычнай рэвалюцыі і пераход усёй улады да Саветаў.

**Перадумовы Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.** Галоўная перадумова Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. — нежаданне і няздольнасць вярхоў расійскай буржуазіі і перш-наперш Часовага буржуазнага ўрада вырашыць сацыяльна-эканамічныя і палітычныя праблемы, якія хвалявалі грамадскасць краіны.

Працягвалася Першая сусветная вайна, якая давяла краіну да разрухі, а народ да галечы. Вайна стала ненавіснай для салдат расійскай арміі. Тым не менш Часовы ўрад дзеля атрымання вялікай кантрыбуцыі з пераможаных краін і выкарыстання яе для развіцця Расіі, а таксама ў мэтах нажывы і ўзбагачэння кіруючай вярхушкі вырашыў працягваць вайну да пераможнага канца. Такая палітыка пазбавіла Часовы ўрад падтрымкі з боку арміі. Бальшавікі, якія знаходзіліся ў апазіцыі да Часовага ўрада, у сваёй агітацыйна-прапагандысцкай рабоце сярод салдат заяўлялі аб тым, што ў выпадку пераходу ўлады да Саветаў вайна будзе скончана на другі дзень. Сваё слова бальшавікі стрымалі. 26 кастрычніка 1917 г. II Усерасійскі з'езд Саветаў прыняў Дэкрэт аб міры.

Не вырашалася Часовым урадам і аграрнае пытанне. Працягвала існаваць памешчыцкае землеўладанне. Сяляне пакутавалі ад малазямелля і беззямелля. Часовы ўрад нічога не зрабіў для таго, каб рэалізаваць тую аграрную праграму,



Правообладатель Народная асвета

якая была састаўной часткай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Бальшавікі на сялянскіх мітынгах абяцалі вырашыць аграрнае пытанне і надзяліць сялян зямлёй. У выніку сяляне, якія складалі большасць насельніцтва Расійскай дзяржавы, падтрымалі партыі сацыялістычнай арыентацыі і адмовілі ў даверы Часоваму ўраду. Дарэчы, у ліку першых дэкрэтаў савецкай улады быў і Дэкрэт аб зямлі.

Часовы ўрад нічога не зрабіў для вырашэння нацыянальнага пытання, а таму пазбавіўся падтрымкі з боку большасці насельніцтва ўскраін Расійскай дзяржавы.

Нічога не было зроблена Часовым урадам для паляпшэння ўмоў працы і жыцця рабочага класа.

Такім чынам, антынародная палітыка Часовага буржуазнага ўрада пазбавіла яго падтрымкі з боку большасці рабочых, сялян, насельніцтва нацыянальных ускраін. Самымі папулярнымі і аўтарытэтнымі сталі партыі сацыялістычнай арыентацыі, перш-наперш бальшавіцкая партыя. Восенню 1917 г. большасць расійскага народа падтрымлівала менавіта гэтую партыю.

Гісторыя не адказвае на пытанне: «Што было б, калі б, напрыклад, не адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя?» Ніхто не ведае, як развіваўся б гістарычны працэс у Расіі і свеце, калі б Кастрычніцкая рэвалюцыя не здзейснілася. Але дакладна вядома, што Кастрычніцкая рэвалюцыя не магла не адбыцца, бо самадзяржаўе, а затым буржуазія давялі народ да такой ступені адчаю, што рэвалюцыя стала непазбежнай. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. — заканамерная з'ява ў жыцці Расійскай дзяржавы.

**Паняцці, якія трэба ведаць:** *аўтаномія, «бальшавізацыя» Саветаў.*

### Пытанні і заданні

**1.** Ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі летам — восенню 1917 г. Чым яно было абумоўлена? **2.** Якія палітычныя партыі і арганізацыі дзейнічалі ў Беларусі і на Заходнім фронце летам — восенню 1917 г.? Якую пазіцыю яны займалі па нацыянальным пытанні, пытаннях аб міры і зямлі? **3.** Што з'яўлялася галоўнай перадумовай Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.? **4.** Чым тлумачыцца рост папулярнасці бальшавіцкай партыі ў расійскім грамадстве восенню 1917 г.? Што такое «бальшавізацыя» Саветаў? **5.** Як вы лічыце, ці адпавядала праграма дзейнасці бальшавікоў сітуацыі, што склалася ў краіне? (*Выкарыстайце гістарычны дакумент, гл. памятку 10.*)

### Ваша меркаванне

На думку гісторыкаў, пасля Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1917 г. перад Расіяй адкрываліся тры магчымыя шляхі развіцця: а) контррэвалюцыйны пераварот і аднаўленне манархіі; б) буржуазна-рэфармісцкі шлях да капіталізму; в) рэвалюцыйны шлях да сацыялізму. Чым, на ваш погляд, быў абумоўлены выбар сацыялістычнага шляху развіцця? (*Выкарыстайце веды па сусветнай гісторыі, гл. памятку 8.*)



Правообладатель Народная асвета

**Гістарычны дакумент**

**З рэзалюцыі І Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РСДРП(б)**

18 верасня 1917 г.

Аб эканамічным становішчы

«...Самадзяржаўе пакінула рэвалюцыі разбураную гаспадарку і парушанае харчовае забеспячэнне. Для прадухілення эканамічнага краху краіны патрабуюцца самыя рашучыя меры, якія адпавядаюць характару рэвалюцыі і накіраваны на галіны вытворчасці, абмену і размеркавання.

Вытворчасць. Тут неабходныя: передача ў рукі дзяржавы буйных і важных галін прамысловасці — нафты, цукру, руды і г. д. — для лепшай і мэтазгоднай эксплуатацыі іх; увядзенне ўсеагульнай працоўнай павіннасці; у процівагу буржуазнай анархіі — устанаўленне кантролю над вытворчасцю з боку Саветаў, фабрычна-заводскіх камітэтаў і г. д...

У галіне сельскай гаспадаркі неабходна ўвядзенне хлебнай манаполіі і патрабуецца тэрміновая перадача ўсёй зямлі — памешчыцкай, манастырскай і г. д. — без выкупу ў рукі сялянскіх Саветаў і камітэтаў для карыстання сялян з адначасовым пераходам да іх памешчыцкага інвентару...»

## § 2. ПАДЗЕІ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ І НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

**Успомніце. 1.** Назавіце першыя заканадаўчыя акты савецкай улады і іх асноўныя ідэі. **2.** Якімі былі першыя мерапрыемствы савецкай улады ў сацыяльна-эканамічнай сферы? **3.** Што такое нацыяналізацыя, харчразвёрстка?



У. Ленін (Ульянаў)

**Пераход улады ў рукі Саветаў у Беларусі і на Заходнім фронце.** У ноч на **25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г.** у Петраградзе пад кіраўніцтвам бальшавікоў пачалося ўзброенае паўстанне. Атрады чырвонагвардзейцаў, салдат і матросаў занялі найважнейшыя аб’екты сталіцы (вакзалы, тэлеграф, банк, масты), а ўвечары 25 кастрычніка 1917 г. — Зімні палац. Часовы ўрад быў арыштаваны, а яго міністры адпраўлены ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Уся ўлада перайшла да *Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК)* — органа Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Увечары 25 кастрычніка 1917 г. пачаў працу *II Усерасійскі з’езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў*. Беларусь на ім прадстаўляў



Правообладатель Народная асвета

51 дэлегат. З’езд прыняў *Дэкрэты аб міры і зямлі*, чым прадэманстраваў сваю рашучасць і здольнасць вырашаць тыя праблемы, якія хвалявалі народ. З’езд стварыў новы ўрад — *Савет Народных Камісараў (СНК)* на чале з У. Леніным — і выбраў заканадаўчы орган краіны — *Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ВЦВК)*.

**25 кастрычніка 1917 г.** аб перамозе ўзброенага паўстання ў Петраградзе стала вядома ў Мінску. У той жа дзень выканкам Мінскага Савета выдаў загад № 1, у якім абвясціў аб пераходзе ўлады ў Мінску ў рукі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. 27 кастрычніка 1917 г. пры Мінскім Савеце быў створаны *Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) Заходняга фронту*. Кіраўніком камітэта стаў К. Ландар.

Меншавікі, эсэры і бундаўцы выступілі супраць устанаўлення савецкай улады. 27 кастрычніка 1917 г. у Мінску імі быў створаны *Камітэт выратавання рэвалюцыі* (рэвалюцыі, якая ў лютым 1917 г. перадала ўладу буржуазіі). Гэты камітэт прад’явіў Мінскаму Савету ўльтыматум, у якім патрабаваў перадачы ўлады ў Беларусі і на Заходнім фронце ў яго рукі.

Улічваючы суадносіны сіл і часовую перавагу контррэвалюцыі, Мінскі Савет у тактычных мэтах згадзіўся на перадачу ўлады ў Беларусі Камітэту выратавання рэвалюцыі пры ўмове, што ў Петраград і Маскву не будуць адпраўлены контррэвалюцыйныя войскі. Умовы бальшавікоў эсэра-меншавіцкім кіраўніцтвам Камітэта былі прыняты.

У той жа час бальшавікі прынялі дадатковыя меры па мабілізацыі рэвалюцыйных сіл Заходняга фронту на дапамогу Мінскаму Савету. 1 лістапада 1917 г. у Мінск з раёна Баранавіч прыбылі атрады рэвалюцыйных салдат і браняпоезд пад камандаваннем бальшавіка У. Пралыгіна. Хутка да Мінска з фронту падышлі і іншыя вайсковыя часці. Іх прыбыццё змяніла суадносіны палітычных і ваенных сіл на карысць бальшавікоў. Камітэт выратавання рэвалюцыі быў распушчаны. Уся ўлада перайшла ў рукі Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта Заходняга фронту. Савецкая ўлада перамагла ў Мінску.

Крыху пазней, чым у іншых гарадах Беларусі, перамагла савецкая ўлада ў Магілёве. Гэта тлумачыцца тым, што вакол Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, якая знаходзілася ў гэтым горадзе, канцэнтраваліся контррэвалюцыйныя арганізацыі, кіруючыя органы буржуазных партый, іх лідары. Савецкі ўрад прыняў рашэнне аб ліквідацыі контррэвалюцыйнай Стаўкі. Ён прызначыў новага галоў-



Атрад пад кіраўніцтвам Р. Берзіна, які прымаў удзел у ліквідацыі Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Расіі. Магілёў, 1917 г.



Правообладатель Народная асвета

накамандуючага — бальшавіка М. Крыленку, накіраваў у Магілёў салдат з Петраграда, маракоў Балтыйскага флоту. Ім дапамагалі атрад пад кіраўніцтвам Р. Берзіна, сфарміраваны з салдат 1-га палка імя Мінскага Савета, а таксама рэвалюцыйныя атрады з Віцебска, Гомеля, Оршы, Полацка і іншых гарадоў Беларусі. 18 лістапада 1917 г. выканкам Магілёўскага Савета прыняў рашэнне аб прызнанні савецкай улады, а ў наступны дзень у горад уступілі рэвалюцыйныя атрады рабочых, салдат і матросаў. 20 лістапада 1917 г. у Магілёве пачала дзейнічаць савецкая ўлада.

На працягу **кастрычніка — лістапада 1917 г.** савецкая ўлада была ўстаноўлена на ўсёй неакупіраванай тэрыторыі Беларусі. Улада ў арміі перайшла ваенна-рэвалюцыйным камітэтам армій, карпусоў і дывізій Заходняга фронту (гл. *дадатковы матэрыял*).

Устанаўленне савецкай улады ў Беларусі дазваляе вызначыць некаторыя яе асаблівасці. *Па-першае*, савецкая ўлада ўстанаўлівалася толькі на неакупіраванай германскімі войскамі тэрыторыі Беларусі.

*Па-другое*, вялікую ролю ва ўстанаўленні савецкай улады ў Беларусі адыгралі салдаты Заходняга фронту. Іх партыйныя і грамадскія арганізацыі цесна ўзаемадзейнічалі з мясцовымі бальшавіцкімі арганізацыямі і Саветамі рабочых і салдацкіх дэпутатаў, з іх перш за ўсё фарміраваліся цэнтральныя і мясцовыя органы ўлады і кіравання.

*Па-трэцяе*, барацьба за ўстанаўленне савецкай улады ў Беларусі ўскладнялася дзеяннямі Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, якая знаходзілася ў Магілёве.

*Па-чацвёртае*, на ўладу ў краі прэтэндавалі таксама беларускія нацыянальныя арганізацыі. Яны аб'ядналіся вакол Вялікай беларускай рады. Прызнаючы савецкую ўладу ў Расіі, беларускія нацыянальныя партыі і арганізацыі не прызнавалі яе на тэрыторыі Беларусі. Яны выступалі за стварэнне дэмакратычнай краёвай улады.

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у савецкай навуковай і вучэбнай літаратуры называлася *Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыяй*. Вялікай — таму што гэтак жа, як Вялікая французская буржуазная рэвалюцыя канца XVIII ст. засведчыла пераход ад феадалізму да капіталізму ў сусветным маштабе, так Кастрычніцкая рэвалюцыя паклала пачатак пераходу ад капіталізму да сацыялізму ў свеце. Сацыялістычнай — бо па сваіх мэтах і задачах (пабудова сацыялістычнага грамадства) яна мела сацыялістычны характар. Аднак з пачатку 1990-х гг. словы «вялікая» і «сацыялістычная» без навуковых абмеркаванняў па палітыка-ідэалагічных матывах з назвы рэвалюцыі былі выключаны. Цяпер гэтая гістарычная падзея называецца Кастрычніцкай рэвалюцыяй 1917 г.

**Фарміраванне і дзейнасць органаў савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце.** У лістападзе 1917 г. у Мінску быў створаны *Абласны выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і*



Правообладатель Народная асвета




Устанаўленне савецкай улады ў Беларусі



Правообладатель Народная асвета

*фронту (**Аблвыканкамзах**)* на чале з бальшавіком М. Рагазінскім як вышэйшы заканадаўчы орган савецкай улады. Выканаўчым органам улады стаў *Савет Народных Камісараў (СНК) Заходняй вобласці і фронту*, які ўзначаліў К. Ландар. Адначасова з цэнтральнымі органамі ўлады ствараліся губернскія, павятовыя і валасныя саветы і іх выканаўчыя камітэты.

Бальшавіцкія арганізацыі на тэрыторыі Беларусі ўзначальваў *Паўночна-Заходні абласны камітэт РСДРП(б)*, старшынёй якога быў ***А. Мяснікоў***.

### Гістарычны партрэт



**Мяснікоў Аляксандр Фёдаравіч** (сапраўднае прозвішча Мяснікян) (1886—1925) — рэвалюцыянер, партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з кіраўнікоў устанаўлення савецкай улады ў Беларусі. Скончыў Маскоўскі ўніверсітэт. З 1914 г. у арміі на Заходнім фронце. З верасня 1917 г. — старшыня Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП(б). З 1 студзеня 1919 г. быў наркамам па ваенных справах у Часовым рабоча-сялянскім урадзе БССР, намеснікам старшыні СНК, старшынёй ЦВК. Летам 1920 г. начальнік палітупраўлення Заходняга фронту. З 1921 г. на савецкай і партыйнай рабоце ў Закаўказзі. Загінуў у 1925 г. у авіяцыйнай катастрофе. Яго імем названа плошча і вуліца ў Мінску.

Пад кіраўніцтвам савецкіх і партыйных арганізацый на тэрыторыі Беларусі ажыццяўляліся рэвалюцыйныя пераўтварэнні: праводзілася ***нацыяналізацыя*** банкаў і прамысловасці, устанаўліваўся рабочы кантроль над вытворчасцю і размеркаваннем прадуктаў, уводзіўся 8-гадзінны рабочы дзень, канфіскоўваліся памешчыцкія землі і ствараліся першыя калектыўныя гаспадаркі сялян, пашыралася сетка школьных устаноў, уводзілася бясплатная адукацыя, разгортвалася праца па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва.

**Палітыка «ваеннага камунізму» і асаблівасці яе правядзення ў Беларусі.** Улічваючы надзвычай цяжкае ваеннае, эканамічнае і харчовае становішча ў краіне, была распрацавана і ажыццяўлялася *палітыка «ваеннага камунізму»*. Гэта была часовая эканамічная палітыка Савецкай дзяржавы ва ўмовах гаспадарчай разрухі, выкліканай ваеннымі дзеяннямі. Яе мэтай з'яўлялася мабілізацыя ўсіх сіл і рэсурсаў на абарону краіны, захаванне заваяванняў Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Галоўнымі элементамі палітыкі «ваеннага камунізму» з'яўляліся:

нацыяналізацыя ўсіх буйных, сярэдніх і большай часткі дробных прадпрыемстваў;

максімальная цэнтралізацыя кіраўніцтва прамысловай вытворчасцю і размеркаваннем;



Правообладатель Народная асвета

харчразвёрстка — забіранне ў сялян лішкаў прадукцыі сельскагаспадарчай вытворчасці на карысць дзяржавы;

забарона прыватнага гандлю і гандлю хлебам, увядзенне дзяржаўнай хлебнай манаполіі;

планавае забеспячэнне насельніцтва таварамі (картачная сістэма);

усеагульная працоўная павіннасць паводле прынцыпу «хто не працуе — той не есць»;

ураўноўванне ў аплаце працы, бясплатнасць камунальных паслуг, праезду ў транспарце і інш.

Паколькі некаторыя названыя палажэнні, у першую чаргу прынцыпы вытворчасці і размеркавання, знешне мелі камуністычны характар, былі выкліканы вайной і ўводзіліся на перыяд вайны, гэтая палітыка атрымала назву палітыкі «ваеннага камунізму».

Палітыка «ваеннага камунізму» праводзілася на той частцы тэрыторыі Беларусі, дзе функцыянавалі органы савецкай улады. Палажэнні гэтай палітыкі не дзейнічалі на тэрыторыі, акупіраванай інтэрвентамі. На вызваленай ад акупантаў тэрыторыі Беларусі палітыка «ваеннага камунізму» праводзілася мясцовымі партыйнымі і савецкімі органамі даволі асцярожна. Там, дзе гэта палітыка праводзілася ў поўным аб'ёме, узнікала незадаволенасць жыхароў беларускай вёскі і як вынік — антысавецкія выступленні сялянства.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць**: *25 кастрычніка 1917 г., кастрычнік — лістапад 1917 г.; Аблвыканкамзах, нацыяналізацыя.*

### Пытанні і заданні

**1.** Калі была ўстаноўлена савецкая ўлада ў Беларусі і на Заходнім фронце? (*Выкарыстайце карту.*) Назавіце асаблівасці ўстанаўлення савецкай улады ў Беларусі. **2.** Чым, на ваш погляд, тлумачыцца даволі хуткая перамога рэвалюцыі на Заходнім фронце? (*Выкарыстайце дадатковы матэрыял.*) **3.** Якія органы савецкай улады былі сфарміраваны на тэрыторыі Беларусі? Хто іх узначаліў? **4.** Назавіце першыя сацыяльныя і эканамічныя мерапрыемствы савецкай улады на тэрыторыі Беларусі. Што такое нацыяналізацыя? **5.** Ахарактарызуйце прычыны, мэты, мерапрыемствы палітыкі «ваеннага камунізму», асаблівасці яе правядзення ў Беларусі. (*Выкарыстайце гістарычныя дакументы 1, 2.*) **6.** Дайце азначэнне паняцця «палітыка ваеннага камунізму» (гл. *памятку 7*). **7.** З дапамогай дадатковай літаратуры падрыхтуйце паведамленні аб дзейнасці А. Мяснікова, К. Ландара (гл. *памятку 3*).

### Ваша меркаванне

Улічваючы, што амаль усе палітычныя сілы расійскага грамадства падтрымлівалі ідэю Устаноўчага сходу, які павінен быў вырашыць пытанні аб міры, зямлі, 8-гадзінным рабочым дні і інш., савецкая ўлада пайшла на яго скліканне. У лістападзе 1917 г. у Беларусі і на Заходнім фронце былі праведзены выбары дэпутатаў Устаноўчага сходу. Вынікі выбараў былі наступныя: 50,7 % выбраных дэпутатаў



Правообладатель Народная асвета

складалі бальшавікі, 32,2 % — эсэры, 5 % — буржуазныя партыі, 0,3 % — БСГ, 11,8 % — іншыя партыі.

Чым, на ваш погляд, тлумачацца такія вынікі выбараў?

## Дадатковы матэрыял

**Устанаўленне савецкай улады на Заходнім фронце (Гапоненко Л. Солдатские массы Западного фронта в борьбе за власть Советов)**

1917 г.

«…С получением известия о победе пролетарского восстания в Петрограде большевистская фракция армейского комитета 2-й армии призвала солдат к активной борьбе за советскую власть. 26 октября по инициативе Бюро армейской большевистской организации в Несвиже (центре дислокации штаба 2-й армии) был создан Военно-революционный комитет, который стал готовить революционный переворот в штабе армии. По указанию армейского ВРК к городу Несвижу был подтянут 32-й Сибирский полк, с помощью которого Военно-революционный комитет установил контроль над штабом армии. Выехавшие в части члены большевистской фракции армейского комитета и местные партийные ячейки развернули борьбу за немедленные перевыборы дивизионных и корпусных комитетов и передачу им всей власти в армии…

С 25 по 31 октября во всех четырёх корпусах 2-й армии власть перешла в руки Военно-революционных комитетов, был созван 2-й Чрезвычайный съезд солдат 2-й армии. Утром 31 октября в городе Несвиже стали собираться избранные на съезд делегаты. Старый армейский комитет, занимавший соглашательскую позицию, пытался сорвать созыв съезда, но, оказавшись перед совершившимся фактом, вынужден был сложить с себя полномочия.

1 ноября в Несвиже открылся 2-й Чрезвычайный съезд солдат 2-й армии. Делегаты съезда единодушно приветствовали Советское правительство в лице Совета Народных Комиссаров».

## Гістарычны дакумент

**1. З Пастановы Саўнаргаса Беларусі аб нацыяналізацыі прамысловых прадпрыемстваў у рэспубліцы**

16 лютага 1919 г.

«1. Усе фабрыкі, заводы і іншыя прамысловыя прадпрыемствы, гаспадары якіх з прыходам савецкай улады ўцяклі або адсутнічаюць па тых ці іншых прычынах або не прымаюць актыўнага ўдзелу ў кіраванні прадпрыемствамі, таксама ўсе іншыя безгаспадарчыя прамысловыя прадпрыемствы... усе фабрычныя і заводскія карпусы, пабудовы і надворныя збудаванні, якія маюць дапаможныя прадпрыемствы, склады, інвентар, машыны, зямельныя плошчы, арэндныя землі, усе грашовыя капіталы, бягучыя рахункі заводаў і іншае аб'яўляюцца з гэтага часу ўласнасцю Беларускай рэспублікі...»



Правообладатель Народная асвета

**2. Харчовы дэкрэт ЦВК БССР**

8 лютага 1919 г.

«У сувязі з усё ўзрастаючай спекуляцыяй хлебам і немагчымасцю працоўных набыць хлеб па таннай цане пастаноўлена:

1. Закупку і продаж хлеба ў межах Беларусі прыватным асобам забараніць.
2. Нарыхтоўку хлеба ажыццяўляць дзяржаўным органам па цвёрдых цэнах.
3. Дапусціць з асобага дазволу харчаддзела нарыхтоўку хлеба прафсаюзным і рабочым арганізацыям на кожнага едака не больш 2 пудоў хлеба».

## Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (у кнізе «Памяць») інфармацыю: 1) калі і якім чынам была ўстаноўлена савецкая ўлада ў вашым краі; 2) як у вашым населеным пункце ўвекавечана памяць пра людзей, якія ўстанаўлівалі савецкую ўладу ў вашым краі. Падрыхтуйце паведамленне.

## § 3. БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ ГЕРМАНСКАЙ АКУПАЦЫІ

**Успомніце. 1.** Назавіце ваенна-палітычныя блокі, якія ўдзельнічалі ў Першай сусветнай вайне. Якія краіны ў іх уваходзілі? **2.** Якімі былі асноўныя ідэі Дэкрэта аб міры? **3.** Што такое анексія, кантрыбуцыя, рэквізіцыя?

**Наступленне войскаў кайзераўскай Германіі і захоп Мінска. Брэсцкі мір.** У адпаведнасці з Дэкрэтам аб міры ў мэтах спынення вайны Савецкі ўрад неаднаразова звяртаўся да саюзнікаў Расіі — краін Антанты — з прапановай заключыць з аўстра-германскім блокам дэмакратычны мір. Аднак краіны Антанты адмовіліся ад мірных перагавораў. У такой сітуацыі кіраўніцтва Савецкай Расіі мусіла пачаць *сепаратныя* (аднабаковыя) перагаворы з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй. У снежні 1917 г. у Брэст-Літоўску такія перагаворы пачаліся. Савецкая дэлегацыя прапанавала заключыць справядлівы дэмакратычны мір — *мір без анексій і кантрыбуцый*. Але германская дэлегацыя адмовілася заключыць такі мір і 10 лютага 1918 г. выставіла ўльтыматыўныя патрабаванні, згодна з якімі ў распараджэнне Германіі павінна была адысці значная частка тэрыторыі Савецкай Расіі, у тым ліку большая частка Беларусі.

Выкарыстаўшы адмову кіраўніка савецкай дэлегацыі Л. Троцкага падпісаць дагавор на цяжкіх для Савецкай Расіі ўмовах, германскае камандаванне 16 лютага 1918 г. афіцыйна заявіла аб спыненні перамір'я і аднаўленні ваенных дзеянняў. Пры гэтым яно ўлічвала тое, што старая расійская армія ў адпаведнасці з Дэкрэтам аб міры дэмабілізавана, а новая армія савецкай уладай яшчэ не створана.



Правообладатель Народная асвета

18 лютага 1918 г. германскія і аўстра-венгерскія войскі пачалі наступленне. Раніцай 19 лютага 1918 г. У. Ленін ад імя СНК РСФСР накіраваў германскаму ўраду радыёграму са згодай падпісання міру на ўмовах, прапанаваных Германіяй. Аднак наступленне працягвалася. Праціўнік захапіў Мінск, Полацк, Оршу і іншыя беларускія гарады.

21 лютага 1918 г. СНК РСФСР апублікаваў дэкрэт-адозву «Сацыялістычная Айчына ў небяспецы!». У адказ на гэты заклік тысячы рабочых і сялян пайшлі ў Чырвоную Армію. **23 лютага 1918 г.** арганізаваныя атрады Чырвонай Арміі пад Нарвай і Псковам прыпынілі адборныя, добра ўзброеныя фарміраванні германскіх войскаў, якія наступалі на Петраград. Дата 23 лютага стала днём нараджэння Чырвонай Арміі і святкавалася ў СССР як Дзень Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту (у Рэспубліцы Беларусь адзначаецца як Дзень абаронцы Айчыны).

У сувязі з наступленнем нямецкіх войскаў былі сфарміраваны падраздзяленні Чырвонай Арміі і ў Беларусі: Магілёўскі полк, чатыры батальёны імя Віцебскага Савета, 1-ы і 2-і гомельскія чырвонагвардзейскія батальёны, Аршанскі конны дывізіён і інш. У пачатку сакавіка 1918 г. наступленне германскіх войскаў удалося спыніць на лініі Полацк — Орша — Магілёў — Гомель. Савецкая ўлада існавала толькі ва ўсходніх паветах Віцебскай і Магілёўскай губерняў.

**3 сакавіка 1918 г.** у Брэст-Літоўску быў падпісаны ***Брэсцкі мірны дагавор*** на вельмі цяжкіх умовах. Тэрыторыя Беларусі дзялілася на некалькі частак. Беларускія землі на захад ад лініі *Дзвінск — Ліда — Пружаны — Брэст-Літоўск* адыходзілі да Германіі. Яе кіраўніцтва арыентавалася на стварэнне «малой Літвы» (Літва, як і Латвія і Эстонія, аддзялялася ад Расіі, Украіна і Фінляндыя прызнаваліся самастойнымі дзяржавамі) з далучэннем да этнічнай Літвы часткі беларускіх зямель — Гродзеншчыны і Брэстчыны. Частка Беларусі на поўдзень ад Палескай чыгункі перадавалася Украінскай Народнай Рэспубліцы. Астатнія беларускія землі разглядаліся як тэрыторыя Расійскай Федэрацыі. Беларусь не атрымала нічога на аднаўленне разбуранай у час вайны гаспадаркі, таму што Расія і Германія ўзаемна адмовіліся пагасіць страты, прычыненыя вайной насельніцтву гэтых дзяржаў. Як бачна, інтарэсы Беларусі ніводным з удзельнікаў перагаворнага працэсу ў Брэст-Літоўску не ўлічваліся.

Акупацыя нямецкімі войскамі большай часткі яе тэрыторыі на захад ад лініі Полацк — Орша — Магілёў — Гомель працягвалася.

**Супраціўленне насельніцтва Беларусі акупантам. Вызваленне Беларусі.** На захопленай тэрыторыі акупанты адмянілі дэкрэты савецкай улады, аднавілі ўладу памешчыкаў і капіталістаў. Немцы ўсталявалі жорсткі акупацыйны рэжым, падпарадкавалі гаспадарчую сістэму Беларусі патрэбам і інтарэсам Германіі. Германскія акупанты *рэквізавалі* гаспадарчы інвентар, адбіралі хатнюю жывёлу і нават рэчы хатняга ўжытку (гл. *гістарычны дакумент*).

Жорсткі акупацыйны рэжым выклікаў моцнае супраціўленне беларускага народа. З першых дзён акупацыі пачала разгортвацца дзейнасць падпольных патрыя-



Правообладатель Народная асвета




Беларусь ва ўмовах германскай акупацыі і Брэсцкага міру



Правообладатель Народная асвета

тычных арганізацый. Па іх ініцыятыве на фабрыках і заводах пракацілася хваля забастовак. У многіх месцах забастоўкі перараслі ва ўзброеную барацьбу. Узброеныя сутычкі рабочых з акупантамі адбыліся ў Гомелі, Гродне, Жлобіне, Рагачове і іншых гарадах.

На барацьбу з акупацыяй выступілі і сяляне. Вясной 1918 г. сялянскія паўстанні ўспыхнулі ў Навагрудскім, Слуцкім, Быхаўскім, Рэчыцкім, Бабруйскім і іншых паветах.

Масавы вызваленчы рух патрабаваў каардынацыі дзеянняў, выпрацоўкі адзінай праграмы барацьбы. У жніўні 1918 г. у Смаленску адбылася 1-я канферэнцыя камуністычных арганізацый акупіраванай тэрыторыі Літвы і Беларусі. Галоўнай задачай падпольных арганізацый канферэнцыя прызнала падрыхтоўку паўстання ў тыле кайзераўскіх войскаў і каардынацыю дзейнасці партызанскіх атрадаў. Да восені 1918 г. партызанскі рух разгарнуўся на ўсёй захопленай германскімі войскамі тэрыторыі Беларусі. У Мінскім, Магілёўскім, Барысаўскім, Гомельскім, Рэчыцкім, Бабруйскім, Ігуменскім, Слуцкім і Быхаўскім паветах вялі барацьбу з немцамі звыш 100 партызанскіх атрадаў. Партызаны кантралявалі Пінскі, Лунінецкі, Кобрынскі, Ганцавіцкі, Столінскі і іншыя паветы. У Бабруйскім павеце была створана так званая ***«Рудабельская рэспубліка»*** (гл. *матэрыял «Гэта цікава»*).

27 жніўня 1918 г. урады РСФСР і Германіі падпісалі дадатковы дагавор, паводле якога германскія войскі адыходзілі да р. Бярэзіна. Паражэнне аўстра-германскага блока ў Першай сусветнай вайне і Лістападаўская рэвалюцыя 1918 г. у Германіі дазволілі ўраду У. Леніна ануляваць 13 лістапада 1918 г. Брэсцкі дагавор. Пачалося вызваленне Беларусі ад нямецкай акупацыі. 10 снежня 1918 г. Чырвоная Армія ўступіла ў Мінск. Да сярэдзіны лютага 1919 г. амаль уся тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад акупантаў. На вызваленай ад немцаў тэрыторыі была адноўлена савецкая ўлада.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць**: *23 лютага 1918 г., 3 сакавіка 1918 г.; Брэсцкі мірны дагавор, «Рудабельская рэспубліка».*

### Пытанні і заданні

**1.** Калі быў заключаны Брэсцкі мірны дагавор? **2.** Прааналізуйце Брэсцкі мірны дагавор па плане: прычыны, умовы, наступствы. (*Выкарыстайце пры адказе карту, с. 19.*) **3.** У сувязі з якімі падзеямі Брэсцкі мірны дагавор быўануляваны? **4.** Ахарактарызуйце германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі. (*Выкарыстайце гістарычны дакумент.*) **5.** Якім чынам беларускі народ адрэагаваў на палітыку германскіх акупантаў?

### Ваша меркаванне

Як вядома, заключэнне сепаратнага мірнага дагавора з Германіяй у 1918 г. атрымала неадназначную ацэнку ў расійскім грамадстве. У. Леніну давялося пе-



Правообладатель Народная асвета

раконваць нават членаў ЦК РСДРП(б) у неабходнасці заключэння гэтага мірнага дагавора. Як вы лічыце, ці было заключэнне Брэсцкага мірнага дагавора ў той час апраўданым? Сваю думку абгрунтуйце (гл. *памятку 8*).

## Гістарычны дакумент

**Вытрымкі са зводкі аператыўнага аддзела Вышэйшага Ваеннага Савета ад 1 жніўня 1918 г.**

«III. Литва и Белоруссия (агентурные данные).

4. Приказ Гинденбурга (ваенны і дзяржаўны дзеяч, генерал-фельдмаршал (1914 г.), прэзідэнт Германіі з 1925 г.) о полном исчерпывании всех средств занятых областей, по-видимому, в полной мере проводится в жизнь. По деревням расклеены объявления, воспрещающие жителям без разрешения германских властей приступать к покосам, сбору овощей и картофеля. Реквизиция продуктов продолжается: так, в Могилевском уезде отдан приказ, чтобы каждая волость доставила в месяц 800 пудов мяса, в окрестностях Минска по деревням производится усиленная реквизиция продуктов и скота, в Могилевском же уезде воспрещен вывоз из пределов уезда лошадей и скота. Во многих уездах Белоруссии объявлена мобилизация лошадей.

5. Весь реквизированный запас продуктов, скота и других материалов немцами усиленно вывозится в Германию. Так, 10 июля со станции Шклов немцами вывезено 32 вагона льна, 22 вагона тряпья, 38 вагонов бумаги со Шкловской фабрики, 40 вагонов лошадей, и с 10 июля ежедневно вывозится 2—3 вагона домашних животных. Аналогичные донесения поступают и из других уездов Белоруссии.

6. Население Литвы и Белоруссии бесплатно привлечено к различным работам в имениях, к ремонту дорог и мостов и т. д. В Могилевском уезде запрещены самовольные порубки леса и расхищение частновладельческого имущества».

## Гэта цікава

Восенню 1918 г. партызанскія атрады дзейнічалі амаль ва ўсіх захопленых нямецкімі войскамі паветах Беларусі. У Бабруйскім павеце партызанскім рухам былі ахоплены ўсе воласці, а ў Рудабельскай воласці на працягу ўсяго перыяду нямецкай, а затым польскай акупацыі існавала савецкая ўлада. Воласць па праве называлі Рудабельскай рэспублікай.

Партызаны Рудабельскай рэспублікі абаранялі воласць ад нападаў акупантаў, вялі актыўныя баявыя дзеянні за яе межамі. Карнікі спалілі Рудабелку, але падавіць партызанскі рух не змаглі. Пасля вызвалення жыхары Рудабелкі назвалі сваю воласць Акцябрскай.



Правообладатель Народная асвета

## Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (у кнізе «Памяць») інфармацыю аб тым, якія падзеі адбываліся на тэрыторыі вашага краю ў час германскай акупацыі. Падрыхтуйце паведамленне.

## § 4—5. АБВЯШЧЭННЕ І СТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Успомніце. 1.** Якімі былі асноўныя ідэі Дэкларацыі правоў народаў Расіі? **2.** Карыстаючыся ведамі з курса грамадазнаўства, назавіце прыкметы дзяржавы. **3.** Якія органы савецкай улады былі створаны на тэрыторыі Беларусі ў лістападзе 1917 г.?

**I Усебеларускі з'езд і яго вынікі.** Па пытанні стварэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ў канцы 1917 г. у беларускім нацыянальным руху вызначыліся два напрамкі. Адзін з іх — *левαрадыкальны (сацыялістычны)*. Ён быў прадстаўлены Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыяй, Беларускім абласным камітэтам, утвораным пры Усерасійскім Цэнтральным Выканаўчым Камітэце сялянскіх дэпутатаў у лістападзе 1917 г. з ліку дэпутатаў-беларусаў, Беларускім нацыянальным камісарыятам, які дзейнічаў у складзе Народнага камісарыята РСФСР па справах нацыянальнасцей. Лідарамі гэтага напрамку з'яўляліся З. Жылуновіч, А. Чарвякоў, Я. Канчар і інш. Яны прадстаўлялі інтарэсы часткі беларускай інтэлігенцыі, рабочых і сялян, якія імкнуліся стварыць беларускую нацыянальную дзяржаўнасць на савецкай аснове.

Другі напрамак — *ліберальна-буржуазны*. Яго лідараў у гістарычнай літаратуры называюць беларускімі дзеячамі нацыянальна-дэмакратычнага кірунку. Прыхільнікі гэтага напрамку групаваліся вакол Вялікай беларускай рады. Яны адмоўна ставіліся да ўсталявання савецкай улады. Кастрычніцкую рэвалюцыю характарызавалі як анархію, якая пагражае існаванню беларускага народа, яго правам і свабодам. Прыхільнікі гэтага напрамку марылі аб стварэнні беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці на буржуазнай аснове.

Складанымі і супярэчлівымі былі адносіны кіраўнікоў новых дзяржаў-суседзяў (Польшчы, Украіны і Літвы) да стварэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Так, Цэнтральная рада Украіны пачала ўкраінізацыю паўднёвай часткі Беларусі, якую атрымала паводле Брэсцкага мірнага дагавора. Літоўскае кіраўніцтва даволі стрымана адносілася да стварэння беларускай дзяржаўнасці, прэтэндуючы на далучэнне заходніх рэгіёнаў Беларусі да сваёй дзяржавы. Кіраўнікі Польшчы на словах былі за федэратыўныя адносіны з Беларуссю, Украінай і Літвой, а на самай справе хацелі далучыць іх да Польшчы. Гэта азначала б аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.



Правообладатель Народная асвета

У такім складаным і супярэчлівым унутрыпалітычным і міжнародным становішчы нацыянальна-дэмакратычнымі дзеячамі, іх партыямі і арганізацыямі намячалася адкрыццё ў Мінску **5 снежня 1917 г.** *I Усебеларускага з’езда.* Аднак у гэты дзень на з’езд прыехалі толькі 300 дэлегатаў, таму была праведзена прыватная нарада дэлегатаў, якія ўжо прыбылі на з’езд. Пасля бурных дэбатаў 7 снежня 1917 г. у Мінскім гарадскім тэатры з’езд быў аб’яўлены афіцыйна адкрытым. Прыбыццё дэлегатаў на з’езд працягвалася. Усяго на з’езд прыехалі 1872 дэлегаты з правам рашаючага і дарадчага голасу. Толькі 15—18 снежня 1917 г. з’езд у поўным складзе дэлегатаў змог прыступіць да абмеркавання галоўнага пытання — арганізацыі краёвай улады і праблемы самавызначэння беларускага народа.



Будынак Мінскага гарадскога тэатра (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы), у якім працаваў I Усебеларускі з’езд

Дэлегаты з’езда прынялі рашэнне стварыць са свайго складу *Усебеларускі Савет сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў* і перадаць яму ўсю ўладу ў краі. Тым самым не прызнаваліся і адхіляліся ад улады Саветы рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў, іх выканаўчыя органы, якія былі створаны на неакупіраванай частцы тэрыторыі Беларусі ў кастрычніку — лістападзе 1917 г. З пункту гледжання бальшавікоў, гэта было не што іншае, як спроба контррэвалюцыйнага дзяржаўнага перавароту.

СНК Заходняй вобласці і фронту ноччу **18 снежня 1917 г.** распусціў з’езд, а члены прэзідыума і шэраг дэлегатаў былі арыштаваны і праз некалькі дзён выпушчаны на волю. Частка дэлегатаў, што не была арыштавана, на нелегальным пасяджэнні перадала краёвую ўладу *Выканкаму Рады Усебеларускага з’езда.*

Чаму так жорстка адносіліся органы савецкай улады да I Усебеларускага з’езда? Ці была забарона далейшай працы з’езда памылкай бальшавікоў? Такія погляды ёсць у гістарычнай навуцы.

*Па-першае*, Усебеларускі з’езд быў распушчаны не за спробу рэалізаваць права беларускага народа на самавызначэнне, як пішуць некаторыя гісторыкі, а за спробу ліквідаваць савецкую ўладу і адхіліць бальшавікоў ад кіраўніцтва краем. Кожная ўлада павінна ўмець сябе абараняць. У снежні 1917 г. у бальшавікоў Беларусі былі сілы і магчымасці, каб абараніць савецкую ўладу ад контррэвалюцыйных спроб яе ліквідацыі.

*Па-другое*, прысутныя на з’ездзе 1872 дэлегаты не прадстаўлялі ўвесь беларускі народ. Ён не толькі іх не выбіраў, але і мала ведаў пра гэты з’езд. На з’ез-



Правообладатель Народная асвета

дзе былі прадстаўнікі палітычных партый і арганізацый, прафсаюзаў, органаў улады і кіравання. Таму нельга сцвярджаць пра «небывала прадстаўнічы Усебеларускі з'езд», як гэта сустракаецца на старонках некаторых публікацый.

*Па-трэцяе*, улада бальшавікоў у Расіі і ўрад У. Леніна ў Петраградзе ўдзельнікамі Усебеларускага з'езда прызнаваліся, а на тэрыторыі Беларусі павінна была існаваць буржуазная ўлада, незалежная ад СНК РСФСР і ад Савецкай Расіі. З гэтым не маглі пагадзіцца бальшавікі Беларусі.

*Па-чацвёртае*, падзеі на з'ездзе і пасля яго сведчаць пра тое, што магчымасцей для супрацоўніцтва розных партый і арганізацый на савецкай аснове не існавала. Ішла барацьба паміж прыхільнікамі буржуазна-рэфармісцкага і рэвалюцыйна-сацыялістычнага кірункаў развіцця Беларусі. У такой сітуацыі ў розных палітычных плыняў не было іншага выбару ў барацьбе за ўладу, акрамя канфрантацыі.

**Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).** У дзень захопу Мінска немцамі **21 лютага 1918 г.** Выканкам Рады Усебеларускага з'езда звярнуўся да народа Беларусі з *1-й Устаўной граматай,* у якой аб'явіў сябе ўладай у краі. Выканаўчым органам, урадам стаў Народны сакратарыят на чале з Я. Варонкам.

**9 сакавіка 1918 г.** Выканкам Рады прыняў *2-ю Устаўную грамату,* у якой Беларусь была аб'яўлена *Народнай Рэспублікай* і вызначаны асноўныя прынцыпы дзяржаўнага ладу, тэрыторыя, правы і свабоды грамадзян, формы ўласнасці і інш. (гл. *гістарычны дакумент I*). 18 сакавіка 1918 г. Выканкам Рады Усебеларускага з'езда быў рэарганізаваны ў *Раду БНР* як вышэйшы заканадаўчы орган дзяржаўнай улады на тэрыторыі Беларусі. Прэзідыум Рады ўзначаліў І. Серада.

**25 сакавіка 1918 г.** Рада БНР прыняла *3-ю Устаўную грамату,* якой абвяшчалася *незалежнасць БНР* у этнаграфічных межах пражывання беларусаў. Нацыянальнымі дзеячамі ў якасці дзяржаўнага сцяга быў прыняты бела-чырвона-белы сцяг. Разам з гербам «Пагоня» — гербам Вялікага Княства Літоўскага — ён стаў дзяржаўным сімвалам БНР.



Народны сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі (няпоўны склад). Злева направа: сядзяць — А. Бурбіс, І. Серада, Я. Варонка, В. Захарка; стаяць — А. Смоліч, П. Крачэўскі, К. Езавітаў, А. Аўсянік, Л. Заяц. Мінск, 1918 г.

Рада БНР спрабавала рэалізаваць незалежнасць дзяржавы пры дапамозе знешніх сіл, што было яе памылкай. 25 красавіка 1918 г. яна накіравала тэлеграму германскаму кайзеру Вільгельму II, у якой выказвалася падзяка «за вызваленне Беларусі нямецкімі войскамі з цяжкага ўціску чужога пануючага здзеку і анархіі». «Толькі пад абаронай Гер-



Правообладатель Народная асвета

манскай імперыі бачыць край сваю добрую долю ў будучыні», — адзначалася ў тэлеграме. Але кіраўніцтва Германіі афіцыйна БНР не прызнала. Не прызналі самаабвешчаную дзяржаву і краіны Антанты.

У поўным сэнсе слова *Беларуская Народная Рэспубліка (БНР)* дзяржавай не з’яўлялася. Утварэнне самастойнай дзяржавы прадугледжвае не толькі яе абвяшчэнне, але і функцыянаванне рэальнай сістэмы органаў улады на пэўнай тэрыторыі, прыняцце законаў, ажыццяўленне канкрэтных знешніх і ўнутрыпалітычных функцый.

На акупіраванай тэрыторыі Беларусі асноўныя пытанні дзяржаўнага ўзроўню фактычна вырашаліся не Радай і Народным сакратарыятам БНР, а германскай ваеннай адміністрацыяй. БНР не здзяйсняла сваіх паўнамоцтваў на ўсёй тэрыторыі пражывання беларусаў, не мела ўласнай арміі, органаў улады на месцах, фінансавай і судовай сістэмы. Яна не атрымала належнага міжнароднага прызнання. Функцыі ўрада БНР абмяжоўваліся палавінчатымі паўнамоцтвамі нацыянальнага прадстаўніцтва пры германскай акупацыйнай адміністрацыі і рашэннем пад кантролем немцаў задач у галіне культуры і адукацыі.

Такім чынам, аб БНР можна гаварыць як аб спробе стварэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці на буржуазнай аснове. Не варта ні перабольшваць значэнне абвяшчэння БНР, як гэта робіцца ў некаторых сучасных публікацыях, ні замоўчваць факт абвяшчэння БНР, як гэта рабілася ў савецкай навуковай і вучэбнай літаратуры.

**Утварэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (ССРБ).** Рэальнае і дзейснае нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі пачалося пасля вызвалення яе тэрыторыі ад нямецкіх акупантаў. Яно было звязана з утварэннем ***Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (ССРБ)***. Працэс нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва праходзіў у даволі складаных умовах.




Паштоўка з бела-чырвона-белым сцягам Беларускай Народнай Рэспублікі




Паштоўка з гербам «Пагоня» Беларускай Народнай Рэспублікі і гербамі Віленскага, Полацкага, Мсціслаўскага, Смаленскага і Навагрудскага ваяводстваў



Правообладатель Народная асвета

З аднаго боку, кіраўнікі *Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама)* і *Цэнтральнага бюро беларускіх секцый РКП(б)* (арганізавана з бежанцаў-беларусаў у розных гарадах Расіі) А. Чарвякоў, З. Жылуновіч і іншыя лічылі неабходным стварэнне беларускай савецкай рэспублікі і ўстанаўленне яе цесных сувязей з РСФСР.

З другога боку, кіраўнікі *Аблвыканкамзаха* і *Паўночна-Заходняй абласной арганізацыі РКП(б)* выступалі супраць абвяшчэння Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі. Яны лічылі, што нацыянальнае пытанне ў Беларусі можна вырашыць у межах Заходняй вобласці, якая б уваходзіла ў склад РСФСР. Закінутыя вайной на тэрыторыю Беларусі небеларусы па нацыянальнасці А. Мяснікоў, В. Кнорын і іншыя не зусім правільна разумелі сутнасць беларускага нацыянальнага пытання і праблемы развіцця сусветнай цывілізацыі. Яны не прызнавалі існавання самастойнай беларускай нацыі і беларускай нацыянальнай культуры, а беларусаў лічылі «крыху сапсаванымі рускімі», якім патрэбна дапамагчы не ў стварэнні дзяржаўнасці, а ў «ліквідацыі некаторых этнаграфічных асаблівасцей». Пасля гэтага, на іх думку, беларусы сталі б сапраўднымі рускімі людзьмі. Рускі народ яны разглядалі як адзінства трох народнасцей: велікаросаў, маларосаў (украінцаў) і беларусаў. На думку А. Мяснікова, В. Кнорына, эпоха нацыянальных дзяржаў адышла ў мінулае, а абарона нацыянальнай дзяржаўнасці перашкаджае сусветнай рэвалюцыі. Такая памылковая пазіцыя мясцовых кіраўнікоў супадала з пазіцыяй вышэйшага савецкага кіраўніцтва.

Аднак, улічваючы імкненне беларускага народа да стварэння сваёй дзяржаўнасці, патрабаванні некаторых палітычных партый і арганізацый у вырашэнні беларускага пытання, наяўнасць самаабвешчанай БНР, а таксама ў мэтах умацавання і пашырэння заваёў сацыялістычнай рэвалюцыі ў сусветным маштабе 24 снежня 1918 г. ЦК РКП(б) прыняў пастанову аб стварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (гл. матэрыял *«Гэта цікава»*).


Год выданьня 1-мы

ВЕСТКІ

Часовага Работніча-Селянскага Радавага (Советского) Ураду Беларусі.

№ 1.

МАНІХВЭСТ

Часовага Работніча-Селянскага Савецкага Праўіцельства Беларусі.

Таварышы і браты рабочыя, бедныя селяне і чырвонаармейцы Беларусі

Газета «Весткі» з тэкстам Маніфеста аб абвяшчэнні ССРБ

Прыняцце канчатковага рашэння аб утварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі, яе абвяшчэнне адбывалася ў Смаленску, які з'яўляўся тады адміністрацыйным цэнтрам *Заходняй Камуны* (так у канцы 1918 г. называлася былая Заходняя вобласць) *РСФСР*. У склад гэтай адміністрацыйнай адзінкі ўваходзіла тэрыторыя тагачаснай Беларусі і Смаленшчыны.



Правообладатель Народная асвета

30 снежня 1918 г. у Смаленску адкрылася *VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б)*. Яна прыняла рэзалюцыю аб абвяшчэнні «самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Беларускай Рэспублікі» ў межах Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў. Канферэнцыя абвясціла сябе *I з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б)* і выбрала кіруючы орган — Цэнтральнае бюро КП(б)Б. Камуністычную партыю бальшавікоў Беларусі ў той час узначальваў А. Мяснікоў.

1 студзеня 1919 г. быў сфарміраваны *Часовы рабоча-сялянскі савецкі ўрад Беларусі* на чале з ***З. Жылуновічам*** і па радыё абнародаваны *Маніфест*. У Маніфесце Беларусь абвяшчалася «вольнай, незалежнай Сацыялістычнай Рэспублікай», замацоўваліся асноўныя палажэнні палітычнага і грамадскага ладу Беларусі, адмяняліся ўсе загады і распараджэнні акупацыйных улад. Рада БНР аб'яўлялася па-за законам. 5 студзеня 1919 г. урад ССРБ і ЦБ КП(б)Б пераехалі са Смаленска ў Мінск, які з гэтага часу стаў сталіцай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі.

### Гістарычны партрэт



**Жылуновіч Зміцер Хведаравіч (Цішка Гартны) (1887—1937)** — беларускі савецкі пісьменнік і грамадскі дзеяч, акадэмік АН БССР. Прымаў удзел у рэвалюцыі 1905—1907 гг. Шукаючы працу, аб'ехаў Беларусь, Украіну і Літву. У 1912 г. працаваў на заводзе «Вулкан» у Пецярбургу. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў сакратаром Белнацкама пры ўрадзе РСФСР, рэдагаваў газету «Дзянніца». З 1 студзеня да 3 лютага ўзначальваў Часовы рабоча-сялянскі савецкі ўрад Беларусі. Пасля быў рэдактарам газеты «Савецкая Беларусь», часопіса «Полымя», дырэктарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР. У гісторыю беларускай літаратуры ўвайшоў як паэт, празаік, драматург, публіцыст і крытык. Найбольш арыгінальны як празаік. У рамане «Сокі цаліны» (1914—1929) паказаў фарміраванне характару рэвалюцыйных змагароў, местачковы побыт і заводскія будні. У іншых творах расказаў пра падзеі Грамадзянскай вайны, пра вёску перыяду калектывізацыі, пра рабочы клас, стварыў вобразы камуністаў. Творы Ц. Гартнага перакладзены на рускую, украінскую, польскую і іншыя мовы.

**Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі (ССРЛіБ, у скарочаных назвах Літбел).** Пагроза інтэрвенцыі з боку Польшчы прымусіла савецкае кіраўніцтва аб'яднаць ССРБ з Літоўскай ССР. **16 студзеня 1919 г.**



Правообладатель Народная асвета




Утварэнне БССР і Літоўска-Беларускай ССР



Правообладатель Народная асвета

ЦК РКП(б) прыняў рашэнне ўключыць Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні ў склад РСФСР, а на аснове Мінскай, Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў абвясціць ***Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Літвы і Беларусі (Літбел)***. Меркавалася, што ўключаныя ў склад РСФСР Віцебская і Магілёўская губерні, калі іншыя тэрыторыі Беларусі будуць захоплены Польшчай, у будучым змогуць стаць асновай для аднаўлення беларускай дзяржаўнасці.

**2—3 лютага 1919 г.** адбыўся *I Усебеларускі з'езд Саветаў*. Яго дэлегаты прынялі Канстытуцыю ССРБ (гл. *гістарычны дакумент II*), а таксама зацвердзілі герб і сцяг рэспублікі. Паводле Канстытуцыі ССРБ вышэйшая ўлада ў рэспубліцы належала з'езду Саветаў Беларусі. У перыяд паміж з'ездамі яе здзяйсняў Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ЦВК) ССРБ. Першая Канстытуцыя ССРБ вызначыла асноўныя задачы дзяржавы, абвясціла дэмакратычныя правы і свабоды грамадзян, адмяніла прыватную ўласнасць на зямлю, лясы, нетры і ваду, абвясціла пераход іх у агульнае дзяржаўнае карыстанне.

З'езд прыняў рашэнне аб аб'яднанні ў адну дзяржаву Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі і Літоўскай ССР. Такое ж рашэнне прыняў і I з'езд Саветаў Літвы ў лютым 1919 г.

27 лютага 1919 г. былі створаны ЦВК і СНК Літбел. У склад гэтай дзяржавы ўвайшлі Мінская, Гродзенская, Віленская, Ковенская і частка Сувалкаўскай губер-



Дэлегаты I Усебеларускага з'езда Саветаў. Мінск. 2—3 лютага 1919 г.



Правообладатель Народная асвета

няў з больш як 4-мільённым насельніцтвам. Сталіцай ССРЛіБ стаў горад Вільня. Аднак ужо ў жніўні 1919 г. тэрыторыя аб'яднанай дзяржавы была захоплена Польшчай. Літоўска-Беларуская ССР фактычна перастала існаваць.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *5—18 снежня 1917 г., 21 лютага 1918 г., 9 сакавіка 1918 г., 25 сакавіка 1918 г., 1 студзеня 1919 г., 16 студзеня 1919 г., 2—3 лютага 1919 г.; Беларуская Народная Рэспубліка (БНР), Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусі (ССРБ), Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі (Літбел).*

## Пытанні і заданні

**1.** Якія два напрамкі вылучаліся ў беларускім нацыянальным руху ў канцы 1917 г.? Якімі палітычнымі сіламі яны былі прадстаўлены? Якую пазіцыю займалі па пытанні аб беларускай дзяржаўнасці? **2.** Калі адбыўся I Усебеларускі з'езд? Якую пазіцыю ён заняў па пытанні аб уладзе на тэрыторыі Беларусі? Чаму СНК Заходняй вобласці і фронту распусціў з'езд? **3.** Калі была абвешчана БНР? Чаму БНР не з'яўлялася дзяржавай у поўным сэнсе гэтага слова? **4.** Якія погляды па пытанні аб нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве ў Беларусі існавалі сярод кіраўнікоў Паўночна-Заходняй абласной арганізацыі РКП(б), Аблвыканкамзаха, Белнацкама? Чаму было прынята рашэнне ўтварыць ССРБ? Калі была абвешчана ССРБ? **5.** Якія рашэнні былі прыняты на I Усебеларускім з'ездзе Саветаў? (*Выкарыстайце гістарычны дакумент II.*) **6.** Падрыхтуйце паведамленне пра дзейнасць З. Жылуновіча (гл. *памятку 3*). Выкарыстайце дадатковую літаратуру. **7.** Пачніце запаўненне табліцы.

**Тэрытарыяльныя змены Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (1919—1939)**

| Перыяд | Гістарычныя ўмовы | Тэрытарыяльныя змены |
|---|---|---|
| 1 студзеня 1919 г. | | |
| 16 студзеня 1919 г. | | |
| 2—3 лютага 1919 г. | | |

## Ваша меркаванне

Ці згодны вы з тым, што спроба Рады БНР рэалізаваць незалежнасць беларускай дзяржавы з дапамогай знешніх сіл (кайзераўскай Германіі) была вялікай памылкай? Сваю думку абгрунтуйце (гл. *памятку 8*).

## Гэта цікава

У беларускай гістарычнай літаратуры сустракаюцца дзве аднолькавыя па змесце назвы першай беларускай савецкай дзяржавы: «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР)» і «Савецкая Сацыялістычная Рэспуб-



Правообладатель Народная асвета

ліка Беларусі (ССРБ)». VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б) у Смаленску 30 снежня 1918 г. прыняла рэзалюцыю аб абвяшчэнні Заходняй камуны «самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Беларускай Рэспублікай». 1 лютага 1919 г. у Смаленску быў надрукаваны «Маніхвэст Часовага Работніча-Сялянскага Савецкага Правіцяльства Беларусі», у фармуліроўцы якога поўная і афіцыйная назва дзяржавы адсутнічае. 1 сакавіка 1919 г. Саўнаркам Літбел афіцыйна зацвердзіў назву новага дзяржаўнага ўтварэння — Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі (ССРЛіБ). Пры другім абвяшчэнні беларускай савецкай дзяржавы ў ліпені 1920 г. была прынята «Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі». Аднак у самым пачатку 1920-х гг. за рэспублікай замацавалася назва «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР)». Калі і якім дакументам канчаткова зацвердзілася гэтая назва, у навуковай і вучэбнай літаратуры не растлумачана. Пытанне патрабуе дадатковага навуковага даследавання.

## Гістарычны дакумент

### І. З 2-й Устаўной граматы Выканкама Рады Усебеларускага з'езда

«1. Беларусь у рубяжох разсялення і лічбеннай перавагі беларускага народа абвяшчаецца НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКАЙ.

*1.* Асноўныя законы Беларускай Народнай Рэспублікі зацьвердзіць Устаноўчы Сойм Беларусі, склікaны на асновах агульнаго, роўнаго, простаго, патаемнаго і прапарцыянальнаго выбарчаго права, не зважаючы на пол, народнасць і рэлігію.

*2.* Да часу, пакуль зьбярэцца Устаноўчы Сойм Беларусі, законадаўчая ўлада ў Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Радзе Усебеларускаго Зьезду, дапоўненай прадстаўнікамі нацыянальных меншасцяў Беларусі.

*3.* Спаўняючая і адміністратыўная ўлада ў Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Народнаму Сакрэтарыяту Беларусі, які назначаецца Радаю Зьезду і перад ёю трымае атвет.

*4.* У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі абвяшчаецца вольнасць слова, друку, сходаў, забастовак, хаўрусаў (аб'яднанняў, саюзаў); безумоўная вольнасць сумленьня, незачэпнасць асобы і памешканьня.

*5.* У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі ўсе народы маюць права на нацыянальна-пэрсанальную аўтаномію; абвяшчаецца роўнае права ўсіх моваў народаў Беларусі.

*6.* У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі права прыватнае ўластнасьці на зямлю касуецца. Зямля перадаецца бяз выкупу тым, што самі на ёй працуюць. Лясы, вазёры і нутро зямлі абвяшчаюцца ўластнасьцю Беларускай Народнай Рэспублікі.

*7.* У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі ўстанаўляецца найбольшы 8-гадзіновы рабочы дзень…»



Правообладатель Народная асвета

**II. З Канстытуцыі Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі**

1919 г.

«1. Беларусь аб'яўляецца Рэспублікай Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Уся ўлада ў цэнтры і на месцах належыць гэтым Саветам…

2. …з'езд Саветаў пастанаўляе:

а) прыватная ўласнасць на зямлю адмяняецца, і ўвесь зямельны фонд аб'яўляецца агульнадзяржаўнай уласнасцю;

б) усе лясы, недры і воды, а таксама і ўвесь жывы і мёртвы інвентар, узорныя гаспадаркі і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы аб'яўляюцца нацыянальнай уласнасцю;

в) у мэтах знішчэння паразітычных слаёў грамадства і арганізацыі гаспадаркі ўводзіцца ўсеагульны працоўны абавязак…

7. У мэтах забеспячэння за працоўнымі сапраўднай свабоды сумлення царква аддзяляецца ад дзяржавы і школа ад царквы, а свабода рэлігійнай і антырэлігійнай прапаганды прызнаецца за ўсімі грамадзянамі…

11. У мэтах забеспячэння за працоўнымі сапраўднага доступу да ведаў ССРБ ставіць сваёй задачай прадставіць рабочым і бяднейшым сялянам поўную і ўсебаковую бясплатную адукацыю…

13. У мэтах абароны заваёў вялікай рабоча-сялянскай рэвалюцыі ССРБ прызнае абавязкам усіх грамадзян рэспублікі абарону сацыялістычнай айчыны і ўстанаўлівае ўсеагульны воінскі абавязак. Ганаровае права абараняць рэвалюцыю са зброяй у руках прадстаўляецца толькі працоўным, на непрацоўныя ж элементы ўскладваюцца іншыя вайсковыя абавязкі…

15. ССРБ прызнае роўныя правы за грамадзянамі, незалежна ад іх расавай і нацыянальнай прыналежнасці…»

## § 6. БЕЛАРУСЬ У ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЕ 1919—1920 гг.

**Успомніце. 1.** Што такое Рэч Паспалітая? Калі адбываліся падзелы Рэчы Паспалітай? Якія краіны ўдзельнічалі ў гэтым працэсе? **2.** Што такое федэрацыя, унія?

**Наступленне польскіх войскаў у Беларусі.** У лістападзе 1918 г. у сувязі з паражэннем у Першай сусветнай вайне Германіі і Аўстра-Венгрыі, а таксама абвяшчэннем савецкай уладай несапраўднымі ўсіх дагавораў царскага ўрада наконт лёсу трэціх краін аднавілася Польская дзяржава. Пры дапамозе краін Антанты за кароткі тэрмін яна стварыла моцную армію. Польскае кіраўніцтва паставіла задачай адрадзіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г., уключыць у склад Польшчы Літву, значныя тэрыторыі Украіны і Беларусі.

У **лютым 1919 г.** пачалося буйнамаштабнае наступленне польскіх войскаў. Іх паўночная група наступала ў напрамку Вільні, Ліды і Маладзечна. У хуткім часе яна заняла большую частку Гродзенскай губерні. Паўднёвая група польскіх войскаў



Правообладатель Народная асвета

наступала ў напрамках Баранавічы — Мінск, Кобрын — Пінск. Да сярэдзіны сакавіка 1919 г. польскія войскі захапілі Ваўкавыск, Слонім, Шчучын, Пінск, Баранавічы і іншыя населеныя пункты. 22 красавіка 1919 г. пасля 3-дзённых баёў савецкія войскі пакінулі Вільню.

Для барацьбы супраць палякаў ствараўся Заходні фронт. У Сацыялістычнай Савецкай Рэспубліцы Літвы і Беларусі было ўведзена ваеннае становішча. Кіруючыя органы ССРЛіБ правялі партыйную, камсамольскую і агульную мабілізацыю ў Чырвоную Армію. У выніку было мабілізавана каля 93 тыс. чалавек. Значная іх частка была накіравана на Заходні фронт, але асноўныя сілы Чырвонай Арміі ў гэты час ваявалі на Усходнім фронце супраць А. Калчака.

Летам 1919 г. становішча на Заходнім фронце пагоршылася. У маі польскія войскі захапілі Смаргонь, Свянцяны, Лунінец і прасоўваліся ў глыб тэрыторыі Беларусі. Чырвоная Армія ў выніку бесперапынных 4-месячных баёў мела вялікія страты ў людзях і ўзбраенні. На 15 чэрвеня 1919 г. асабовы склад часцей Чырвонай Арміі не перавышаў 36 тыс. чалавек. Ім супрацьстаялі 96 тыс. салдат і афіцэраў польскай арміі.

Улічваючы складанасць ваеннага становішча, былі мабілізаваны на Заходні фронт дзясяткі тысяч байцоў з Гомельшчыны, Віцебшчыны, Міншчыны і іншых мясцін Беларусі. Заходні фронт дадаткова атрымаў фонды харчавання, адзення, абутку.

Праведзеныя мерапрыемствы ўмацавалі Заходні фронт. Але, калі з Францыі была перакінута добра вывучаная і ўзброеная армія Галера, сілы польскіх войскаў амаль падвоіліся. 1 ліпеня 1919 г. яны пачалі агульнае наступленне і ў той жа дзень захапілі Вілейку, 3 ліпеня — Маладзечна, а 8 жніўня — Мінск.

У жніўні — верасні 1919 г. польскія войскі захапілі Ігумен (сучасны Чэрвень), Нова-Барысаў, Бабруйск, Жлобін, Рагачоў і Рэчыцу. Толькі ў **кастрычніку 1919 г.** іх наступленне было спынена на лініі *Заходняй Дзвіны (Полацк — Лепель — Барысаў), затым на поўдзень па р. Бярэзіне.*

**Асноўныя напрамкі барацьбы з польскімі інтэрвентамі.** 22 красавіка 1919 г. кіраўнік польскай дзяржавы Ю. Пілсудскі ў сваім звароце «Да жыхароў былога Вялікага Княства Літоўскага» абяцаў даць усім свабоду і роўныя магчымасці ў вырашэнні нацыянальных і рэлігійных спраў, а таксама забяспечыць *федэратыўныя* сувязі беларускай, украінскай і літоўскай свабодных дзяржаў пад кіраўніцтвам Польшчы. Але гэта быў дыпламатычны ход.

На захопленай тэрыторыі быў устаноўлены жорсткі *акупацыйны рэжым*, аднаўлена ўлада памешчыкаў і капіталістаў. Праводзіліся масавыя арышты працаўнікаў польскага рэжыму і дзеячаў беларускага нацыянальнага руху. Падазроныя ў сімпатыях да савецкай улады расстрэльваліся. Толькі ў Мінску было арыштавана 1000 жыхароў, з якіх 100 чалавек расстраляна па прыгаворах ваенна-палявога суда. Масавым разбоем адзначана знаходжанне польскіх акупантаў у Рэчыцкім, Бабруй-



Правообладатель Народная асвета

скім, Пінскім і іншых паветах Беларусі. У Лідзе ў выніку ўчыненых польскімі акупантамі пагромаў загінула звыш 100 чалавек.

Багацці Беларусі раскрадаліся і перапраўляліся ў Польшчу. Дзяржаўнай мовай была аб'яўлена польская. Зачыняліся беларускія школы і ўстановы культуры. У Мінску, напрыклад, забаронена было ставіць на сцэне п'есы папулярных беларускіх драматургаў Янкі Купалы, Каруся Каганца і іншых аўтараў. З дзяржаўных устаноў звальняліся асобы беларускага паходжання і праваслаўнага веравызнання.

Некаторыя кіраўнікі беларускага нацыянальнага руху паверылі прапагандзе Ю. Пілсудскага. Рада БНР (у ходзе наступлення Чырвонай Арміі ў лістападзе — снежні 1918 г. яна пакінула Мінск, пераехала спачатку ў Вільню, а потым у Гродна) на чале з Я. Лёсікам звярнулася да Ю. Пілсудскага з лістом, у якім змяшчалася просьба аб перадачы ёй улады ў Беларусі. Старшыня ўрада БНР А. Луцкевіч пачаў перагаворы з кіраўніцтвам Польшчы аб прызнанні БНР. У верасні 1919 г. А. Луцкевіч у Варшаве пагадзіўся заключыць унію Беларусі і Польшчы пры ўмове прызнання польскім сеймам незалежнасці БНР. Але Ю. Пілсудскі не прыняў гэтай прапановы і загадаў інтэрніраваць (прымусова затрымаць) А. Луцкевіча.

Польскае кіраўніцтва лавіравала. Ю. Пілсудскі дазволіў правесці сесію Рады БНР, спадзеючыся, што яна прыме рашэнне аб уніі Польшчы і Беларусі без ніякіх умоў. Каб схіліць на свой бок беларускіх нацыянальных дзеячаў, быў падпісаны дэкрэт аб стварэнні двух батальёнаў беларускага войска і арганізавана Беларуская вайсковая камісія. Але галоўнакамандуючым беларускага войска быў прызначаны польскі афіцэр.

Беларускі народ не скарыўся акупантам. Яго барацьбу ўзначалілі камуністы і эсэры. У канцы жніўня 1919 г. ЦК КП(б)ЛіБ утварыў спецыяльны палітычны орган — *Бюро па нелегальнай рабоце,* якое займалася фарміраваннем партызанскіх атрадаў (гл. *гістарычны дакумент*). У кастрычніку 1919 г. ЦК БПС-Р (Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў) заклікаў усе палітычныя партыі стварыць агульны фронт барацьбы за вызваленне Беларусі.

Антыбеларуская пазіцыя польскага кіраўніцтва і размах антыпольскай барацьбы выклікалі раскол ва ўладных структурах БНР. На сесіі Рады БНР у снежні 1919 г. прыхільнікам польскай арыентацыі, старшыні Рады Я. Лёсіку і старшыні ўрада А. Луцкевічу, быў выказаны недавер. Утварыўся новы прэзідыум Рады і новы ўрад БНР на чале з В. Ластоўскім, якія з'яўляліся праціўнікамі уніі з Польшчай. У хуткім часе польскія ўлады арыштавалі сваіх палітычных праціўнікаў, у тым ліку і кіраўніка новага ўрада БНР В. Ластоўскага, а таксама афіцыйна заявілі, што не збіраюцца прызнаваць Беларускую Народную Рэспубліку.

Прыхільнікі уніі з Польшчай склалі *Найвышэйшую раду* пад кіраўніцтвам І. Серады. Гэтая рада была марыянеткай у польскай акупацыйнай адміністрацыі,



Правообладатель Народная асвета




Беларусь у сакавіку 1919—1920 гг.



Правообладатель Народная асвета

бо, акрамя культурна-нацыянальнай аўтаноміі ў межах Мінскай акругі, польскія ўлады больш нічога не абяцалі беларусам. У сакавіку 1920 г. Найвышэйшая Рада заключыла дагавор з польскім урадам, у якім дала згоду на ўключэнне ў склад Польшчы былых Віленскай і Гродзенскай губерняў.

З мэтай барацьбы за вызваленне Беларусі ад польскіх акупантаў адбываўся працэс далейшага збліжэння камуністаў і беларускіх эсэраў. У снежні 1919 г. у Смаленску прайшла сумесная канферэнцыя прадстаўнікоў гэтых партый. Быў падпісаны дагавор, у якім камуністы і эсэры абавязваліся стварыць адзіны антыпольскі фронт барацьбы. Таксама быў распрацаваны план узброенага паўстання і створаны *Беларускі паўстанцкі камітэт (БПК)*.

У пачатку 1920 г. камуністычная і эсэраўская плыні партызанскага руху аб'ядналіся. Вялікую ролю ў гэтым аб'яднанні адыграла *Беларуская камуністычная арганізацыя (БКА)* на чале з У. Ігнатоўскім.

Беларускія партызаны разбуралі камунікацыі, узрывалі польскія вайсковыя эшалоны, праводзілі разведвальную работу ў тыле ворага. У студзені 1920 г. у вёсцы Гатава каля Мінска адбыўся першы з'езд партызан, а ў красавіку ў вёсцы Міханавічы — другі. На гэтых з'ездах распрацоўвалася і ўдакладнялася тактыка барацьбы супраць польскіх акупантаў.

**Даты, якія трэба ведаць:** *люты — кастрычнік 1919 г.*

### Пытанні і заданні

**1.** Калі пачалося наступленне польскіх войскаў у Беларусі? Якія мэты ставіла польскае кіраўніцтва? Якімі былі вынікі польскага наступлення? (*Выкарыстайце карту на с. 35.*) **2.** Ахарактарызуйце польскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі. **3.** Ахарактарызуйце пазіцыю дзеячаў Рады БНР па нацыянальным пытанні ў гады польскай акупацыі. **4.** Назавіце партыі і арганізацыі, якія ўзначалілі барацьбу беларускага народа супраць польскіх акупантаў. **5.** Якія формы барацьбы супраць польскіх акупантаў прымяняліся беларускімі партызанамі ў 1919—1920 гг.? (*Выкарыстайце гістарычны дакумент.*)

### Ваша меркаванне

Кіраўнікі БНР дабіваліся ўсталявання кантактаў з ЗША, Англіяй, Францыяй. Кіраўнікам гэтых краін дасылаліся шматлікія «ноты пратэсту» супраць захопу беларускіх зямель палякамі і бальшавікамі, пісьмы з просьбамі «афіцыйна прызнаць незалежнасць Беларусі», «дапамагчы беларускаму народу ў дзяржаўным будаўніцтве». Міністры БНР звярталіся да дыпламатычных місій розных краін, каб атрымаць месца на Парыжскай мірнай канферэнцыі і дабіцца пастаноўкі на ёй беларускага пытання. Але краіны Антанты не прызнавалі БНР і не рэагавалі на заходы яе палітычных дзеячаў.

Наколькі апраўданым, на ваш погляд, было супрацоўніцтва некаторых дзеячаў БНР з польскім урадам па пытанні стварэння незалежнай беларускай дзяржавы?



Правообладатель Народная асвета

### Гістарычны дакумент

**З палітычнай зводкі палітаддзела Заходняга фронту ад 6 ліпеня 1920 г.**

«В Игуменском направлении в тылу противника действуют партизанские отряды, в которых участвуют 70-летние старики. Одним из таких отрядов в районе Минска взорваны артсклады. В Рудобельских лесах успешно действуют партизаны. 28 мая в Глусске была на 4 дня восстановлена советская власть. В Бобруйском и Слуцком уездах отмечаются массовые случаи порчи телеграфных проводов и шоссе.

В Лунинец-Мозырском районе имеется много партизанских отрядов, есть некоторые в 700 человек, хорошо вооруженных и имеющих в достаточном количестве взрывчатые вещества. В Речицком районе действует партизанский отряд в 300 человек, имеющий винтовки, до 20 пулеметов и автоматы. Другой отряд, насчитывающий до 150 человек, вооружен винтовками. В ночь на 19 июня между Бабичами и Демехами разобран путь, в результате чего потерпел крушение бронепоезд противника. В связи с крестьянскими восстаниями настроение польских солдат подавленное, зарегистрировано несколько случаев продажи польскими солдатами оружия крестьянам за плату или в обмен на продукты».

### Гэта цікава

У 1919—1920 гг. на акупіраваных палякамі землях Беларусі актыўна развіваўся партызанскі рух. Адным з арганізатараў партызанскай барацьбы быў легендарны дзед Талаш (1844—1946), аб дзейнасці якога расказаў Я. Колас у аповесці «Дрыгва». У Мазырскім павеце 75-гадовы Васіль Талаш перайшоў лінію фронту, наладзіў сувязь з Чырвонай Арміяй, арганізаваў партызанскі атрад з 300 чалавек, які пад яго кіраўніцтвам выбіў палякаў з в. Навасёлкі, захапіў зброю, боепрыпасы. За ўдзел у барацьбе супраць інтэрвентаў Васіль Талаш быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У гады Вялікай Айчыннай вайны амаль 100-гадовы дзед Талаш удзельнічаў у партызанскім руху супраць германскіх акупантаў.

## Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (кнізе «Памяць») інфармацыю аб тым, якія падзеі адбываліся на тэрыторыі вашага краю ў 1919—1920 гг. Падрыхтуйце паведамленне.



Правообладатель Народная асвета

## § 7. БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ ВА ЎМОВАХ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ. ДРУГОЕ АБВЯШЧЭННЕ ССРБ

**Успомніце. 1.** Што такое Грамадзянская вайна, інтэрвенцыя? **2.** Назавіце храналагічныя рамкі Грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі ў Расіі. **3.** Што такое дэкларацыя?

**Ваенныя дзеянні на польска-савецкім фронце ў 1920 г.** Вясной 1920 г., павялічыўшы сваю армію з дапамогай краін Антанты, Польшча зноў разгарнула наступленне і захапіла Мазыр, Калінкавічы і іншыя населеныя пункты (*гл. карту на с. 35*). Чырвоная Армія атрымала папаўненне з Усходняга фронту, дзе скончылася вайна з А. Калчаком. Галоўнакамандуючым Заходнім фронтам быў назначаны М. Тухачэўскі, начальнікам палітаддзела А. Мяснікоў. Наступленне Чырвонай Арміі пачалося 14 мая 1920 г. даволі паспяхова, але ў выніку ўмацавання польскіх войскаў яно было спынена ў канцы мая. Савецкія войскі былі зноў адкінуты за р. Бярэзіну.

Новае наступленне савецкіх войскаў пачалося ў сярэдзіне чэрвеня 1920 г. на поўдні Беларусі. Ад польскіх акупантаў былі вызвалены Мазыр, Рэчыца і іншыя населеныя пункты. У пачатку ліпеня пачалося наступленне савецкіх войскаў на Мінскім напрамку. 11 ліпеня быў вызвалены Мінск, 19 ліпеня — Гродна, а 1 жніўня пасля цяжкіх баёў савецкія войскі авалодалі Брэстам. Дарога на Варшаву была адкрыта.

Яшчэ 11 ліпеня 1920 г. міністр замежных спраў Англіі Д. Керзан па даручэнні Вярхоўнага савета Антанты накіраваў Савецкаму ўраду радыёграму з патрабаваннем спыніць наступленне савецкіх войскаў па лініі *Гродна — Ялаўка — Няміраў — Брэст-Літоўск* і далей па тэрыторыі Украіны да Карпат. Гэтая лінія павінна была стаць усходняй часовай граніцай Польшчы. У гістарычнай літаратуры яна атрымала назву «*лінія Керзана*». Але савецкае кіраўніцтва, якім валодала ідэя сусветнай пралетарскай рэвалюцыі, прыняло рашэнне аб перанясенні баявых дзеянняў на захад ад «лініі Керзана». Гэта была сур'ёзная палітычная памылка.



М. Тухачэўскі праводзіць агляд часцей Чырвонай Арміі на Заходнім фронце. 1920 г.

У сярэдзіне жніўня 1920 г. Чырвоная Армія дайшла да Варшавы. Польшчы была аказана значная ваенная і дыпламатычная падтрымка з боку Англіі, Францыі, Італіі і ЗША.



Правообладатель Народная асвета

Савецкія войскі панеслі вялікія страты, не хапала боепрыпасаў, іх тылы адсталі на 200—300 км. 16 жніўня 1920 г. польскія войскі перайшлі ў контрнаступленне пад Варшавай. Магутны нацыянальна-патрыятычны ўздым польскага народа ў абарону сваёй радзімы не спраўдзіў разлікаў Савецкага ўрада на падтрымку Чырвонай Арміі польскім пралетарыятам. Чырвоная Армія пацярпела паражэнне. Дзясяткі тысяч савецкіх салдат і афіцэраў трапілі ў палон і былі знішчаны польскімі ўладамі шляхам жудасных здзекаў над імі, голаду і холаду. У жніўні — кастрычніку 1920 г. польскімі войскамі зноў была акупіравана ўся тэрыторыя Заходняй Беларусі.



Артылерыя на перадавых пазіцыях каля Барысава. На пярэднім плане А. Мяснікоў. 1920 г.

Знясіленая бесперапыннымі войнамі, Савецкая Расія 12 кастрычніка 1920 г. заключыла з Польшчай прэлімінарны (папярэдні) мірны дагавор. Але і пасля заключэння перамір'я польскія войскі працягвалі наступаць. 15 кастрычніка 1920 г. яны захапілі Мінск, але 17 кастрычніка яго пакінулі, бо па ўмовах перамір'я сталіца Беларусі заставалася за савецкім бокам.

**Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі 31 ліпеня 1920 г.** Летам 1920 г., пасля вызвалення Беларусі ад польскіх інтэрвентаў, узнікла пытанне аб аднаўленні на яе тэрыторыі савецкай дзяржаўнасці. 12 ліпеня 1920 г. РСФСР прызнала Літву, заключыла з ёй мірны дагавор. Неабходнасць у захаванні Літбел адпала.

**31 ліпеня 1920 г.** у Мінску адбылося сумеснае пасяджэнне прадстаўнікоў партый і грамадскіх арганізацый, на якім была прынята *«Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі»*. Дэкларацыя пацвердзіла аднаўленне сацыялістычных асноў грамадскага і дзяржаўнага ладу ў Беларусі, абвешчаных у Маніфесце 1 студзеня 1919 г. (гл. *гістарычны дакумент*).



Советская
БЕЛОРУСЬ

ДЕКЛАРАЦИЯ

Газета «Советская Белорусь» з тэкстам Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Беларускай ССР



Правообладатель Народная асвета

Савецкая Беларусь аднаўлялася ў межах шасці паветаў Мінскай губерні (Мінскі, Барысаўскі, Бабруйскі, Ігуменскі, Слуцкі і Мазырскі) з насельніцтвам крыху больш за 1,5 млн чалавек.

**Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Беларусі. 18 сакавіка 1921 г.** у Рызе быў падпісаны мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй, Украінай і Польшчай. Прадстаўнікоў Савецкай Беларусі А. Чарвякова і І. Клішэўскага, як і дэлегацыю БНР у складзе В. Ластоўскага і У. Пігулеўскага, да перагавораў у Рызе не дапусцілі. Інтарэсы Беларусі на рыжскіх перагаворах прадстаўляла дэлегацыя РСФСР.

Згодна з Рыжскім мірным дагаворам да Польшчы адышла тэрыторыя Заходняй Беларусі (да Негарэлага, што за 50 км на захад ад Мінска) з плошчай больш за 100 тыс. км$^2$ і насельніцтвам каля 4 млн чалавек.

Вынікам Грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі з'яўлялася тое, што тэрыторыя Беларусі аказалася падзеленай на тры часткі: яе заходняя частка знаходзілася ў складзе Польшчы, усходняя — у складзе РСФСР, і толькі 6 паветаў Цэнтральнай Беларусі складалі тэрыторыю ССРБ. Многія жыхары Беларусі загінулі ці падаліся ў бежанцы. Не працавала большасць прамысловых прадпрыемстваў і транспарт, скараціліся пасяўныя плошчы і пагалоўе жывёлы, занапала сельская гаспадарка. Гарадское насельніцтва, пазбаўленае харчоў і паліва, паступова сыходзіла ў вёску. Не хапала адзення і абутку, іншых прадметаў першай жыццёвай неабходнасці. Вайна прывяла да глыбокага эканамічнага і палітычнага крызісу.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *31 ліпеня 1920 г., 18 сакавіка 1921 г.; Рыжскі мірны дагавор.*

### Пытанні і заданні

**1.** Карыстаючыся картай (с. 35), ахарактарызуйце ход ваенных дзеянняў на Заходнім фронце ў 1920 г. Вызначыце прычыны паражэння Чырвонай Арміі ў жніўні — кастрычніку 1920 г. **2.** Калі адбылося другое абвяшчэнне ССРБ? Чаму яно стала неабходным? **3.** Калі быў падпісаны Рыжскі мірны дагавор? Якімі былі яго ўмовы? **4.** Ахарактарызуйце вынікі Грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі для Беларусі. **5.** Прадоўжыце запаўненне табліцы.

**Тэрытарыяльныя змены Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (1919—1939)**

| Перыяд | Гістарычныя ўмовы | Тэрытарыяльныя змены |
|---|---|---|
| 31 ліпеня 1920 г. | | |
| 18 сакавіка 1921 г. | | |



Правообладатель Народная асвета

## Ваша меркаванне

Якія передумовы для ўтварэння будучага Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР) былі замацаваны ў «Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі»? (*Выкарыстайце гістарычны дакумент*.)

## Дадатковы матэрыял

У беларускай гістарычнай літаратуры ўтрымліваюцца розныя ацэнкі падзей у Слуцку і Слуцкім павеце, якія адбыліся ў лістападзе — снежні 1920 г. У некаторых падручніках па гісторыі сцвярджаецца, што там адбылося «антыбальшавіцкае паўстанне». Факты гісторыі сведчаць толькі аб спробе антысавецкіх сіл яго арганізаваць. Паводле ўмоў перамір'я і прэлімінарнага дагавора з Польшчай, заключанага 12 кастрычніка 1920 г., Слуцк і Слуцкі павет заставаліся на савецкім баку. Польскія войскі, а разам з імі Слуцкая вайсковая брыгада з 4 тыс. чалавек, сфарміраваная праціўнікамі савецкай улады, пры набліжэнні да Слуцка Чырвонай Арміі пачалі адыходзіць на захад. Сур'ёзных сутыкненняў з савецкімі войскамі не было. Здзяйсняліся толькі асобныя нападзенні Слуцкай вайсковай брыгады на палявыя заставы і варты савецкіх войскаў. У мэтах ліквідацыі Слуцкай брыгады ў снежні 1920 г. была праведзена вайсковая аперацыя Чырвонай Арміі. У выніку рэшткі брыгады перайшлі на польскую тэрыторыю, дзе былі раззброены.

## Гістарычны дакумент

**З Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі**

31 ліпеня 1920 г.

«…Арганізаваны рабочы клас і працоўнае сялянства Беларусі… абапіраючыся на волю працоўных мас, праяўленую на I з'ездзе Саветаў Беларусі ў лютым 1919 г. … абвяшчаюць незалежную Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Беларусі… усе законы і пастановы польскай акупацыйнай улады аб аднаўленні прыватнай уласнасці ў Беларусі адмяняюцца.

Асноўныя палажэнні аб арганізацыі народнагаспадарчага жыцця, абвешчаныя 1 студзеня 1919 г. у Маніфесце Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі, аднаўляюцца ў поўнай ступені… права прыватнай уласнасці на зямлю адмяняецца назаўсёды… усе народныя багацці пераходзяць у рукі дзяржаўных органаў рабоча-сялянскага народа… уводзіцца дзяржаўная хлебная манаполія, арганізуецца дзяржаўнае забеспячэнне ўсяго працоўнага насельніцтва ўсімі прадметамі першай неабходнасці, устанаўліваецца ўсебаковае сацыяльнае забеспячэнне працоўных, поўная абарона іх працы…



Правообладатель Народная асвета

Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі вызначае сваю заходнюю мяжу па этнаграфічнай мяжы паміж Беларуссю і прымыкаючымі да яе буржуазнымі дзяржавамі. Мяжа Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі з Савецкай Расіяй і Украінай вызначаецца свабоднымі выражэннямі волі беларускага народа на павятовых і губернскіх з’ездах Саветаў у поўнай згодзе з урадамі РСФСР і УССР…

Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі, знаходзячыся ва ўзаемаадносінах з Савецкай Расіяй як роўная з роўнай, перадае на ўвесь час рэвалюцыйных войнаў усе свае ўзброеныя сілы ў падпарадкаванне адзінага камандавання ўзброеных сіл усіх савецкіх рэспублік, а таксама заяўляе, што ўсе дыпламатычныя выступленні ССРБ будуць узгоднены з выступленнямі РСФСР і будуць мець на ўвазе агульныя інтарэсы ўсіх савецкіх рэспублік, пабудаваных на прынцыпах дыктатуры пралетарыяту.

Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі, знаходзячыся на працягу доўгага часу ў цеснай сувязі з Расіяй, павінна тэрмінова прыступіць да ўстанаўлення адзінага гаспадарчага плана з РСФСР…

Устанаўліваецца поўнае раўнапраўе моў (беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай)…»

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ па раздзеле I «Кастрычніцкая рэвалюцыя. Стварэнне беларускай дзяржаўнасці»

1. Назавіце даты наступных падзей:

- устанаўленне савецкай улады ў Беларусі;
- I Усебеларускі з'езд;
- падпісанне Брэсцкага мірнага дагавора;
- прыняцце 1-й Устаўной граматы Выканкамам Рады Усебеларускага з'езда;
- абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі;
- абвяшчэнне незалежнасці БНР;
- абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі;
- I Усебеларускі з'езд Саветаў;
- прыняцце Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі;
- падпісанне Рыжскага мірнага дагавора.

2. Падбярыце паняцце да кожнага азначэння:

а) прымусовае далучэнне адной дзяржавай тэрыторыі другой дзяржавы;
б) захоп войскамі адной дзяржавы тэрыторыі або часткі тэрыторыі іншай дзяржавы, які суправаджаецца ўсталяваннем уласнай адміністрацыі і законаў;
в) самастойнае ажыццяўленне дзяржаўнай улады або шырокае ўнутранае самакіраванне, якое прадастаўляецца народу, што кампактна пражывае ў межах дзяржавы;
г) гвалтоўнае ўмяшанне адной або некалькіх дзяржаў ва ўнутраныя справы другой дзяржавы;
д) пераход зямлі, прадпрыемстваў, іншых сродкаў вытворчасці з прыватнай уласнасці ў дзяржаўную;
е) элемент палітыкі «ваеннага камунізму», сістэма нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі, згодна з якой сяляне абавязаны былі здаваць дзяржаве ўсе лішкі прадукцыі;
ж) рост уплыву бальшавікоў на народныя масы, які суправаджаўся павелічэннем іх прадстаўніцтва ў Саветах рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

3. Канкрэтызуйце асноўныя тэндэнцыі развіцця Беларусі ў 1917—1920-я гг. фактамі. Запоўніце табліцу.



Правообладатель Народная асвета

**Асноўныя тэндэнцыі развіцця Беларусі ў 1917—1920-я гг.**

| Асноўныя тэндэнцыі | Падзеі, з'явы, працэсы з гісторыі Беларусі |
|---|---|
| 1. Устанаўленне савецкай улады на тэрыторыі Беларусі | |
| 2. Барацьба з германскай і польскай інтэрвенцыяй | |
| 3. Стварэнне беларускай дзяржаўнасці | |

4. Сістэматызуйце свае веды аб падзеях, звязаных са стварэннем беларускай дзяржаўнасці. Прадоўжыце запаўненне сінхранічнай табліцы.

| Перыяд | Падзеі на Заходнім фронце | Падзеі на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі | Дзеянні кіраўніцтва Савецкай Расіі |
|---|---|---|---|
| Кастрычнік — снежань 1917 г. | Пераход улады да Саветаў салдацкіх дэпутатаў | Устанаўленне савецкай улады | Дэкрэт аб міры, Дэкрэт аб зямлі, Дэкларацыя правоў народаў Расіі |
| Люты 1918 — студзень 1919 г. | | | |
| Люты 1919 г. — кастрычнік 1920 г. | | | |
| Сакавік 1921 г. | | | |

5. Назавіце фактары, якія абумовілі перамогу савецкай улады ў Беларусі.

6. Раскрыйце прычынна-выніковыя сувязі паміж наступнымі фактамі (гл. *памятку* 4):

а) ідэя бальшавікоў аб сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі і пазіцыя кіраўнікоў Аблвыканкамзаха па пытанні аб беларускай дзяржаўнасці;

б) лістападаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя ў Германіі і вызваленне Беларусі ад германскіх акупантаў;

в) ідэя бальшавікоў аб сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі і паход Чырвонай Арміі на Варшаву ў 1920 г.;

г) вызваленне тэрыторыі Беларусі ад польскіх інтэрвентаў і другое абвяшчэнне ССРБ;



Правообладатель Народная асвета

д)




Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Раздзел II
## БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ СТАНАЎЛЕННЯ САВЕЦКАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ПАД УЛАДАЙ ПОЛЬШЧЫ

### § 8. СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСІ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

**Успомніце.** Якімі былі вынікі Грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі для БССР?

**Асаблівасці палітычнай сітуацыі ў Беларусі ў міжваенны перыяд.** 1921—1939 гг. — перыяд ажыццяўлення ў Беларускай ССР *новай эканамічнай палітыкі і будаўніцтва савецкага сацыялістычнага грамадства*.

У пачатку 1920-х гг. тэрыторыя БССР складалася з 6 паветаў Цэнтральнай Беларусі. Большая частка беларускай этнічнай тэрыторыі знаходзілася ў складзе Расійскай Федэрацыі і Польшчы. У 1924 г. адбылося першае ўзбуйненне тэрыторыі БССР, калі ў яе склад увайшло больш за 10 паветаў Віцебшчыны, Магілёўшчыны і Гомельшчыны. У 1926 г. адбылося другое ўзбуйненне тэрыторыі БССР, і да яе далучыліся Гомельскі і Рэчыцкі паветы. Заходняя Беларусь да 1939 г. знаходзілася ў складзе Польшчы.

Пасля Грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі ў Беларускай ССР, як і ў іншых савецкіх рэспубліках, узнік глыбокі палітычны крызіс. Палітыка «ваеннага камунізму», заснаваная на прымусовых, ваенна-камуністычных метадах работы, не адпавядала новым умовам мірнага будаўніцтва. Яна выклікала незадаволенасць народа, што неўзабаве вылілася ў шматлікія мітынгі, забастоўкі і нават узброеныя выступленні супраць савецкай улады.

Палітычнае становішча ў БССР ускладнялася неўладкаванасцю адносін з прыгранічнымі дзяржавамі, пашырэннем нелегальнага (кантрабанднага) гандлю з замежжам, пастаяннымі нападамі ўзброеных бандаў з тэрыторыі Польшчы.

На фарміраванне палітычнай сітуацыі аказвала ўплыў і тое, што ў Беларусі ў дарэвалюцыйныя часы праходзіла «мяжа яўрэйскай аселасці». Нэпманамі тут з'яўляліся пераважна яўрэі. Гэта служыла асновай для ўзмацнення, з аднаго боку, шавіністычнай ідэалогіі яўрэйскай буржуазіі — сіянізму, а з другога — зняважлівых і нават варожых адносін да яўрэяў, іх заняткаў, побыту і культуры — антысемітызму.

Новая эканамічная палітыка (нэп), якая была ўведзена ў 1921 г., змяшчала мноства супярэчнасцей. Значная іх частка насіла палітычны характар. Шмат камуністаў Беларусі, а таксама частка рабочага класа і іншых пластоў насельніцтва



Правообладатель Народная асвета

лічылі нэп вяртаннем да прыватнай уласнасці, а разам з ёй — да няроўнасці і сацыяльнай несправядлівасці. Некаторыя палітыкі сцвярджалі, што вынікі перамогі рабочага класа выкарысталі ў сваіх інтарэсах буржуазія, гарадское мяшчанства і сяляне, а пралетарыят ізноў ператварыўся ў эксплуатуемы клас. Праціўнікі новай эканамічнай палітыкі нават абрэвіятуру «нэп» расшыфроўвалі як «новая эксплуатацыя пралетарыяту», разглядалі гэту палітыку як магчымасць рэстаўрацыі капіталізму ў СССР.

Для такіх меркаванняў меліся падставы. Нэп прадугледжваў побач з развіццём сацыялістычных форм гаспадарання некаторае ажыўленне капіталістычнай эканомікі пад строгім кантролем Савецкай дзяржавы. Гэтае адступленне рабілася для таго, каб выкарыстаць вытворчы вопыт і капіталы былых эксплуататарскіх класаў у мэтах аднаўлення гаспадаркі і насычэння рынка таварамі і паслугамі. Нэп — гэта быў тактычны манеўр Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы ва ўмовах пасляваеннай разрухі, а не змена стратэгічнага курсу з мэтай рэстаўрацыі капіталізму, як думалі некаторыя камуністы, дзяржаўныя дзеячы, прадстаўнікі розных пластоў насельніцтва СССР і замежных краін.

Але тым не менш у СССР, БССР і іншых рэспубліках разгарнуліся вострыя дыскусіі па праблемах далейшага сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця. Дыскусіі з'явіліся своеасаблівым ідэалагічным прыкрыццём барацьбы за ўладу, якая доўжылася на працягу наступных двух дзесяцігоддзяў.

У сярэдзіне 1920-х гг. у сувязі са зменай міжнароднага становішча, стабілізацыяй капіталізму ў Еўропе і ЗША надзеі на сусветную рэвалюцыю становяцца ілюзорнымі. Савецкае кіраўніцтва адмаўляецца ад канцэпцыі сусветнай рэвалюцыі і сусветнага сацыялізму. Яно ставіць задачу неадкладна прыступіць да будаўніцтва сацыялізму ў адной краіне — у Савецкім Саюзе. Калі гэтага не рабіць, лічыў І. Сталін, тады «капіталістычныя элементы... возьмуць верх, савецкая ўлада разложыцца, партыя перародзіцца. За нэпам эканамічным непазбежна прыдзе нэп палітычны і рэстаўрацыя капіталізму ў СССР».

Супраць курсу на пабудову сацыялізму ў СССР выступілі Л. Троцкі, А. Зіноўеў, Л. Каменеў і іншыя дзеячы Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. Яны ізноў звязвалі магчымасць сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР толькі з перамогай рэвалюцый у Еўропе і ЗША. Апазіцыянеры лічылі, што сродкі для індустрыялізацыі могуць быць атрыманы толькі за кошт іх «перапампоўвання» з сельскай гаспадаркі ў прамысловасць. Для гэтага прапаноўвалася ўвесці павышанае падаткаабкладанне сялянства і неэквівалентны таварны абмен паміж горадам і вёскай. Л. Троцкі, напрыклад, сцвярджаў, што сялян патрэбна абкласці «індустрыяльнай данінай».

Палітычная лінія большасці кіраўнікоў ЦК ВКП(б) і СНК СССР, якія групаваліся вакол І. Сталіна, была накіравана на тое, што індустрыя павінна базіравацца на паступовым пад'ёме матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працоўных горада і вёскі. І. Сталін патрабаваў першачарговага развіцця важнейшых галін прамысловасці,



Правообладатель Народная асвета

здольных забяспечыць тэхналагічны прарыў ва ўсёй эканоміцы краіны, у тым ліку і ў сельскай гаспадарцы. Палітычная і ідэйная барацьба закончылася ў 1920-я гг. перамогай лініі І. Сталіна і яго прыхільнікаў. Палітычная апазіцыя была разгромлена.

**Развіццё БССР у гады сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі.** Пасля першых двух гадоў індустрыялізацыі І. Сталін гаварыў: «Затрымаць тэмпы — гэта значыць адстаць. А адсталых б'юць. Старую Расію бесперапынна білі за адсталасць... За адсталасць ваенную, за адсталасць культурную, за адсталасць прамысловую, за адсталасць сельскагаспадарчую... Мы адсталі ад перадавых краін на 50—100 гадоў. Мы павінны прабегчы гэту адлегласць за дзесяць гадоў...»

СССР сапраўды «прабег» гэты шлях за 10—15 гадоў і стаў адной з перадавых індустрыяльных дзяржаў свету. У канцы 1930 — пачатку 1940-х гг. ён належаў да ліку пяці краін свету (ЗША, Англія, Францыя, Германія), якія былі здольнымі вырабляць усе віды тагачаснай прамысловай прадукцыі.

У СССР і БССР была здзейснена сапраўдная культурная рэвалюцыя. Паспяхова ажыццяўлялася ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва, было ўведзена ўсеагульнае абавязковае пачатковае навучанне дзяцей і зроблены пераход да ўсеагульнага абавязковага навучання дзяцей за курс сямігадовай школы. Хуткімі тэмпамі развівалася сярэдняя агульнаадукацыйная школа. У Беларускай ССР была створана вышэйшая школа, далейшае развіццё атрымалі сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы. Значных поспехаў дасягнулі беларуская навука, літаратура і мастацтва. Усе здабыткі культуры і сусветнай цывілізацыі станавіліся даступнымі для чалавека працы.

Цаной велізарных намаганняў савецкага, у тым ліку беларускага, народа, выкарыстання яго працоўнага энтузіязму, свядомага і часовага, як тады меркавалася, абмежавання матэрыяльных запатрабаванняў людзей да канца 1930-х гг. у СССР і БССР было створана *сацыялістычнае грамадства*. Яго характэрнымі рысамі з'яўляліся:

1. Аднапартыйная сістэма, усеўладдзе партыйна-дзяржаўнай наменклатуры і абмежаванне дэмакратычных пачаткаў у жыцці грамадства.
2. Дзяржаўнае дырэктыўнае планаванне развіцця эканомікі, сацыяльнай сферы і культуры, панаванне агульнанароднай (дзяржаўнай) уласнасці на сродкі вытворчасці.
3. Адсутнасць эксплуататарскіх класаў і капіталістычнай эксплуатацыі чалавека чалавекам.
4. Моцная сацыяльная палітыка ў інтарэсах большасці народа — права на працу і абавязак працаваць (адсутнасць беспрацоўя), бясплатнасць адукацыі і аховы здароўя, таннасць жылля і камунальных паслуг, пуцёвак у санаторыі і дамы адпачынку.



Правообладатель Народная асвета

5. Рост агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню народа.

6. Рашучая і бескампрамісная барацьба са злачыннасцю і негатыўнымі з'явамі ў грамадстве (п'янствам, наркаманіяй, прастытуцыяй, спекуляцыяй і інш.).

7. Панаванне ў свядомасці большай часткі насельніцтва марксісцка-ленінскай ідэалогіі.

Для створанага ўпершыню ў СССР і БССР сацыялістычнага грамадства былі характэрны дэфармацыі. Да іх ліку можна аднесці забарону прыватнай ініцыятывы і прадпрымальніцкай дзейнасці, абмежаванне дэмакратычных пачаткаў у жыцці грамадства, парушэнне сацыялістычнай законнасці і правоў чалавека, нізкі ўзровень матэрыяльнага дабрабыту людзей і інш. Аднак дэфармацыі сацыялізму былі выкліканы не толькі памылкамі партыйнага і савецкага кіраўніцтва. Яны аб'ектыўна абумоўліваліся як складанасцю і маштабнасцю ўпершыню вырашаемых задач, так і наяўнасцю варожага СССР капіталістычнага акружэння, яго жаданнем знішчыць першую ў свеце краіну сацыялізму.

*Канстытуцыя СССР 1936 г.* і *Канстытуцыя БССР 1937 г.* заканадаўча замацавалі перамогу альтэрнатыўнага капіталізму сацыялістычнага ладу.

Нягледзячы на жорсткасць палітычнага рэжыму і рэпрэсіі, грамадская атмасфера 1930-х гг. была прасякнута пафасам стваральнай працы. Мелі месца сапраўдны працоўны гераізм і добрасумленнае служэнне Айчыне. У працоўнае асяроддзе ўкараняліся каштоўнасці чалавечай дабрыні, салідарнасці і справядлівасці. Змяняліся светапогляд і псіхалогія савецкіх людзей. Ідэяй, якая мела векавыя традыцыі і магутную аб'яднальную сілу, стала ідэя патрыятызму. У інтарэсах патрыятычнага выхавання ў школах было адноўлена выкладанне сістэматычнага курса гісторыі. У сродках масавай інфармацыі прапагандаваліся ідэі моцнай дзяржаўнасці і перавагі грамадскіх інтарэсаў над асабістымі, матывы шчаслівага жыцця і паўнацэннай сям'і.

Савецкі, у тым ліку і беларускі, народ ганарыўся дасягненнямі ў галіне навукі, адукацыі і культуры. Для мільёнаў людзей адкрыліся перспектывы атрымаць адукацыю, у тым ліку і вышэйшую, падняцца з самых «нізоў» да высокіх пасад у дзяржаве, увайсці ў навуковую эліту, раскрыць і рэалізаваць свае творчыя здольнасці.

Савецкі Саюз аказваў магутнае ўздзеянне на ход сусветнай гісторыі. Савецкі народ карыстаўся павагай з боку мільёнаў людзей у розных краінах свету.

### Пытанні і заданні

**1.** Якімі былі асаблівасці палітычнай сітуацыі ў Беларусі ў міжваенны перыяд? Чым яны былі абумоўлены? **2.** Па якіх пытаннях ішла палітычная барацьба ў савецкім грамадстве ў 1920—1930-я гг.? Якімі былі яе вынікі? **3.** Назавіце характэрныя рысы грамадства, пабудаванага ў СССР і БССР у канцы 1930-х гг. Што, на ваш погляд, можна аднесці да дасягненняў і недахопаў гэтага грамадства? Сваю думку абгрунтуйце (гл. *памятку 8*). **4.** Чым былі абумоўлены наступныя гістарычныя падзеі: а) замена палітыкі «ваеннага камунізму» новай эканамічнай палітыкай; б) адмова савецкага кіраўніцтва ад ідэі сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі? (*Выкарыстайце веды па сусветнай гісторыі.*)



Правообладатель Народная асвета

### Ваша меркаванне

Сваю прамысловую, ваенна-тэхнічную, культурную адсталасць ад краін Захаду СССР пераадолеў за 10—15 гадоў. Цана гэтага «прабегу» была надзвычай высокай — лёс цэлага пакалення савецкіх людзей. Не адмаўляючы гэтага, расійскі гісторык Н. Сіманаў падкрэслівае: «Параўноўваючы высокую цану, якую заплацілі народы СССР за здзейснены напярэдадні Другой сусветнай вайны індустрыяльны рывок, з цаной, якую ім у процілеглым выпадку прыйшлося б заплаціць за ваенна-тэхнічную і эканамічную адсталасць краіны, гэтыя ахвяры і страты не прыходзіцца лічыць ні непатрэбнымі, ні празмернымі».

Як вы лічыце, ці былі апраўданы намаганні савецкіх людзей у 1930-я гг.? Сваю думку абгрунтуйце.

## § 9. БССР У ГАДЫ НОВАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ

**Успомніце. 1.** У чым заключалася сутнасць палітыкі «ваеннага камунізму», новай эканамічнай палітыкі? **2.** Што ўяўляла сабой тэрыторыя БССР у 1921 г.?

**Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі пасля Першай сусветнай і Грамадзянскай войнаў.** Першая сусветная і Грамадзянская войны, а таксама інтэрвенцыя замежных краін паставілі Савецкую Беларусь на мяжу эканамічнай катастрофы. З 715 прамысловых прадпрыемстваў Беларусі пасля вайны засталося 235. Многія з іх з-за адсутнасці сыравіны і паліва не працавалі. Прамысловая вытворчасць у Беларусі скарацілася ў некалькі разоў. Быў разбураны чыгуначны транспарт. Прадукцыя сельскай гаспадаркі складала менш за палову ад даваеннай. Не хапала хлеба, тавараў народнага спажывання.

Насельніцтва Беларусі значна скарацілася. Шмат жыхароў краю загінула на франтах, эмігрыравала, памерла ад голаду, хвароб, эпідэмій і інш.

Адбывалася люмпенізацыя грамадства (духоўная і матэрыяльная галеча людзей, якая суправаджалася стратай імі пастаяннай работы, сувязі са сваёй сацыяльнай групай). Злачынныя групоўкі тэрарызавалі насельніцтва, нягледзячы на жорсткія меры з боку органаў Надзвычайнай камісіі і міліцыі. Заняпала мараль. Гібель бацькоў, распад сем'яў і сваяцкіх сувязей былі прычынай пашырэння дзіцячай беспрытульнасці, што стала яшчэ адной крыніцай росту злачыннасці, жабрацтва.

**Пераход да новай эканамічнай палітыкі. Погляды Д. Прышчэпава на шляхі пераўтварэнняў у вёсцы.** Становішча, што склалася ў краіне, патрабавала кардынальных перамен. Выйсце, на думку У. Леніна, было ў замене палітыкі «ваеннага камунізму» ***новай эканамічнай палітыкай (нэпам)***. Яна была прынята на X з'ездзе РКП(б) у **сакавіку 1921 г.**

Мэтай нэпа з'яўлялася ўмацаванне на эканамічнай аснове палітычнага саюзу рабочага класа і сялянства дзеля захавання савецкай улады, а таксама аднаў-



Правообладатель Народная асвета

ленне таварна-грашовых адносін. Нэп уяўляў сабой спробу дзяржавы спалучыць у адзінай палітыка-эканамічнай сістэме прынцыпы сацыялістычнага і капіталістычнага гаспадарання. Для ліквідацыі таварнага голаду дапускалася ў пэўных межах пад кантролем дзяржавы развіццё капіталізму. Ставілася задача выкарыстаць прыватныя сродкі і вопыт капіталістычных элементаў у інтарэсах аднаўлення гаспадаркі і стварэння ўмоў для будаўніцтва сацыялістычнага грамадства.



У братнім яднанні працы сялян і рабочых. Плакат. 1921 г.

Нэп — гэта ў першую чаргу *пераход ад харчразвёрсткі да* ***харчпадатку***, памер якога быў на 30—50 % ніжэйшым. Памер харчпадатку вылічваўся з плошчы пасеваў і аб'яўляўся сялянам яшчэ да пачатку сельскагаспадарчых работ (гл. *гістарычны дакумент*). Акрамя збожжа, натуральным падаткам абкладалася прадукцыя жывёлагадоўлі: мяса, масла, воўна і інш. Усіх падаткаў у 1921 г. было ўстаноўлена 13. Пазней яны былі заменены адзіным грашовым падаткам.

Увядзенне нэпа дало сялянам *права свабодна распараджацца сваёй прадукцыяй, якая заставалася ў іх пасля выплаты падатку*, прадаваць яе на рынку. У такіх умовах у сялян з'явілася зацікаўленасць у развіцці сваёй гаспадаркі. Сялянам дазволілі *свабодна выбіраць формы землекарыстання*. Аднолькава законнымі былі прызнаны сельскагаспадарчы кааператыў (арцель), сялянская абшчына (абшчыннае землекарыстанне), індывідуальнае карыстанне зямлёй у выглядзе палосак, хутароў і адрубаў. Дазвалялася *арэнда зямлі* і *выкарыстанне наёмнай рабочай сілы* пры ўмове, што сам наймальнік працуе.

Наркам земляробства БССР Д. Прышчэпаў меў у аграрнай палітыцы ўласную пазіцыю, якая атрымала назву ***«прышчэпаўшчыны»***. Партыйным кіраўніцтвам Беларусі ён быў абвінавачаны ў стаўленні на развіццё хутарской сістэмы і абарону інтарэсаў заможных гаспадароў. Д. Прышчэпаў быццам бы лічыў, што сельскагаспадарчы крэдыт павінен выдавацца прадстаўнікам заможных пластоў вёскі, а падатак для іх павінен быць зменшаны. Вырашэнне праблемы аграрнага перанасялення ў Беларусі ён бачыў у перасяленні беднаты на Урал, у Сібір і на Далёкі Усход. У 1929 г. Д. Прышчэпаў быў выключаны з партыі і зняты з пасады наркама.

Сёння некаторыя гісторыкі сцвярджаюць, што Д. Прышчэпаў зрабіў шмат патрэбнага і карыснага для беларускай вёскі. Ён быў шчырым прыхільнікам буйной сельскагаспадарчай вытворчасці, на землях былых памешчыцкіх маёнткаў ствараў



Правообладатель Народная асвета

саўгасы, садзейнічаў выдзяленню беззямельным і малазямельным сялянам зямлі, стварэнню такой беларускай вёскі, у якой пераважаюць гаспадаркі сераднякоў. Таму агульнае абвінавачванне Д. Прышчэпава не з'яўлялася абгрунтаваным і справядлівым.

Разам з тым курс на перасяленне сялян на хутары і выдзяленне ім адрубаў сведчыў аб неразуменні Д. Прышчэпавым таго, што хутарызацыя — гэта шлях умацавання капіталістычных адносін у вёсцы, падтрымкі яе заможных жыхароў пад лозунгам «Багацей, беларускі селянін!». Таму палітыка хутарызацыі Д. Прышчэпава (на хутары ў 1920-я гг. было выселена крыху больш за 12 % сялянскіх гаспадарак Беларусі) супярэчыла палітыцы бальшавікоў, якія стваралі ў вёсцы сацыялістычныя калектыўныя гаспадаркі — калгасы, саўгасы, камуны, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі і іншыя кааператыўныя аб'яднанні, што паспяхова вырашалі задачу ліквідацыі цераспалосіцы і далёказямелля.

Новая эканамічная палітыка ў прамысловасці прадугледжвала *пераход прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік* — форму гаспадарання, пры якой прадпрыемствы пакрываюць выдаткі за кошт свайго прыбытку. Адбываецца працэс самафінансавання прадпрыемстваў. Дзяржаўныя прадпрыемствы працавалі на поўным гаспадарчым разліку, стратныя прадпрыемствы закрываліся ці часова кансерваваліся, а прадпрыемствы, якія не мелі для дзяржавы асаблівага значэння, аддаваліся ў арэнду кааператыўным арганізацыям або прыватным асобам. Гэта павінна было ў кароткі тэрмін ліквідаваць таварны голад і пашырыць тавараабарот паміж горадам і вёскай.

Нэп — гэта *развіццё дзяржаўнага, кааператыўнага* і *прыватнага гандлю* як асноўных форм эканамічных сувязей паміж горадам і вёскай. Прамы прадуктаабмен спыняўся, адбываўся пераход да таварна-грашовых адносін. Гэтаму са-



Новая механічная майстэрня на заводзе «Энергія» ў Мінску. 1920-я гг.



Правообладатель Народная асвета

дзейнічала праведзеная ў 1922—1924 гг. *грашовая рэформа*, вынікам якой было ўвядзенне ў абарачэнне забяспечанага золатам чырвонца.

З дазволам прыватнага гандлю ўся Беларусь спачатку ператварылася ў вялікі базар. Былыя мяшочнікі, хатнія гаспадыні, рабочыя, дэмабілізаваныя салдаты і інш. натоўпам выйшлі на плошчы і вуліцы, гандлюючы хто чым мог. Упарадкаванне гандлю адбылося ў выніку стварэння дзяржаўнай падатковай службы, выкупу гандлярамі патэнта (ліцэнзіі) і выплаты імі падатку. Да сярэдзіны 1920-х гг. была створана шырокая сетка магазінаў і магазінчыкаў — рознічны гандаль, дзе галоўнай фігурай стаў прыватнік. У аптовым гандлі вядучую ролю адыгрывалі дзяржаўныя і кааператыўныя прадпрыемствы.

Нэп — гэта карэнная перабудова сацыяльнай сферы, *адмова ад ваенна-камуністычных прынцыпаў размеркавання*. Адмяняліся ўсеагульная працоўная павіннасць, працоўныя мабілізацыі, працоўныя арміі і ўраўняльная аплата працы. Камплектаванне прадпрыемстваў рабочай сілай рабілася праз біржы працы, а заработная плата вызначалася ў залежнасці ад выкананай работы. Аднаўлялася плата за транспарт, камунальныя і іншыя паслугі.

**Уплыў нэпа на развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі і транспарту.** Ажыццяўленне нэпа і стабілізацыя фінансаў садзейнічалі паскарэнню тэмпаў аднаўленчых работ, развіццю прамысловай вытворчасці. У 1921 г. у Мінску пачаў дзейнічаць завод «Энергія» (цяпер станкабудаўнічае вытворчае аб'яднанне), які вырабляў жалезныя плугі, вёдры, лыжкі. На заводзе было асвоена чыгуннае ліццё. Былі адноўлены і пабудаваны мінскі завод «Метал» і шпалерная фабрыка, Старэўскі шклозавод (Слуцкі павет), Копыскі кафельны завод, лесазаводы ў Бабруйску, запалкавая фабрыка «Бярэзіна» і шклозавод у Барысаве, Віцебская льнопрадзільная



Адзін з карпусоў Мінскага гарбарнага завода. 1920-я гг.



Правообладатель Народная асвета

фабрыка «Дзвіна», абутковая і кандытарская фабрыкі ў Гомелі, цвіковы завод «Чырвоны Кастрычнік» у Оршы і інш. Пачалі дзейнічаць гарбарныя і вінакурныя заводы. Усяго за гады аднаўлення было пабудавана 106 новых прадпрыемстваў. Аднаўляўся таксама чыгуначны транспарт. У 1926/1927 гаспадарчым годзе асноўныя фонды прадпрыемстваў склалі амаль 87 млн руб. супраць 59 млн руб. у 1913 г. Адкрываліся таксама шавецкія, кравецкія, слясарныя і дрэваапрацоўчыя майстэрні, пякарні, якія забяспечвалі рынак таварамі першай жыццёвай неабходнасці.

Пад лозунгам рэгулявання землекарыстання, ліквідацыі цераспалосіцы і далёказямелля, павышэння эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці ў 1920-х гг. праводзілася перасяленне сялян з вёсак на хутары і ў дробныя паселішчы. Ламаўся традыцыйны ўклад сельскага жыцця, які фарміраваўся на працягу стагоддзяў.

Не маючы патрэбных сродкаў і жадання парушыць традыцыйны лад жыцця, большасць сялян з асцярогай адносілася да хутарызацыі. На тэрыторыі ўсходніх губерняў Беларусі за час сталыпінскай аграрнай рэформы на хутары і адрубы выйшла толькі каля 13 % сялянскіх гаспадарак. У працэсе землеўпарадкавання ў 1920-я гг. на хутары перасялілася амаль столькі ж гаспадарак. Да 1928 г. агульная колькасць сялянскіх гаспадарак, што выйшлі на хутары і адрубы, склала каля 25 % усіх гаспадарак. Для аслаблення аграрнай перанаселенасці беларускай вёскі праводзілася перасяленне сялян у раёны Сібіры і Далёкага Усходу.

У 1925 г. сельская гаспадарка БССР наблізілася да даваенных памераў пасяўной плошчы, ураджайнасці і валавога збору сельскагаспадарчых культур. Умовы жыцця людзей палепшыліся.

Такім чынам, 1920-я гг. вызначыліся завяршэннем аднаўлення прамысловасці і сельскай гаспадаркі, правядзеннем хутарызацыі і перасяленнем сялян у раёны Сібіры і Далёкага Усходу, павелічэннем вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *сакавік 1921 г.; новая эканамічная палітыка, харчпадатак, «прышчэпаўшчына».*

### Пытанні і заданні

**1.** Ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі пасля Першай сусветнай і Грамадзянскай войнаў. **2.** Якімі былі эканамічныя і палітычныя перадумовы ўвядзення новай эканамічнай палітыкі? (*Выкарыстайце веды па сусветнай гісторыі.*) **3.** Якая ідэя савецкай улады адлюстравана на плакаце 1921 г. (с. 51)? **4.** Як вы разумееце сцвярджэнне: «Мэтай нэпа з'яўлялася ўмацаванне на эканамічнай аснове палітычнага саюзу рабочага класа і сялянства дзеля захавання савецкай улады»? **5.** Параўнайце палітыку «ваеннага камунізму» і новую эканамічную палітыку па самастойна вызначаных крытэрыях (гл. *памятку 6*). **6.** Чым харчпадатак адрозніваўся ад харчразвёрсткі? Чаму замена харчразвёрсткі натуральным падаткам спрыяла даволі хуткаму аднаўленню сельскай гаспадаркі? (*Выкарыстайце гістарычны дакумент.*) **7.** Якімі былі вынікі новай эканамічнай палітыкі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы БССР? **8.** Дайце азначэнне паняццяў: *новая эканамічная палітыка, «прышчэпаўшчына», харчпадатак* (гл. *памятку 7*).



Правообладатель Народная асвета

### Ваша меркаванне

Як вы лічыце, чаму насельніцтва Беларусі па-рознаму адносілася да новай эканамічнай палітыкі? (Гл. § 8, *Асаблівасці палітычнай сітуацыі ў Беларусі ў міжваенны перыяд.*) Якія слаі насельніцтва, на ваш погляд, падтрымлівалі гэтую палітыку, а якія адносіліся негатыўна? Чаму?

### Гістарычны дакумент

**З дэкрэта «Аб замене харчовай і сыравіннай развёрсткі натуральным падаткам»**

21 сакавіка 1921 г.

«**1.** Для забеспячэння правільнага і спакойнага вядзення гаспадаркі на аснове больш свабоднага распараджэння земляроба прадуктамі сваёй працы і сваімі гаспадарчымі сродкамі, для ўмацавання сялянскай гаспадаркі і падняцця яе прадукцыйнасці, а таксама ў мэтах дакладнага ўстанаўлення падаючых на земляробаў дзяржаўных абавязацельстваў развёрстка як сродак дзяржаўных нарыхтовак харчавання, сыравіны і фуражу замяняецца натуральным падаткам.

**2.** Гэты падатак павінен быць меншым за абкладанне, якое праводзілася да гэтага часу шляхам развёрсткі. Сума падатку павінна быць разлічана так, каб забяспечыць самыя неабходныя патрэбы арміі, гарадскіх рабочых і неземляробчага насельніцтва…

**3.** Падатак бярэцца ў выглядзе працэнтнага ці долевага адлічэння ад выробленых у гаспадарцы прадуктаў, зыходзячы з уліку ўраджаю, колькасці едакоў у гаспадарцы і наяўнасці жывёлы ў ёй.

**4.** Закон аб падатку павінен быць складзены такім чынам і апублікаваны ў такі тэрмін, каб земляробы яшчэ да пачатку вясенніх палявых работ былі як мага больш дакладна паведамлены аб памерах падаючых на іх абавязацельстваў.

**5.** Усе запасы харчавання, сыравіны і фуражу, якія застаюцца ў земляробаў пасля выканання імі падатку, знаходзяцца ў поўным іх распараджэнні і могуць быць выкарыстаны імі для паляпшэння асабістага спажывання і для абмену на прадукты фабрычна-заводскай і саматужнай прамысловасці і сельскагаспадарчай вытворчасці».

## Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (кнізе «Памяць») інфармацыю аб эканамічным развіцці вашага краю ў гады новай эканамічнай палітыкі. Падрыхтуйце паведамленне.



Правообладатель Народная асвета

## § 10. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ БССР У 1920-я гг.

**Успомніце. 1.** Што было зроблена савецкай уладай для вырашэння нацыянальнага пытання ў Расіі? **2.** Што такое федэрацыя, аўтаномія? **3.** Калі тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў былі далучаны да РСФСР?

**Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця.** У 1921—1924 гг. Беларуская ССР складалася з шасці паветаў былой Мінскай губерні, якія ў сваю чаргу падзяляліся на воласці. На беларускіх землях, якія знаходзіліся ў складзе РСФСР, захаваўся дарэвалюцыйны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел на губерні (Віцебская, Смаленская, Гомельская, у якую ў 1919 г. была перайменавана Магілёўская губерня), паветы і воласці.

У 1924 г. быў уведзены новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел рэспублікі. Губерні, паветы, воласці ліквідаваліся, а замест іх ствараліся *акругі, раёны, сельсаветы.* У пачатку 1925 г. Беларуская ССР была падзелена на 10 акруг, 100 раёнаў і 1202 сельскія саветы.

У месцах кампактнага пражывання нацыянальных меншасцей ствараліся нацыянальныя сельскія Саветы. У 1928 г. налічвалася 23 яўрэйскія, 19 польскіх, 16 рускіх, 5 латышскіх, 2 украінскія і 2 нямецкія сельскія Саветы.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам вызначалася структура органаў дзяржаўнай улады і кіравання, а таксама партыйных і грамадскіх арганізацый (рэспубліканскіх, акруговых, гарадскіх і раённых).

11 ліпеня 1923 г. у сувязі з трэцяй гадавінай вызвалення Мінска ад польскіх інтэрвентаў была абвешчана амністыя членам нацыянальных арганізацый, палітычным і культурным дзеячам, усім тым, хто ў свой час далучыўся да контррэвалюцыйных арганізацый, а потым абвясціў аб лаяльных адносінах да савецкай улады.

### Гістарычная даведка

Поспехі ў ажыццяўленні нэпа і нацыянальна-культурнага будаўніцтва аслабілі пазіцыі ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі ў эміграцыі. У кастрычніку 1925 г. на II (Берлінскай) канферэнцыі Рада БНР аб'явіла аб роспуску сваіх палітычных цэнтраў і спыненні барацьбы з савецкай уладай. БССР была прызнана месцам кансалідацыі беларускага народа, а Мінск — адзіным цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі. У БССР вярнуліся з эміграцыі многія беларускія нацыянальныя дзеячы.

1920-я гг. характарызуюцца фарміраваннем у СССР і БССР *аднапартыйнай палітычнай сістэмы.* Дасягненні ў дзяржаўным, гаспадарчым і культурным будаўніцтве, а таксама пастаяннае ўздзеянне і рэпрэсіўныя меры ў адносінах да кіраўнікоў і членаў нацыянальна-дэмакратычных партый аслаблялі іх дзейнасць. У 1921 г. самаліквідаваўся Бунд і распалася Яўрэйская камуністычная партыя. Беларуская



Правообладатель Народная асвета

партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў) у пачатку 1921 г. налічвала ў сваіх шэрагах каля 20 тыс. чалавек, мела даволі шматлікія партыйныя арганізацыі. У 1924 г. у Мінску адбыўся з'езд членаў партыі беларускіх эсэраў, якія заявілі аб спыненні яе дзейнасці.

Нягледзячы на тое што нацыяльна-дэмакратычныя апазіцыйныя партыі самараспусціліся, унутры самой партыі бальшавікоў узмацнілася палітычная барацьба розных фракцый і груповак за ўладу, за накірункі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і духоўнага развіцця, за будучае краіны.

У гады нэпа ў сувязі з ажыўленнем капіталістычных элементаў працоўныя рэспублікі пачалі выказваць незадаволенасць дзейнасцю Саветаў. Гэта праявілася ў нізкай яўцы насельніцтва на выбары ў Саветы. У 1924 г., напрыклад, у Беларусі ў выбарах прынялі ўдзел толькі 35,4 % выбаршчыкаў. З мэтай павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці насельніцтва пры сельскіх і местачковых Саветах ствараліся пастаянныя камісіі па сельскай гаспадарцы і добраўпарадкаванні. Арганізоўваліся таксама культурна-асветныя, фінансавыя, падатковыя і іншыя камісіі, на пасяджэннях якіх абмяркоўваліся пытанні мясцовага жыцця. Дзейнічалі дэпутацкія групы — аб'яднанні дэпутатаў з Саветаў розных узроўняў, якія працавалі на адным прадпрыемстве. У працоўных калектывах выбіралі жанчын-дэлегатак, якія затым праводзілі дэлегацкія сходы. Жанчыны ўключаліся ў грамадска-палітычнае жыццё.

У новых умовах мірнага будаўніцтва змяніліся функцыі *прафсаюзаў*. Цяпер іх задачай стала абарона інтарэсаў пралетарыяту ў барацьбе з нэпманаўскай буржуазіяй. Прафсаюзы ўдзельнічалі ў рабоце па арганізацыі вытворчасці, удасканаленні тэхнікі і тэхналогіі, праводзілі вытворчыя нарады.

*Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі (КСМБ)* удзельнічаў у рабоце па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва, увядзенні ўсеагульнага абавязковага навучання дзяцей школьнага ўзросту, стварэнні і арганізацыі дзейнасці ўстаноў культуры. Камсамол працаваў пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і разглядаўся як яе памочнік і рэзерв.

Значную ролю ў грамадска-палітычным жыцці адыгрывалі шэфскія *таварыствы па аказанні дапамогі вёсцы, абароннае таварыства Асаавіяхім, фізкультурныя арганізацыі* і інш. Усё гэта сведчыла аб развіцці дэмакратычных пачаткаў у грамадска-палітычным жыцці БССР.

**Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза ССР. Узбуйненне тэрыторыі БССР у 1924 і 1926 гг. Канстытуцыя БССР 1927 г.** Ажыццяўленню новай эканамічнай палітыкі садзейнічала ўмацаванне і пашырэнне сувязей паміж савецкімі рэспублікамі. 16 студзеня 1921 г. быў заключаны *Дагавор аб ваенным і гаспадарчым саюзе паміж РСФСР і БССР.*

У выніку ўсебаковага супрацоўніцтва да сярэдзіны 1922 г. усе савецкія рэспублікі прыйшлі да ідэі дзяржаўнага саюза паміж імі. **14—18 снежня 1922 г.** адбыўся *IV Усебеларускі з'езд Саветаў*. Ён прыняў рашэнне аб неабходнасці ўтварэння Саюза ССР і далучэння да яго БССР (гл. *гістарычны дакумент*).



Правообладатель Народная асвета

Стварэнню СССР папярэднічала дыскусія аб тым, як аб’яднаць нацыянальныя савецкія рэспублікі ў адзіную дзяржаву. Выказваліся розныя прапановы. І. Сталін лічыў патрэбным уключыць савецкія рэспублікі ў склад РСФСР на правах аўтаномных рэспублік. Гэта быў так званы *план «аўтанамізацыі»*, які пазбаўляў савецкія нацыянальныя рэспублікі суверэнітэту. У. Ленін па-іншаму падышоў да вырашэння гэтай праблемы. Ён лічыў неабходным ствараць не адзіную ўнітарную дзяржаву, якой з’яўлялася дарэвалюцыйная Расійская імперыя, а добраахвотны раўнапраўны саюз нацыянальных савецкіх рэспублік з правам выхаду з гэтага саюза. Гэта замацоўвалася ў самой назве новай дзяржавы — *Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік*. Усе рэспублікі захоўвалі атрыбуты дзяржаўнасці — заканадаўчую, выканаўчую і судовую ўладу. Частку паўнамоцтваў яны добраахвотна перадавалі цэнтральным органам улады. СССР павінен быў стаць федэратыўнай дзяржавай, добраахвотным і раўнапраўным саюзам савецкіх нацыянальных рэспублік.

*І з’езд Саветаў СССР* адкрыўся ў Маскве **30 снежня 1922 г.** Ён прыняў *Дэкларацыю* і *Дагавор аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік*. Дагавор аб утварэнні СССР заключылі суверэнныя савецкія рэспублікі: БССР, РСФСР, УССР і ЗСФСР (Закаўказская Савецкая Федэратыўная Сацыялістычная Рэспубліка). У склад выбранага з’ездам ЦВК СССР ад БССР увайшло 7 чалавек. ***А. Чарвякоў*** — старшыня ЦВК і СНК БССР — стаў адным з чатырох старшынь Прэзідыума ЦВК СССР.

### Гістарычны партрэт



**Чарвякоў Аляксандр Рыгоравіч** (1892—1937) нарадзіўся ў в. Дукарка Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Дзяржаўны і партыйны дзеяч БССР і СССР. У 1915 г. скончыў Віленскі настаўніцкі інстытут. У час Першай сусветнай вайны быў прызваны ў армію, вёў рэвалюцыйна-прапагандысцкую работу ў вайсковых гуртках і арганізацыях. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе. З ліпеня 1918 г. у Чырвонай Арміі: камісар дывізіі, начальнік аддзела Усерасійскага бюро ваенных камісараў. У ліку 5 членаў Часовага рабоча-сялянскага Савецкага ўрада Беларусі 1 студзеня 1919 г. падпісаў у Смаленску Маніфест аб абвяшчэнні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. У 1919 г. народны камісар асветы ССРБ, намеснік наркама асветы Літоўска-Беларускай ССР, начальнік палітаддзела Гомельскага ўмацаванага раёна. У 1920—1924 гг. старшыня ЦВК і СНК БССР, у 1924—1937 гг. старшыня ЦВК БССР. З пачатку 1930-х гг. падвяргаўся неабгрунтаваным абвінавачванням у скажэнні генеральнай лініі партыі. Скончыў жыццё самагубствам.



Правообладатель Народная асвета

Уваходжанне БССР у склад Савецкага Саюза садзейнічала больш шырокаму і эфектыўнаму выкарыстанню матэрыяльных рэсурсаў, перадавога вопыту, сучаснай тэхнікі і тэхналогій вытворчасці вялікай краіны, умацаванню гаспадарчых і культурных сувязей паміж рэспублікамі.

Разам з тым для развіцця эканомікі і культуры Беларусі, аб'яднання беларускай нацыі ў яе этнаграфічных межах, умацавання нацыянальнай дзяржаўнасці патрабавалася далучэнне да БССР усіх беларускіх зямель. На сумежных тэ-




Тэрыторыя Беларусі пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора. Узбуйненне БССР у 1924 і 1926 гг.



Правообладатель Народная асвета

рыторыях пражывала больш беларусаў, чым непасрэдна ў БССР. Улічваліся таксама знешнепалітычныя абставіны, асабліва становішча ў Заходняй Беларусі, дзе беларускае насельніцтва падвяргалася эканамічнай, палітычнай і духоўнай эксплуатацыі.

У сакавіку **1924 г.** Прэзідыумам ЦВК СССР і Усерасійскім ЦВК былі прыняты пастановы аб перадачы Беларускай ССР 15 паветаў і асобных валасцей Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў, дзе большасць насельніцтва складалі беларусы. VI Надзвычайны Усебеларускі з'езд Саветаў у сакавіку 1924 г. заканадаўча аформіў далучэнне да БССР усходнебеларускіх зямель.

У **1926 г.** да БССР былі далучаны Гомельскі і Рэчыцкі паветы, у якіх таксама пераважала беларускае насельніцтва. У выніку ўзбуйнення тэрыторыя БССР павялічылася да 126 тыс. км$^2$, а насельніцтва дасягнула амаль 5 млн чалавек.

Такім чынам, усходнебеларускія землі (Віцебшчына, Гомельшчына і Магілёўшчына) былі далучаны да Савецкай Беларусі. Значна ўзмацніўся эканамічны патэнцыял рэспублікі, былі створаны больш спрыяльныя ўмовы для нацыянальна-дзяржаўнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Заходнебеларускія землі да 1939 г. заставаліся ў складзе Польшчы. Працэс фарміравання тэрыторыі БССР у межах пражывання беларускага этнасу яшчэ не скончыўся.

11 красавіка **1927 г.** VIII Усебеларускім з'ездам Саветаў была прынята *другая Канстытуцыя Беларускай ССР*. У ёй замацоўваліся змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле рэспублікі, дасягненні беларускага народа ў дзяржаўным, гаспадарчым і культурным будаўніцтве. У Канстытуцыі адлюстроўваўся факт аб'яднання БССР і іншых саюзных рэспублік у адзіную саюзную дзяржаву — Савецкі Саюз, вызначаліся суверэнныя правы БССР у складзе СССР.

**Даты, якія трэба ведаць:** *14—18 снежня 1922 г., 30 снежня 1922 г., 1924 г., 1926 г., 1927 г.*

## Пытанні і заданні

**1.** Ахарактарызуйце асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага жыцця БССР у 1920-я гг. Складзіце тэзісны план адказу на гэтае пытанне (гл. *памятку 9*). **2.** Якой была роля КП(б)Б, Саветаў, прафсаюзаў, камсамола, іншых грамадскіх аб'яднанняў у грамадскім жыцці БССР у гэты перыяд? З дапамогай дадатковай літаратуры падрыхтуйце паведамленне на гэтую тэму. **3.** Чым адрозніваліся ленінскі і сталінскі планы аб'яднання савецкіх рэспублік? **4.** Калі быў утвораны СССР? Якія савецкія рэспублікі заключылі Дагавор аб утварэнні СССР? **5.** Як вы думаеце, чаму ў пастанове IV Усебеларускага з'езда Саветаў афармленне Саюза ССР на Усерасійскім з'ездзе Саветаў называецца фармальным актам? Якія былі перадумовы для аб'яднання рэспублік у СССР? **6.** Дайце ацэнку гістарычнай падзеі — утварэнню СССР (гл. *памятку 2*). Якое значэнне мела для БССР уваходжанне ў склад Саюза ССР? **7.** Падрыхтуйце паведамленне аб дзейнасці А. Чарвякова. (*Выкарыстайце дадатковую літаратуру.*) **8.** Прадоўжыце запаўненне табліцы. Пакажыце на карце (с. 59) змены ў тэрыторыі БССР.



Правообладатель Народная асвета

**Тэрытарыяльныя змены Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (1919—1939)**

| Перыяд | Гістарычныя ўмовы | Тэрытарыяльныя змены |
|---|---|---|
| 1924 г. | | |
| 1926 г. | | |

## Ваша меркаванне

Ці згодны вы з тым, што ўтварэнне СССР адпавядала жыццёвым інтарэсам Савецкай Беларусі? Сваю думку абгрунтуйце.

## Гістарычны дакумент

**З пастановы IV Усебеларускага з'езда Саветаў (ад 18 снежня 1922 г.) аб утварэнні СССР**

«Четвертый Всебелорусский съезд Советов рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов считает, что предложение Всеукраинского съезда Советов о немедленном оформлении уже фактически существующего Союза Советских Республик, объединяя против единого фронта мирового капитала силы рабочих и крестьян всех советских республик на основах взаимного равенства, тесной политической и хозяйственной связи, в то же время обеспечивая самостоятельное национально-культурное строительство и создавая необходимые гарантии для проявления хозяйственной инициативы каждого из членов, отвечает жизненным интересам Советской Белоруссии и потому должно получить скорейшее осуществление на предстоящем съезде всех советских республик.

IV съезд Советов Белоруссии выражает свою глубокую уверенность, что съезд РСФСР совместно с представителями Украины, Белоруссии и Закавказских республик создает единый, крепко сплоченный союз трудящихся всех братских республик, поручает своей делегации, избираемой для участия на Всероссийском съезде Советов, дать во время работы съезда торжественное обещание и совершить формальные акты, закрепляющие братский Союз Социалистических Советских Республик».

# § 11. ПАЛІТЫКА БЕЛАРУСІЗАЦЫІ

**Успомніце. 1.** Якой была пазіцыя бальшавікоў па нацыянальным пытанні? **2.** Назавіце асноўныя ідэі Дэкларацыі правоў народаў Расіі.

**Беларусізацыя — састаўная частка савецкай нацыянальнай палітыкі.** СССР — краіна шматнацыянальная. Яе палітыка ў галіне нацыянальных адносін распрацоўвалася ў вышэйшых партыйных структурах. X з'езд РКП(б) у сакавіку 1921 г. лічыў неабходным дабівацца даверу раней прыгнечаных нацый, развіваць на іх



Правообладатель Народная асвета

роднай мове органы ўлады, судовыя органы, курсы і школы як агульнаадукацыйнага, так і прафесійна-тэхнічнага кірунку, культурна-асветныя ўстановы, прэсу, тэатр. XII з'езд РКП(б) у 1923 г. вызначыў канкрэтныя задачы ў галіне нацыянальнай палітыкі: фарміраванне органаў улады нацыянальных рэспублік з мясцовых дзеячаў, якія валодалі б мовай, ведалі быт, звычаі народаў; ужыванне роднай мовы ва ўсіх дзяржаўных органах і ўстановах; арганізацыя нацыянальных вайсковых часцей і інш.

Беларуская ССР з'яўлялася шматнацыянальнай рэспублікай. Нацыянальныя адносіны тут мелі свае асаблівасці. *Па-першае*, паводле перапісу 1926 г., у БССР беларусы складалі 80,6 % насельніцтва рэспублікі, яўрэі — 8,2 %, рускія — 7,7 %, палякі — 2 %, украінцы — 0,7 %, да астатніх 0,8 % належалі латышы, літоўцы, немцы, татары, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. Як бачна, шматнацыянальная меншасць складала толькі пятую частку насельніцтва, а пераважная яго большасць належала да беларускай нацыі. Беларусы ў асноўным жылі ў вёсцы. У некаторых беларускіх гарадах і мястэчках яўрэі і рускія складалі да 40—60 % жыхароў. У сувязі з гэтым моўная сітуацыя ў БССР была спецыфічнай: горад быў рускамоўным, а вёска — беларускамоўнай.

*Па-другое*, нягледзячы на тое што беларусы ў складзе насельніцтва БССР складалі 80,6 %, іх доля ў складзе партыйных, савецкіх і гаспадарчых органаў не дасягала і паловы. У 1922 г. з 13 членаў Цэнтральнага бюро КП(б)Б беларусаў было 5, яўрэяў — 6, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей — 2. З 74 членаў павятовых камітэтаў партыі быў 31 беларус, 34 з'яўляліся яўрэямі, 9 чалавек прадстаўлялі іншыя нацыянальнасці.

Цэнтральны камітэт КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР праводзілі ў жыццё тую нацыянальную палітыку, асноўныя кірункі якой былі распрацаваны РКП(б) і яе структурамі. Палітыка, якая праводзілася ў БССР з ліпеня 1924 г., атрымала назву палітыкі ***беларусізацыі***. Яе можна разглядаць у якасці састаўной часткі савецкай нацыянальнай палітыкі.

Намаганнямі дзеячаў нацыянальнага адраджэння А. Чарвякова, З. Жылуновіча, У. Ігнатоўскага і інш. у 1920—1924 гг. закладваліся асновы савецкай нацыянальнай палітыкі ў Беларусі. У лютым 1921 г. ЦВК БССР звярнуўся з заклікам да раскіданых вайной культурных работнікаў вярнуцца на Радзіму. Да канца 1921 г. каля 300 чалавек — беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі — вярнулася ў БССР.

Па ініцыятыве наркама асветы ***У. Ігнатоўскага*** пры Наркамасветы БССР у **1922 г.** быў арганізаваны *Інстытут беларускай культуры* (*Інбелкульт*). Пры Наркамаце асветы БССР працавалі курсы беларусазнаўства для падрыхтоўкі настаўнікаў. Сведчаннем поспехаў у правядзенні нацыянальнай палітыкі з'яўлялася і тое, што ў 1922 г. прыкладна чвэрць усіх школ праводзіла выкладанне дысцыплін на беларускай мове, у астатніх школах беларуская мова была ўведзена як абавязковая для вывучэння. Пачалі ствараецца школы для нацыянальных меншасцей.



Правообладатель Народная асвета

У 1920 г. было створана выдавецтва «Беларусь», а ў 1922 г. кааператыўнае выдавецтва «Белтрэстдрук». З'явілася магчымасць выдання кніг на беларускай мове і мовах іншых народаў. Да сярэдзіны 1922 г. на тэрыторыі Беларусі было распаўсюджана каля 150 тыс. беларускіх кніг. У арганізацыях і ўстановах працавалі курсы па вывучэнні беларускай мовы, справаводства пераводзілася на беларускую мову.

### Гістарычны партрэт



**Ігнатоўскі Усевалад Макаравіч** (1881—1931). Нарадзіўся ў в. Такары Брэсцкага павета Гродзенскай губерні. Беларускі гісторык і грамадскі дзеяч. У 1911 г. скончыў Юр'еўскі ўніверсітэт. Да кастрычніка 1917 г. член партыі эсэраў. За ўдзел у рэвалюцыйным руху неаднаразова арыштоўваўся. У 1919—1920 гг. змагаўся ў падполлі супраць польскіх акупантаў. У 1914—1920 гг. працаваў выкладчыкам Мінскага настаўніцкага (педагагічнага з 1919 г.) інстытута. У 1920—1921 гг. наркам земляробства, у 1920—1926 гг. наркам асветы БССР. Прафесар БДУ, дэкан факультэтаў грамадскіх навук і педагагічнага, намеснік рэктара ўніверсітэта. З 1926 г. старшыня Інбелкульта. У 1929—1931 гг. першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук. Напісаў шэраг навуковых прац — «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі», «Гісторыя Беларусі ў XIX і пачатку XX ст.», «1863 год на Беларусі».

**Асноўныя мерапрыемствы палітыкі беларусізацыі.** Цэнтральнае месца ў палітыцы беларусізацыі займала *развіццё беларускай мовы* і *пашырэнне сферы яе ўжывання*. На тэрыторыі БССР *прызнаваліся раўнапраўнымі беларуская, руская, яўрэйская* і *польская мовы*. Асноўныя рэспубліканскія дакументы друкаваліся на чатырох мовах; агульнасаюзныя — на беларускай і рускай мовах, грамадска-прававыя — на беларускай і адной з трох раўнапраўных моў. За кожным грамадзянінам замацоўвалася права звяртацца ў любую ўстанову на роднай мове і на ёй атрымаць адказ.

Палітыка беларусізацыі садзейнічала таму, каб беларуская мова стала афіцыйнай моваю у рабоце партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый, а таксама часцей Чырвонай Арміі, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі. Беларусізацыю ў ЦВК, СНК, Наркамасветы і Наркамземе прадугледжвалася ажыццявіць за адзін год, ва ўсіх астатніх установах — на працягу 2—3 гадоў. Супрацоўнікі гэтых устаноў вывучалі беларускую мову і пераводзілі на яе справаводства. Калі ў 1925 г. беларус-



Правообладатель Народная асвета

кую мову ў цэнтральных кіруючых органах ведала не больш за 20 % служачых, то ў 1927 г. — 80 %, у акруговых і раённых адпаведна 36 % і 70 %.

Састаўной часткай палітыкі беларусізацыі з'яўлялася *стварэнне беларускамоўных навучальных* і *выхаваўчых устаноў, вывучэнне гісторыі, геаграфіі, эканомікі* і *культуры Беларусі*. Да канца 1920-х гадоў каля 80 % школ было пераведзена на беларускую мову выкладання, што адпавядала ўдзельнай вазе беларусаў у агульным складзе насельніцтва БССР. Акрамя таго, дзейнічалі школы для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей з роднай мовай выкладання. У 1927 г. выкладанне ў школах БССР вялося на васьмі нацыянальных мовах.

У савецка-партыйных школах, на рабочых факультэтах, у вячэрніх школах для дарослых, школах рабочай і сялянскай моладзі ўводзілася абавязковае вывучэнне гісторыі, эканомікі і геаграфіі Беларусі, беларускай мовы і літаратуры. Ва ўсіх вышэйшых навучальных установах беларуская мова вывучалася ў абавязковым парадку, на яе выкладанне паступова пераводзіліся іншыя вучэбныя дысцыпліны.

Адным з асноўных кірункаў палітыкі беларусізацыі з'яўлялася *павышэнне ролі асоб карэннай нацыянальнасці, у першую чаргу беларусаў, у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі*, выхаванне і вылучэнне кадраў з карэннага насельніцтва на партыйную, савецкую, гаспадарчую і грамадскую работу. Гэтая частка палітыкі беларусізацыі атрымала назву ***«карэнізацыі»***. Ставілася задача вылучэння на кіруючыя пасады працаўнікоў па іх дзелавых якасцях, веданні ўмоў і асаблівасцей Беларусі, дасканалым валоданні беларускай і рускай мовамі. Да канца 1920-х гг. доля беларусаў у кіруючых органах рэспублікі павялічылася да 50 з лішнім працэнтаў, што яшчэ не адпавядала іх удзельнай вазе ў агульнай колькасці насельніцтва БССР.

Яшчэ адзін з кірункаў палітыкі беларусізацыі — *стварэнне ў складзе Беларускай ваеннай акругі нацыянальных тэрытарыяльных воінскіх часцей і злучэнняў*, перавод іх работы па навучанні і выхаванні салдат і афіцэраў на беларускую мову. Да канца 1920-х гг. былі створаны 2-я Беларуская стралковая дывізія і 16-ы Беларускі стралковы корпус (да трох дывізій), а таксама Аб'яднаная беларуская вайсковая школа імя ЦВК БССР. У іншых вайсковых злучэннях, якія знаходзіліся на тэрыторыі БССР, уводзілася вывучэнне беларускай мовы.

І, нарэшце, палітыка беларусізацыі ўключала *ўсебаковае развіццё беларускай нацыянальнай культуры* — літаратуры, музыкі, тэатра, жывапісу, кнігадрукавання (аб гэтым размова пойдзе ў наступным параграфе).

Разам з тым у правядзенні палітыкі беларусізацыі меліся супярэчнасці паміж пазіцыямі кіраўніцтва СССР і Беларускай ССР. ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР разглядалі гэтае мерапрыемства як сродак развіцця беларускай мовы і культуры, завяршэння працэсу фарміравання беларускай нацыі, павышэння ролі карэннай нацыянальнасці ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. У той жа час ЦК ВКП(б),



Правообладатель Народная асвета

ЦВК і СНК СССР у правядзенні палітыкі беларусізацыі бачылі нацыяналістычныя праявы, цэнтрабежныя тэндэнцыі, нават адмову ад будаўніцтва сацыялізму і рэстаўрацыю капіталізму.

Былі яшчэ даволі моцныя і цяжкія для пераадолення супярэчнасці паміж прыхільнікамі і праціўнікамі беларусізацыі. З аднаго боку, беларуская дзяржаўная, партыйная, навуковая і культурная эліта станоўча адносілася да беларусізацыі і садзейнічала яе правядзенню ў жыццё. З другога боку, чыноўнікі, навукоўцы, дзеячы культуры з ассяроддзя яўрэйскай, рускай і іншых нацыянальных меншасцей разглядалі беларусізацыю як сродак гвалтоўнага пераводу насельніцтва на беларускую мову, а таму яе не падтрымлівалі і пры магчымасці ёй шкодзілі.

У ходзе ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі нярэдка фарсіраваліся яе тэмпы, ужываліся адміністрацыйныя метады правядзення, парушаўся прынцып добраахвотнасці ў карыстанні той ці іншай мовай. Патрабаванне ведання беларускай мовы іншы раз адсоўвала на другі план дзелавыя якасці людзей. Жорсткія меры прымаліся ў адносінах да кіраўнікоў, якія дапускалі памылкі ці не праяўлялі актыўнасці ў правядзенні палітыкі беларусізацыі. Гэта не толькі папярэджанне ці вымова, але і перавод на ніжэйшую пасаду, зняцце з работы. Праваканцыйна паводзілі сябе прадстаўнікі некаторых сіяніскіх арганізацый. Яны беспадстаўна сцвярджалі, што яўрэяў у першую чаргу выкідваюць з кіруючых органаў улады. У сапраўднасці ў канцы 1920-х гг. колькасць яўрэяў на кіруючых пасадах у некалькі разоў перавышала іх удзельную вагу ў складзе насельніцтва Беларускай ССР.

**Вынікі і значэнне палітыкі беларусізацыі.** У канцы 1920-х гг. правядзенне палітыкі беларусізацыі было прыпынена. Многія палітычныя і дзяржаўныя дзеячы, прадстаўнікі навуковай і культурнай эліты БССР былі абвінавачаны ў распальванні нацыяналізму, спробе аддзяліць рэспубліку ад СССР і павесці яе па капіталістычным шляху развіцця.

Нягледзячы на памылкі і недахопы, палітыка беларусізацыі дапамагала беларусам усведамляць сябе нацыяй, развіваць нацыянальную самасвядомасць. Яна садзейнічала завяршэнню працэсу фарміравання беларускай нацыі, павышэнню палітычнай і грамадскай актыўнасці насельніцтва Беларускай ССР.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *1922 г.; беларусізацыя, «карэнізацыя».*

### Пытанні і заданні

**1.** Ахарактарызуйце нацыянальны склад насельніцтва БССР паводле перапісу 1926 г. **2.** Якімі былі асаблівасці нацыянальных адносін у рэспубліцы ў пачатку 1920-х гг.? **3.** Назавіце асноўныя кірункі савецкай нацыянальнай палітыкі ў 1920-я гг. **4.** Канкрэтызуйце прыкладамі вывад аб тым, што беларусізацыя з'яўлялася састаўной часткай савецкай нацыянальнай палітыкі. *(Выкарыстайце веды па сусветнай гісторыі.)* **5.** Дайце азначэнне паняццяў *беларусізацыя, карэнізацыя*. **6.** Назавіце асноўныя мерапрыемствы палітыкі беларусізацыі, яе супярэчнасці і вынікі яе рэалізацыі. **7.** З дапамогай дадатковай літаратуры падрыхтуйце паведамленне пра У. Ігнатоўскага (гл. *памятку 3*).



Правообладатель Народная асвета

### Ваша меркаванне

Дайце ўласную абгрунтаваную ацэнку палітыцы беларусізацыі. Якія, на ваш погляд, урокі гісторыі неабходна засвоіць сучасным грамадзянам Беларусі з гэтага факту айчыннай гісторыі?

### Гэта цікава

У 1926/1927 навучальным годзе ў Беларусі дзейнічала 4576 школ з чатырох- і сямігадовым тэрмінамі навучання. Сярод іх была 4201 беларуская школа, 189 яўрэйскіх, 117 польскіх, 40 рускіх, 19 латышскіх, 3 нямецкія, 6 літоўскіх і 1 эстонская.

## § 12. РАЗВІЦЦЁ АДУКАЦЫІ, НАВУКІ І КУЛЬТУРЫ Ў БССР У 1920-я гг.

**Успомніце.** Якімі былі асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця БССР у першай палове 1920-х гг.?

**Ліквідацыя масавай непісьменнасці дарослага насельніцтва. Станаўленне сістэмы адукацыі ў БССР.** Задачы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў патрабавалі ўсеагульнай пісьменнасці. У Беларусі была створана *Рэспубліканская надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці*. У гарадах і вёсках арганізоўваліся і працавалі школы і пункты па ліквідацыі непісьменнасці, школы рабочай моладзі, групы індывідуальнага навучання дарослых.

У 1926 г. у БССР аформілася *таварыства «Прэч непісьменнасць»*. Яго старшынёй быў абраны А. Чарвякоў — старшыня ЦВК БССР. Па ініцыятыве камсамола праводзіліся месячнікі «За пісьменнасць», а таксама культпаходы і культэстафеты, у ходзе якіх адбывалася навучанне людзей грамаце. Пры гарадскіх і сельскіх Саветах былі створаны групы садзейнічання ліквідацыі непісьменнасці, праходзілі грамадскія агляды школ і пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці.

У гэтай рабоце прымалі ўдзел калектывы фабрык і заводаў, калгасаў і саўгасаў, арганізацый і ўстаноў, настаўнікі, студэнты, школьнікі, усе пісьменныя людзі. Але да канца 1920-х гг. былі зроблены толькі першыя крокі на шляху ліквідацыі масавай непісьменнасці дарослага насельніцтва. Для поўнага вырашэння гэтай праблемы патрабаваліся дадатковыя намаганні дзяржавы і шырокіх колаў грамадскасці ў наступныя гады.

Да сярэдзіны 1920-х гг. у БССР была створана сістэма народнай адукацыі, якая забяспечвала кожнаму рэальную магчымасць закончыць агульнаадукацыйную школу і атрымаць патрэбную прафесію. Яна ўключала: 1) дашкольныя ўстановы; 2) масавую чатырохгадовую працоўную школу; 3) сямігадовую працоў-



Правообладатель Народная асвета

ную політэхнічную школу ў складзе двух канцэнтраў (першы канцэнтр уключаў у сябе I—IV групы, другі — V—VII групы; вучэбныя класы ў той час называліся групамі); 4) школы сялянскай моладзі (ШСМ), школы фабрычна-заводскага навучання (ФЗН), прафесійныя школы (прафшколы), прафесійныя і агульнаадукацыйныя курсы; 5) рабочыя факультэты; 6) тэхнікумы; 7) вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Аднак у сістэме народнай адукацыі Беларусі таго часу заставаліся недахопы. Адсутнасць сярэдняй школы стварала разрыў паміж агульнаадукацыйнай і вышэйшай школай. Агульная падрыхтоўка вучняў заканчвалася ў сямігадовай школе. Дарога ў вышэйшыя навучальныя ўстановы праходзіла праз рабочыя факультэты, тэхнікумы і агульнаадукацыйныя курсы. Сярэдняя агульнаадукацыйная школа была адноўлена ў БССР толькі ў 1932 г.

Паміж чатырохгадовай працоўнай школай і прафесійна-тэхнічнымі навучальнымі ўстановамі таксама адсутнічалі сувязь і пераемнасць. Пачатковую школу вучні заканчвалі ў 11—12 гадоў, а ў школы ФЗН і на вытворчасць прымалі толькі па дасягненні 15-гадовага ўзросту. Частка выпускнікоў чатырохгадовай школы на працягу 2—3 гадоў знаходзілася па-за школай і вытворчасцю, губляючы раней атрыманыя веды.

Не была створана школа, адзіная для горада і вёскі. Для дзяцей, якія жылі ў гарадах і буйных прамысловых цэнтрах, існавалі фабрычна-заводскія сямігодкі з вытворчым ухілам і спецыяльнымі вучэбнымі планамі і праграмамі, а для дзяцей, якія жылі ў сельскай мясцовасці, — школы сялянскай (пазней — калгаснай) моладзі з сельскагаспадарчым ухілам і адпаведнымі вучэбнымі планамі і праграмамі.

Адной з важных праблем культурнага будаўніцтва была арганізацыя ўсеагульнага абавязковага навучання дзяцей. У **1926 г.** ЦВК і СНК БССР прынялі пастанову *«Аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага навучання дзяцей ад 8 да 11 гадоў»*. У адпаведнасці з гэтай пастановай праводзіліся растлумачальная работа сярод насельніцтва, перапіс дзяцей школьнага ўзросту, будаўніцтва і рамонт школьных будынкаў і абсталявання, нарыхтоўка паліва, добраўпарадкаванне школьных двароў, забеспячэнне дзяцей адзеннем і абуткам, падручнікамі і школьнымі пісьмовымі прыладамі. Арганізоўваліся таксама гарачае харчаванне і падвоз дзяцей у школу з далёкіх вёсак, праходзілі камсамольскія суботнікі на карысць школы. У выніку ў 1929/1930 навучальным годзе 91 % дзяцей ва ўзросце 8 гадоў вучыліся ў пачатковых школах. Беларуская ССР першай з саюзных рэспублік ажыццявіла ўсеагульнае абавязковае навучанне дзяцей 8-гадовага ўзросту.

Падрыхтоўка спецыялістаў ажыццяўлялася ў вышэйшых навучальных установах. Калі ў 1925 г. працавала 4 ВНУ з 4342 студэнтамі і 436 выкладчыкамі, то ў 1932 г. — 31 ВНУ з 10 574 студэнтамі і 1388 выкладчыкамі (гл. *дадатковы матэрыял*).



Правообладатель Народная асвета



У. Пічэта

Паспяхова развіваліся ў 1920-я гг. сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы Беларусі.

**Беларуская навука. Даследаванні беларускага этнасу, яго гісторыі і культуры.** 1920-я гг. сталі часам нараджэння беларускай навукі. У 1922 г. быў створаны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). У **1929 г.** ён быў рэарганізаваны ў *Беларускую акадэмію навук*, якая стала цэнтрам навуковага жыцця рэспублікі.

1920-я гг. — перыяд актыўнага даследавання беларускага этнасу, яго гісторыі і культуры. Вялікі ўклад у гэтую справу ўнёс гісторык-славіст, выпускнік Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, першы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, адзін з арганізатараў Інбелкульта і АН БССР ***У. Пічэта***. Яму належаць навуковыя працы па старажытнай і сярэдневяковай гісторыі Беларусі, асаблівасцях гістарычнага развіцця Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, аграрнай рэформе Жыгімонта II Аўгуста ў Вялікім Княстве Літоўскім і інш. Усяго У. Пічэта апублікаваў больш за 150 прац па гісторыі Беларусі.



М. Доўнар-Запольскі

Шмат зрабіў у справе вывучэння беларускай гісторыі і культуры доктар гістарычных навук, прафесар, фалькларыст і этнограф ***М. Доўнар-Запольскі***. Найбольш буйныя яго навуковыя працы прысвечаны пераважна сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі і Літвы. У яго магістарскай дысертацыі даследавалася дзяржаўная гаспадарка Вялікага Княства Літоўскага пры Ягелонах, а ў доктарскай дысертацыі — арганізацыя заходнярускага сялянства ў XVI ст. Пяру М. Доўнар-Запольскага належыць брашура «Асновы дзяржаўнасці Беларусі». У працах па этнаграфіі ён з асаблівай увагай вывучаў беларускае вяселле і вясельныя песні, сямейнае звычаёвае права. Усяго па этнаграфіі і фальклоры апублікаваў больш за 30 прац.

Выдатны вучоны, філолаг-славіст, заснавальнік беларускага мовазнаўства, філалогіі і фалькларыстыкі, акадэмік Расійскай акадэміі навук ***Я. Карскі*** стварыў капітальную трохтомную працу «Беларусы». Гэта галоўны твор у яго навуковай спадчыне, помнік выдатнаму вучонаму, сапраўдная беларуская энцыклапедыя. У ёй



Правообладатель Народная асвета



Я. Карскі



М. Шчакаціхін

даследуюцца народная славеснасць, фанетыка, марфалогія і сінтаксіс беларускай мовы ў іх гістарычным развіцці, а таксама старажытная і новая беларуская літаратура.

Адным з заснавальнікаў беларускага мастацтвазнаўства з'яўляўся выхаванец Маскоўскага ўніверсітэта, выкладчык гісторыі беларускага мастацтва ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ***М. Шчакаціхін***. Ён даследаваў беларускую архітэктуру XI—XIX стст., манументальны жывапіс полацкіх храмаў, іканапіс XVII—XVIII стст., старажытнабеларускія гравюры, мастацтва кніг Ф. Скарыны. Шмат увагі надаваў вывучэнню творчасці беларускіх мастакоў І. Ахрэмчыка, В. Волкава, А. Грубэ, У. Кудрэвіча, М. Філіповіча і інш.

Разам з тым палітычныя рэпрэсіі 1920—1930-х гг. выліліся ў расправу над прадстаўнікамі беларускай навукі, літаратуры і мастацтва. У 1930-я гг. былі рэпрэсіраваны 26 акадэмікаў і 6 членаў-карэспандэнтаў Беларускай акадэміі навук. Больш за палову свайго складу страціў у выніку рэпрэсій Саюз пісьменнікаў Беларусі. Жудаснай расправай над нацыянальнай інтэлігенцыяй стала сфабрыкаваная ў 1930 г. справа аб «Саюзе вызвалення Беларусі», па якой было арыштавана 108 лепшых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі.

**Літаратура і мастацтва.** Бурнае развіццё беларускай савецкай літаратуры пачалося ў 1920-я гг. У гэты час узніклі літаратурныя аб'яднанні «Маладняк», «Узвышша», «Полымя». Плённа працавалі беларускія пісьменнікі ***Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны, Максім Гарэцкі***. У 1926 г. пачаў друкаваць свае творы ***А. Куляшоў***. У першых зборніках «Росквіт зямлі», «Па песню, па сонца!..» ён услаўляў пераўтварэнні 1920-х гг. у беларускай вёсцы. Увогуле беларускія пісь-



Правообладатель Народная асвета



Е. Міровіч



У. Галубок

меннікі і паэты віталі Кастрычніцкую рэвалюцыю, перадавалі ў сваіх творах яе пафас і драматызм, адлюстроўвалі падзеі Грамадзянскай вайны, натхнёна апявалі нараджэнне новага грамадства. Для іх, як і для ўсяго народа, гэта быў час агульнага духоўнага ўздыму, надзей, веры і мар.

Важную ролю ў станаўленні беларускага тэатральнага мастацтва адыграў *Беларускі першы дзяржаўны тэатр*, які быў адкрыты ў Мінску ў верасні 1920 г. Яго рэжысёрам стаў ***Е. Міровіч***. Адначасова ў Мінску працавала Тэатральная трупа *У. Галубка*. У 1926 г. яна была пераўтворана ў *Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр*. У 1926 г. у Віцебску адкрыўся *Беларускі другі дзяржаўны тэатр*, аснову якога склалі выпускнікі Беларускай драматычнай студыі, што працавала ў Маскве пры Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры. Выдатнаму дзеячу беларускага мастацтва, драматургу і рэжысёру У. Галубку першаму ў рэспубліцы было прысвоена званне «Народны артыст БССР».

1920-я гг. — час станаўлення беларускага кіно. Кінавытворчасць у рэспубліцы пачыналася з кінахронікі. На працягу 1925—1926 гг. было знята каля 30 стужак, у тым ліку «Меліярацыя БССР», «У здаровым целе — здаровы дух» і інш.

Першымі нацыянальнымі мастацкімі стужкамі былі «Лясная быль» (1926) рэжысёра ***Ю. Тарыча*** (па аповесці М. Чарота «Свінапас») і «Кастусь Каліноўскі» (1927) рэжысёра У. Гардзіна. Асноўныя тэмы творчасці беларускіх кінематографістаў таго часу — рэвалюцыйная барацьба беларускага народа і будаўніцтва сацыялістычнага грамадства.

Пра поспехі беларускага жывапісу сведчаць творы, якія з'явіліся яшчэ ў 1920-я гг. Сярод іх карціны ***В. Волкава*** «Малатабоец», «Партызаны», «Плыта-



Правообладатель Народная асвета

гоны», ***М. Філіповіча*** «Бітва на Нямізе», «Ноч на Івана Купалу», «Паўстанне К. Каліноўскага», пейзажы ***У. Кудрэвіча*** «Раніца вясны», «Над Свіслаччу», «На Сажы».

**Даты, якія трэба ведаць:** *1926 г., 1929 г.*

### Пытанні і заданні

**1.** Якія меры прымаліся ў БССР для ліквідацыі непісьменнасці дарослага насельніцтва? Растлумачце, чаму гэтаму пытанню ўдзялялася такая вялікая ўвага. **2.** Ахарактарызуйце сістэму адукацыі, якая склалася ў БССР у 1920-я гг. Якімі былі яе дасягненні і недахопы? (*Выкарыстайце дадатковы матэрыял.*) **3.** Назавіце асноўныя кірункі навуковых даследаванняў гісторыі і культуры беларускага народа ў 1920-я гг. **4.** Якімі былі асноўныя тэмы творчасці беларускіх пісьменнікаў, кінематаграфістаў, мастакоў у 1920-я гг.? Чым яны былі абумоўлены? **5.** На прыкладзе вядомага вам літаратурнага твора (твора мастацтва) 1920-х гг. пакажыце, як у іх адлюстраваны «подых» таго часу. **6.** Падрыхтуйце прэзентацыі аб дзеячах беларускай культуры 1920-х гг. (*Выкарыстайце дадатковую літаратуру.*)

### Дадатковы матэрыял

30 кастрычніка 1921 г. адбылося афіцыйнае адкрыццё Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У першы год ва ўніверсітэце вучылася 1250 студэнтаў, заняткі вялі 14 прафесараў, 49 выкладчыкаў і асістэнтаў. У складзе ўніверсітэта ў 1922/1923 навучальным годзе дзейнічалі факультэты: рабочы, грамадскіх навук, педагагічны, медыцынскі, факультэт права і гаспадаркі.

У 1930—1931 гг. у складзе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта засталіся толькі 3 факультэты: фізіка-матэматычны, хімічны і біялагічны, а на базе іншых факультэтаў было створана 6 самастойных інстытутаў: Мінскі медыцынскі, Вышэйшы педагагічны (цяпер Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка), Магілёўскі палітыка-асветны (на базе палітыка-асветнага аддзялення педагагічнага факультэта), планава-эканамічны і кааператыўны (на базе факультэта народнай гаспадаркі), савецкага будаўніцтва і права.

У красавіку 1919 г. аднавіў сваю работу Горы-Горацкі земляробчы інстытут. У снежні 1920 г. у Мінску быў створаны Беларускі політэхнічны інстытут, а ў 1922 г. на яго базе адкрыты Інстытут сельскай і лясной гаспадаркі.

У 1925 г. у выніку зліцця Горацкага сельскагаспадарчага інстытута і Мінскага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі ў Горках была створана Беларуская дзяржаўная акадэмія сельскай гаспадаркі імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Для падрыхтоўкі заатэхнікаў і ветэрынарных работнікаў у 1924 г. быў створаны Віцебскі ветэрынарны інстытут. Кадры для партыйнага і дзяржаўнага будаўніцтва рыхтаваў адкрыты ў 1925 г. Камуністычны ўніверсітэт імя У. Леніна.



Правообладатель Народная асвета

# § 13. ПРАВЯДЗЕННЕ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ССР

**Успомніце. 1.** Калі і з якой мэтай была ўведзена новая эканамічная палітыка? Як яна паўплывала на развіццё прамысловасці? **2.** Што такое прамысловая рэвалюцыя? Калі яна адбывалася ў краінах Захаду?

**Паступовае згортванне новай эканамічнай палітыкі.** З дасягненнем даваеннага ўзроўню вытворчасці пачалося паступовае згортванне новай эканамічнай палітыкі. Гэта было абумоўлена аб'ектыўнымі працэсамі ўмацавання капіталізму, пастаяннага росту беспрацоўя і маёмаснай няроўнасці, узбагачэння капіталістычных элементаў (большасць выгад ад нэпа атрымалі толькі нешматлікія нэпманы), збяднення і незадаволенасці той часткі насельніцтва (рабочых і сялян), якая складала сацыяльную базу савецкай улады і абараняла гэту ўладу ў гады Грамадзянскай вайны.

У краіне пашырыліся злачыннасць, прастытуцыя, наркаманія, склаўся стыль жыцця нэпманаў (узбагачэнне любымі сродкамі, парушэнне законнасці, п'янства), з'явіліся прыкметы зрошчвання карумпіраваных партыйных і дзяржаўных работнікаў з «прыватна-ўласніцкім капіталізмам», пачаўся працэс перараджэння савецкай бюракратыі (хабар, злоўжыванне службовым становішчам, жульніцтва, махлярства і г. д.).

Задачы сацыялістычнага будаўніцтва, усталявання прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці патрабавалі адмаўлення ад той палітыкі, якая нараджала і ўзмацняла капіталістычныя элементы, а таксама негатыўныя з'явы ў грамадстве.

Наступленне на прыватны капітал пачалося ў другой палове 1920-х гг. Значна павялічваліся падаткі, скасоўваліся арэндныя дагаворы, скарачаліся грашовыя і таварныя крэдыты прыватнікам. Быў узяты курс на выцясненне прыватнага капіталу са сферы вытворчасці, фінансаў і гандлю, на паступовае згортванне новай эканамічнай палітыкі.

У другой палове 1920-х гг. у поўнай адпаведнасці з праграмай сацыялістычнага будаўніцтва новая эканамічная палітыка была паступова заменена палітыкай сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі сельскай гаспадаркі і культурнай рэвалюцыі. У 1930-я гг. гэты курс Савецкай дзяржавы атрымаў афіцыйную назву палітыкі *разгорнутага наступлення сацыялізму на ўсім фронце*.

**Пераход да планавай дзяржаўнай эканомікі. Прычыны правядзення індустрыялізацыі ў БССР.** Даволі нізкі ўзровень развіцця прадукцыйных сіл у сярэдзіне 1920-х гг. патрабаваў стварэння буйной машыннай вытворчасці і перабудовы ўсёй народнай гаспадаркі на аснове высокапрадукцыйнай тэхнікі. Гэты працэс у СССР і БССР атрымаў назву *сацыялістычнай **індустрыялізацыі***. У краінах Захаду ён вядомы як *індустрыяльная (прамысловая) рэвалюцыя*.

Курс на правядзенне сацыялістычнай індустрыялізацыі ў СССР прыняў у **1925 г.** XIV з'езд ВКП(б). Сацыялістычная індустрыялізацыя ў СССР адрознівалася ад



Правообладатель Народная асвета

прамысловай рэвалюцыі ў капіталістычных краінах. На Захадзе яна працягвалася стагоддзі і пачыналася з развіцця лёгкай прамысловасці, якая патрабавала менш фінансавых выдаткаў і забяспечвала атрыманне ў кароткі тэрмін высокага прыбытку. Зароблены капітал накіроўвалі потым у цяжкую прамысловасць. У СССР і БССР індустрыялізацыю патрэбна было ажыццявіць за 10—15 гадоў, і пачыналася яна з цяжкай прамысловасці, што патрабавала вялікіх капітальных укладанняў.

Паколькі краіны Захаду адмовіліся даваць пазыкі і крэдыты СССР, фінансавыя сродкі для індустрыялізацыі прыходзілася шукаць унутры краіны. Гэта прыбытак ад нацыяналізаваных фабрык, заводаў, прадпрыемстваў сувязі, іншых галін гаспадаркі; продажу зерня, лесу і нафтапрадуктаў за мяжу, а таксама карцін, скульптур і іншых мастацкіх каштоўнасцей; скарачэння сродкаў на ўтрыманне кіруючага апарату; усталявання жорсткага рэжыму эканоміі. Былі выкарыстаны золата і серабро, прададзены за мяжу званы, іконы і іншыя царкоўныя каштоўнасці. Уведзена дзяржаўная манаполія на гарэлку, а таксама валютная манаполія, у выніку якой чырвонец пазбавіўся канверціравання і стаў унутранай валютай.

Формамі «перапампоўвання» сродкаў насельніцтва на патрэбы індустрыялізацыі былі недаплата за работу рабочым і служачым, звышпадатак для сялян у выглядзе пераплат за прамысловыя тавары і недаплат па лініі цэн на сельскагаспадарчыя прадукты, прамыя і ўскосныя падаткі (падатак са звароту), эмісія грошай, подпіс на дзяржаўныя пазыкі, канфіскацыя маёмасці і зберажэнняў у заможных сялян, кампаніі ў гарадах па забіранні ў насельніцтва золата і каштоўнасцей.

Ажыццяўленне палітыкі індустрыялізацыі, сацыялістычнай мадэрнізацыі савецкага грамадства адбывалася ва ўмовах планавага кіраўніцтва дзяржаўнай эканомікай. Планы даваенных савецкіх пяцігодак (**1928—1932 гг.** — першая пяцігодка; **1933—1937 гг.** — другая пяцігодка; **1938 — чэрвень 1941 гг.** — незавершаная трэцяя пяцігодка) прадугледжвалі высокія тэмпы развіцця ўсіх галін цяжкай індустрыі з тым, каб як мага хутчэй падняць эканамічную магутнасць і абараназдольнасць СССР, умацаваць незалежнасць краіны ад капіталістычнага свету, садзейнічаць сацыялістычным пераўтварэнням у сельскай гаспадарцы.

**Асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў Беларускай ССР.** Індустрыялізацыя ў БССР з'яўлялася часткай адзінага працэсу індустрыялізацыі ў СССР. Разам з тым яна мела і свае асаблівасці. *Па-першае*, з улікам дастатковых запасаў мясцовай сыравіны, патрэбы ў таварах народнага спажывання, зручных шляхоў зносін і вытворчых традыцый асноўная ўвага ў БССР аддавалася паліўнай, дрэваапрацоўчай, папяровай, гарбарнай, швейнай, абутковай і харчовай прамысловасці. У рэспубліцы былі пабудаваны торфапрадпрыемства «Асінторф» каля Оршы, Бабруйскі і Гомельскі дрэваапрацоўчыя камбінаты, Аршанскі льнокамбінат, фабрыка штучнага валакна ў Магілёве, швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» і панчошна-трыкатажная фабрыка імя Камуністычнага Інтэрнацыянала Моладзі (КІМ) ў Віцебску.



Правообладатель Народная асвета



Завод імя К. Варашылава (да 1930 г. — завод «Энергія»). 1930-я гг.



Мінскі радыёзавод (пазней Мінскі прыборабудаўнічы завод). 1940 г.

*Па-другое*, прыгранічнае становішча БССР, неразведанасць яе прыродных багаццяў, недахоп сыравіны, інжынерна-тэхнічных і рабочых кадраў не дазвалялі разгарнуць буйнамаштабнае будаўніцтва аб'ектаў цяжкай прамысловасці, як гэта рабілася ў іншых рэгіёнах СССР. Тым не менш частка капіталаўкладанняў накіроўвалася на развіццё энергетыкі, машынабудавання і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. У гады даваенных пяцігодак уступілі ў строй Беларуская дзяржаўная раённая электрастанцыя (БелДРЭС), Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання («Гомсельмаш»), Мінскі радыёзавод, магілёўскія трубаліцейны і аўтарамонтны заводы, Гомельскі шкляны і Крычаўскі цэментны заводы. Былі створаны таксама станкабудаўнічыя заводы імя К. Варашылава і імя С. Кірава ў Мінску і станкабудаўнічыя заводы ў Віцебску і Гомелі.

*Па-трэцяе*, з-за недахопу ў рэспубліцы ўласных фінансавых рэсурсаў частку сродкаў на патрэбы індустрыялізацыі выдзяляў урад СССР. З 338 млн руб., укладзеных у прамысловасць БССР за гады першай пяцігодкі, каля $^1/_3$ паступіла з саюзнага бюджэту. З рэспублік Савецкага Саюза ў Беларусь завозілася прамысловае абсталяванне, чорныя і каляровыя металы, каменны вугаль, нафтапрадукты. На новабудоўлях рэспублікі працавалі спецыялісты і рабочыя з Масквы, Ленінграда, Кіева, Харкава, прамысловых цэнтраў Урала. У той жа час тэхнічнае абсталяванне, станкі, зробленыя ў БССР, паступалі на фабрыкі і заводы Масквы, Украіны, Урала.

*Па-чацвёртае*, у БССР былі створаны новыя галіны прамысловасці: паліўная, машынабудаўнічая, радыётэхнічная, хімічная, наладзілася вытворчасць штучнага валакна і трыкатажу. Сфарміраваліся інжынерна-тэхнічныя кадры, выраслі кадры рабочага класа. Мноства спецыялістаў і кваліфікаваных рабочых было падрыхтавана ў прафесійна-тэхнічных навучальных установах, а таксама на фабрыках і заводах.

**Формы працоўнай актыўнасці рабочага класа і іх уплыў на развіццё эканомікі.** Забеспячэнне фабрык і заводаў новай тэхнікай выклікала масавы рух за па-



Правообладатель Народная асвета

вышэнне тэхнічнага ўзроўню рабочага класа шляхам яго навучання ў працэсе працоўнай дзейнасці. Курсы, кружкі, групы па вывучэнні перадавой тэхнікі, а таксама індывідуальнае вучнёўства сталі звычайнай практыкай вытворчых калектываў. Лозунг «Кадры вырашаюць усё» цяпер стаў гучаць так: «Кадры, якія авалодалі тэхнікай, вырашаюць усё».

Масавы *рух за авалоданне новай тэхнікай* даў штуршок разгортванню сацыялістычнага спаборніцтва. Ім была ахоплена большасць рабочага класа. У 1935 г. установлены ордэн «Знак пашаны» — узнагарода для наватараў і перадавікоў вытворчасці.

Яшчэ адной праявай творчай ініцыятывы рабочага класа з'явіўся *стаханаўскі рух*. Ён так названы па прозвішчы яго ініцыятара, данецкага шахцёра Аляксея Стаханава. За начную змену з 30 на 31 жніўня 1935 г. ён высек адбойным малатком 102 т вугалю і перавысіў існаваўшую тады норму ў 14 разоў.

Стаханаўскі рух хутка распаўсюдзіўся ва ўсіх галінах прамысловасці, на транспарце і ў сельскай гаспадарцы. Ён сімвалізаваў добрасумленныя адносіны да працы і садзейнічаў паспяховаму выкананню планавых заданняў другой пяцігодкі. Праца ў СССР станавілася справай гонару, славы, доблесці і геройства. У 1938 г. за выдатныя дасягненні ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве было ўстаноўлена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Гэта была найвышэйшая ў СССР ступень працоўнай адзнакі.

**Вынікі ажыццяўлення індустрыялізацыі ў Беларускай ССР.** У выніку ажыццяўлення індустрыялізацыі СССР стаў адной з пяці краін свету (ЗША, Англія, Францыя, Германія), якія былі здольны вырабляць любы від прамысловай прадукцыі, даступнай тады чалавецтву. Беларуская ССР з аграрнай рэспублікі краіны ператварылася ў рэспубліку з развітой прамысловасцю. З'явіліся новыя галіны прамысловасці. БССР стала індустрыяльна-аграрнай рэспублікай Савецкага Саюза. У 1930-я гг. было ліквідавана беспрацоўе, адменена картачная сістэма на прамысловыя і харчовыя тавары.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *1925 г., 1928—1932 гг., 1933—1937 гг., 1938—1941 гг; індустрыялізацыя.*

### Пытанні і заданні

**1.** Якімі былі прычыны і мэты правядзення індустрыялізацыі ў СССР і БССР? **2.** Чым індустрыялізацыя ў СССР і БССР адрознівалася ад прамысловай рэвалюцыі ў краінах Захаду? Чым былі абумоўлены кароткія тэрміны яе правядзення? **3.** Якія сродкі выкарыстоўваліся для правядзення індустрыялізацыі ў СССР і БССР? **4.** Ахарактарызуйце асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў БССР. Чым яны былі абумоўлены? **5.** Якімі былі вынікі індустрыялізацыі ў БССР? Растлумачце сэнс высновы: «БССР стала індустрыяльна-аграрнай рэспублікай Савецкага Саюза». **6.** Дайце абгрунтаваную ацэнку гістарычнаму факту — індустрыялізацыя ў БССР (гл. *памятку 2*). **7.** З дапамогай дадатковай літаратуры, іншых крыніц інфармацыі высвятліце, якія прадпрыемствы, пабудаваныя ў нашай рэспубліцы ў 1928—1941 гг., дзейнічаюць і сёння.



Правообладатель Народная асвета

### Ваша меркаванне

Якую ролю, на ваш погляд, адыграла сацыялістычнае спаборніцтва ў правядзенні індустрыялізацыі ў БССР? Ці можна разглядаць яго ў якасці аднаго са сродкаў індустрыялізацыі? Чым, на ваш погляд, быў абумоўлены працоўны гераізм савецкіх людзей у той перыяд?

## Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (кнізе «Памяць») звесткі аб прамысловым развіцці вашага краю ў 1928—1941 гг. Падрыхтуйце паведамленні.

Якія галіны прамысловасці развіваліся ў вашым краі ў 1928—1941 гг.? Чым гэта было абумоўлена?

## § 14. КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ССР

**Успомніце. 1.** Якой была пазіцыя бальшавікоў па пытанні аб зямлі? **2.** Назавіце асноўныя ідэі Дэкрэта аб зямлі. **3.** Што такое кааперацыя?

**Прычыны і асаблівасці правядзення калектывізацыі ў БССР.** У Савецкім Саюзе і Беларускай ССР сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў вёсцы ў канцы 1920-х — 1930-я гг. вядомы як ***калектывізацыя сельскай гаспадаркі***. Пад калектывізацыяй сельскай гаспадаркі трэба разумець палітыку Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, якая накіравана на вытворчае кааперавание сялянскіх гаспадарак, іх масавы перавод з індывідуальнай сістэмы гаспадарання на калектыўную. Аб'ектыўна яна была неабходнай для больш поўнага забеспячэння прамысловасці якаснай сельскагаспадарчай сыравінай, а насельніцтва — прадуктамі харчавання, для выкарыстання сельскагаспадарчай тэхнікі і перадавога вопыту ў мэтах павышэння эфектыўнасці гаспадарання, для паляпшэння дабрабыту народа.

Пры распрацоўцы і правядзенні палітыкі калектывізацыі ўлічваліся калектывісцкія традыцыі славянскай вёскі — сялянская абшчына, калектыўная праца на будаўніцтве дарог і мастоў, падчас дапамогі людзям, якія трапілі ў бяду («талака»), а таксама вопыт развіцця кааперацыі ў дарэвалюцыйнай Расіі.

Стварэнне калектыўных гаспадарак пачалося з першых гадоў усталявання савецкай улады. Да 1927 г. у БССР было звыш 400 *арцеляў, камун* і *таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі*, а таксама 213 саўгасаў.

Курс на правядзенне палітыкі калектывізацыі сельскай гаспадаркі распрацаваў XV з'езд ВКП(б) у **1927 г.**

Асноўнай формай вытворчага кааперавання сялянскіх гаспадарак былі прызнаны *калгасы*, у якіх, на думку іх арганізатараў, найбольш поўна спалучаліся гра-



Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

мадскія і асабістыя інтарэсы сялян. Калгасы — гэта буйныя сельскагаспадарчыя вытворчыя кааператывы. Яны павінны былі стварацца на базе калектыўнага гаспадарання і добраахвотнага абагульвання сродкаў вытворчасці, якія меліся ў індывідуальных гаспадарках сялян.

Стварэнню калгасаў, як правіла, папярэднічала арганізацыйная і агітацыйна-прапагандысцкая работа, у працэсе якой стараліся пераканаць сялян у перавагах калектыўнай гаспадаркі перад індывідуальнай і неабходнасці добраахвотнага ўступлення ў калгасы. Дзе было магчыма, у гэтых жа мэтах праводзіліся экскурсіі сялян у бліжэйшыя да вёскі камуны, саўгасы, арцелі, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі. Было зроблена нямала для таго, каб сяляне добраахвотна ўступалі ў калгасы.

Аднак прынцып добраахвотнасці пры арганізацыі калгасаў не заўсёды забяспечваўся. Разам з тым трэба лічыць памылковымі сцвярджэнні некаторых гісторыкаў аб тым, быццам бы ўсё сялянства варожа ставілася да палітыкі калектывізацыі, не жадала ўступаць у калгасы, а яго гвалтам туды заганялі. Адносіны розных пластоў сялянства да калгаснага будаўніцтва былі неаднолькавыя.

Найбяднейшае і частка сярэдняга сялянства станоўча адносілася да калектывізацыі сельскай гаспадаркі і звязвала з ёй сваю будучыню. Большая частка сераднякоў праяўляла палітычную няўстойлівасць, ваганні, стрыманасць, іншы раз варожасць з-за неразумення ці запалохвання з боку кулакоў, баялася прайграць, страціць уласнасць і нічога не атрымаць узамен. На перакананне гэтай часткі насельніцтва і была накіравана перш-наперш агітацыйна-прапагандысцкая работа. Варожа ставілася да калгасаў толькі частка заможнага сялянства, сельская буржуазія, якую ў той час называлі кулакамі.

Пры арганізацыі калгасаў ажыццяўлялася абагульванне сродкаў вытворчасці, якія меліся ў сялянскіх гаспадарках, і на базе гэтага ствараліся непадзельныя фонды калгасаў. Падлягалі абагульванню сеялкі, жняяркі, малатарні, веялкі, плугі, культыватары, бароны, калёсы, іншая сельскагаспадарчая тэхніка, прылады сельскагаспадарчага прызначэння, а таксама коні як цяглавая сіла і пабудовы сельскагаспадарчага прызначэння — гумны, клеці, свірны і інш.

Катэгарычна забаранялася абагульваць жыллёвыя пабудовы сялян і прадметы іх дамашняга ўжытку, кароў, свіней, авечак, іншую жывёлу, а таксама свойскую птушку (курэй, гусей, качак і інш.). Не дазвалялася абагульваць памяшканні для ўтрымання свойскай жывёлы і птушкі. Там, дзе мясцовыя партыйныя і савецкія органы рабілі спробы абагульваць індывідуальную сялянскую маёмасць, мелі месца сур'ёзныя парушэнні прынцыпаў і правіл калектывізацыі сялянскіх гаспадарак, таму што абагульванню належалі толькі сродкі вытворчасці.

**Пераход да суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі і фарсіраванне яе тэмпаў.** Без патрэбных матэрыяльна-тэхнічных і маральна-псіхалагічных умоў у другой палове 1929 — пачатку 1930 г. пачалася *суцэльная калектывізацыя* і



Правообладатель Народная асвета

фарсіраванне яе тэмпаў. На гэта арыентавала пастанова ЦК ВКП(б) ад 5 студзеня 1930 г. «Аб тэмпе калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву». Яна абумовіла выкарыстанне адміністрацыйна-сілавых метадаў у правядзенні калектывізацыі. Сялян часта сталі прымушаць запісвацца ў калгасы, што прывяло да павелічэння колькасных паказчыкаў. Да 1 сакавіка 1930 г. у калгасы было аб'яднана 58 % ад агульнай колькасці сялянскіх гаспадарак Беларусі. Гэта быў самы высокі паказчык калектывізацыі ў першай пяцігодцы.

Рэакцыяй сялянства на фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі і абагульванне рабочай, а нярэдка свойскай жывёлы і птушкі сталі масавы зарэз і продаж жывёлы. Да мая 1930 г. пагалоўе коней і буйной рагатай жывёлы скарацілася больш як на чвэрць. Растлумачальная работа сярод насельніцтва не мела поспеху. Сельская гаспадарка панесла вялікія страты.

**Палітыка дзяржавы ў адносінах да кулакоў.** Пры стварэнні калгасаў савецкая ўлада праводзіла дыферэнцыраваную палітыку ў адносінах да розных пластоў сялянства. Апорай Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы ў вёсцы была бедната і частка сераднякоў (гэтую частку насельніцтва сёння некаторыя гісторыкі па палітыка-ідэалагічных матывах зневажаюць, называюць гультаямі, басотай, люмпенамі). Большую частку сераднякоў, якія праяўлялі палітычную няўстойлівасць і хістанні, партыйныя і савецкія органы стараліся пераканаць у перавагах калектыўнай формы гаспадарання і прыцягнуць на бок савецкай улады.

Рэпрэсіўныя меры прымяняліся да кулакоў, якія вялі забароненую законам антысавецкую і антыкалгасную прапаганду, здзяйснялі тэрарыстычныя акты (забівалі камуністаў, камсамольцаў і сельскіх актывістаў), займаліся шкодніцкай дзейнасцю (знішчалі калгасную маёмасць). Многія з заможных сялян нічога шкоднага не рабілі і пацярпелі толькі таму, што іх аднеслі да катэгорыі кулакоў (гл. *гістарычны дакумент*). Разам з тым нельга агульна называць усіх багатых сялян людзьмі, якіх савецкая ўлада незаслужана карала, крыўдзіла. Толькі са студзеня па красавік 1930 г. у БССР было зафіксавана 519 антысавецкіх кулацкіх выступленняў.

Улічваючы палітычную пазіцыю і шкодніцкую дзейнасць кулацтва, а таксама факт суцэльнай калектывізацыі, была распрацавана новая палітыка ў адносінах да заможнай часткі сялянства. Гэта была *палітыка ліквідацыі кулацтва як класа на аснове суцэльнай калектывізацыі.*

Сэнс дадзенай палітыкі заключаўся ў тым, каб пазбавіць кулакоў сродкаў вытворчасці і магчымасці эксплуатаваць сялян, а таксама перавыхаваць іх шляхам далучэння да прадукцыйнай працы. Разам з тым раскулачванне іншы раз праводзілася ў жорсткай форме. У многіх месцах яно набывала характар прамога рабавання і глумлення над асобай селяніна, распальвання нізкіх страсцей бядняцкіх пластоў вёскі, якім даставалася частка маёмасці раскулачаных. Кулакоў дзяржаўная прапаганда нярэдка паказвала як ворагаў, якіх трэба знішчаць. Кулак быў фактычна пастаўлены па-за законам.



Правообладатель Народная асвета

Непазбежным вынікам паспешлівасці, фарсіравання тэмпаў калектывізацыі сталі перагібы і памылкі ў калгасным руху. 14 сакавіка 1930 г. з’явілася пастанова ЦК ВКП(б) «Аб барацьбе са скрыўленнямі партлініі ў калгасным руху». Пачаўся развал штучна створаных калгасаў. Да жніўня 1930 г. большасць сялянскіх гаспадарак выйшла з калгасаў.

Сярод памылак былі парушэнні прынцыпу добраахвотнасці пры ўступленні сялян у калгасы; празмернае падаткаабкладанне індывідуальных сялянскіх гаспадарак, з-за чаго іх вядзенне губляла ўсялякі сэнс; забарона самастойнага перасялення ў іншыя месцы і продажу сялянскай маёмасці пад пагрозай яе поўнай канфіскацыі. У шэрагу выпадкаў раскулачванне праводзілася не на аснове суцэльнай калектывізацыі і закранала серадняка. Замест калгасаў (арцеляў) як асноўнай формы калгаснага будаўніцтва нярэдка ствараліся камуны, у якіх абагульваліся каровы і дробная жывёла сялян. Закрываліся таксама мясцовыя рынкі, разбураліся ўстановы рэлігійнага культу.

**Вынікі калгаснага будаўніцтва.** Масіраваная палітыка-ідэалагічная і арганізацыйная работа, жорсткая падатковая палітыка і іншыя меры спрыялі пашырэнню калектывізацыі. У 1935 г. у калгасах налічвалася 85,6 % сялянскіх гаспадарак, у 1939 г. — больш за 90 %. На ўсёй тэрыторыі рэспублікі дзейнічалі машынна-трактарныя станцыі (МТС), у якіх канцэнтравалася сельскагаспадарчая тэхніка, працавалі інжынеры, тэхнікі і механізатары. МТС забяспечвалі механізацыю сельскагаспадарчых вытворчых працэсаў у калгасах і саўгасах. У канцы 1930-х гг. на калгасных палях працавала больш за 9 тыс. трактароў, сотні камбайнаў і шмат іншай сельскагаспадарчай тэхнікі. Ішоў працэс арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў, стварэння вытворчых брыгад і звенняў, ссялення хутарскіх гаспадарак у калгасныя цэнтры.

Разам з тым у 1920—1930-я гг. большую частку фінансавых і матэрыяльных рэсурсаў, лепшыя кадры дзяржава выкарыстоўвала для правядзення палітыкі сацыялістычнай індустрыялізацыі і ўмацавання абараназдольнасці СССР. Сельская гаспадарка фінансавалася па рэшткавым прынцыпе, развівалася галоўным чынам за кошт мізэрных уласных сродкаў.

У сучаснай гістарычнай літаратуры нярэдка негатыўна ацэньваецца калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Але нельга адмаўляць і замоўчваць тое, што ка-



Трактарная калона «Інтэрнацыянал»



Дыскаванне глебы. Сельгаскамуна імя Беларускай ваеннай акругі



Правообладатель Народная асвета

лектывізацыя забяспечвала «перапампоўванне» часткі сродкаў сельскай гаспадаркі ў прамысловасць і высокія тэмпы індустрыялізацыі краіны. Механізацыя сельскагаспадарчых работ вызваліла дзясяткі тысяч рабочых рук, якія выкарыстоўваліся ў працэсе індустрыялізацыі. Яна дазволіла стабілізаваць становішча ў аграрным сектары эканомікі, павысіць прадукцыйнасць працы, павялічыць вытворчасць збожжа, ільновалакна, бульбы, малака і іншай прадукцыі пры змяншэнні колькасці занятых у сельскай гаспадарцы.

Стварэнне буйных высокапрадукцыйных і высокатаварных сельскагаспадарчых кааператываў, фермерскіх гаспадарак, агракамбінатаў, аграфірм і г. д., здольных забяспечыць прамысловасць сыравінай, а насельніцтва — прадуктамі харчавання, стала магістральным шляхам развіцця сельскай гаспадаркі ва ўсім свеце. У гэтым сэнсе калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў СССР і БССР адлюстроўвала тэндэнцыі сусветнага развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *1927 г., калектывізацыя сельскай гаспадаркі.*

### Пытанні і заданні

**1.** Дайце азначэнне паняцця *калектывізацыя сельскай гаспадаркі* (гл. *памятку 7*). З якой мэтай праводзілася калектывізацыя? **2.** Што такое калгасы? Як адносіліся да іх розныя пласты сялянства? **3.** Растлумачце, што такое палітыка суцэльнай калектывізацыі. **4.** Раскрыйце прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі: а) суцэльная калектывізацыя сельскай гаспадаркі і палітыка ліквідацыі кулацтва як класа; б) суцэльная калектывізацыя сельскай гаспадаркі і правядзенне індустрыялізацыі. **5.** Назавіце памылкі, якія былі допушчаны пры правядзенні калектывізацыі. **6.** Ахарактарызуйце вынікі калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР.

## Ваша меркаванне

Дайце ўласную абгрунтаваную ацэнку калектывізацыі сельскай гаспадаркі (гл. *памятку 2*).

## Гістарычны дакумент

### З пастановы СНК СССР ад 21 мая 1929 г. аб прыкметах кулацкіх гаспадарак

«1. …К кулацким хозяйствам относятся все крестьянские хозяйства, обладающие одним из следующих признаков:

а) если хозяйство систематически применяет наемный труд для сельскохозяйственных работ или в кустарных промыслах и на предприятиях, за исключением случаев применения наемного труда в тех пределах, в которых оно, согласно законодательству о выборах в Советы, не влечет за собой лишения избирательских прав;



Правообладатель Народная асвета

б) если в хозяйстве имеется мельница, маслобойня, крупорушка, просорушка, волночесалка, шерстобитка, терочное заведение, картофельная, плодовая или овощная сушилка или другое промышленное предприятие — при условии применения в этих предприятиях механического двигателя, а также, если в хозяйстве имеется водяная или ветряная мельница;

в) если хозяйство систематически сдает внаем сложные сельскохозяйственные машины с механическими двигателями;

г) если хозяйство сдает внаем постоянно или на сезон отдельные оборудованные помещения под жилье или предприятие;

д) если члены хозяйства занимаются торговлей, ростовщичеством, коммерческим посредничеством или имеют другие нетрудовые доходы (в том числе служители культа).

Советам Народных Комиссаров союзных республик и краевым (областным) исполнительным комитетам предоставляется право видоизменять указанные признаки применительно к местным условиям…»

## Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (кнізе «Памяць») звесткі аб правядзенні калектывізацыі ў вашым краі. Падрыхтуйце паведамленне.

## § 15. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў КАНЦЫ 1920-х — 1930-я гг.

**Успомніце. 1.** Што такое палітычная сістэма? Якія яе функцыі? **2.** Назавіце прыкметы прававой дзяржавы. (*Выкарыстайце веды з курса грамадазнаўства.*)

**Фарміраванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы.** У 1930-я гг. новым стаў адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел СССР і саюзных рэспублік. Акругі былі ліквідаваны, і ўся тэрыторыя Беларусі дзялілася на *вобласці, раёны* і *сельсаветы*.

У 1930-я гг. была сфарміравана палітычная сістэма беларускага грамадства. Яе ядром з’яўлялася *Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б)* — састаўная частка *Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў) (ВКП(б))*. Пад яе кіраўніцтвам працавалі органы дзяржаўнай улады і кіравання, а таксама грамадскія арганізацыі. Яна вызначала асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі, арганізоўвала іх выкананне, кантралявала ўсю піраміду ўлады.

У 1932—1937 гг. беларускую партыйную арганізацыю ўзначальваў накіраваны з Масквы савецкі партыйны і ваенны дзеяч ***М. Гікала***.



Правообладатель Народная асвета

## Гістарычны партрэт



**Гікала Мікалай Фёдаравіч** (1897—1938). У 1918 г. з'яўляўся старшынёй Грозненскага Савета, камандуючым часцямі Чырвонай Арміі ў г. Грозным. У час барацьбы з войскамі А. Дзянікіна камандаваў партызанскім атрадам, а потым групай паўстанцкіх войскаў Церскай вобласці. З 1922 г. сакратар Горскага абкама РКП(б), загадчык агітацыйна-прапагандысцкага аддзела і сакратар Паўночна-Каўказскага крайкама партыі. Працаваў сакратаром ЦК КП(б) Узбекістана і ЦК КП(б) Азербайджана. З 1930 г. сакратар Маскоўскага гаркама партыі. У 1932 г. выбраны першым сакратаром ЦК КП(б) Беларусі. Быў членам Прэзідыума ЦВК БССР, Рэўваенсавета Беларускай ваеннай акругі. У Мінску яго імем названа вуліца.

Вышэйшым органам заканадаўчай улады ў БССР, у адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР 1937 г., стаў *Вярхоўны Савет БССР* (раней — Усебеларускі з'езд Саветаў і выбраны ім Цэнтральны выканаўчы камітэт БССР). У 1924—1937 гг. Цэнтральны выканаўчы камітэт Беларускай ССР узначальваў выдатны беларускі партыйны і дзяржаўны дзеяч ***А. Чарвякоў***.

Вышэйшым органам выканаўчай улады з'яўляўся *Савет народных камісараў БССР*, а ў абласцях, гарадах, раёнах і сельсаветах — *выканаўчыя камітэты* адпаведных Саветаў. У 1927—1937 гг. Савет народных камісараў Беларускай ССР узначальваў партыйны і дзяржаўны дзеяч ***М. Галадзед***.

## Гістарычны партрэт



**Галадзед Мікалай Мацвеевіч** (1894—1937) нарадзіўся ў в. Стары Крывец Навазыбкаўскага павета Чарнігаўскай губерні. У дзяцінстве парабкаваў. Да рэвалюцыйнага руху далучыўся на шахтах Крывога Рога. У гады Першай сусветнай вайны вёў бальшавіцкую прапаганду ў арміі. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. з'яўляўся членам салдацкіх камітэтаў на Паўднёва-Заходнім фронце. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. У 1918—1923 гг. на савецкай рабоце ў Навазыбкаўскім і Горацкім паветах. З 1924 г. член Часовага Беларускага бюро ЦК РКП(б), з 1925 г. другі сакратар ЦК КП(б) Беларусі. У 1927—1937 гг. працаваў Старшынёй Саўнаркама Беларускай ССР. Яго імем названа вуліца ў Мінску.



Правообладатель Народная асвета

Была пабудавана вертыкаль судовай улады, якая пачыналася ад *Вярхоўных судоў СССР* і *БССР* і заканчвалася *гарадскімі* і *раённымі судамі*. Разам з тым пры Народных камісарыятах унутраных спраў СССР і БССР, створаных у 1934 г. на базе АДПУ (Аб’яднанае дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне) СССР і ДПУ БССР, дзейнічалі пазасудовыя органы — *Асобыя нарады*. Існавала яшчэ адна пазасудовая ўстанова — *«тройкі»*, якія мелі права выносіць судовыя рашэнні аж да пакарання смерцю.

У 1932—1933 гг. у СССР і БССР быў уведзены *пашпартны рэжым*. Пашпарты ўводзіліся для жыхароў гарадоў, рабочых пасёлкаў, раённых цэнтраў, новабудоўляў, саўгасаў, МТС, прыгранічных зон, абаронных аб’ектаў і інш. Сельскія жыхары (калгаснікі) пашпартоў не атрымлівалі і ўлічваліся па спісах, якія вялі сельсаветы. Калгаснікі маглі прымацца на працу ў гарадах толькі пры наяўнасці ў іх даведкі ад праўлення калгаса аб яго згодзе на адыход калгасніка. Па сутнасці, правы калгаснікаў былі абмежаваны. Яны прымацоўваліся да калгаса, які вызначаў іх лёс, іх будучае.

Рэальная палітычная ўлада канцэнтравалася ў партыйных органах. Саветы ў 1930-я гг. толькі фармальна лічыліся палітычнай асновай грамадства. Іх дзейнасць абмяжоўвалася ў асноўным рашэннем гаспадарчых і культурна-асветніцкіх задач. Што тычыцца сельскіх саветаў, то многія з іх заставаліся ўбаку ад правядзення калектывізацыі сялянскіх гаспадарак. Гэта выклікала ў некаторых партыйных кіраўнікоў скептыцызм адносна іх неабходнасці ў сельскай мясцовасці. Але прапановы аб замене сельсаветаў праўленнямі калгасаў не прайшлі. Перад саветамі ўсіх узроўняў была пастаўлена задача «павярнуцца тварам да ўдарніцтва ў прамысловасці і калгаснага будаўніцтва ў вёсцы».

У 1930-я гг. узмацнялася *цэнтралізацыя ў кіраўніцтве краінай*, фарміраваўся магутны рэпрэсіўны апарат. Насаджаліся *адміністрацыйна-дырэктыўныя метады кіравання*, што абмяжоўвала ініцыятыву і прадпрымальнасць кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўзмацняла бюракратызм дзяржаўных структур. *Павышалася роля партыйна-дзяржаўнага апарату*.

Грамадскія арганізацыі Беларусі сваю дзейнасць па-ранейшаму бачылі ў выкананні задач, якія былі пастаўлены дзяржавай. *Камсамольцы*, напрыклад, былі ўдарнай сілай савецкіх новабудоўляў. Сваёй гераічнай працай яны забяспечвалі поспехі індустрыялізацыі, дасягалі вышынь у навуцы, адукацыі і культуры, добра зарэкамендавалі сябе ў арміі і дзяржаўным апараце. Прафсаюзныя арганізацыі займаліся рэгуляваннем працоўных адносін і заработнай платы, разам з дырэкцыямі і партыйнымі камітэтамі прымалі адказныя рашэнні па вытворчых справах.

Разам з тым ва ўмовах цэнтралізацыі ў кіраўніцтве краінай з другой паловы 1930-х гг. сфера дзейнасці камсамола абмяжоўвалася выхаваннем моладзі, вытворчай і культурна-асветніцкай работай. *Прафсаюзы* пазбавіліся права заключэння калектыўных дагавораў з адміністрацыяй прадпрыемстваў як формы рэгулявання



Правообладатель Народная асвета

заработнай платы. Знікае так званы «трохвугольнік», калі, акрамя дырэктара, у прыняцці рашэння па вытворчых пытаннях прымалі ўдзел партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі прадпрыемстваў. Актыўнасць грамадскіх арганізацый, іх удзел у грамадска-палітычным жыцці Беларусі ў параўнанні з 1920-мі гг. паступова зніжаліся.

**Палітычныя рэпрэсіі.** Курс на будаўніцтва сацыялістычнага грамадства пахаваў надзеі на рэстаўрацыю капіталізму. У 1920-я гг. у савецкім грамадстве абвастрыліся супярэчнасці па пытаннях аб кірунках грамадска-палітычнага развіцця краіны і шляхах пабудовы сацыялізму ў СССР. У вельмі жорсткай форме разгарнулася барацьба супраць праціўнікаў палітычнага курсу Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. У гістарыяграфіі гэтая барацьба вядома пад назвай *палітычныя рэпрэсіі* (ад познелац. *repressio* — падаўленне, карная мера, пакаранне).

Пытанне, чаму адбываліся рэпрэсіі, іх сапраўдныя прычыны ў гістарыяграфіі асвятляюцца з рознай ступенню аргументаванасці. Гісторыкі маюць розныя меркаванні па гэтым пытанні (гл. *дадатковы матэрыял*).

Пачатак палітычных рэпрэсій у Беларусі прыпадае на мяжу 1920—1930-х гг., самая вялікая колькасць рэпрэсій — на другую палову 1930-х гг.

З канца 1920-х гг. пачынаюцца палітычныя рэпрэсіі па абвінавачванні ў так званым «нацыянал-дэмакратызме». З 826 чалавек, якія праходзілі па спісе ўдзельнікаў беларускага нацыянальнага руху 1917—1924 гг., былі рэпрэсіраваны ўсе, хто застаўся пражываць на тэрыторыі СССР. Што ж такое нацыянал-дэмакратызм?

***Нацыянал-дэмакратызм*** — кірунак грамадска-палітычнай думкі, які спалучае агульнадэмакратычныя ідэі і мэты з задачамі сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення прыгнечаных народаў. У Беларусі канца XIX — пачатку XX стст. нацыянал-дэмакратызм уяўляў сабой ідэалогію і практыку беларускіх нацыянальных дзеячаў, накіраваную на стварэнне суверэннай беларускай нацыянальнай дзяржавы на буржуазнай аснове, усебаковае развіццё беларускай культуры і мовы, завяршэнне працэсу фарміравання беларускай нацыі, павышэнне нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа. У другой палове 1920-х гг. Камуністычнай партыяй і савецкай уладай нацыянал-дэмакратызм быў абвешчаны кулацкім ухілам, контррэвалюцыйнай плынню, варожай, антысавецкай ідэалогіяй і практыкай. Такія абвінавачанні выліліся ў расправу над беларускімі нацыянальнымі дзеячамі. Яскравым прыкладам з'яўляецца сфабрыкаваная ў 1930 г. справа аб так званым «Саюзе вызвалення Беларусі», па якой было арыштавана 108 чалавек. Быў сфабрыкаваны таксама шэраг іншых спраў, па якіх да крымінальнай адказнасці прыцягнуты і асуджаны многія прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі.

Людзей арыштоўвалі і каралі за «контррэвалюцыйную агітацыю», «шкодніцтва ў калгасах і на прадпрыемствах», «удзел у антысавецкіх, шкодніцка-дыверсійных, шпіёнска-тэрарыстычных і паўстанцкіх арганізацыях», «шпіянаж на карысць замежных краін», «тэрарыстычныя намеры супраць кіраўнікоў партыі і ўрада» і інш.



Правообладатель Народная асвета

Значная колькасць арыштаваных асуджалася да расстрэлу. Пры гэтым многія справы былі сфальсіфікаванымі, віна асуджаных не была даказана. Нярэдка следства суправаджалася здзекамі і катаваннямі, калі арыштаваных прымушалі прызнавацца ў злачынствах, якіх яны не рабілі. Законнасць груба парушалася. Даносы, паклёпы, абгаворы сталі звычайнай з'явай.

У выніку пацярпела шмат зусім нявінных людзей — партыйных і дзяржаўных работнікаў, дзеячаў навукі, літаратуры і мастацтва, духавенства, працаўнікоў. З сярэдзіны 1950-х гг. да сярэдзіны 1990-х гг. у Беларусі было рэабілітавана больш за 160 тыс. грамадзян, якія пацярпелі ад палітычных рэпрэсій. Разам з тым дзясяткі мільёнаў ахвяр палітычных рэпрэсій у СССР, пра якія расказваецца ў публікацыях апошніх дзесяцігоддзяў, не што іншае, як міф, запушчаны ў грамадскую свядомасць для дыскрэдытацыі сацыялістычнай сістэмы. Патрабуюцца намаганні і час для навуковай распрацоўкі праблемы палітычных рэпрэсій з тым, каб падобнае больш нідзе і ніколі не паўтарылася.

**Канстытуцыя БССР 1937 г.** 19 лютага **1937 г.** Надзвычайным XII Усебеларускім з'ездам Саветаў была прынята *трэцяя Канстытуцыя Беларускай ССР*. У ёй было запісана, што БССР — сацыялістычная дзяржава рабочых і сялян, палітычную аснову якой складаюць Саветы дэпутатаў працоўных, а эканамічную аснову — сацыялістычная сістэма гаспадаркі і сацыялістычная ўласнасць у дзвюх формах: дзяржаўнай і кааператыўна-калгаснай. Вышэйшым органам дзяржаўнай улады і адзіным заканадаўчым органам быў прызнаны Вярхоўны Савет Беларускай ССР, а вышэйшым выканаўчым і распарадчым органам — Савет народных камісараў Беларускай ССР. Мясцовымі органамі дзяржаўнай улады з'яўляліся абласныя, раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах, пасялковыя і сельскія Саветы дэпутатаў працоўных і іх выканаўчыя камітэты.

**Канфесійная палітыка Савецкай дзяржавы.** У пачатку 20-х гг. на тэрыторыі Усходняй Беларусі дзейнічала каля 1500 праваслаўных храмаў. Савецкая ўлада разгарнула жорсткую і бязлітасную барацьбу з царквою. Яна лічыла, што права на існаванне мае толькі марксісцка-ленінская ідэалогія, і ніякая іншая. Зачыняліся царкоўныя навучальныя ўстановы, канфіскоўвалася царкоўная маёмасць, зачыняліся і разбураліся храмы — бясцэнныя архітэктурныя помнікі, знішчаліся шэдэўры іканапісу, кнігі. Праводзіліся рэпрэсіі супраць духавенства і актыўных вернікаў.

Савецкая ўлада спрыяла развіццю сектанцтва і ўнутры праваслаўнай царквы арганізоўвала расколы. У 1920—1930-я гг. шырокае распаўсюджанне ў царкоўным жыцці Беларусі атрымала *«абнаўленства»* — апазіцыйная рэлігійная плынь, накіраваная на абнаўленне, мадэрнізацыю рэлігійнага культу, а фактычна на разбурэнне кананічнай праваслаўнай царквы (самаліквідавалася пасля 1945 г.). Акрамя таго, духавенства Мінскай епархіі ў 1927 г. заявіла аб абвяшчэнні *аўтакефаліі (адміністрацыйнай самастойнасці)* Беларускай Праваслаўнай Царквы. У 1929 г. ва Усходняй Беларусі дзейнічалі 1122 храмы, з якіх 423 храмы кананіч-



Правообладатель Народная асвета

най царквы, 386 храмаў знаходзілася ў падпарадкаванні епіскапаў-аўтакефалістаў і 313 храмаў належалі абнаўленцам.

У *1929 г.* у Беларускай ССР шырокі размах набыла антырэлігійная прапаганда. У гэтым годзе быў створаны Беларускі антырэлігійны ўніверсітэт. У Мінску прайшоў першы Усебеларускі з'езд бязбожнікаў. Пачаліся масавыя арышты духавенства, якія суправаджаліся закрыццём храмаў. Да пачатку 1932 г. колькасць праваслаўных цэркваў скарацілася да 500, а пасля 1933 г. як вынік масавых рэпрэсій супраць духавенства колькасць дзеючых храмаў зменшылася да некалькіх дзясяткаў. З лета 1939 да лета 1941 г. праваслаўнае богаслужэнне ва Усходняй Беларусі нідзе не праводзілася.

Каталіцкая царква ва Усходняй Беларусі, як і іншыя канфесіі, таксама падвярглася рэпрэсіям. Па абвінавачванні ў шкодніцка-падрыўной дзейнасці на карысць Польшчы было арыштавана шмат прадстаўнікоў каталіцкага духавенства, многія з якіх былі расстраляны. Да 1937 г. дзейнічала толькі 11 касцёлаў.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *1937 г.; нацыянал-дэмакратызм.*

### Пытанні і заданні

**1.** Ахарактарызуйце грамадска-палітычную сістэму БССР у 1930-я гг. **2.** Якой была роля грамадскіх арганізацый у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі ў 1930-я гг.? **3.** З дапамогай розных крыніц інфармацыі падрыхтуйце паведамленне аб дзейнасці Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі ў 1920—1930-я гг. **4.** Што такое палітычныя рэпрэсіі? Якія меркаванні выказваюцца сучаснымі гісторыкамі аб прычынах палітычных рэпрэсій у СССР і БССР? (*Выкарыстайце дадатковы матэрыял.*) **5.** Калі была прынята трэцяя Канстытуцыя БССР? Якім чынам у ёй замацавана пабудова ў БССР сацыялістычнага грамадства? (*Выкарыстайце гістарычны дакумент.*) **6.** З дапамогай дадатковай літаратуры падрыхтуйце паведамленні аб М. Галадзедзе і М. Гікале. Дайце ацэнку іх дзейнасці (гл. *памятку 3*).

### Ваша меркаванне

Ці можна характарызаваць БССР у 1930-я гг. як прававую дзяржаву? Сваю думку абгрунтуйце (гл. *памятку 8*). Выкарыстайце веды з курса грамадазнаўства.

### Дадатковы матэрыял

#### Меркаванні гісторыкаў аб прычынах палітычных рэпрэсій

Частка гісторыкаў сцвярджае, што палітычныя рэпрэсіі былі вынікам выдатна спланаваных «зверху» мерапрыемстваў, якія праводзіліся ў маштабе дзяржавы. Кіраўніцтва СССР з дапамогай рэпрэсіўнай палітыкі вырашала задачы вызвалення партыйнага і дзяржаўнага апарату ад сапраўды недастойных чыноўнікаў, падаўлення мясцовага сепаратызму і забеспячэння безумоўнай улады цэнтра.



Правообладатель Народная асвета

Другая група гісторыкаў, у тым ліку і замежных, пісала аб тым, што І. Сталін напярэдадні Другой сусветнай вайны жорстка расправіўся з «пятай калонай» (чужаземнай агентурай, якая дзейнічала на тэрыторыі СССР) і гэтым самым умацаваў бяспеку ўласнай дзяржавы. Ініцыятыва ў ажыццяўленні рэпрэсій ішла «знізу», ад мясцовых партыйных і савецкіх кіраўнікоў. У І. Сталіна не было пэўных намераў ажыццявіць «вялікую чыстку». Наконт неабходнасці рэпрэсій В. Молатаў гаварыў: «Мы абавязаны 1937 году тым, што ў нас у час вайны не было “пятай калоны”».

Трэцяя група гісторыкаў сцвярджае, што рэпрэсіі мелі эканамічную аснову. Кіраўніцтва СССР не спраўлялася з рашэннем народнагаспадарчых задач і выйсце бачыла ў шырокім выкарыстанні ў індустрыяльным развіцці краіны таннай працы зняволеных у турмах. Менш пераканаўчай можна лічыць думку, што рэпрэсіўная палітыка тлумачылася бояззю дзяржаўных кіраўнікоў страціць уладу, а таму і здзяйсняліся крывавыя злачынствы.

Чацвёртая група гісторыкаў звязвае рэпрэсіі з нецярпімасцю партыйных і дзяржаўных структур да іншадумства, з традыцыямі шальмавання палітычных апанентаў, з культывацыяй насілля і прымусу, з практыкай перакладвання ўласных памылак на плечы «ворагаў» і «шкоднікаў».

І, нарэшце, ёсць нямала гісторыкаў, якія спасылаюцца на марксісцка-ленінскую тэорыю і пішуць пра насілле бальшавікоў як «павівальную бабку любой рэвалюцыі» і як вынік класавай барацьбы, пра жаданне бальшавікоў знішчыць патэнцыяльную небяспеку контррэвалюцыі, разграміць сацыяльныя пласты грамадства, якія маглі ўзяць рэванш за паражэнне ў Грамадзянскай вайне.

## Гістарычны дакумент

### З Канстытуцыі БССР 1937 г.

**Статья 2.** Политическую основу БССР составляют Советы депутатов трудящихся, выросшие и окрепшие в результате свержения власти помещиков и капиталистов, завоевания диктатуры пролетариата, освобождения белорусского народа от национального гнета царизма и русской империалистической буржуазии и разгрома белорусской националистической контрреволюции.

**Статья 4.** Экономическую основу БССР составляют социалистическая система хозяйствования и социалистическая собственность на орудия и средства производства, утвердившиеся в результате ликвидации капиталистической системы хозяйства, отмены частной собственности на орудия и средства производства и уничтожения эксплуатации человека человеком.



Правообладатель Народная асвета

## § 16. АДУКАЦЫЯ І НАВУКА Ў КАНЦЫ 1920-х — 1930-я гг.

**Успомніце.** Назавіце асноўныя дасягненні ў развіцці адукацыі і навукі ў БССР у 1920-я гг.

**Змены ў сістэме адукацыі. Увядзенне ўсеагульнай пачатковай адукацыі.** У 1930-я гг. у сістэме народнай адукацыі адбыліся значныя змены. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі была створана сістэма навучання, якая знішчыла вучэбныя прадметы і класна-ўрочную сістэму. Вучэбны матэрыял групаваўся ў тры блокі (комплексы): «прырода», «праца», «грамадства». Пануючым метадам навучання школьнікаў з'яўляўся брыгадна-лабараторны метад. Вучэбныя класы называліся групамі, вучні групы дзяліліся на брыгады на чале з брыгадзірам. Брыгада калектыўна працавала на прадпрыемстве, калектыўна авалодвала ведамі, а за членаў брыгады (вучняў) адказваў настаўнік-брыгадзір. Асабістая адказнасць за вучобу фактычна адсутнічала.

У 1930-я гг. у школах БССР, як і ўсёй краіны, была адноўлена класна-ўрочная сістэма навучання з вучэбнымі прадметамі і асабістай адказнасцю вучняў за сваю працу. Вучэбныя групы зноў пачалі называцца класамі. Павышалася роля педагога ў навучанні і выхаванні моладзі.

У 1930-я гг. працягвалася работа па ўвядзенні *ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання* і паступовым пераходзе да сямігадовага навучання. У выніку ў 1931/1932 навучальным годзе ў БССР амаль 98 % усіх дзяцей ва ўзросце 8—11 гадоў навучаліся ў 1—4-х класах пачатковай школы. У гарадах, прамысловых цэнтрах і 17 раёнах рэспублікі ў 5-м класе навучалася 96 % дзяцей адпаведнага ўзросту. Такім чынам, *у канцы першай пяцігодкі быў завершаны пераход да ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання* і працягвалася работа па паступовым увядзенні ўсенавуча на базе сямігадовай школы.

У гады другой пяцігодкі Беларуская ССР зрабіла вялікі крок наперад у ажыццяўленні ўсеагульнага сямігадовага навучання і ў развіцці сярэдняй адукацыі. У канцы пяцігодкі працавала 7 тыс. школ, у якіх вучылася больш за 1 млн чалавек.

З 1932 г. пачалося паступовае *ператварэнне сямігадовай школы ў сярэднюю*. У агульнаадукацыйных школах ствараліся 8—10-я класы. Сярэдняя школа набыла дакладную і сталую структуру: *пачатковая школа* (1—4-я класы), *няпоўная сярэдняя школа* (1—7-я класы), *сярэдняя школа* (1—10-я класы). У 1935 г. пачалася адмена абмежаванняў для дзяцей былых эксплуататарскіх класаў пры прыёме ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Перад навучальнымі ўстановамі была пастаўлена задача ўзбройваць моладзь глыбокімі і трывалымі ведамі асноў навук, ажыццяўляць выхаванне грамадзяніна і патрыёта.

XVIII з'езд ВКП(б) у 1939 г. паставіў задачу ажыццяўлення ўсеагульнага сярэдняга навучання ў горадзе і завяршэння пераходу да ўсеагульнага сямігадовага навучання ў вёсцы і ва ўсіх нацыянальных рэспубліках.

Працягвалася *работа па ліквідацыі непісьменнасці дарослага насельніцтва*. У гэтай рабоце прымалі ўдзел калектывы фабрык і заводаў, калгасаў і саў-



Правообладатель Народная асвета

гасаў, арганізацый і ўстаноў, настаўнікі, студэнты, школьнікі, усе пісьменныя людзі. У выніку колькасць пісьменнага насельніцтва БССР ва ўзросце дзевяці гадоў і старэй (без уліку заходніх абласцей) павысілася з 53 % у 1926 г. да амаль 79 % у 1939 г. Такім чынам, *масавая непісьменнасць у БССР была ліквідавана.*

Але поўнасцю пераадолець непісьменнасць да канца 1930-х гг. не ўдалося. Значная частка дарослага насельніцтва (асабліва жыхароў вёскі, пераважна жанчын) не вучылася. У 1939 г. Саўнаркам БССР прыняў спецыяльную пастанову, у якой была пастаўлена задача завяршэння ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці ў рэспубліцы.

Далейшае развіццё атрымала *вышэйшая школа*. Усяго ў канцы другой пяцігодкі ў 23 вышэйшых навучальных установах БССР вучылася каля 15 тыс. студэнтаў. За гады сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР было падрыхтавана больш за 40 тыс. спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Сярод іх — настаўнікі, урачы, інжынеры, эканамісты, аграномы, юрысты, прадстаўнікі іншых прафесій.

Значнае развіццё атрымала *сярэдняя спецыяльная адукацыя*. Былі створаны новыя сельскагаспадарчыя, індустрыяльныя, педагагічныя, медыцынскія і іншыя навучальныя ўстановы. У 1939/1940 навучальным годзе ў БССР працавалі 102 тэхнікумы, у якіх налічвалася каля 34 тыс. навучэнцаў.

Кадры кваліфікаваных рабочых рыхтавалі *прафесійныя школы* і *школы фабрычна-заводскага вучнёўства*. Ажыццяўлялася таксама вытворча-тэхнічнае навучанне на фабрыках і заводах без адрыву ад вытворчасці.

**Развіццё навукі. Беларуская акадэмія навук. Вучоныя — ураджэнцы Беларусі.** Цэнтрам навуковага жыцця з'яўлялася *Беларуская акадэмія навук*. У канцы 1930-х гг. у рэспубліцы працавала 40 навукова-даследчых устаноў, у якіх налічвалася каля 1,5 тыс. навуковых супрацоўнікаў.

Вучоныя Я. Афанасьеў, М. Дарожкін, М. Прыляжаеў, У. Шкатэлаў, А. Кедраў-Зіхман, Ц. Годнеў, М. Гайдукоў і іншыя займаліся пошукам карысных выкапняў, гідраэнергетычных рэсурсаў, даследаваннем праблем арганічнай і неарганічнай хіміі, батанікі, павышэння ўраджайнасці. Яны вывадзілі новыя гатункі збожжавых і бабовых культур, бульбы.



В. Шчарбакоў

Распрацоўваліся важныя пытанні гісторыі, беларускай мовы і літаратуры, філасофіі і эканомікі. Беларускія археолагі вывучалі археалагічныя помнікі ў басейне Дняпра, Сожа і Заходняй Дзвіны. Іх работы прывялі да адкрыцця ў Беларусі стаянак верхняга палеаліту, пашырылі веды аб яе насельніцтве ў эпоху жалеза. Гісторыкі У. Пічэта, В. Шчарбакоў і іншыя апублікавалі работы па гісторыі эпохі феадалізму і капіталізму, Кастрычніцкай рэвалюцыі



Правообладатель Народная асвета



О. Шміт



А. Чыжэўскі

ў Беларусі. Плённа працавалі ў галіне гісторыі Старажытнага Усходу М. Нікольскі, усеагульнай гісторыі — У. Перцаў.

Талент, веды і шматгранную працу прысвяцілі савецкай навуцы многія ўраджэнцы Беларусі. Буйны вучоны ў галіне матэматыкі, геафізікі, астраноміі і геаграфіі ***О. Шміт*** з'яўляўся адным з арганізатараў і ўдзельнікаў асваення Паўночнага марскога шляху. Упершыню ў СССР ён даследаваў матэматычныя законы грашовай эмісіі, даў матэматычнае абгрунтаванне наяўнасці жалезных руд на Курскай магнітнай анамаліі, сфармуляваў новую тэорыю «халоднага» ўтварэння Зямлі і планет з дапланетнага газапылавога воблака. У 1920—1930-я гг. О. Шміт даследаваў ледавікі Паміра, узначальваў экспедыцыі на ледаколе «Г. Сядоў» на Зямлю Франца-Іосіфа, на параходзе «Чалюскін», на ледаколе «Сібіракоў» упершыню за адну навігацыю прайшоў увесь Паўночны марскі шлях. Ён стаў Героем Савецкага Саюза, акадэмікам АН СССР. Расійскай акадэміяй навук заснавана прэмія О. Шміта за лепшыя навуковыя працы ў галіне даследавання і асваення Арктыкі.

Знакаміты савецкі вучоны ***А. Чыжэўскі*** — біяфізік, адзін з заснавальнікаў геліябіялогіі. Ён даследаваў уплыў касмічных фактараў і ўздзеянне паветраных іонаў на жывыя арганізмы, што выкарыстоўваецца ў так званай «люстры Чыжэўскага». А. Чыжэўскі ўстанавіў залежнасць паміж цыкламі сонечнай актыўнасці і многімі з'явамі ў біясферы. Яго навуковыя працы «Земное эхо солнечных бурь» і «Космический пульс жизни. Земля в объятиях солнца. Гелиотараксия» не згубілі сваёй актуальнасці і сёння.



Правообладатель Народная асвета

### Пытанні і заданні

**1.** Ахарактарызуйце змены ў сістэме адукацыі БССР у 1930-я гг. Якой была ў той час структура сярэдняй школы ў БССР? **2.** Вызначыце асноўныя этапы ў развіцці школьнага навучання ў 1930-я гг. **3.** Складзіце тэзісны план адказу на пытанне: «Дасягненні БССР у сферы адукацыі ў 1930-я гг.» (гл. *памятку 9*). **4.** Назавіце асноўныя кірункі навуковых даследаванняў у БССР у 1930-я гг. Чым яны былі абумоўлены? **5.** Падрыхтуйце паведамленні (прэзентацыі) аб навуковай дзейнасці О. Шміта, А. Чыжэўскага. (*Выкарыстайце дадатковую літаратуру, свае веды па іншых вучэбных прадметах.*)

### Ваша меркаванне

У § 13 адзначалася, што ў 1930-я гг. палітыка Савецкай дзяржавы атрымала афіцыйную назву палітыкі разгорнутага наступлення сацыялізму на ўсім фронце. Як вы лічыце, якую ролю ў сацыялістычным будаўніцтве выконвалі школа і навука?

## Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (кнізе «Памяць») звесткі аб развіцці адукацыі ў вашым краі ў 1920—1930-я гг.; аб вашых земляках, якія ўславілі нашу краіну. Падрыхтуйце паведамленні.

## § 17. РАЗВІЦЦЁ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА Ў КАНЦЫ 1920-х — 1930-я гг.

**Успомніце. 1.** Назавіце асноўныя тэмы ў творчасці беларускіх пісьменнікаў, мастакоў у 1920-я гг. **2.** Што такое метад сацыялістычнага рэалізму? (*Выкарыстайце веды, засвоеныя на ўроках беларускай літаратуры.*)

**Асноўныя напрамкі і тэмы ў творчасці беларускіх пісьменнікаў.** У канцы 1920-х — 1930-я гг. у беларускай літаратуры плённа працавалі Янка Купала, Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Міхась Зарэцкі, Пятро Глебка, Міхась Лынькоў, Кузьма Чорны і інш. Лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў і паэтаў былі перакладзены на рускую мову і мовы іншых народаў СССР.


Янка Купала

Творчасць ***Янкі Купалы*** і ***Якуба Коласа*** з'яўляецца летапісам жыцця беларускага народа. Янка Купала напісаў паэму «Над ракою Арэсай», у якой утрымліваецца роздум паэта над гістарычным мінулым Палесся, паказваецца лёс і перажыванні ўдзельнікаў асушэння палескіх балот. Яго паэма «Та-



Правообладатель Народная асвета



Якуб Колас

расова доля» прысвечана памяці ўкраінскага паэта Т. Шаўчэнкі. Якуб Колас напісаў аповесць «Дрыгва» — твор пра змаганне беларускага народа за перамогу рэвалюцыі. Яе герой дзед Талаш стаў легендарным увасабленнем народнага гераізму часоў Грамадзянскай вайны. Аповесць Якуба Коласа «Адшчапенец» прысвечана калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Жыццю беларускай вёскі напярэдадні калектывізацыі прысвяціў свой раман «Мядзведзічы» ***К. Крапіва***. Яго драма «Партызаны» расказвае пра барацьбу беларускага народа за савецкую ўладу ў Грамадзянскую вайну, а сатырычная камедыя «Хто смяецца апошнім» накіравана супраць двурушнікаў, кар’ерыстаў, падхалімаў, паклёпнікаў.

Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі прысвяціў раман «Сцежкі-дарожкі» ***М. Зарэцкі***. Ён паказаў лёс народа, пакутлівыя блуканні і пошукі інтэлігенцыі ў пераломны гістарычны перыяд, пераход яе лепшай часткі на шлях самаадданага служэння рэвалюцыі. У рамане «Вязьмо» М. Зарэцкі адлюстроўвае працэс калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў беларускай вёсцы.

Ранняя лірыка ***П. Броўкі*** прасякнута матывамі ўслаўлення рэвалюцыі, новага ладу жыцця. У паэмах «Праз горы і стэп» і «1914» ён раскрывае падзеі Грамадзянскай вайны, асноўныя рысы чалавечага характару, паводзіны людзей ва ўмовах складанай рэчаіснасці. Значнае месца ў творчасці П. Броўкі займала пейзажная і інтымная лірыка.

***П. Глебка*** ў гісторыка-рэвалюцыйных паэмах «Мужнасць», «У тыя дні» і іншых творах паказаў складаны шлях барацьбы за ўладу Саветаў, развіваў тэму Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны.

***М. Лынькоў*** у 1930-я гг. распрацоўваў у літаратуры праблему выхавання ва ўмовах сацыялістычнага будаўніцтва, ствараў вобразы яго будаўнікоў, паказваў асаблівасці светапогляду, этыкі і маралі савецкага чалавека. У рамане «На чырвоных лядах» М. Лынькоў расказаў пра жыццё беларускага народа ў дакастрычніцкі час. Шырокавядомай з’яўляецца яго аповесць для дзяцей «Міколка-паравоз». ***К. Чорны*** ў тыя гады напісаў раманы «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне» і іншыя, у якіх зроблена спроба ў мастацкіх вобразах расказаць пра лёс беларускага народа ад часоў паншчыны да пабудовы сацыялістычнага грамадства.

**Тэатральнае і музычнае мастацтва. Станаўленне беларускай оперы і балета.** У канцы 1920-х — 1930-я гг. далейшае развіццё атрымала тэатральнае мастацтва



Правообладатель Народная асвета



Будынак Рэспубліканскага тэатра юнага гледача



Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР

Беларусі. Вандроўны тэатр, які быў створаны ў 1920-я гг., рэарганізаваны ў *Беларускі трэці дзяржаўны тэатр* з базай у Гомелі. Былі створаны таксама *Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР* у Бабруйску (з 1947 г. — у Мінску) і *Рэспубліканскі тэатр юнага гледача* ў Мінску, тэатры рабочай моладзі ў Мінску, Віцебску і Гомелі, калгасна-саўгасныя тэатры ў шэрагу гарадоў рэспублікі. Усяго ў БССР у 1930-я гг. працавала 14 тэатраў.

Таленавітыя майстры сцэны — *У. Крыловіч, Б. Платонаў, Г. Глебаў, У. Уладамірскі, Ф. Ждановіч, П. Малчанаў, А. Ільінскі, Л. Ржэцкая* — унеслі бясцэнны ўклад у развіццё беларускага тэатральнага мастацтва.

Заснавальнікамі беларускай савецкай оперы, сімфоніі, камернай музыкі з'яўляюцца *М. Чуркін, М. Аладаў, Я. Цікоцкі*. Усе яны былі вучнямі рускіх кампазітараў.

У 1932 г. у Мінску была адкрыта *Беларуская дзяржаўная кансерваторыя*. На педагагічную працу ў яе былі запрошаны выкладчыкі з Масквы і Ленінграда.

У 1933 г. быў створаны *Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР*. У яго рэпертуары разам з рускай і заходнееўрапейскай класікай значнае месца занялі творы нацыянальнага мастацтва. Сярод іх оперы «Міхась Падгорны» *Я. Цікоцкага*, «У пушчах Палесся» *А. Багатырова* (паводле аповесці Якуба Коласа «Дрыгва»), першы нацыянальны балет «Салавей» *М. Крошнера* (паводле аднайменнай аповесці Змітрака Бядулі). Вядучымі артыстамі Тэатра оперы і балета былі *Л. Александроўская, М. Дзянісаў, І. Балоцін*.

У 1937 г. была створана *Беларуская дзяржаўная філармонія*. Яна адыгрывала важную ролю ў музычным жыцці рэспублікі.

**Выяўленчае мастацтва, архітэктура і скульптура.** У канцы 1920-х — 1930-я гг. беларускія мастакі стварылі шмат твораў, прысвечаных барацьбе за ўладу Са-



Правообладатель Народная асвета




Будынак Акадэміі навук Беларускай ССР



Дом урада. 1934 г.



Дом Чырвонай Арміі. 1940 г.



Галоўны корпус Беларускага політэхнічнага інстытута

ветаў, Грамадзянскай вайне і сацыялістычнаму будаўніцтву. Найбольш вядомымі з іх з'яўляюцца карціны ***І. Ахрэмчыка*** «Падпісанне Маніфеста аб утварэнні БССР» і «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск», а таксама карціны іншых мастакоў.

Творы 1930-х гг. мастака ***У. Кудрэвіча*** прысвечаны тэме пераўтварэння прыроды Беларусі. Сярод іх акварэлі «Паглыбленне Арэсы», «Экскаватар на асушцы», а таксама жывапісная карціна «Баржы на Сажы», «Электрастанцыя над Дзвіной», «БелДРЭС» і інш. Жывапісец і графік ***І. Давідовіч*** напісаў у 1930-я гг. карціны «Карагод» і «Курлоўскі расстрэл».

Выдатнымі архітэктурнымі збудаваннямі 1920—1930-х гг. сталі Дом урада, Дом Чырвонай Арміі, будынкі Акадэміі навук, Тэатра оперы і балета (архітэктар ***І. Лангбард***), Рэспубліканскага тэатра юнага гледача, Мінскага палаца піянераў і школьнікаў, гасцініцы «Беларусь» (архітэктары ***А. Воінаў, У. Вараксін***) у Мінску. Былі створаны таксама новыя будынкі ў Магілёве, Віцебску, Гомелі і іншых гарадах.

Па праектах архітэктара ***Г. Лаўрова*** былі пабудаваны Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна і галоўны корпус Беларускага політэхнічнага інстытута, а па



Правообладатель Народная асвета



Галоўны корпус Дзяржаўнай бібліятэкі Беларускай ССР імя У. І. Леніна. Пабудаваны ў 1932 г.



Галоўны корпус Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Фотаздымак пачатку 1930-х гг.

праекце ***І. Запарожца і Г. Лаўрова*** — універсітэцкі гарадок у Мінску. У 1939 г. пачалося ўзвядзенне будынка Цэнтральнага Камітэта Кампартыі (бальшавікоў) Беларусі (цяпер рэзідэнцыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь).



Будынак Цэнтральнага камітэта Кампартыі Беларусі. 1940-я гг.

Беларускія скульптары ***З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў, М. Манізер*** і іншыя стварылі шэраг манументальных кампазіцый, якія ўпрыгожылі Дом урада, Дом Чырвонай Арміі, Палац піянераў і школьнікаў.

Захоўвалася і развівалася мастацкая самадзейнасць. Для аказання метадычнай дапамогі яе калектывам былі створаны Рэспубліканскі і абласныя дамы народнай творчасці. Праходзілі конкурсы і алімпіяды калгаснай самадзейнасці, адкрываліся калгасна-саўгасныя тэатры. У чэрвені 1940 г. у Маскве адбылася Першая дэкада беларускага мастацтва і літаратуры, у якой удзельнічалі прафесійныя і самадзейныя творчыя калектывы, пісьменнікі, кампазітары, мастакі, дзеячы тэатра і кіно.

**Беларускі кінематограф.** Развіццё беларускага кінематографа ў 1930-я гг. звязана ў першую чаргу з імем выдатнага рэжысёра ***У. Корш-Сабліна***. Галоўнае месца ў яго творчасці займалі стужкі пра Грамадзянскую вайну (ён сам быў яе ўдзельнікам) і рэвалюцыйны рух у Беларусі. Сярод створаных ім мастацкіх стужак — «Першы ўзвод», «Шукальнікі шчасця», «Маё каханне», «Сонечны паход», «Залатыя агні», «Дачка Радзімы», «Вогненныя гады» і інш. Да ліку лепшых твораў беларускага кінамастацтва належаць фільмы для дзяцей «Палескія рабінзоны» і «Канцэрт Бетховена».



Правообладатель Народная асвета

Дасягненні ў галіне культурнага будаўніцтва ў канцы 1920-х — 1930-я гг. — агульнацывілізацыйныя каштоўнасці, сапраўдная культурная рэвалюцыя, якая забяспечыла якасна новы ўзровень інтэлектуальнага патэнцыялу Савецкай Беларусі.

### Пытанні і заданні

**1.** Назавіце беларускіх пісьменнікаў, творчая дзейнасць якіх адносіцца да 1930-х гг. Якімі былі асноўныя тэмы іх творчасці? **2.** Ці згодны вы з тым, што творчасць Я. Купалы, Я. Коласа — гэта летапіс жыцця беларускага народа? Канкрэтызуйце свае разважанні прыкладамі з вядомых вам твораў. (*Выкарыстайце веды па беларускай літаратуры.*) **3.** Назавіце прозвішчы беларускіх мастакоў, архітэктараў, скульптараў 1930-х гг. і іх творы. **4.** Падрыхтуйце паведамленні (прэзентацыі) пра жыццёвы шлях і творчасць дзеячаў беларускай культуры 1930-х гг. **5.** Якую ролю выконвала беларуская культура ў будаўніцтве сацыялістычнага грамадства? Пацвердзіце сваё меркаванне на прыкладзе якога-небудзь літаратурнага твора (твора мастацтва, архітэктуры, скульптуры) 1930-х гг.

### Ваша меркаванне

Напішыце эсэ на адну з тэм (гл. *памятку 12)*:

Чаму развіццё культуры ў СССР і БССР у 1930-я гг. атрымала назву культурнай рэвалюцыі?

Дасягненні і страты ў развіцці беларускай культуры ў 1930-я гг.

## § 18. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ПАД УЛАДАЙ ПОЛЬШЧЫ

**Успомніце.** Якімі былі вынікі Грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі для Беларусі?

**Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця беларускага насельніцтва.** Паводле Рыжскага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. заходнебеларускія землі ўвайшлі ў склад Польшчы. Іх раздзялілі на Палескае, Навагрудскае, Віленскае і Беластоцкае ваяводствы. Польскія ўлады не прызнавалі тэрміна «Заходняя Беларусь» і ў афіцыйных дакументах называлі Заходнюю Беларусь ***«усходнімі крэсамі (ускраінамі)»***.

Сярод прамысловых прадпрыемстваў Заходняй Беларусі пераважалі харчовыя і дрэваапрацоўчыя, большасць з іх былі дробнымі. У 1928 г. дзейнічалі каля 2 тыс. прадпрыемстваў, на 80 % з якіх працавалі ад 5 да 20 чалавек. Найбольш буйнымі прадпрыемствамі былі: запалкавая фабрыка «Прагрэс-Вулкан» у Пінску, тытунёвая і фанерная ў Гродне, фанерная фабрыка ў Мастах, шклозавод «Нёман» у Лідскім павеце і фабрыка гумавых вырабаў «Ардаль» у Лідзе.

*Заходняя Беларусь з'яўлялася аграрным прыдаткам прамысловых раёнаў Польшчы, рынкам збыту прадукцыі, крыніцай таннай сыравіны і рабочай сілы.* Панавала беспрацоўе. У 1936 г. у Заходняй Беларусі налічвалася больш за 25 тыс. беспрацоўных. Рабочы дзень на прадпрыемствах дасягаў 10—12 і больш гадзін, заработная плата была ніжэйшая, чым у карэннай Польшчы.



Правообладатель Народная асвета

На тэрыторыі Заходняй Беларусі ўладарыў іншаземны капітал. У 1922 г. польскі ўрад прадаў англійскім і французскім прадпрымальнікам права на спілоўку дрэў Белавежскай пушчы і іншых лясных масіваў. Тытунёвая вытворчасць была перададзена ў арэнду італьянскім, а запалкавая — шведскім прадпрымальнікам.

Больш за 80 % насельніцтва Заходняй Беларусі займалася сельскай гаспадаркай. Каля паловы зямельнага фонду належала памешчыкам ці іншым буйным уладальнікам, якія складалі менш за 1 % жыхароў сельскай мясцовасці. Шмат зямлі належала каталіцкай царкве.

За заслугі ў польска-савецкай вайне 1919—1920 гг. польскія ўлады раздавалі заходнебеларускія землі былым афіцэрам і чыноўнікам. Новых каланістаў называлі ***асаднікамі.*** Апошнія былі добра арганізаваны, узброены і выконвалі паліцэйскія функцыі адносна мясцовага насельніцтва. На тэрыторыі Заходняй Беларусі было расселена на хутарах каля 10 тыс. асаднікаў.

Сяляне Заходняй Беларусі пакутавалі ад малазямелля і беззямелля, падатковага прыгнёту і чыноўніцкага самавольства. У пачатку 1930-х гг. сярод сельскага насельніцтва Заходняй Беларусі сяляне-беднякі складалі каля 70 %, серад댯някі — 23 %, заможныя сяляне, асаднікі, шляхта — больш чым 6 %. Цэны на прамысловыя тавары шырокага ўжытку (запалкі, газа, тытунь, соль), а таксама сялянская запазычанасць у банках былі надзвычай высокімі.

У вёсцы існавалі рэшткі феадальных адносін: арэнда зямлі за адпрацоўкі або за частку ўраджаю, адпрацоўкі за права карыстання пашай, нарыхтоўка дроў за даўгі багатым, натуральная плата за працу, наяўнасць сервітутаў (сумеснае карыстанне сялян і памешчыкаў выганамі, сенажацямі, пашамі і іншымі ўгоддзямі). Бязлітасна эксплуатаваліся памешчыкамі беззямельныя сяляне (парабкі). Іх налічвалася ў Заходняй Беларусі каля 70 тыс. чалавек.

У пошуках работы і сродкаў для існавання збяднелыя сяляне ад'язджалі ў краіны Заходняй Еўропы, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі. Па розных падліках, з 1921 па 1939 г. былі вымушаны пакінуць Заходнюю Беларусь каля 130 тыс. чалавек.

**Асноўныя кірункі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Дзейнасць палітычных партый і арганізацый.** Цяжкае становішча працоўных штурхала іх на барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. У 1921—1925 гг. гэтая барацьба набыла характар партызанскай вайны. Партызаны спальвалі маёнткі памешчыкаў, сядзібы асаднікаў і чыноўнікаў, рабілі напады на паліцэйскія ўчасткі. Колькасць партызан даходзіла да 6 тыс. чалавек. У 1924—1925 гг. яны правялі каля 280 баявых аперацый. Найбольш вядомымі арганізатарамі партызанскай барацьбы на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі камуністы *К. Арлоўскі, С. Ваўпшасаў, В. Корж, А. Рабцэвіч.*

Урад Польшчы вымушаны быў увесці надзвычайнае становішча ў краі. Усюды дзейнічалі ваенна-палявыя суды і лютавалі карныя экспедыцыі. Рэпрэсіямі і тэ-



Правообладатель Народная асвета



Цэнтральны сакратарыят Беларускай сялянска-рабочай грамады. 1926 г.

рорам польскім уладам удалося задушыць партызанскі рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Кіраўнікамі нацыянальна-вызваленчай барацьбы з'яўляліся *Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ)*, створаная ў **1923 г.,** іншыя партыі і арганізацыі. КПЗБ змагалася супраць падпарадкавання краю іншаземнаму капіталу, нацыянальнага прыгнёту, за самавызначэнне Заходняй Беларусі і яе ўз'яднанне з БССР, за дэмакратычныя правы і 8-гадзінны рабочы дзень, канфіскацыю памешчыцкіх зямель і падзел іх без выкупу паміж сялянамі, скасаванне асадніцтва, за школу на роднай мове, устанаўленне рабоча-сялянскай улады. Пад кіраўніцтвам КПЗБ дзейнічалі Камуністычны Саюз Моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ), Міжнародная арганізацыя дапамогі рэвалюцыянерам Заходняй Беларусі (МАДР), Беларуская сялянска-рабочая грамада (БСРГ), пасольскі клуб «Змаганне» (легальная дэпутацкая фракцыя ў польскім сейме, якая змагалася за інтарэсы заходнебеларускіх сялян і рабочых), Таварыства беларускай школы (ТБШ).

*Беларуская сялянска-рабочая грамада* ўтворана ў **1925 г.** Гэта была масавая легальная рэвалюцыйна-дэмакратычная арганізацыя Заходняй Беларусі. Да пачатку 1927 г. колькасць яе членаў дасягнула 120 тыс. чалавек. Праграма Грамады ўключала патрабаванні самавызначэння Заходняй Беларусі, утварэння сялянска-рабочага ўрада, перадачы зямлі сялянам без выкупу, ліквідацыі асадніцтва, аддзялення царквы ад дзяржавы, арганізацыі школ на роднай мове.

У маі **1926 г.** у Польшчы адбыўся дзяржаўны пераварот, у выніку якога была ўстаноўлена дыктатура на чале з маршалам Ю. Пілсудскім. Дыктатарскі рэжым праводзіў так званую ***«палітыку санацыі»*** (аздараўлення). Яна ўключала комп-



Правообладатель Народная асвета

лекс мер у эканамічнай, палітычнай і сацыяльнай сферах жыцця польскага грамадства.

Каб знізіць сацыяльную напружанасць у вёсцы, польскія ўлады праводзілі аграрныя пераўтварэнні. Яны ажыццяўляліся па трох асноўных напрамках: 1) *парцэляцыя* — свабодны продаж праз зямельны банк невялікіх участкаў памешчыцкай і дзяржаўнай зямлі (парцэл), галоўным чынам, асобам польскай нацыянальнасці; 2) *камасацыя* — добраахвотнае і прымусовае высяленне сялян на хутары (да 1939 г. на хутары ў прымусовым парадку было расселена каля 70 % сялянскіх гаспадарак); 3) *ліквідацыя сервітутаў*.

Цяжкае сацыяльнае і эканамічнае становішча дапаўнялася паліцэйскім тэрорам. Па ўсёй тэрыторыі «ўсходніх крэсаў» лютавалі карныя экспедыцыі, якія называліся *пацыфікацыяй* («уціхамірваннем»). У час пацыфікацый паліцэйскія разбуралі жыллё сялян, знішчалі іх маёмасць, учынялі масавае збіванне насельніцтва. Жыхарам вёсак забаранялася запальваць святло вечарам, збірацца групамі, хадзіць у іншыя вёскі.

Вядучая роля ў правядзенні тэрору належала тайнай палітычнай паліцыі — *дэфензіве*. Яна шырока выкарыстоўвала метады правакацый, паклёпу, запалохвання і фізічных катаванняў.

Напалоханы размахам нацыянальна-вызваленчай барацьбы ўрад Польшчы ў студзені **1927 г.** разграміў Беларускую сялянска-рабочую грамаду. 490 яе кіраўнікоў і актывістаў былі прыцягнуты да судовай адказнасці і пасаджаны ў турмы. Сярод асуджаных былі кіраўнікі Грамады — Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Валошын і П. Мятла. Тых, хто выступаў у абарону кіраўнікоў і актывістаў Беларускай сялянска-рабочай грамады, польскія ўлады жорстка каралі. Па гэтых матывах у 1927 г. польскія ўлады расстралялі дэманстрацыю працоўных мястэчка Косава Палескага ваяводства. Забітых і параненых налічвалася некалькі дзясяткаў. Пахаванне забітых вылілася ў маніфестацыю пратэсту супраць зверстваў паліцыі і ненавіснага рэжыму Ю. Пілсудскага.

У гады сусветнага эканамічнага крызісу 1929—1933 гг. становішча працоўных Заходняй Беларусі яшчэ больш пагоршылася. Шэраг забастовак рабочых мелі палітычны характар. Найбольш масавымі былі выступленні рабочых дрэваапрацоўчай прамысловасці, лесарубаў і возчыкаў у Белавежскай пушчы, а таксама ў Слонімскім павеце. Былі выпадкі захопу прадпрыемстваў рабочымі.

Яркай старонкай вызваленчай барацьбы ў вёсцы з’явілася ўзброенае выступленне сялян Кобрынскага павета ў жніўні 1933 г. Супраць аграрнай і падатковай палітыкі польскіх улад мужна змагаліся сяляне вёсак Заполле Карэліцкай гміны, Асташына Навагрудскага, Баранава Гродзенскага, Ляплёўка Брэсцкага паветаў. Абаранялі свае права на свабодную лоўлю рыбы ў возеры Нарач сяляне навакольных вёсак. У 1935 г. яны арганізавалі забастоўку, у выніку якой улады вымушаны былі пайсці сялянам на ўступкі.



Правообладатель Народная асвета

Вядучая роля ў арганізацыі барацьбы працоўных Заходняй Беларусі па-ранейшаму належала КПЗБ. У 1934 г. партыя налічвала 4 тыс. камуністаў, каля 3 тыс. членаў партыі пастаянна знаходзіліся ў турмах. КПЗБ выхавала буйных арганізатараў рэвалюцыйнага руху, сярод якіх ***І. Лагіновіч***, ***А. Славінскі***, ***В. Харужая***, ***М. Арэхва, С. Прытыцкі, У. Царук*** і інш.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічалі таксама іншыя партыі і арганізацыі — Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), Беларускі сялянскі саюз (БСС), Цэнтрасаюз (Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый) і інш. Яны адмоўна адносіліся да СССР, выступалі супраць рэвалюцыйнага руху працоўных, а некаторыя з іх падтрымлівалі палітыку польскіх улад.

Прыход да ўлады ў Германіі А. Гітлера, прыняцце ў Польшчы ў 1935 г. новай канстытуцыі, ліквідацыя рэштак дэмакратычных свабод, зняволенне ў турмах і канцэнтрацыйным лагеры Бяроза-Картузская тысяч камуністаў і іншых праціўнікаў дыктатарскага рэжыму Ю. Пілсудскага карэнным чынам змянілі палітычную сітуацыю. Многія палітычныя партыі і арганізацыі краін Еўропы, у тым ліку Заходняй Беларусі і Польшчы, сталі на шлях стварэння *адзінага народнага антыфашысцкага фронту* супраць пагрозы фашызму і вайны.

Пра салідарнасць працоўных Заходняй Беларусі з рабочымі і сялянамі іншых краін у барацьбе супраць адзінага ворага — фашызму — яскрава сведчыць той факт, што 137 яе ўраджэнцаў змагаліся ў складзе інтэрнацыянальных брыгад у Іспаніі. Салідарнасць працоўных Заходняй Беларусі і Польшчы праявілася ў масавай кампаніі за выратаванне жыцця С. Прытыцкага (гл. *дадатковы матэрыял*).

Разам з тым на развіццё нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйнага руху адмоўна паўплывалі неабгрунтаваны роспуск у жніўні **1938 г.** Камінтэрнам Камуністычнай партыі Польшчы і яе састаўной часткі — Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, а таксама пакаранне смерцю савецкімі ўладамі многіх кіраўнікоў Кампартыі Заходняй Беларусі як «агентаў польскай дэфензівы». Абвінавачанне супраць іх было лжывым. Добрае імя КПЗБ, яе кіраўнікоў і дзеячаў нацыянальна-вызваленчага руху было адноўлена ў 1956 г.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *1923—1938 гг., 1925—1927 гг., 1926 г.; «усходнія крэсы», асаднікі, палітыка «санацыі».*

### Пытанні і заданні

**1.** Ахарактарызуйце палітычнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. **2.** Як развівалася прамысловасць Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг.? Назавіце аграрныя пераўтварэнні, якія праводзіліся ў сельскай гаспадарцы Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг. **3.** Дайце азначэнне паняццяў: *«усходнія крэсы», асаднікі, палітыка «санацыі».* **4.** Якія формы нацыянальна-вызваленчай барацьбы выкарыстоўвала насельніцтва Заходняй Беларусі? Прывядзіце прыклады выступленняў рабочых і сялян Заходняй Беларусі. **5.** Назавіце палітычныя партыі і арганізацыі, якія дзейнічалі на тэ-



Правообладатель Народная асвета

рыторыі Заходняй Беларусі. Якімі былі іх мэты? Растлумачце, што азначала патрабаванне: «самавызначэнне Заходняй Беларусі». **6.** Падрыхтуйце паведамленні аб кіраўніках нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі: І. Лагіновіч, В. Харужая, С. Прытыцкі, Б. Тарашкевіч. *(Выкарыстайце дадатковую літаратуру.)*

## Ваша меркаванне

Паводле даных перапісу насельніцтва 1921 г., бяднейшыя пласты сялянства (з надзелам да 10 га) складалі ў Заходняй Беларусі 80,15 % усіх сялянскіх гаспадарак. Сярэдні памер зямельнага надзелу гэтай праслойкі сялян складаў 4,9 га.

Як вы лічыце, чаму зямельны надзел памерам да 10 га ў Заходняй Беларусі азначаў прыналежнасць да бяднейшых пластоў сялянства?

## Дадатковы матэрыял

**Урыўкі з успамінаў С. Прытыцкага аб замаху на жыццё правакатара**

«…Утром 27 января я снова направился в окружной суд... и начал с напряжением ждать появления перед судебным столом провокатора. Наконец после краткого перерыва председатель суда объявил: «Пригласить свидетеля Якова Стрельчука».

...Предатель говорил тихо. От его показаний зависела судьба подсудимых. Каждый из присутствующих на суде стремился не пропустить ни одного слова. Поэтому в зале была полная тишина. Когда Стрельчук, повысив тон и указывая на подсудимых, начал называть их агентами большевизма, я решил действовать. Мгновенно вынув из кармана оба пистолета, направился к судебному столу. Направив один пистолет под правое ухо, а второй в спину, нажал на оба курка сразу. Прозвучало два выстрела. В зале поднялась большая паника.

...пользуясь паникой, я направился к выходу, чтобы выбежать из здания суда. С разбега, ударом плеча, я выломал дверь и оказался в коридоре в окружении шпиков и полицейских. ...Шпики Дойновский и Бучковский выхватили пистолеты и открыли по мне огонь. [Я] получил пули в бок, в шею и в руку. Шпики только тогда перестали стрелять, когда посчитали, что я уже мёртв…

В июне 1936 года Виленский окружной суд вынес мне приговор: за революционную деятельность в рядах Коммунистической партии к 15 годам тюремного заключения; за убийство на суде провокатора — к смертной казни через повешение…

Под нажимом широкой общественной мысли кассационный суд в Варшаве 15 декабря 1936 года вынужден был приговор Виленского окружного суда отменить и направить его на рассмотрение во второй раз. Виленский окружной суд в новом составе в феврале 1937 года смертную казнь заменил мне тяжелым пожизненным заключением. Таким образом, благодаря широкому движению трудящихся многих стран моя жизнь была спасена».



Правообладатель Народная асвета

## § 19. СТАНОВІШЧА КУЛЬТУРЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

**Успомніце. 1.** Як развіваліся адукацыя, літаратура і мастацтва ў БССР у 1920—1930-я гг.? **2.** Калі была заключана Брэсцкая царкоўная унія? Якімі былі яе ўмовы?

**Адукацыя. Таварыства беларускай школы.** Польскія ўлады не прызнавалі беларускай нацыі і ставілі за мэту выкараніць нацыянальную свядомасць беларусаў і апалячыць іх. Статыстычныя звесткі аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі фальсіфікаваліся, да палякаў адносілі амаль усіх беларусаў-католікаў і шмат праваслаўных. На самай жа справе ў Навагрудскім, Палескім і Віленскім ваяводствах беларусаў было 67 %, а не 22,5 %, як сцвярджала афіцыйная польская статыстыка, палякаў — адпаведна 12—13 %, а не 42 %.

Да захопу Польшчай Заходняй Беларусі тут працавала 359 беларускіх школ, настаўніцкія семінарыі ў Свіслачы і Барунах, беларускія гімназіі ў Навагрудку, Нясвіжы, Клецку і Радашковічах. У 1938/1939 навучальным годзе ў Заходняй Беларусі не засталося ніводнай беларускай навучальнай установы.

Але і польскіх школ было недастаткова. Каля 13 % дзяцей школьнага ўзросту нідзе не вучыліся, 43 % насельніцтва ва ўзросце звыш 10 гадоў было непісьменным. Інтэлігенцыі з карэнных беларусаў налічвалася зусім мала.

У дзяржаўных установах не дазвалялася карыстацца беларускай мовай. Беларусаў на дзяржаўную службу не бралі. Не было беларускіх тэатраў. Самадзейныя беларускія тэатральныя суполкі з-за перашкод мясцовай адміністрацыі прыпынялі сваю дзейнасць. Закрываліся нешматлікія клубы, бібліятэкі, хаты-чытальні, створаныя ў папярэднія гады беларускай грамадскасцю. Прагрэсіўныя газеты і часопісы канфіскоўваліся і зачыняліся, іх рэдактараў садзілі ў турму.

Важную ролю ў жыцці Заходняй Беларусі ў 1920—1930-я гг. адыграла *Таварыства беларускай школы (ТБШ)* — масавая культурна-асветніцкая арганізацыя, створаная ў **1921 г.** У пачатку 1930-х гг. ТБШ налічвала каля 500 гурткоў і 30 тыс. актывістаў. Таварыства змагалася за пісьменнасць насельніцтва, за адкрыццё новых і захаванне існуючых беларускіх школ, стварала клубы, бібліятэкі, хаты-чытальні, арганізоўвала мастацкую самадзейнасць, народныя хары, выдавала падручнікі, спеўнікі. Актыўна працавалі сярод насельніцтва драматычныя гурткі, створаныя мясцовымі аддзеламі ТБШ. У **1937 г.** дзейнасць Таварыства беларускай школы была забаронена.

**Літаратура, жывапіс, музычнае мастацтва.** У цяжкіх умовах нацыянальнага прыгнёту развівалася заходнебеларуская культура. У Вільні працавала *Беларускае навуковае таварыства*. Ля яго вытокаў стаялі В. Ластоўскі, браты Іван і Антон Луцкевічы. Члены таварыства перакладвалі на беларускую мову педагагічную і мастацкую літаратуру, выступалі з дакладамі і паведамленнямі па гісторыі, літаратуры, этнаграфіі і фальклору Беларусі. Пры таварыстве знаходзіўся беларускі



Правообладатель Народная асвета

гісторыка-этнаграфічны музей і беларускі архіў. Бібліятэка музея налічвала больш за 14 тыс. тамоў кніг і дакументаў.

Не адно пакаленне заходнебеларускай моладзі карысталася падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі, створанымі Б. Тарашкевічам, М. Гарэцкім, І. Дварчаніным і іншымі аўтарамі. ***Б. Тарашкевіч*** быў не толькі выдатным грамадска-палітычным дзеячам Заходняй Беларусі, але і вучоным-мовазнаўцам і літаратуразнаўцам, педагогам, публіцыстам і перакладчыкам.

## Гістарычны партрэт



**Тарашкевіч Браніслаў Адамавіч** (1892—1938) з'яўляўся адным з лідараў Беларускай сацыялістычнай грамады, а пасля яе распаду ў 1918 г. — Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі. У 1918 г. выдаў «Беларускую граматыку для школ», у 1919 г. выкладаў беларускую і грэчаскую мовы ў Мінскім педагагічным інстытуце. У 1920—1922 гг. працаваў у Літве, быў адным з кіраўнікоў і заснавальнікаў Таварыства беларускай школы. У 1922 г. выбраны паслом (дэпутатам) сейма Польшчы, узначаліў у ім пасольскі клуб «Змаганне». З трыбуны сейма і ў заходнебеларускім друку абараняў сацыяльныя і нацыянальныя правы працоўных. У 1925 г. стаў адным з заснавальнікаў Беларускай сялянска-рабочай грамады. Двойчы, у 1927 і 1931 гг., быў арыштаваны польскімі ўладамі і засуджаны адпаведна на 12 і 8 гадоў зняволення. У 1930 г. распараджэннем прэзідэнта Польшчы быў вызвалены з турмы. У выніку абмену палітвязнямі з 1933 г. жыў у СССР, працаваў у Міжнародным аграрным універсітэце ў Маскве. У 1938 г. быў неабгрунтавана асуджаны да вышэйшай меры пакарання і расстраляны. Рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР у 1957 г.

М. Гарэцкі ў 1920—1922 гг. выпусціў у свет «Гісторыю беларускай літаратуры» і «Хрэстаматыю беларускай літаратуры: XI век — 1905 год», а І. Дварчанін у 1927 г. выдаў «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 года)». Гэтыя кнігі, як і «Беларуская граматыка для школ» Б. Тарашкевіча, шырока выкарыстоўваліся ў беларускіх гімназіях і іншых навучальных установах.

Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі выклікаў актывізацыю літаратурнага жыцця. У літаратуру прыйшлі маладыя паэты: М. Танк, П. Пестрак, М. Васілёк, В. Таўлай, М. Машара і іншыя.



Правообладатель Народная асвета



Максім Танк

Лёс і духоўны свет заходнебеларускіх працоўных, багацце роднай прыроды раскрыў ***М. Танк*** у грамадзянскай і пейзажнай лірыцы, гумарыстычных і сатырычных вершах, баладах, песнях, казках, героікарамантычных паэмах («Нарач», «Каліноўскі», «Журавінавы цвет» і інш.).

Галоўная тэма паэзіі ***П. Пестрака***, які пачаў друкавацца з 1926 г., — змаганне заходнебеларускіх працоўных за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

Вершы Міхася Васілька «У бой на акупанта», «Як я пана перанёс» і іншыя, а таксама паэма В. Таўлая «Непераможныя» заклікалі да мужнасці ў змаганні з польскімі панамі. Пратэст супраць сацыяльнага і нацыянальнага ўціску, вера ў творчыя сілы народа адлюстраваны М. Машарам ў яго паэмах «Вяселле», «Смерць Кастуся Каліноўскага», «Мамчына горка», п'есах «Вось тут і зразумей...», «Чорт з падпечча», «Лёгкі хлеб», а таксама ў шматлікіх зборніках вершаў. Палітычнай завостранасцю і навуковай дакладнасцю вызначаліся публіцыстычныя артыкулы сакратара ЦК КПЗБ І. Лагіновіча.

У заходнебеларускім выяўленчым мастацтве адлюстроўвалася жыццё сялян, гістарычнае мінулае роднай зямлі, дзейнасць яе выдатных сыноў, прыгажосць беларускай прыроды і іншыя тэмы. Мастак ***П. Сергіевіч*** жыццю сялян Заходняй Беларусі прысвяціў палотны «За прасніцай», «Вяселле на Беларусі», «Залёты», «Араты», «Каваль куе каня» і інш. Гістарычнае мінулае Беларусі адлюстравана ім у карцінах «Усяслаў Полацкі», «Кастусь Каліноўскі сярод паўстанцаў 1863 г.», «Скарына ў друкарні» і інш. П. Сергіевіч з'яўляецца аўтарам шматлікіх партрэтаў — «Партрэт маці», «Беларуская настаўніца», «Рыгор Шырма», «Дзяўчына ў сінім сарафане» і інш.

Мастак ***Я. Драздовіч*** у 1920-я гг. стварыў графічную серыю старадаўняй архітэктуры Беларусі і Літвы. Сярод яго работ — «Глыбокае», «Мір», «Навагрудак», «Крэва», «Ліда», «Трокі», «Гальшанскае гарадзішча каля Барунскага тракту» і інш. Я. Драздовіч з'яўляецца аўтарам партрэтаў А. Грыневіча, Усяслава Полацкага, Францыска Скарыны. У пачатку 1930-х гг. цыкламі карцін «Жыццё на Марсе», «Жыццё на Сатурне», «Жыццё на Месяцы» ён паклаў пачатак касмічнай тэме ў беларускім выяўленчым мастацтве.

Развівалася музычнае мастацтва. Збіральнікам і даследчыкам беларускага музычнага фальклору, прапагандыстам беларускай народнай музыкі быў ***Р. Шырма***. У 1929 г. ён выдаў фальклорны зборнік «Беларускія народныя песні». Р. Шырма ствараў мастацкія калектывы, кіраваў харамі ў Пружанах, Віленскай беларускай



Правообладатель Народная асвета



Дзеячы культуры — удзельнікі вечара беларускай паэзіі і песні ў Віленскім універсітэце. 1936 г. У першым радзе ў цэнтры — Рыгор Шырма

гімназіі. У 1940 г. ён арганізаваў і да 1978 г. узначальваў Беларускую дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу, якая цяпер носіць яго імя.

Прапагандыстам беларускай народнай песні быў спявак ***М. Забэйда-Суміцкі*** з сям'і беззямельнага селяніна в. Несцяровічы каля Ружан. Пазней ён спяваў на лепшых оперных сцэнах свету, яго выступленні перадаваліся па радыё ў Парыжы, Празе, Нью-Ёрку, Лондане і іншых гарадах.

Багатая і шматгранная заходнебеларуская культура з'яўляецца састаўной часткай беларускай і еўрапейскай культурна-гістарычнай спадчыны.

**Праваслаўная царква і каталіцкі касцёл. Неаунія ў Заходняй Беларусі.** Пасля аднаўлення ў 1918 г. Польшчы яе тэрыторыя была аб'яўлена Ватыканам місіянерскай тэрыторыяй, на якой павінна была праводзіцца работа па пашырэнні *новай уніі — неауніі* (новай у параўнанні з Брэсцкай царкоўнай уніяй 1596 г.). У адпаведнасці з неауніяй працягваўся працэс ліквідацыі праваслаўнай царквы праз яе прымусовае ператварэнне ў царкву каталіцкую і ўніяцкую. Ні каталіцкае духавенства, ні каталіцкія вернікі, ні каталіцкія храмы не станавіліся ўніяцкімі. На праваслаўнае духавенства аказваўся ціск з мэтай прымусовага пераходу з беларускай або рускай мовы на польскую ў царкоўнай пропаведзі і ў выкладанні рэлігіі ў школе. У суды падаваліся неабгрунтаваныя іскі аб вяртанні католікам праваслаўных храмаў, манастыроў і царкоўнай маёмасці. З 500 існаваўшых раней у краі праваслаўных цэркваў да 1924 г. больш за 300 былі ператвораны ў каталіцкія і ўні-



Правообладатель Народная асвета

яцкія храмы. Уніяцкаму духавенству гарантавалася аплата працы пры ўмове, што яно прынясе прысягу на вернасць Польшчы.

Уніяцкіх місіянераў рыхтавалі ў Любліне (Польшча) і Дубне (Валынь). У Альберціне (каля Слоніма) езуіты заснавалі ўніяцкі манастыр, а таксама школу місіянераў. Для распаўсюджання уніі сярод беларусаў альберцінскія езуіты выдавалі на беларускай мове часопіс «Да Злучэньня». У 1932 г. польскі ўрад пад націскам Ватыкана прыняў тайнае рашэнне аб тым, што «задача схілення Усходу ў каталіцтва, гэтак жа як і ў мінулыя стагоддзі, застаецца і надалей «гістарычнай місіяй» польскай дзяржавы».

Пад ціскам польскіх улад епіскапат праваслаўнай царквы ў Польшчы станавіўся на шлях разрыву кананічнай сувязі з Маскоўскім патрыярхатам. Гэта пагражала зліццём праваслаўнай царквы з каталіцкай і ўніяцкай і яе поўным знішчэннем. У мэтах захавання праваслаўнай царквы ў Польшчы канстанцінопальскі патрыярх Грыгорый VII дараваў ёй *аўтакефалію* (статус самастойнай царквы). У 1925 г. Сінод праваслаўнай царквы ў Польшчы афіцыйна абвясціў праваслаўную царкву аўтакефальнай. Гэта садзейнічала недапушчэнню яе зліцця з каталіцкай і ўніяцкай цэрквамі і захаванню праваслаўя на заходнебеларускіх землях.

**Даты, якія трэба ведаць:** *1921—1937 гг.*

### Пытанні і заданні

**1.** Ахарактарызуйце нацыянальную і канфесійную палітыку польскага ўрада на заходнебеларускіх землях. Дакажыце, што палітыка польскага ўрада ў сферы адукацыі, культуры, рэлігіі парушала палажэнні Рыжскага мірнага дагавора. (*Выкарыстайце гістарычны дакумент.*) **2.** Што такое ТБШ? Назавіце асноўныя напрамкі яе дзейнасці. **3.** Назавіце прозвішчы дзеячаў навукі, літаратуры і мастацтва ў Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг. Якімі былі асноўныя тэмы ў творчасці пісьменнікаў, мастакоў Заходняй Беларусі? **4.** Падрыхтуйце паведамленні аб творчасці дзеячаў культуры Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг.

### Ваша меркаванне

Як вы лічыце, чаму пісьменнікі і мастакі Заходняй Беларусі часта звярталіся ў сваёй творчасці да гістарычнага мінулага беларускага народа?

### Гістарычны дакумент

**З Рыжскага мірнага дагавора РСФСР і УССР з Польшчай**

18 сакавіка 1921 г.

Артыкул 7

«Польшча прадастаўляе асобам рускай, украінскай і беларускай нацыянальнасцей, якія знаходзяцца ў Польшчы, на аснове раўнапраўя нацыянальнасцей усе правы, якія забяспечваюць свабоднае развіццё культуры, мовы і выкананне рэлігійных абрадаў. Узаемна Расія і Украіна забяспечваюць асобам польскай нацыянальнасці, якія знаходзяцца ў Расіі, Украіне і Беларусі, усе тыя ж правы.



Правообладатель Народная асвета

Асобы рускай, украінскай і беларускай нацыянальнасцей у Польшчы маюць права ў межах унутранага заканадаўства культываваць сваю родную мову, арганізоўваць і падтрымліваць свае школы, развіваць сваю культуру і ўтвараць з гэтай мэтай таварыствы і саюзы. Гэтымі ж правамі, у межах унутранага заканадаўства, будуць карыстацца асобы польскай нацыянальнасці, якія знаходзяцца ў Расіі, Украіне і Беларусі».

## НАШ КРАЙ У 1917—1939 гг.

Канкрэтызуйце асноўныя тэндэнцыі развіцця Беларусі ў 1917—1939 гг. фактамі з гісторыі вашага краю. Выкарыстайце інфармацыю мясцовага краязнаўчага музея, гісторыка-дакументальную хроніку свайго раёна (кнігу «Памяць»), іншую дадатковую літаратуру.

*Устанаўленне савецкай улады:*

• Калі адбывалася ўстанаўленне савецкай улады на тэрыторыі вашага краю? З якімі падзеямі гэта было звязана?

• Якія органы савецкай улады былі створаны ў вашым краі? Якія пераўтварэнні імі праводзіліся ў грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах?

• Назавіце прозвішчы людзей, якія ўстанаўлівалі савецкую ўладу ў вашым краі. Якім чынам увекавечана памяць аб іх у вашым населеным пункце?

*Барацьба з германскімі і польскімі інтэрвентамі:*

• Якім было палітычнае і сацыяльна-эканамічнае становішча вашага краю ў гады германскай і польскай інтэрвенцыі?

• Якія падзеі адбываліся на тэрыторыі вашага краю ў час германскай акупацыі (1917—1918) і ў гады польска-савецкай вайны 1919—1920 гг.?

• Назавіце прозвішчы людзей, якія ўзначалілі барацьбу супраць германскіх і польскіх інтэрвентаў у вашым краі. Якім чынам увекавечана памяць аб іх у вашым населеным пункце?

*Станаўленне савецкага сацыялістычнага грамадства:*

• Як развівалася прамысловасць у вашым краі ў 1921—1939 гг.? Якія галіны прамысловасці развіваліся ў гэты перыяд? На выпуску якой прадукцыі спецыялізаваліся мясцовыя прадпрыемствы? Чым гэта было абумоўлена?

• Якія прадпрыемствы былі пабудаваны ў вашым краі ў гады першых пяцігодак? Якія з іх дзейнічаюць і сёння?

• Як развівалася сельская гаспадарка ў вашым краі ў 1921—1939 гг.? Як праходзіла тут калектывізацыя? Якімі былі яе вынікі?

• Якія змены адбыліся ў культурным развіцці вашага краю ў 1921—1939 гг.? Як развівалася сістэма адукацыі ў вашым краі ў 1921—1939 гг.?

• Якія дзеячы беларускай культуры жылі і працавалі ў вашым краі ў 1921—1939 гг.?



Правообладатель Народная асвета

## УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ па раздзеле II «Беларусь ва ўмовах станаўлення савецкага сацыялістычнага грамадства. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы»

**1.** Назавіце даты наступных падзей:
- пераход да новай эканамічнай палітыкі;
- утварэнне СССР;
- першае і другое ўзбуйненні тэрыторыі БССР;
- прыняцце другой Канстытуцыі БССР;
- прыняцце курса на індустрыялізацыю;
- прыняцце курса на калектывізацыю;
- прыняцце трэцяй Канстытуцыі БССР;
- дзейнасць КПЗБ;
- дзейнасць БСРГ;
- дзейнасць ТБШ.

**2.** Падбярыце паняцце да кожнага азначэння:

а) былыя афіцэры польскай арміі, якім за заслугі ў польска-савецкай вайне 1919—1920 гг. польскія ўлады раздавалі ўчасткі заходнебеларускіх зямель;

б) палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР у 1920-я гг.;

в) працэс стварэння буйной машыннай вытворчасці ў прамысловасці і іншых галінах народнай гаспадаркі;

г) аб'яднанне індывідуальных гаспадарак сялян у буйныя калектыўныя гаспадаркі (калгасы);

д) адзін з асноўных напрамкаў палітыкі беларусізацыі, які прадугледжваў павышэнне ролі асоб карэннай нацыянальнасці ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі; вылучэнне кадраў з карэннага насельніцтва на партыйную, савецкую, гаспадарчую і грамадскую работу;

е) афіцыйная назва заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы;

ж) комплекс сацыяльна-эканамічных і палітычных мерапрыемстваў, якія праводзіліся ў Польшчы, у тым ліку ў Заходняй Беларусі, Ю. Пілсудскім;

з) кірунак у аграрнай палітыцы (па прозвішчы наркама земляробства БССР), згодна з якім стаўка рабілася на развіццё хутарской сістэмы;

і) элемент палітыкі «ваеннага камунізму», сістэма нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі, згодна з якой сяляне абавязаны былі здаваць дзяржаве ўсе лішкі прадукцыі.



Правообладатель Народная асвета

**3.** У прапанаваным спісе паняццяў вызначыце тыя, якія характарызуюць развіццё БССР і Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг. Сістэматызуйце іх па сферах грамадскага жыцця. Запоўніце табліцу. Дайце азначэнне гэтым паняццям.

| Эканамічная сфера | Палітычная сфера | Сацыяльная сфера | Духоўная сфера |
|---|---|---|---|
| | | | |

*Аграрная рэформа, беларусізацыя, буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, Беларуская Народная Рэспубліка, Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусі, Брэсцкі мірны дагавор, «ваенны камунізм», заходнерусізм, індустрыялізацыя, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, люстрацыя, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, нацыяналізацыя, новая эканамічная палітыка, прамысловая рэвалюцыя, «прышчэпаўшчына», Рыжскі мірны дагавор, «санацыя», сацыялістычная рэвалюцыя.*

**4.** Сістэматызуйце свае веды аб развіцці БССР у 1921—1939 гг. Запоўніце табліцу.

| **Пытанні для аналізу** | **Час правядзення** | **Мэты** | **Сутнасць** | **Вынікі** | **Значэнне** |
|---|---|---|---|---|---|
| Новая эканамічная палітыка | | | | | |
| Індустрыялізацыя | | | | | |
| Калектывізацыя сельскай гаспадаркі | | | | | |

**5.** Назавіце асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў БССР. Чым яны былі абумоўлены?

**6.** Канкрэтызуйце асноўныя тэндэнцыі развіцця БССР у 1921—1939 гг. фактамі. Запоўніце табліцу.

Асноўныя тэндэнцыі развіцця БССР у 1921—1939 гг.

| **Асноўныя тэндэнцыі развіцця БССР** | **Падзеі, з’явы, працэсы з гісторыі БССР** |
|---|---|
| Аднаўленне народнай гаспадаркі пасля Грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі | |
| Палітыка беларусізацыі | |
| Правядзенне індустрыялізацыі | |



Правообладатель Народная асвета

| Асноўныя тэндэнцыі развіцця БССР | Падзеі, з'явы, працэсы з гісторыі БССР |
|---|---|
| Ажыццяўленне калектывізацыі сельскай гаспадаркі | |
| Складванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы | |
| «Культурная рэвалюцыя» | |

**7.** Дайце характарыстыку беларускага грамадства 1930-х гг.

| | |
|---|---|
| Эканамічная сфера | |
| Палітычная сфера | |
| Сацыяльная сфера | |
| Духоўная сфера | |

**8.** Раскрыйце прычынна-выніковыя сувязі паміж наступнымі гістарычнымі фактамі:




**9.** Параўнайце па самастойна вызначаных крытэрыях развіццё БССР і Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг. (гл. *памятку 6*).



Правообладатель Народная асвета

## Раздзел III
# БССР У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВОЙНАЎ

## § 20. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ВАЕННЫХ ВЫПРАБАВАННЯЎ

**Успомніце. 1.** Што такое палітыка «прымірэння агрэсара»? Прывядзіце прыклады такой палітыкі ў 1930-я гг. **2.** Што такое бліцкрыг?

**Пачатак Другой сусветнай вайны.** У другой палове 1930-х гг. *абвастрыліся супярэчнасці паміж найбуйнейшымі дзяржавамі Еўропы*, якія імкнуліся да перадзелу свету, зон уплыву, што скláліся пасля Першай сусветнай вайны. Германія ставіла за мэту ліквідацыю Версальска-Вашынгтонскай сістэмы дагавораў 1919—1922 гг., нарошчванне ваеннай сілы і ўстанаўленне сусветнага панавання. У той жа час Англія і Францыя стараліся цаной уступак аслабіць германскі націск на Захад і скіраваць яго на Усход, супраць Савецкага Саюза.

У ваенна-палітычнай сітуацыі, калі Англія і Францыя намагаліся «ўлагодзіць» агрэсара, Савецкі Саюз прапанаваў *палітыку стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе*. Ён праявіў гатоўнасць супрацоўнічаць з усімі еўрапейскімі краінамі для барацьбы супраць германскай агрэсіі. Але перагаворы паміж СССР, Англіяй і Францыяй, якія праходзілі летам 1939 г. у Маскве, зайшлі ў тупік і станоўчых вынікаў не далі.

На думку некаторых беларускіх гісторыкаў, кіраўніцтва Савецкага Саюза ў правядзенні знешняй палітыкі ў перадваенныя гады рабіла памылкі. Сярод іх занадта даверлівыя адносіны да палітыкі кіраўнікоў фашысцкай Германіі і стварэнне стану такога ж даверу ў савецкім грамадстве, пэўнае спачуванне фашысцкай агрэсіі супраць суверэнных дзяржаў і народаў Еўропы, развязванне савецка-фінскай вайны зімой 1939—1940 гг. Узнікшыя супярэчнасці паміж СССР і Фінляндыяй патрэбна было, безумоўна, старацца пераадолець мірнымі сродкамі, бо, як сцвярджаюць сумленныя дыпламаты, лепш 10 гадоў перамоў, чым адзін дзень вайны. А савецка-фінская вайна працягвалася не адзін дзень. Яна была звязана з вялікімі людскімі і матэрыяльнымі стратамі з абодвух бакоў і адмоўнымі адносінамі да яе міжнароднай супольнасці.

Фактычна адмовіўшыся ад стварэння ў Еўропе антыфашысцкай кааліцыі дзяржаў, Англія і Францыя свядома штурхалі фашыстаў на Усход. Яны не пакінулі Савецкаму Саюзу альтэрнатывы (выбару). У такой сітуацыі, каб пазбегнуць магчымай палітычнай ізаляцыі і вайны на два фронты (супраць Германіі і яе саюзнікаў — на захадзе і Японіі — на ўсходзе), СССР быў вымушаны прыняць прапанову Герма-



Правообладатель Народная асвета

нії наладзіць міждзяржаўныя адносіны. 20 жніўня 1939 г. быў падпісаны *савецка-германскі гандлёвы дагавор*, паводле якога СССР атрымаў крэдыт для закупкі ў Германіі машын, абсталявання, бранявой сталі, аптычных прыбораў і інш. Савецкі Саюз, згодна з дагаворам, пастаўляў у Германію збожжа, лес, нафту, каляровыя металы. СССР выконваў дагаворныя абавязацельствы, у той час як Германія яшчэ ў пачатку 1941 г. спыніла свае пастаўкі, спасылаючыся на ўнутраныя цяжкасці.

**23 жніўня 1939 г.** у Маскве паміж СССР і Германіяй быў падпісаны *Дагавор аб ненападзенні* тэрмінам на 10 гадоў *(пакт Молатава — Рыбентропа)*. Падпісваючы дагавор, Савецкі Саюз імкнуўся выйграць час для завяршэння мерапрыемстваў па ўмацаванні абараназдольнасці краіны, адвесці пагрозу стварэння адзінага антысавецкага фронту. У сваю чаргу Германія атрымала свабоду дзеянняў для пашырэння агрэсіі супраць краін Еўропы.

Разам з дагаворам аб ненападзенні быў падпісаны *сакрэтны дадатковы пратакол*, паводле якога вызначаліся сферы ўплыву дзвюх дзяржаў. У сферу інтарэсаў СССР уваходзілі Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна, што было актам гістарычнай справядлівасці, а таксама Усходняя Польшча аж да Варшавы, Латвія і Эстонія, Бесарабія. Другі з'езд народных дэпутатаў СССР у снежні 1989 г. прызнаў сакрэтны дадатковы пратакол і іншыя сакрэтныя дамоўленасці з Германіяй юрыдычна неправадзейнымі і несапраўднымі з моманту іх падпісання.

**1 верасня 1939 г.** Германія напала на Польшчу. 3 верасня 1939 г. Англія і Францыя, падтрымліваючы ахвяру агрэсіі — Польшчу, аб'явілі вайну Германіі. Пачалася Другая сусветная вайна.

### Гістарычная даведка

Другая сусветная вайна — самая крывапралітная вайна ў гісторыі чалавецтва. Яна працягвалася 6 гадоў — з 1 верасня 1939 да 2 верасня 1945 г. У яе былі ўцягнуты 61 дзяржава, больш за 80 % тагачаснага насельніцтва Зямлі. Ваенныя дзеянні адбываліся на тэрыторыі 40 дзяржаў, а таксама на марскіх і акіянскіх прасторах. Па няпоўных звестках, у вайне загінулі 50—55 млн чалавек.

Людскія страты Савецкага Саюза ў вайне 1941—1945 гг. складаюць больш за 27 млн чалавек. У іх ліку — 6,8 млн чалавек былі забітымі на полі бою, загінулі ў выніку раненняў, аварый, няшчасных выпадкаў і г. д., 2,2 млн чалавек загінулі ў варожым палоне, 7,4 млн чалавек мірнага насельніцтва было знішчана гітлераўцамі наўмысна, 2,6 млн чалавек загінулі на прымусовых работах у Германіі, 1,5 млн чалавек загінулі ў зоне ваенных дзеянняў і ва ўмовах блакады, 82 тыс. савецкіх воінаў загінулі пры разгроме японскай Квантунскай арміі ў жніўні 1945 г. і 6,7 млн чалавек склалі дэмаграфічныя страты (не нарадзіліся, памерлі ў выніку хвароб, няшчасных выпадкаў, аварый і г. д.). Прыкладна 56 % усіх страт насельніцтва складаюць мірныя жыхары гарадоў і вёсак. Гэта сведчыць аб чалавеканенавісніцкім характары нацысцкага рэжыму, палітыцы генацыду ў адносінах да народаў СССР.



Правообладатель Народная асвета

**Асноўныя этапы Вялікай Айчыннай вайны.** Састаўной і рашаючай часткай Другой сусветнай вайны з'яўлялася ***Вялікая Айчынная вайна.***

У гісторыі Вялікай Айчыннай вайны можна вылучыць тры асноўныя этапы. **Першы этап** — нападзенне нацысцкай Германіі на СССР, няўдачы і паражэнні Чырвонай Арміі, разгром немцаў пад Масквой, пачатак павароту ў вайне (**22 чэрвеня 1941 — 18 лістапада 1942 г.**). Гэты этап у гісторыі вайны звязаны з мужнасцю і гераізмам савецкіх воінаў і ў той жа час з няўдачамі і паражэннямі Чырвонай Арміі летам і восенню 1941 г. Былі разгромлены і акружаны буйныя савецкія групоўкі войскаў на захад ад Мінска, у раёне Кіева, Вязьмы і Бранска, у іншых мясцінах краіны. У палон была ўзята вялікая колькасць савецкіх ваеннаслужачых. Вораг захапіў шмат ваеннай тэхнікі і ўзбраенняў, боепрыпасаў, гаруча-змазачных матэрыялаў, што знаходзіліся на складах уздоўж заходняй граніцы СССР. Разгром немцаў пад Масквой зімой 1941—1942 гг. паклаў пачатак павароту ў вайне, канчаткова пахаваў гітлераўскую стратэгію «бліцкрыгу» і развеяў міф аб непераможнасці германскай арміі. Актывізаваўся рух Супраціўлення ў заваяваных Германіяй, Італіяй, Японіяй краінах Еўропы і Азіі, канчаткова сфарміравалася антыгітлераўская кааліцыя.

**Другі этап** — карэнны пералом у ходзе вайны, крушэнне наступальнай стратэгіі фашысцкага блоку (**19 лістапада 1942 — снежань 1943 г.**). Ён звязаны з разгромам войскаў Германіі і яе саюзнікаў пад Сталінградам і на Курскай дузе, паспяховым наступленнем Чырвонай Арміі летам — восенню 1943 г., вызваленнем левабярэжнай Украіны і сталіцы савецкай Украіны Кіева. Стратэгічная ініцыятыва ў вядзенні баявых дзеянняў канчаткова перайшла ў рукі савецкага ваеннага камандавання.

**Трэці этап** — выгнанне варожых войскаў за межы СССР, вызваленне ад акупацыі краін Еўропы, поўны крах нацысцкай Германіі (**студзень 1944 — 9 мая 1945 г.**). Гэты этап звязаны з шэрагам магутных удараў Чырвонай Арміі ў 1944 г., у іх ліку — Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён», якая закончылася выгнаннем акупантаў з захопленай савецкай тэрыторыі і аднаўленнем дзяржаўнай граніцы СССР. На гэтым этапе вайны былі вызвалены ад нямецка-фашысцкай акупацыі краіны Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропы і адбылася поўная і безагаворачная капітуляцыя гітлераўскай Германіі.

**Характар Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа**. Характар вайны вызначаецца мэтамі і задачамі, якія стаяць перад краінай. Савецкі Саюз у навязанай яму вайне ставіў за мэту абарону Айчыны, вызваленне акупіраванай ворагам савецкай тэрыторыі і насельніцтва. Таму гэта была вайна савецкага народа за свабоду і незалежнасць Айчыны, за права людзей жыць і працаваць на роднай зямлі. Адсюль назва — «Айчынная вайна». У літаратуры яе яшчэ называюць «народнай», «свяшчэннай».



Правообладатель Народная асвета

Па маштабах баявых дзеянняў, жорсткасці барацьбы, ваенна-палітычных і міжнародных выніках вайна з'яўлялася сапраўды «Вялікай». Яна працягвалася 1418 дзён і начэй, з іх 1320 сутак, ці 93 %, прыходзілася на актыўныя баявыя дзеянні. Працягласць савецка-германскага фронту на розных этапах вайны складала ад 3 да 6,2 тыс. кіламетраў, у той час калі ў Італіі і Паўночнай Афрыцы працягласць франтоў не перавышала 300—350 км, а ў Заходняй Еўропе — 800 км.

Да сярэдзіны 1944 г. на савецка-германскім фронце адначасова дзейнічалі ад 190 да 270 дывізій праціўніка, у той час як супраць англа-амерыканскіх войскаў у Паўночнай Афрыцы і ў Італіі — ад 7 да 26 дывізій. За гады вайны на савецка-германскім фронце было знішчана 607 дывізій вермахта. Англія і ЗША разбілі і ўзялі ў палон у Паўночнай Афрыцы і Заходняй Еўропе 176 дывізій.

У 1941—1945 гг. супраць СССР ваявала не толькі нацысцкая Германія, але і яе саюзнікі — Італія, Венгрыя, Румынія, Фінляндыя, Славакія і Харватыя. Іспанія афіцыйна вайну Савецкаму Саюзу не аб'яўляла, але дывізію сваіх войскаў у групу германскіх армій «Поўнач» накіравала. У распараджэнні Германіі знаходзіліся прамысловыя магутнасці і рэсурсы паліва і электраэнергіі, па сутнасці, усіх краін Еўропы. Таму вайну 1941—1945 гг. ніяк не назавеш савецка-германскай ці германа-савецкай, як гэта робяць некаторыя гісторыкі. Вайна 1941—1945 гг. — гэта вайна сапраўды «Айчынная» і сапраўды «Вялікая». Яе так назвалі тыя, хто ўступіў у смяротную сутычку з фашызмам і за кошт вялікіх ахвяр і пакут задушыў яго ва ўласным логаве.

Савецкія воіны і працаўнікі тылу не толькі абаранілі гонар, свабоду і незалежнасць сваёй Айчыны. Яны вызвалілі ад фашысцкага варварства народы шэрага краін Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропы. Савецкі Саюз зрабіў усё магчымае для таго, каб фашызм і яго «новы парадак» не маглі адрадзіцца на нямецкай зямлі, каб ад Германіі больш ніколі не зыходзіла небяспека новай вайны і каб мір і бяспека ўсталяваліся ў Еўропе і ва ўсім свеце.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *23 жніўня 1939 г., 1 верасня 1939 г., 22 чэрвеня 1941 — 18 лістапада 1942 г., 19 лістапада 1942 — снежань 1943 г., студзень 1944 — 9 мая 1945 г.; Вялікая Айчынная вайна.*

### Пытанні і заданні

**1.** Калі пачалася Другая сусветная вайна? Якія падзеі сталі пачаткам Другой сусветнай вайны? **2.** Растлумачце прычынна-выніковыя сувязі паміж: палітыкай «прымірэння» агрэсара, заключэннем пакта Молатава — Рыбентропа і пачаткам Другой сусветнай вайны (гл. *памятку 4*). **3.** Назавіце храналагічныя рамкі этапаў Вялікай Айчыннай вайны і асноўныя падзеі кожнага этапу. (*Выкарыстайце веды па сусветнай гісторыі.*) **4.** Чым вызначаецца характар вайны? Якім быў характар Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа?



Правообладатель Народная асвета

## Ваша меркаванне

Германскія фашысты, плануючы «маланкавую» вайну супраць СССР, спадзяваліся, што шматнацыянальная савецкая краіна ва ўмовах вайны распадзецца на асобныя часткі, якія будуць хутка заваяваны. Надзеі гітлераўцаў не спраўдзіліся: народы СССР сумесна выступілі супраць акупантаў і разграмілі іх. Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны багата подзвігамі людзей усіх нацыянальнасцей, якія пражывалі ў СССР.

Чым, на ваш погляд, тлумачыцца такое адзінства савецкага народа ў барацьбе з германскімі захопнікамі? Ці згодны вы з тым, што вытокі адзінства і гераізму савецкага народа трэба шукаць у перадваеннай гісторыі СССР? Сваю думку абгрунтуйце *(гл. памятку 8)*.

## Гэта цікава

Своеасаблівым гімнам абароны Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны стала песня «Свяшчэнная вайна» кампазітара А. Аляксандрава на словы В. Лебедзева-Кумача. У ёй былі такія словы:

Вставай, страна огромная,
Вставай на смертный бой
С фашистской силой темною,
С проклятою ордой.
Пусть ярость благородная
Вскипает, как волна,
Идет война народная,
Священная война!

24 чэрвеня 1941 г. у газетах «Известия» і «Красная звезда» быў апублікаваны верш В. Лебедзева-Кумача «Священная война». Адразу пасля публікацыі кампазітар А. Аляксандраў напісаў да яго музыку. Друкаваць словы і ноты не было калі, і Аляксандраў напісаў іх мелам на дошцы, а музыканты перапісалі іх у свае сшыткі. Ужо 27 чэрвеня 1941 г. на Беларускім вакзале ў Маскве група Чырванасцяжнага ансамбля чырвонаармейскай песні і танца СССР упершыню выканала гэтую песню. Па ўспамінах відавочнікаў, песню ў той дзень выконвалі пяць разоў.

З 15 кастрычніка 1941 г. «Священная война» стала кожны дзень гучаць па Усесаюзным радыё — кожную раніцу пасля боя крамлёўскіх курантаў. Песня была вельмі папулярнай на франтах Вялікай Айчыннай вайны, яна падтрымлівала высокі баявы дух у войсках, асабліва ў цяжкіх абарончых баях.

У пасляваенны час гэтая песня часта выконвалася Чырванасцяжным ансамблем песні і танца Савецкай Арміі імя А. Аляксандрава і мела шырокі поспех як у СССР, так і на зарубежных гастролях. 22 мая 2007 г. Ансамбль песні і танца Расійскай арміі імя А. Аляксандрава пад апладысменты выканаў гэтую песню ў штаб-кватэры НАТА ў Бруселі.



Правообладатель Народная асвета

## § 21. УЗ’ЯДНАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ З БССР

**Успомніце. 1.** Калі Германія напала на Польшчу? **2.** Якімі былі вынікі вайны Германіі супраць Польшчы?

**Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Устанаўленне савецкай улады ў Заходняй Беларусі.** Нягледзячы на мужнасць польскіх салдат і афіцэраў, германскія войскі імкліва рухаліся ў глыб польскай тэрыторыі. Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна апынуліся пад пагрозай фашысцкага зняволення. Кіраўніцтва Германіі, пачынаючы ваенную кампанію, падштурхоўвала Савецкі Саюз хутчэй выступіць супраць Польшчы. СССР павінен быў заняць тыя тэрыторыі, якія ўваходзілі ў сферу яго інтарэсаў, у тым ліку частку тэрыторыі карэннай Польшчы аж да Варшавы. Гітлераўцы тым самым стараліся ўскласці адказнасць за развязванне вайны і на Савецкі Саюз. Аднак савецкае кіраўніцтва не паддалося на гэтую правакацыю.

15 верасня 1939 г. гітлераўскімі войскамі быў захоплены Беласток, а 18 верасня польская вайсковая групоўка «Брэст» з баямі пакінула крэпасць. **17 верасня 1939 г.**, калі амаль уся тэрыторыя карэннай Польшчы была занята нямецкімі войскамі, польская дзяржава была фактычна знішчана, савецкае кіраўніцтва дало загад войскам Чырвонай Арміі перайсці савецка-польскую граніцу. Мэтай гэтага паходу было пакласці канец прыгнёту працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны і забяспечыць ім поўную бяспеку, не дапусціць іх рабавання гітлераўскімі захопнікамі.

Баявых дзеянняў паміж савецкімі і польскімі войскамі ва ўсёй паласе Беларускага фронту фактычна не было. Зафіксаваны выпадкі супраціўлення пагранічных польскіх патрулёў, а таксама баі пад Кобрынам і Сапоцкінам. Найбольш моцнае супраціўленне савецкім войскам аказалі польскія ваенныя фарміраванні ў Гродне, дзе ў выніку баёў 20—21 верасня 1939 г. было шмат забітых і параненых.

### Гістарычная даведка

Беларускі і Украінскі франты былі створаны загадам наркама абароны СССР К. Варашылава 11 верасня 1939 г. Беларускі фронт налічваў 200 802 салдаты і афіцэры. Яму супрацьстаяла 45 тыс. польскіх салдат і афіцэраў, з якіх прыкладна палова не была ўзброена і не зведзена ў канкрэтныя воінскія адзінкі.

У воінскіх часцях польскай арміі на «крэсах усходніх» знаходзілася шмат беларусаў. У час вераснёўскіх баёў 1939 г. гарнізон Брэсцкай крэпасці амаль на 40 % складаўся з рэзервістаў-беларусаў. З 300 тыс. польскіх вайскоўцаў, што трапілі ў германскі палон, 40 тыс. назваліся беларусамі.

Да 25 верасня 1939 г. Чырвоная Армія вызваліла Заходнюю Беларусь ад польскіх войскаў. Большасць насельніцтва сустракала савецкіх салдат з радасцю, кветкамі, хлебам-соллю.



Правообладатель Народная асвета

Яшчэ да прыходу савецкіх вайсковых часцей у некаторых месцах ствараліся партызанскія атрады, адбывалася раззбраенне паліцыі і асаднікаў. У сёлах і мястэчках фарміраваліся рэвалюцыйныя камітэты, якія браліся за выкананне ўладных функцый.



Чырвонаармейцы раздаюць савецкія газеты насельніцтву Заходняй Беларусі. Верасень 1939 г.

Адначасова з прыходам войскаў Чырвонай Арміі ажыццяўлялася ўсталяванне новага ладу жыцця. У ваяводствах і павятовых цэнтрах ствараліся *часовыя ўправы* як органы новай улады. Яны арганізоўвалі на фабрыках і заводах камітэты рабочага кантролю, забяспечвалі насельніцтва прадуктамі харчавання, наладжвалі медыцынскае абслугоўванне, рэгулявалі цэны на прамысловыя і харчовыя тавары, змагаліся са спекуляцыяй, адчынялі школы. Пры часовых управах ствараліся атрады рабочай гвардыі.

У вёсках і мястэчках былі створаны *сялянскія камітэты*, якія дзялілі памешчыцкую, асадніцкую і царкоўную зямлю, бралі на ўлік маёмасць, інвентар, жывёлу і запасы збожжа ў былых памешчыцкіх маёнтках. Малазямельныя і беззямельныя сяляне атрымалі ворную зямлю, жывёлу, зерне на пасеў. Памешчыцкае землеўладанне было ліквідавана, у вёсцы павялічылася серадняцкая праслойка.

**28 верасня 1939 г.** СССР і Германія падпісалі новы дагавор *«Аб дружбе і граніцы»*. Паводле дагавора граніца была праведзена крыху на захад ад так званай *«лініі Керзана»*, вызначанай яшчэ ў 1919 г. Вярхоўным саветам Антанты як усходняя граніца Польшчы. Гэта была этнічная мяжа паміж беларусамі і палякамі. Прыкладна па гэтай лініі праходзіць і сёння беларуска-польская граніца. Да дагавора былі прыкладзены два сакрэтныя пратаколы, згодна з якімі ў сферу ўплыву СССР дадаткова ўключаліся Літва і Фінляндыя. Дагавор «Аб дружбе і граніцы» ў цэлым і асабліва ў той частцы, якая тычылася «дружбы» Савецкага Саюза з нацысцкай Германіяй, нанёс вялікі ўрон міжнароднаму аўтарытэту СССР, дэзарыентаваў антыфашысцкія сілы ў многіх краінах у пачатку Другой сусветнай вайны.



В. Молатаў падпісвае савецка-германскі дагавор «Аб дружбе і граніцы». Стаяць (злева-направа): І. фон Рыбентроп, І. Сталін, В. Паўлаў. 28 верасня 1939 г.



Правообладатель Народная асвета



ДЭКЛАРАЦЫЯ
НАРОДНАГА САБРАННЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ
АБ УВАХОДЖАННІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў САСТАЎ БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ

*Прынята аднагалосна на пасяджэнні 29 кастрычніка 1939 г.*

У цяжкую гадзіну, пагражаўшую разгромам і знішчэннем нашаму народу, вялікі Совецкі Саюз узяў пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Беларусі.

З дапамогаю непераможнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі народы Заходняй Беларусі вызваліліся ад панавання памешчыкаў і капіталістаў. Назаўсёды мінулі чорныя годы знявагі беларускага народа пад ігам польскіх паноў, папіраўшых элементарныя правы і нацыянальнае дастоінства беларускага народа.

Працоўныя Заходняй Беларусі заўсёды лічылі сябе звязанымі неразрыўнымі, кроўнымі узамі з сваімі братамі, пабудаваўшымі Совецкую Соцыялістычную Беларусь.

Працоўныя Заходняй Беларусі рашуча патрабуюць аб'яднання дагэтуль расчлененых двух частак адзінага беларускага народа, адзінай беларускай зямлі.

Лічачы волю беларускага народа вышэйшым законам, Беларускае Народнае Сабранне пастанаўляе:

*Прасіць Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Совецкага Саюза і Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, аб'яднаць беларускі народ у адзіную дзяржаву і пакласці тым самым канец раз'яднанню беларускага народа.*

Толькі ў саставе Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі народ Заходняй Беларусі зможа залячыць глыбокія раны, нанесеныя яму доўгімі гадамі заняволення і з дапамогаю вялікага Совецкага Саюза ўзняць і перабудаваць гаспадарку, развіць сваю нацыянальную культуру, дастойную свабоднага народа, і забяспечыць росквіт дабрабыту ўсіх працоўных Заходняй Беларусі.

Няхай жыве Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка!

Няхай жыве наша магутная радзіма — вялікі Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Дэкларацыя Народнага сходу Заходняй Беларусі аб уваходжанні яе ў склад БССР

**Народны сход Заходняй Беларусі.** Для вызначэння далейшага лёсу заходнебеларускіх зямель было вырашана склікаць *Народны сход* Заходняй Беларусі з выбраных насельніцтвам дэпутатаў. Выбары дэпутатаў Народнага сходу адбыліся 22 кастрычніка 1939 г. У выбарах удзельнічалі амаль 97 % выбаршчыкаў. Сярод выбраных 929 дэпутатаў сходу пераважалі былыя актыўныя ўдзельнікі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Дэпутаты былі прадстаўнікамі розных пластоў насельніцтва і розных нацыянальнасцей.

Пасяджэнні Народнага сходу Заходняй Беларусі пачаліся **28 кастрычніка 1939 г.** у гарадскім тэатры Беластока ў святочнай атмасферы. У рабоце сходу прымалі ўдзел прадстаўнікі ўрада БССР, народныя паэты Беларусі Янка Купала і Якуб Колас. Па дакладах дэпутатаў *С. Прыцыцкага* і *Ф. Манцэвіча* 29 кастрычніка 1939 г. сход аднагалосна прыняў *Дэкларацыю аб дзяржаўнай уладзе* і *Дэкларацыю аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР*. У гэтых дакументах абвяшчалася аб устанаўленні савецкай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў асобе Саветаў дэпутатаў працоўных. Утрымліваўся таксама зварот да Вярхоўных Саветаў СССР і БССР аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Савецкага Саюза і Беларускай ССР.

У апошні дзень работы Народнага сходу **30 кастрычніка 1939 г.** аднагалосна былі прыняты дэкларацыі аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці і канфіскацыі памешчыцкіх зямель.

## Гістарычны партрэт



**Прытыцкі Сяргей Восіпавіч** (1913—1971) нарадзіўся ў в. Гаркавічы Саколкаўскага павета Гродзенскай губерні ў сялянскай сям'і. Савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. У студзені 1936 г. у Віленскім акруговым судзе ў час судовага працэсу над 17 рэвалюцыянерамі па заданні ЦК КПЗБ страляў у правакатара, быў цяжка паранены і арыштаваны. У чэрвені 1936 г. быў прыгавораны да пакарання смерцю. Дзякуючы актыўнай барацьбе працоўных Заходняй Беларусі, Польшчы, СССР, Францыі, ЗША, Анг-



Правообладатель Народная асвета

лії і іншых краін смяротны прыгавор быў заменены пажыццёвым турэмным зняволеннем. У верасні 1939 г. вызвалены з турмы. У гады Вялікай Айчыннай вайны з'яўляўся адным з арганізатараў камуністычнага падполля і партызанскага руху ў Беларусі. У пасляваенныя гады знаходзіўся на партыйнай і савецкай рабоце. З 1968 г. з'яўляўся Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

Сход выбраў паўнамоцную камісію для паездкі ў Маскву, каб перадаць рашэнне аб уступленні Заходняй Беларусі ў склад Савецкага Саюза. 17 верасня Народны сход абвясціў Днём усенароднага свята.

2 лістапада 1939 г. нечарговая 5-я сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла Закон аб уключэнні ў склад СССР Заходняй Беларусі і яе ўз'яднанні з БССР. У сярэдзіне лістапада 1939 г. 3-я (нечарговая) сесія Вярхоўнага Савета БССР пастанавіла прыняць Заходнюю Беларусь у склад БССР.



Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР (17 верасня — 14 лістапада 1939 г.)



Правообладатель Народная асвета

У выніку ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР тэрыторыя апошняй павялічылася з 125,6 да 225,6 тыс. км$^2$, а насельніцтва — з 5,6 да 10,3 млн чалавек. На далучанай тэрыторыі было ўтворана 5 абласцей — Баранавіцкая, Брэсцкая, Беластоцкая, Вілейская і Пінская, якія ў сваю чаргу падзяляліся на раёны і сельсаветы.

**Гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі пасля аб'яднання з БССР.** Уз'яднанне з БССР паскорыла развіццё прамысловасці Заходняй Беларусі. Аднаўляліся і пашыраліся прамысловыя прадпрыемствы, вялося будаўніцтва новых. Аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся ў канцы 1940 г. амаль у 2 разы ў параўнанні з 1938 г. і склаў 27,6 % прамысловай вытворчасці рэспублікі.

З восені 1939 г. на базе былых памешчыцкіх маёнткаў пачалі ствараціца калгасы і саўгасы. У іх запісвалася ў асноўным маламаёмаснае сялянства, якое бачыла ў гэтым сродак выратавання ад беднасці. У адносінах да заможных сялян праводзілася палітыка абмежавання шляхам устанаўлення павышаных грашовых і натуральных падаткаў. Да чэрвеня 1941 г. было створана 1115 калгасаў і 28 саўгасаў, якія аб'ядноўвалі каля 7 % сялянскіх гаспадарак. Задача ажыццяўлення суцэльнай калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі ў тыя гады не ставілася.

Ажыццяўляліся таксама пераўтварэнні ў галіне культуры. Ужо восенню 1939 г. было адкрыта шмат новых школ. Дзясяткі тысяч дзяцей сялян і рабочых мелі магчымасць бясплатна атрымаць адукацыю. Адчынялі дзверы новыя бальніцы, амбулаторыі, медыцынскія пункты, якія бясплатна абслугоўвалі насельніцтва.

Для падрыхтоўкі кадраў спецыялістаў ствараліся новыя навучальныя ўстановы. У 1939—1940 гг. пачалі работу Беластоцкі педагагічны, Баранавіцкі, Гродзенскі і Пінскі настаўніцкія інстытуты, а таксама школьныя педагагічныя вучылішчы ў Беластоку, Брэсце, Гродне, Маладзечне, Навагрудку і Пінску і дашкольныя — у Ваўкавыску і Лідзе. Працавалі медыцынскія і народнагаспадарчыя тэхнікумы. Функцыянавалі драматычныя тэатры, бібліятэкі, кінатэатры, дамы культуры.

Уз'яднанне Заходняй Беларусі з СССР і БССР мела гістарычнае значэнне. Быў пакладзены канец падзелу беларускага этнасу і беларускай этнічнай тэрыторыі. Збылася адвечная мара беларускага народа жыць у адзінай дзяржаве. Уключэнне заходнебеларускіх зямель у склад СССР і БССР садзейнічала паскарэнню іх сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця.

Напярэдадні вайны Беларуская ССР была адной з індустрыяльна-аграрных рэспублік Савецкага Саюза. У яе склад уваходзілі 10 абласцей і 188 раёнаў. На тэрыторыі БССР уздоўж заходняй граніцы краіны ствараліся баявыя ўмацаванні — «лінія Молатава». Вялося будаўніцтва авіяцыйных заводаў у Мінску і Магілёве, танкарамонтных заводаў у Віцебску і Баранавічах. Войскі, якія знаходзіліся на тэрыторыі рэспублікі, забяспечваліся новай баявой тэхнікай, узбраеннямі і сродкамі сувязі. Дзейнічалі шматлікія абаронныя і спартыўныя таварыствы. Праводзілася вялікая работа па выхаванні ў савецкіх людзей пачуцця патрыятызму, гатоўнасці



Правообладатель Народная асвета

абараняць Айчыну. Абарона Заходняй граніцы СССР ускладвалася на войскі 5 прыгранічных ваенных акруг.

Вясной і ў пачатку лета 1941 г. для адпору магчымай фашысцкай агрэсіі Савецкай дзяржавай былі прыняты тэрміновыя меры. Для папаўнення войскаў у заходнія ваенныя акругі пад выглядам вучэбных збораў былі накіраваны 800 тыс. рэзервістаў. Пачалося скрытае перакідванне з унутраных ваенных акруг Савецкага Саюза ў заходнія, у тым ліку і на тэрыторыю БССР, дадатковага кантынгенту савецкіх войскаў у колькасці 7 армій (66 дывізій). Да дзяржаўнай граніцы скрыта, начнымі маршамі, рухаліся дывізіі рэзерваў заходніх акруг, а пад выглядам вучэнняў — арміі другога стратэгічнага эшалона прыкрыцця граніцы.

Хоць савецкія войскі і былі падцягнуты да граніцы, у стан павышанай баявой гатоўнасці яны не прыводзіліся. У адпаведнасці з прапановамі Генштаба Узброеных Сіл СССР ад 15 мая 1941 г. займаць абарону павінны былі войскі, якія знаходзіліся непасрэдна каля граніцы. Іншыя войскі прызначаліся для нанясення контрудараў і разгортвання наступлення.

**Даты, якія трэба ведаць:** *17 верасня 1939 г., 28 верасня 1939 г., 28—30 кастрычніка 1939 г.*

### Пытанні і заданні

**1.** Калі і пры якіх знешнепалітычных умовах адбыўся паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь? Якімі былі вынікі гэтага паходу? **2.** Назавіце органы савецкай улады, якія былі сфарміраваны ў Заходняй Беларусі, і іх першыя мерапрыемствы. **3.** З якой мэтай і калі быў скліканы Народны сход Заходняй Беларусі? Якія рашэнні ён прыняў? **4.** Ахарактарызуйце эканамічныя і культурныя пераўтварэнні, якія праводзіліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі пасля ўз'яднання з БССР. **5.** Дайце абгрунтаваную ацэнку гістарычнаму факту — уз'яднанню Заходняй Беларусі з БССР (гл. *памятку 2*). **6.** Ахарактарызуйце становішча БССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. **7.** Закончыце запаўненне табліцы. (*Выкарыстайце карту на с. 119.*) Зрабіце вывады, запішыце іх у форме тэзісаў (гл. *памяткі 5, 9*).

**Тэрытарыяльныя змены Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (1919—1939)**

| Перыяд | Гістарычныя ўмовы | Тэрытарыяльныя змены |
|---|---|---|
| Верасень — лістапад 1939 г. | | |

### Гэта цікава

У верасні 1939 г. Чырвоная Армія вызваліла Вільню і Віленскі край, якія раней знаходзіліся ў складзе Польшчы. Насельніцтва і часовыя органы мясцовай улады Віленшчыны рыхтаваліся да ўдзелу ў выбарах дэпутатаў Народнага сходу Заходняй Беларусі. Але ў пачатку кастрычніка 1939 г. у Маскве пачаліся перагаворы паміж СССР і Літвой. На аснове дасягнутага пагаднення Вільня і Вілен-



Правообладатель Народная асвета

скі край кіраўніцтвам СССР былі перададзены буржуазнай Літве.

На сесіі Вярхоўнага Савета СССР 1 жніўня 1940 г. наркам замежных спраў СССР В. Молатаў сказаў:

«Савецкі Саюз пайшоў на перадачу г. Вільні Літоўскай Рэспубліцы не таму, што ў ім пераважае літоўскае насельніцтва. Не, у Вільні большасць складае нелітоўскае насельніцтва. Але савецкі ўрад лічыўся з тым, што горад Вільня, які Польшчай быў насільна «адлучаны», павінен належаць Літве, як такі горад, з якім звязана, з аднаго боку, гістарычнае мінулае Літоўскай дзяржавы, а з другога, спадзяванні літоўскага народа».


Оперативная сводка
Генерального штаба РККА
18 сентября

В течение 18 сентября войска Красной Армии продолжали отбрасывать части польской армии и к вечеру заняли:

На севере — в Западной Белоруссии — гор. **Свенцяны**, железнодорожный узел **Лида**, гор. **Новогрудок**, м. **Оряя** (на реке Неман), города **Слоним**, **Волковыск** и ж.-д. станцию **Ягловичи** (на ж.-д. линии Минск — Брест-Литовск).

На юге — в Западной Украине — железнодорожный узел **Сарны**, города **Луцк**, **Станиславов**, **Галич**, **Красне**, **Бучач**.

Передовые колонны Красной Армии приближаются к гор. **Львову** и **Вильно**.

Оперативная сводка
Генерального штаба РККА
19 сентября 1939 г.

В течение 19 сентября части Красной Армии продолжали теснить польские войска и к концу дня заняли:

На севере — в Западной Белоруссии после двухчасового боя — гор. **Вильно**, м. **В. Берестовица** (50 клм. восточнее Белостока), гор. **Пружаны**, гор. **Кобрин** (40 клм. сев.-восточнее Брест-Литовска).

На юге — в Западной Украине — гор. **Владимир-Волынский**, **Сокаль** (на р. Буг), **Броды**, **Бобрка**, **Рогатин**, **Долина**. Кавалерийские и танковые части вступили в северо-восточную и южную окраины гор. **Львова**.

Аператыўныя звесткі Генеральнага штаба Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі за 18 і 19 верасня 1939 г.

## Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (кнізе «Памяць») звесткі аб падзеях, якія адбываліся на тэрыторыі вашага краю ў 1939—1941 гг. Падрыхтуйце паведамленне.

## § 22. ПАЧАТАК ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**Успомніце. 1.** Якой была кодавая назва плана вайны Германіі супраць СССР? Што прадугледжваў гэты план? **2.** Якімі былі асноўныя кірункі ўдараў нямецка-фашысцкіх войскаў летам 1941 г.?

**Нападзенне нацысцкай Германіі на СССР. Мэты Германіі ў вайне супраць Савецкага Саюза.** Парушыўшы савецка-германскі дагавор аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 г., нацысцкая Германія **22 чэрвеня 1941 г.** вераломна напала на СССР. Яе мэтамі ў вайне з'яўляліся:

1) пашырэнне жыццёвай прасторы для германцаў за кошт далучэння ўсходніх тэрыторый, заваяванне сусветнага панавання;

2) разгром Узброеных Сіл СССР, знішчэнне Савецкай дзяржавы, падзел тэрыторыі і багаццяў СССР паміж Германіяй і яе саюзнікамі, стварэнне на прасторах СССР дробных дзяржаўных утварэнняў каланіяльнага і паўкаланіяльнага тыпу.

Нацысты планавалі засяліць Украіну, Беларусь, Літву, Латвію, Эстонію 10 млн нямецкіх каланістаў — «сапраўднымі гаспадарамі зямлі і прамысловасці», потым уключыць гэтыя землі ў склад «вялікай Германіі». У Закаўказзі і Сярэдняй Азіі меркавалі арганізаваць з буржуазных нацыяналістаў марыянетачныя ўрады, цалкам падпарадкаваныя Берліну, і дыслакаваным там гарнізонам нямецкіх войскаў.



Правообладатель Народная асвета

Маскву нацысты хацелі знішчыць цалкам, а Ленінград — разбурыць і перадаць саюзнай Фінляндыі. Румыніі за ваенную дапамогу абяцалі аддаць Малдавію і Адэсу, Італіі — шэраг зямель на поўдні СССР. Правячым колам Турцыі пры ўступленні ў вайну абяцалі перадаць шэраг раёнаў Закаўказзя, Японіі — савецкі Далёкі Усход і Усходнюю Сібір. Не забыліся нацысты і пра Злучаныя Штаты Амерыкі і Англію. Калі яны прызнаюць першынство Германіі ў свеце, вернуць ёй калоніі, прымкнуць да ваеннага паходу супраць СССР ці будуць нейтральнымі — пры гэтых умовах нацысты абяцалі ЗША аддаць Чукотку і Камчатку, Англіі — поўнач еўрапейскай часткі СССР з Мурманскам і Архангельскам;

3) фізічнае знішчэнне большай часткі славян — насельніцтва «ніжэйшай расы», анямечванне астатніх славян і ператварэнне іх у рабоў нямецкіх каланізатараў. У Мінску, напрыклад, планавалася пакінуць 100 тыс. чалавек мясцовага насельніцтва і пасяліць 50 тыс. нямецкіх каланістаў, у Гомелі — адпаведна 50 і 30 тыс., у Магілёве і Бабруйску — па 50 і 20 тыс., у Барысаве, Лідзе і Навагрудку — па 15 тыс. мясцовага насельніцтва і 5 тыс. нямецкіх каланістаў і г. д.

22 чэрвеня 1941 г. у 12 гадзін дня з Заявай Савецкага ўрада па радыё выступіў наркам замежных спраў В. Молатаў, які выказаў упэўненасць у перамозе над агрэсарам. Вайна з першых дзён атрымала назву «Вялікай Айчыннай». Па ўсёй краіне, у тым ліку ў Беларусі, праводзілася ***мабілізацыя*** ў дзеючую Чырвоную Армію ваеннаабавязаных запасу.

СССР быў вымушаны пайсці на жорсткую цэнтралізацыю кіраўніцтва дзяржавай. 23 чэрвеня 1941 г. была створана *Стаўка Галоўнага Камандавання* (пазней — *Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання*), а 30 чэрвеня — *Дзяржаўны камітэт абароны* на чале з І. Сталіным.

З тэрыторыі Беларусі ажыццяўлялася ***эвакуацыя*** мірнага насельніцтва і матэрыяльных каштоўнасцей ва ўсходнія раёны СССР.

За кароткі час было эвакуіравана звыш 1,5 млн чалавек, 124 прадпрыемствы, тысячы металаапрацоўчых станкоў, матораў, тэкстыльных, швейных, гарбарна-абутковых і трыкатажных машын, трактароў, камбайнаў, малатарняў. Вывозіліся гатовая прадукцыя і сыравіна, збожжа і прадукты харчавання, пераганяліся на ўсход сотні тысяч галоў жывёлы. Эвакуіравалася таксама частка ўстаноў адукацыі, навукі і культуры.

Насельніцтва Беларусі дапамагала Чырвонай Арміі. У будаўніцтве абарончых аб'ектаў па ўмацаванні рубяжоў на тэрыторыі рэспублікі ўдзельнічалі каля 2 млн чалавек.



І. Сталін (Джугашвілі)



Правообладатель Народная асвета



Апалчэнцы-гамяльчане вядуць агонь па ворагу каля в. Краснае Гомельскага р-на. 1941 г.



Магіляўчане капаюць процітанкавыя равы пад Магілёвам. 1941 г.

З добраахвотнікаў, якія не падлягалі прызыву ў армію, былі створаны дзясяткі *знішчальных батальёнаў* і сотні фарміраванняў **народнага апалчэння**, што вялі барацьбу з дэсантамі праціўніка, шпіёнамі, ахоўвалі прамысловыя аб'екты, дзяржаўныя ўстановы, лініі сувязі. Разам з часцямі Чырвонай Арміі добраахвотнікі ўдзельнічалі ў абарончых баях.

**Абарончыя баі ў Беларусі і іх вынікі. Гераізм і патрыятызм савецкіх людзей.** Напад на СССР гітлераўцы пачалі моцным артылерыйскім абстрэлам прыгранічных раёнаў і авіяналётамі на месцы размяшчэння савецкіх войскаў, на аэрадромы, казармы, чыгуначныя вузлы, гарады. На Мінск, Смаленск і Маскву наступала група армій *«Цэнтр»* на чале з генерал-фельдмаршалам Ф. фон Бокам. Ёй супрацьстаяў *Заходні фронт,* якім камандаваў генерал арміі *Д. Паўлаў*.

Галоўны ўдар па савецкіх войсках у Беларусі германская армія нанесла ў раёнах Гродна і Брэста. Ужо ў першых баях войскі праціўніка адчулі на сабе такую моц супраціўлення, якой яны не сустракалі ў час вядзення баявых дзеянняў у Заходняй і Цэнтральнай Еўропе. Нягледзячы на тое што часці Чырвонай Арміі 23 чэрвеня 1941 г. пакінулі Гродна і адышлі за раку Нёман, савецкая танкавая дывізія контратакавала праціўніка і адкінула яго на захад на некалькі кіламетраў.

Гераічна змагаліся з ворагам пагранічнікі, лётчыкі, прадстаўнікі ўсіх родаў савецкіх войскаў. Гінулі, але не пакідалі баявыя пазіцыі воіны пагранічных застаў, якімі камандавалі *М. Ішкоў, А. Кіжаватаў, І. Ціханаў, В. Усаў*. Лётчыкі *П. Рабцаў, А. Данілаў, С. Гудзімаў, Д. Кокараў* таранілі варожыя самалёты. Экіпажы бамбардзіроўшчыкаў пад камандаваннем *М. Гастэлы, А. Маслава* здзейснілі наземныя тараны. На працягу першага дня вайны ў паветраных баях было збіта больш за 100 нямецкіх самалётаў.

Усяму свету вядома гераічная абарона *Брэсцкай крэпасці*. За бессмяротны подзвіг, які здзейснілі абаронцы крэпасці, у 1965 г. ёй было прысвоена ганаровае званне «Крэпасць-герой».

Толькі за першыя тры дні абароны Мінска воіны 100-й стралковай дывізіі пад



Правообладатель Народная асвета

камандаваннем *І. Русіянава* знішчылі больш за 100 танкаў і бронемашын праціўніка.

28 чэрвеня 1941 г. германскія войскі здолелі захапіць Мінск. У гіганцкім «катле» на захад ад беларускай сталіцы ў акружэнні апынуліся звыш 300 тыс. байцоў і камандзіраў 3, 4, 10 і 13-й савецкіх армій, большасць якіх трапіла ў германскі палон.

Аб нечалавечых умовах утрымання ў лагеры для савецкіх ваеннапалонных у г. Мінску сведчыць запіска рэйхсміністру па справах акупіраваных усходніх тэрыторый Розенбергу ад 10 ліпеня 1941 г. (гл. *гістарычны дакумент*).

У складанай ваенна-стратэгічнай сітуацыі ў ліпені 1941 г. часці Заходняга фронту ажыццявілі шэраг контрудараў. **6 ліпеня** войскі 20-й арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта *П. Курачкіна* нанеслі контрудар у напрамку *Сянно — Лепель* і адкінулі ворага на 30—40 км. Адбылася адна з буйнейшых у пачатковы перыяд вайны танкавых бітваў, у якой з абодвух бакоў было задзейнічана больш за 1500 машын. 13 ліпеня войскі 63-га корпуса на чале з генерал-лейтэнантам *Л. Пятроўскім* фарсіравалі Дняпро, вызвалілі Жлобін, Рагачоў і разгарнулі наступленне на Бабруйск. 22 ліпеня пачаўся 12-дзённы рэйд па тылах ворага кавалерыйскай групы генерала *А. Гарадавікова*. Былі вызвалены Глуск, Старыя Дарогі, нанесены раптоўны ўдар па Асіповічах. 30 ліпеня быў



Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 г. Карціна Я. Зайцава, 1950 г.



Савецкія ваеннапалонныя. Чэрвень 1941 г.



Салдаты Чырвонай Арміі вядуць бой з праціўнікам у раёне Астрашыцкага Гарадка каля Мінска. Чэрвень 1941 г.



Правообладатель Народная асвета




Мемарыяльны комплекс «Кацюша» ў Оршы

вызвалены Крычаў. Але, не падтрыманыя агульным наступленнем, контрудары асобных вайсковых злучэнняў мелі толькі часовы тактычны поспех.

Выключна напружанымі былі баі на рубяжах Бярэзіны і Дняпра. Пад Барысавам, паводле прызнання нямецкага генерала Г. Гудэрыяна, гітлераўскія войскі адчулі моц танкаў Т-34.

**14 ліпеня 1941 г.** *пад Оршай* упершыню нанесла магутны раптоўны ўдар па ворагу батарэя рэактыўных установак («кацюш») пад камандаваннем капітана *І. Флёрава*.

На працягу 23 дзён савецкія войскі стрымлівалі націск ворага пад Магілёвам. Толькі воінамі дывізіі, якой камандаваў генерал-маёр М. Раманаў, за 10 дзён баявых дзеянняў было знішчана 179 танкаў і бронетранспарцёраў, каля 4 тыс. салдат і афіцэраў праціўніка.

Больш за месяц ішлі баі за Гомель. Горад абаранялі не толькі войскі Цэнтральнага фронту, але і 6700 апалчэнцаў і каля 3 тыс. байцоў знішчальных батальёнаў. Штодзённа на будаўніцтве абарончых аб'ектаў горада працавала больш за 10 тыс. гамяльчан. Пад сценамі горада вермахт страціў звыш за 80 тыс. салдат і афіцэраў, каля 200 танкаў і 100 самалётаў.

Да **пачатку верасня 1941 г.** уся тэрыторыя Беларусі была акупіравана нямецка-фашысцкімі войскамі.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *22 чэрвеня 1941 г., 6 ліпеня 1941 г., 14 ліпеня 1941 г., пачатак верасня 1941 г.; мабілізацыя, эвакуацыя, народнае апалчэнне.*

### Пытанні і заданні

**1.** Ахарактарызуйце мэты Германіі ў вайне супраць Савецкага Саюза. **2.** Якія меры былі прыняты савецкім кіраўніцтвам па мабілізацыі сіл на абарону Айчыны? Што такое мабілізацыя, эвакуацыя, народнае апалчэнне? **3.** Назавіце асноўныя ваенныя дзеянні, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. Якімі былі іх вынікі? (*Выкарыстайце ілюстрацыі, змешчаныя ў параграфе, гістарычны дакумент.*) **4.** З дапамогай дадатковай літаратуры падрыхтуйце паведамленні аб гераізме абаронцаў Беларусі ў пачатковы перыяд вайны.

### Ваша меркаванне

У чым, на ваш погляд, заключающца прычыны паражэнняў Чырвонай Арміі летам 1941 г.? Пры падрыхтоўцы адказу выкарыстайце веды па сусветнай гісторыі, дадатковую літаратуру.



Правообладатель Народная асвета

**Гістарычны дакумент**

**З дакладной запіскі Розенбергу ад 10 ліпеня 1941 г.**



Ваеннапалонныя

«В лагере для военнопленных в Минске... находится приблизительно 100 тыс. военнопленных и 40 тыс. гражданских заключенных. Этот лагерь охраняется командой кадровых солдат численностью около одной роты. Охрана лагеря такой малочисленной командой возможна только при условии применения самой жестокой силы. Военнопленные, проблема питания которых едва ли разрешима, живут по 6—8 дней без пищи, в состоянии вызванной голодом животной апатии, и у них одно стремление — достать что-либо съедобное.

Гражданские заключенные в возрасте от 15 до 50 лет — жители Минска и его окрестностей. ...По отношению к заключенным единственный возможный язык слабой охраны, сутками несущей бессменную службу, — это огнестрельное оружие, которое она беспощадно применяет <…>»

## Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (кнізе «Памяць») інфармацыю аб тым, якія падзеі адбываліся на тэрыторыі вашага краю летам 1941 г. Падрыхтуйце паведамленне.

Якім чынам увекавечаны подзвіг абаронцаў Айчыны ў вашым краі?

## § 23. ГЕРМАНСКІ АКУПАЦЫЙНЫ РЭЖЫМ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**Успомніце. 1.** Якімі былі мэты Германіі ў вайне супраць СССР? **2.** Калі тэрыторыя Беларусі была акупіравана германскімі войскамі?

**План «Ост». Акупацыйны «новы парадак».** Згодна з ***планам «Ост»,*** распрацаваным напярэдадні нападу на СССР, гітлераўцы меркавалі знішчыць ці прымусова выселіць 75 % беларусаў, рускіх і ўкраінцаў. Астатніх 25 % жыхароў Беларусі прадугледжвалася анямечыць і выкарыстаць у якасці рабочай сілы (гл. *гістарычны дакумент 1*). Яўрэяў і цыганоў, якія таксама жылі ў Беларусі, чакала поўнае знішчэнне.

На захопленай тэрыторыі Беларусі германскія акупанты ўстанавілі «новы парадак». Гітлераўцы ліквідавалі дзяржаўнасць беларускага народа і тэрытарыяль-



Правообладатель Народная асвета



Так нямецка-фашысцкія захопнікі ўсталёўвалі на акупіраванай тэрыторыі «новы парадак»

ную цэласнасць рэспублікі, падзяліўшы Беларусь на 5 частак:

1) тэрыторыя Віцебскай, Магілёўскай, амаль усёй Гомельскай, усходнія раёны Мінскай і некалькі раёнаў Палескай абласцей былі аднесены да вобласці армейскага *тылу групы армій «Цэнтр»,* дзе ўлада знаходзілася ў руках камандавання ваенных і паліцэйскіх органаў;

2) паўднёвыя раёны Палескай, Пінскай і Брэсцкай абласцей з перадваеннымі абласнымі цэнтрамі Мазыр, Пінск, Брэст былі далучаны да рэйхскамісарыята *«Украіна»*, граніца якога праходзіла прыкладна за 20 км на поўнач ад чыгункі Брэст — Гомель;

3) Беластоцкая, паўночныя раёны Брэсцкай, частка раёнаў Баранавіцкай абласцей былі ўключаны ў склад *Усходняй Прусіі*;

4) паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці былі далучаны да *Генеральнай акругі Літва*;

5) *Генеральная акруга Беларусь* з цэнтрам у Мінску была ўключана ў склад рэйхскамісарыята «Остланд» з рэзідэнцыяй у Рызе.

Генеральная акруга Беларусь падзялялася на 10 акруг (гебітаў). Вышэйшым выканаўчым органам тут з'яўляўся Генеральны камісарыят Беларусі, які ўзначальваў В. Кубэ, а з верасня 1943 г. — К. фон Готберг. Генеральнаму камісарыяту падпарадкоўваліся гебітскамісарыяты (у акругах), штатскамісарыяты (у гарадах), ортскамісарыяты (у раёнах).

Гітлераўскія захопнікі рабавалі насельніцтва, забіраючы сыравіну, прамысловую прадукцыю, культурныя каштоўнасці. Сілай зброі, за нізкую плату яны прымушалі людзей працаваць да 12—14 гадзін у суткі, плаціць падаткі, здаваць сельскагаспадарчыя прадукты.

Эканамічны прыгнёт суправаджаўся духоўным. У сістэме школьнай адукацыі, якая дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі, вучэбны працэс меў прагерманскую і прафашысцкую скіраванасць. У класе мусіў быць вывешаны партрэт А. Гітлера. Настаўніку, уваходзячы ў клас, належала вітаць вучняў узнятай правай рукой з воклічам «Хайль Гітлер!» або «Жыве Беларусь!». Вучні павінны былі гэтак жа адказваць настаўніку. Перад пачаткам урокаў праводзіліся гутаркі пра біяграфію Гітлера і яго паплечнікаў, аб жыцці народа ў Новай Еўропе, перамогах вермахта.

На ўроках прыроды вучні мусілі засвойваць тэмы «Паняцце аб расах», «Характарыстыка рас», «Арыйская раса як вышэйшая культурная і цывілізаваная раса чалавецтва», на ўроках гісторыі — тэмы «Беларусь і Германія», «Беларусь у будаўніцтве Новай Еўропы», «Жыццё Адольфа Гітлера» і інш. З канца 1941/1942



Правообладатель Народная асвета

навучальнага года пачаў уводзіцца лацінскі алфавіт. В. Кубэ папярэджваў: «Кожны бальшавіцкі ўплыў, што будзе выходзіць са школы, будзе карацца смерцю».

На тэрыторыі акупіраванай Беларусі выходзілі газеты і часопісы. Вяліся радыёперадачы, дэманстраваліся кінафільмы. Дзейнічалі асобныя тэатры і гурткі мастацкай самадзейнасці. Немцы нават выдалі загад, каб артысты Мінскага драматычнага тэатра здалі экзамен па беларускай мове, а таксама вывучылі нямецкі гімн, маршы, вершы, прысвечаныя А. Гітлеру.

**Палітыка генацыду.** На тэрыторыі Беларусі гітлераўцы праводзілі палітыку ***генацыду*** — знішчэння груп насельніцтва па расавых, нацыянальных, палітычных і іншых матывах. Для падтрымкі акупацыйнага рэжыму былі створаны і накіраваны на тэрыторыю Беларусі ўкраінскія, літоўскія і латышскія паліцэйскія батальёны. Яны ахоўвалі камунікацыі, змагаліся з партызанамі, удзельнічалі ў масавым знішчэнні яўрэйскага насельніцтва, пры гэтым вызначаліся не меншай лютасцю ў адносінах да мясцовых жыхароў, чым гітлераўцы.

Тэрыторыя Беларусі пакрылася сеткай канцэнтрацыйных лагераў і турмаў (больш як 260 лагераў смерці, іх філіялаў і аддзяленняў), дзе людзей спальвалі, цкавалі сабакамі, закопвалі жывымі ў зямлю, атручвалі ў душагубках. Самым буйным у Беларусі і СССР з'яўляўся Трасцянецкі лагер смерці каля Мінска, у якім было знішчана больш за 200 тыс. чалавек. Па колькасці знішчаных людзей Трасцянецкі лагер саступаў толькі польскім Асвенцыму, Майданаку і Трэблінцы.

Адным з буйнейшых гарадскіх лагераў смерці было мінскае *гета,* створанае гітлераўцамі 19 ліпеня 1941 г. Гета было абнесена высокай агароджай з калючым дротам. Выходзіць з яго яўрэі маглі толькі на работу ці па спецыяльным дазволе. На спіне і грудзях яны павінны былі насіць жоўтыя знакі. За парушэнне правілаў пагражаў расстрэл. На насельніцтва гета гітлераўцы накладвалі кантрыбуцыі, зборам якіх займаўся яўрэйскі камітэт і яўрэйская паліцыя. У гады акупацыі ў мінскім гета сістэматычна праводзіліся пагромы. У выніку тут было знішчана каля 100 тыс. чалавек. Усяго ў Беларусі існавала больш за 100 яўрэйскіх гета, у якія немцы сагналі сотні тысяч яўрэяў — жыхароў Беларусі, краін Еўропы.

Аб знішчэнні яўрэяў у Генеральнай акрузе Беларусь сведчыць данясенне генеральнага камісара Беларусі Кубэ рэйхскамісару Остланда Лозе ад 31 ліпеня 1942 г. (гл. *гістарычны дакумент 2*).

Нацысты правялі больш за 140 карных аперацый, у ходзе якіх спалілі каля 5,5 тыс. населеных пунктаў разам з усімі ці часткай жыхароў. У правядзенні карных аперацый удзельнічалі не толькі ахоўныя дывізіі і паліцэйскія сілы, але і кадравыя вайскоўцы, узброеныя танкамі, самалётамі, артылерыяй. У час гэтых аперацый цэлыя раёны былі ператвораны ў «зоны пустыні».

22 сакавіка 1943 г. карнікі спалілі жывымі ўсіх жыхароў вёскі Хатынь каля Лагойска.



Правообладатель Народная асвета



Скульптура «Няскораны чалавек». Мемарыяльны комплекс «Хатынь»

На месцы спаленай Хатыні ў 1969 г. быў адкрыты мемарыяльны архітэктурна-скульптурны комплекс на ўшанаванне памяці ўсіх ахвяр нацысцкага генацыду ў Беларусі. Трагічны лёс Хатыні падзялілі 628 беларускіх вёсак, 186 з якіх не былі адноўлены, паколькі знішчаны разам з іх жыхарамі. Адной з праяў акупацыйнай палітыкі быў вываз насельніцтва на прымусовыя работы ў Германію. У рэйху такіх людзей называлі **«остарбайтарамі»** («усходнімі рабочымі»).

Людзей прымусова вывозілі ў таварных вагонах, па некалькі дзён яны не атрымлівалі харчавання і вады. Захопам насельніцтва займаліся армейскія часці, жандармерыя, атрады СС і СД, паліцыя. Былі выпадкі, калі войскі вермахта і паліцыя акружалі вёскі і забіралі ўсё насельніцтва, а пры аказанні супраціўлення расстрэльвалі.

Нават дзяцей нацысты прымушалі выконваць непасільную фізічную працу, марылі голадам, змяшчалі ў канцэнтрацыйныя лагеры, вывозілі на катаржныя работы ў Германію, бралі ў іх кроў для сваіх салдат. За час акупацыі гітлераўцы насільна вывезлі з Беларусі ў Германію больш за 380 тыс. чалавек, у тым ліку больш за 24 тыс. дзяцей. Вярнулася дамоў пасля вайны толькі 160 тыс. чалавек.

Усяго ў час акупацыі ў Беларусі загінула больш за 2,2 млн чалавек, амаль кожны чацвёрты яе жыхар.

**Дзейнасць беларускіх калабарантаў.** З дазволу нацыстаў і пад іх кіраўніцтвам на акупіраванай тэрыторыі Беларусі былі створаны прафашысцкія арганізацыі ***калабарантаў*** (ад франц. *collaboration* — супрацоўніцтва) — *Беларуская народная самапомач, Беларускі корпус самааховы, Саюз беларускай моладзі* (гл. *дадатковы матэрыял*). У народзе калабарантаў называлі здраднікамі, гітлераўскімі памагатымі. Галоўнай іх мэтай было стварэнне з дапамогай немцаў «самастойнай Беларусі» пад эгідай гітлераўскай Германіі. У якасці сімвалаў беларускія калабаранты выкарыстоўвалі гістарычны герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг, віталі адзін аднаго клічам «Жыве Беларусь!» з выкідваннем па-фашысцку рукі наперад.

Поспехі савецкіх войскаў на франтах вайны, гераічнае супраціўленне насельніцтва ў тыле прымушалі гітлераўскае кіраўніцтва ўсё часцей звяртацца да палі-



Правообладатель Народная асвета

тычных манеўраў з тым, каб увесці ў зман народ і шырэй прыцягнуць яго да барацьбы супраць бальшавізму. Менавіта такім манеўрам з'яўлялася стварэнне ў снежні 1943 г. *Беларускай цэнтральнай рады (БЦР)*, якую ўзначаліў Р. Астроўскі.

БЦР з'яўлялася марыянетачным урадам, таму што поўнасцю кантралявалася гітлераўцамі. Рада дапамагала акупантам весці барацьбу супраць партызан, выконваць пастаўкі для германскай арміі.

У сакавіку 1944 г. па загадзе Р. Астроўскага пачалася прымусовая мабілізацыя ў *Беларускую краёвую абарону (БКА)*. За няяўку ў вызначаны тэрмін прадугледжвалася пакаранне смерцю. Галоўнае камандаванне БКА ўзначаліў маёр Ф. Кушаль. Для афіцэраў і падафіцэраў былі арганізаваны трохтыднёвыя курсы перападрыхтоўкі.

Да сярэдзіны красавіка 1944 г. БЦР удалося стварыць 36 пяхотных і 6 сапёрных батальёнаў краёвай абароны. Аднак гэтае войска не апраўдала надзей акупантаў і выкарыстоўвалася ў асноўным на гаспадарчых работах ці ў ахове розных збудаванняў і складоў. Многія члены БКА са зброяй перайшлі да партызан, а частка іх пасля вызвалення Беларусі апынулася ў Германіі.

27 чэрвеня 1944 г. у гарадскім тэатры Мінска адбыўся *II Усебеларускі кангрэс*, на які з'ехаліся бургамістры, начальнікі паліцыі, члены БЦР і іншыя «дэлегаты» — здраднікі Айчыны. Кангрэс абвясціў сябе «паўнапраўным і найвышэйшым прадстаўніком беларускага народа», выбраў Р. Астроўскага прэзідэнтам БЦР, выказаў непрызнанне БССР як формы беларускай дзяржаўнасці. Але праз некалькі дзён гэтыя «кангрэсмены» пад гукі артылерыйскай кананады савецкіх войскаў ужо ўцякалі ў Берлін і Кёнігсберг.

**Паняцці, якія трэба ведаць:** *план «Ост», генацыд, «остарбайтары», калабарацыянізм.*

### Пытанні і заданні

**1.** Што такое план «Ост»? Які лёс быў вызначаны гітлераўцамі беларусам? (*Выкарыстайце гістарычны дакумент 1.*) **2.** Што такое генацыд? Ахарактарызуйце акупацыйную палітыку гітлераўцаў на тэрыторыі Беларусі. Якімі былі яе вынікі? (*Выкарыстайце пры падрыхтоўцы адказу гістарычны дакумент 2 і дадатковую літаратуру.*) **3.** Дакажыце, што ўсе элементы «новага парадку», устаноўленага гітлераўцамі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, былі накіраваны на выкананне плана «Ост». **4.** Якія арганізацыі дзейнічалі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі? (*Выкарыстайце дадатковы матэрыял.*) Як вы лічыце, чаму гітлераўцы дазволілі стварыць гэтыя арганізацыі і падтрымлівалі іх дзейнасць?

### Ваша меркаванне

Гісторык В. Ключэўскі пісаў, што гісторыя жорстка правучвае тых, хто не жадае засвойваць яе ўрокі. Як вы лічыце, які ўрок гісторыі не засвоілі беларускія нацыянальныя дзеячы, якія імкнуліся адрадзіць беларускую дзяржаўнасць з дапамогай фашыстаў? Як бы вы сфармулявалі гэты «ўрок гісторыі»?



Правообладатель Народная асвета

## Дадатковы матэрыял

### Прафашысцкія арганізацыі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі

***Беларуская народная самапомач*** была створана ў кастрычніку 1941 г. па загадзе генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ. Першапачаткова гэтая арганізацыя займалася зборам грашовых і матэрыяльных каштоўнасцей, прадуктаў харчавання і вопраткі, аказвала матэрыяльную дапамогу пацярпелым ад вайны. Паступова ператваралася ў палітычны рух. У сакавіку 1942 г. Беларуская народная самапомач запатрабавала ад нямецкіх улад аўтаноміі Беларусі і стварэння беларускага ўрада і беларускага войска. У гэтым выпадку абяцалася, што «ўрад абвесціць аддзяленне Беларусі ад СССР і аб'явіць яму вайну як ворагу беларускага народа». Але нават такое стаўленне да СССР не спадабалася германскай адміністрацыі. У чэрвені 1943 г. дзейнасць Беларускай народнай самапомачы была абмежавана толькі зборам ахвяраванняў і вярбоўкай новых членаў.

***Беларускі корпус самааховы*** пачаў фарміравацца летам 1942 г. як вайсковая структура беларускіх калабарантаў. З чэрвеня 1942 па красавік 1943 г. было створана 20 батальёнаў самааховы. Слаба ўзброеныя, небаяздольныя атрады самааховы лёгка разганяліся партызанамі. Інтарэс акупантаў да самааховы пачаў слабець. Вясной 1943 г. германскія ўлады расфарміравалі атрады Беларускага корпуса самааховы. Замест іх немцы стварылі беларускія паліцэйскія батальёны на чале са сваім камандным складам.

***Саюз беларускай моладзі*** быў створаны ў чэрвені 1943 г. Мэтамі саюза было выхаванне праваднікоў германскай палітыкі, падрыхтоўка беларускай моладзі для працы на ваенных заводах Германіі, служба ў ваенна-дапаможных часцях вермахта. Саюз беларускай моладзі працаваў пад кантролем германскай адміністрацыі. У 1944 г. у яго шэрагах налічвалася больш за 12 тыс. чалавек, з якіх да 5 тыс. былі накіраваны на работу і вучобу ў Германію.

## Гістарычны дакумент

### 1. З заўваг і прапаноў начальніка аддзела міністэрства па справах акупіраваных усходніх тэрыторый (ад 27 красавіка 1942 г.) па генеральным плане «Ост»

*В. Да пытання аб беларусах*

«Паводле плана [«Ост»] прадугледжваецца высяленне 75 % беларускага насельніцтва з займаемай ім тэрыторыі. Значыць, 25 % беларусаў па плане галоўнага ўпраўлення імперскай бяспекі падлягаюць анямечванню.

Непажаданае ў расавых адносінах беларускае насельніцтва будзе яшчэ на працягу многіх гадоў знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі. У сувязі з гэтым [трэба] па магчымасці старанна адабраць беларусаў нардычнага тыпу, прыгодных



Правообладатель Народная асвета

па расавых прыкметах і палітычных меркаваннях для анямечвання, і адправіць іх у імперыю ў мэтах выкарыстання ў якасці рабочай сілы… Іх можна было б выкарыстоўваць у сельскай гаспадарцы ў якасці сельскагаспадарчых рабочых, а таксама ў прамысловасці альбо як рамеснікаў. Паколькі да іх адносіліся б як да немцаў і ў сувязі з адсутнасцю ў іх нацыянальных пачуццяў, яны ў хуткім часе, у крайнім выпадку ў бліжэйшым пакаленні, маглі б быць цалкам анямечаны.

Наступным пытаннем з'яўляецца пытанне аб месцы для перасялення беларусаў, непрыгодных у расавых адносінах для анямечвання. Паводле генеральнага плана яны павінны быць… пераселены ў Заходнюю Сібір. Патрэбна было б таксама падумаць над тым, каб перасяліць беларусаў на Урал ці ў раёны Паўночнага Каўказа, якія часткова маглі б таксама з'явіцца рэзервовымі тэрыторыямі для еўрапейскай каланізацыі».

**2. З данясення генеральнага камісара Беларусі Кубэ рэйхскамісару Остланда Лозе ад 31 ліпеня 1942 г.**

«<…> За последние 10 недель в Белоруссии ликвидировано около 55 тыс. евреев. В Минской области евреи полностью истреблены, причем от этого не пострадала вербовка рабочей силы. В преимущественно польской области Лиды ликвидировано 16 тыс. евреев, в Слониме — 8 тыс. и т. д. <…> в области Глубокого <…> 10 тыс. евреев. В городе Минске 28 и 29 июля были ликвидированы 10 тыс. евреев, из них 6,5 тыс. русских евреев, преимущественно стариков, женщин и детей, остальные состояли из неработоспособных евреев, которые были по приказу фюрера вывезены в Минск в ноябре прошлого года, главным образом из Вены, Брно, Бремена и Берлина. Область Слуцка также облегчена на много тысяч евреев. То же самое произошло в Новогрудке и Вилейке. Радикальные мероприятия предстоят в Барановичах и Ханцевичах [Ганцевичах]. Только в городе Барановичи проживает около 10 тыс. евреев, из которых в следующем месяце будет ликвидировано 9 тыс. евреев».

## Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (кнізе «Памяць») інфармацыю аб «новым парадку», устаноўленым германскімі акупантамі на тэрыторыі вашага краю. Падрыхтуйце паведамленне.

Калі ёсць магчымасць, пагутарыце з жыхарамі вашага краю, якія жылі ў гады германскай акупацыі. Запішыце іх успаміны.



Правообладатель Народная асвета

## § 24. ПАЧАТАК МАСАВАЙ БАРАЦЬБЫ СУПРАЦЬ ГЕРМАНСКІХ АКУПАНТАЎ

**Успомніце.** Калі пачалося контрнаступленне Чырвонай Арміі пад Масквой? Якімі былі яго вынікі?

**Роля КП(б)Б у арганізацыі народных мас на барацьбу з акупантамі.** Барацьба беларускага народа супраць германскіх акупантаў ажыццяўлялася ў трох асноўных формах: а) узброеныя дзеянні партызан; б) дзейнасць падпольных груп і арганізацый; в) масавы зрыў насельніцтвам, якое не ўваходзіла ў склад партызанскіх фарміраванняў і падпольных арганізацый, эканамічных, палітычных і ваенных планаў акупантаў.

Арганізатарам барацьбы беларускага народа супраць акупантаў была Камуністычная партыя. На акупіраванай тэрыторыі Беларусі была створана і дзейнічала шырокая сетка партыйнага і камсамольскага падполля, якое аб'ядноўвала 35 тыс. камуністаў і каля 100 тыс. камсамольцаў. Ужо 1 ліпеня 1941 г. ЦК КП(б)Б звярнуўся да партыйных, савецкіх і камсамольскіх арганізацый з дырэктывай аб разгортванні партызанскай барацьбы ў тыле ворага (гл. *гістарычны дакумент*).

Ствараліся падпольныя партыйныя і камсамольскія арганізацыі і іх кіруючыя органы: абкамы, гаркамы і райкамы. У час акупацыі ў рэспубліцы дзейнічалі 203 падпольныя партыйныя органы. Сакратары абкамаў КП(б)Б узначальвалі партызанскія злучэнні. Сакратар ЦК КП(б)Б П. Калінін кіраваў дзейнасцю Беларускага штаба партызанскага руху.



Падпольныя і партызанскія газеты Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.

Падпольныя абкамы і райкамы КП(б)Б праводзілі масава-палітычную работу, мелі свае тыпаграфіі, сродкі сувязі. Яны выдавалі абласныя і атрадныя газеты, а таксама распаўсюджвалі сярод партызан і насельніцтва акупіраваных тэрыторый лістоўкі і зводкі Савецкага інфармацыйнага бюро (Саўінфармбюро). У рэспубліцы выдаваліся орган ЦК КП(б)Б газета «Звязда» і орган ЦК ЛКСМБ «Чырвоная змена». Кожны допіс, кожны радок у падпольных газетах і лістоўках, кожнае слова зводак Саўінфармбюро заклікалі да барацьбы з гітлераўцамі.

Партыйныя і камсамольскія кіраўнікі — М. Аўхімовіч, І. Ганенка, М. Зімянін, К. Мазураў, Ф. Сурганаў і інш. — выязджалі на акупіраваную тэрыторыю Беларусі, дзе пра-



Правообладатель Народная асвета

водзілі палітыка-растлумачальную і выхаваўчую работу сярод партызан і мясцовага насельніцтва.

На вызваленых ад германскіх захопнікаў тэрыторыях падпольныя абкамы і райкамы партыі аднаўлялі савецкую ўладу. У многіх раёнах Беларусі былі створаны і дзейнічалі выканкамы Саветаў дэпутатаў працоўных. Найчасцей функцыі органаў савецкай улады выконвалі партызанскія атрады і створаныя імі камендатуры, якія вырашалі пытанні гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, уладкавання быту і жыцця людзей.

Падпольныя партыйныя арганізацыі вылучылі са свайго асяроддзя такіх выдатных партызанскіх кіраўнікоў, як *Ц. Бумажкоў, К. Заслонаў, В. Казлоў, І. Кожар, В. Корж, П. Машэраў, М. Шмыроў (Бацька Мінай)* і інш.

**Стварэнне першых партызанскіх атрадаў.** Ужо ў пачатку нямецкай акупацыі ў Беларусі пачалі дзейнічаць першыя партызанскія атрады. 26 чэрвеня 1941 г. першы сакратар Кастрычніцкага РК КП(б)Б Гомельскай вобласці ***Ц. Бумажкоў*** і ўпаўнаважаны Наркамата нарыхтовак па Кастрычніцкім раёне ***Ф. Паўлоўскі*** стварылі партызанскі атрад *«Чырвоны Кастрычнік»*.

### Гістарычная даведка

Разам з часцямі Чырвонай Арміі партызаны атрада «Чырвоны Кастрычнік» вялі баі з нямецкімі войскамі на р. Пціч. Яны правялі шэраг удалых аперацый, у час якіх знішчылі 30 нямецкіх танкаў, 55 адзінак аўтабронетэхнікі праціўніка, узарвалі некалькі мастоў. У ліпені 1941 г. партызаны атрада разграмілі штаб нямецкай дывізіі ў в. Воземля. У баі праціўнік страціў 80 салдат і афіцэраў, былі захоплены трафеі і карысныя дакументы, якія партызаны перадалі камандаванню савецкіх войскаў. За гераізм і ўмелае кіраўніцтва партызанскай барацьбой ка-



Ц. Бумажкоў



Ф. Паўлоўскі



Правообладатель Народная асвета

мандзіру атрада Ц. Бумажкову і камісару Ф. Паўлоўскаму, першым з беларускіх партызан, 6 жніўня 1941 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У ліку першых партызанскіх атрадаў быў атрад, які ўзнік на 5-ы дзень вайны і дзейнічаў у Пінскім раёне пад камандаваннем ***В. Каржа***, а таксама партызанскі атрад пад камандаваннем ***М. Шмырова*** (*Бацькі Мінаяа*) на Віцебшчыне.

### Гістарычны партрэт



**Корж Васіль Захаравіч** (1899—1967) — адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі. Герой Савецкага Саюза. У 1921—1925 гг. удзельнічаў у рэвалюцыйным руху ў Заходняй Беларусі. З 1925 г. працаваў старшынёй калгасаў у Слуцкім і Старобінскім раёнах, а ў 1931—1936 гг. — у органах Наркамата ўнутраных спраў БССР. Удзельнік грамадзянскай вайны ў Іспаніі на баку рэспубліканцаў. З 1940 г. працаваў у Пінскім абкаме КП(б)Б. У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны сфарміраваў партызанскі атрад, які ў ліпені 1941 г. прыняў бой з нямецкімі танкамі. Восенню 1941 г. атрад на чале з В. Каржом разам з партызанамі Палесся і Міншчыны прайшоў рэйдам па многіх раёнах Палескай і Мінскай абласцей. Член Пінскага падпольнага абкама КП(б)Б, камандзір Пінскага партызанскага злучэння. У пасляваенныя гады знаходзіўся на савецкай і гаспадарчай рабоце.



**Шмыроў Мінай Піліпавіч** (партызанскі псеўданім — Бацька Мінай) (1891—1964) — адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Віцебшчыне. Герой Савецкага Саюза. У 1921—1923 гг. камандзір атрада па барацьбе з бандытызмам на Віцебшчыне, потым працаваў у зямельным аддзеле, старшынёй калгаса, дырэктарам ільнозавода, кардоннай фабрыкі. 10 ліпеня 1941 г. з рабочых кардоннай фабрыкі ў в. Пудаць арганізаваў партызанскі атрад. У 1942 г. камандзір 1-й Беларускай партызанскай брыгады. Акупанты ўзялі ў заложнікі чатырох яго дзяцей і сваякоў і расстралялі іх. З лістапада 1942 г. працаваў у Цэнтральным штабе партызанскага руху. У Віцебску створаны мемарыяльны музей і ўстаноўлены помнік М. Шмырову, на радзіме і ў вёсцы Пудаць — абеліск, у Суражы — помнік загінуўшым дзецям Бацькі Мінаяа.



Правообладатель Народная асвета



За родную Беларусь. Карціна У. Сухаверхава. 1948 г.

На аснове былых знішчальных батальёнаў, якія ствараліся з мясцовага насельніцтва для барацьбы з нямецкімі дэсантнікамі і дыверсантамі, сфарміраваліся партызанскія атрады ў Парыцкім, Лельчыцкім, Ельскім, Лоеўскім, Рагачоўскім і іншых раёнах Беларусі. За ліпень — верасень 1941 г. у Беларусі было сфарміравана звыш 430 партызанскіх атрадаў і груп, у якіх налічвалася больш за 8 тыс. чалавек. У склад першых атрадаў і груп уваходзілі камуністы і камсамольцы, савецкія і гаспадарчыя кіраўнікі, актывісты, беларускія патрыёты з ліку мясцовага насельніцтва, а таксама вайскоўцы, што трапілі ў акружэнне ці вырваліся з варожага палону.

Частка створаных летам — восенню 1941 г. атрадаў і груп была разгромлена. Некаторыя атрады самараспусціліся. Іншыя, выканаўшы заданні, выйшлі ў савецкі тыл ці перайшлі на паўлегальнае становішча. Аднак каля 200 атрадаў і груп працягвалі барацьбу з ворагам.

Разгром германскіх войскаў пад Масквой узняў маральны настрой патрыётаў. Расла колькасць партызанскіх атрадаў і груп. Значна палепшылася ўзбраенне «лясных байцоў». Удасканальвалася структура партызанскіх сіл. Яны ўсё больш набывалі вайсковую будову: брыгады ў асноўным складаліся з атрадаў, якія падзяляліся на ўзводы і аддзяленні. Узрастала майстэрства камандных кадраў і партызанскіх штабоў, умацоўваліся сувязі з мясцовым насельніцтвам.

Вялікае значэнне для развіцця партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці мела існаванне з **лютага па верасень 1942 г.** так званых ***Суражскіх***



Правообладатель Народная асвета



М. Савіцкі. Віцебскія вароты. 1966—1967 гг.

***(Віцебскіх) «варот»*** — 40-кіламетровага прарыву ў лініі савецка-германскага фронту паміж Веліжам і Усвятамі на стыку нямецкіх армій «Поўнач» і «Цэнтр».

Праз «вароты» з «*Вялікай зямлі*» (неакупіраванай тэрыторыі СССР) у тыл ворага накіроўваліся арганізатарскія і дыверсійныя групы, зброя, боепрыпасы, медыкаменты і інш. Многія партызанскія атрады падтрымлівалі сувязь з Віцебскім абкамам і ЦК КП(б)Б, што дзейнічалі за лініяй фронту, а таксама з ваеннымі саветамі 3-й і 4-й савецкіх армій.



У. Амельянюк

**Антыфашысцкія патрыятычныя арганізацыі. Масавае супраціўленне мірнага насельніцтва акупацыйнаму рэжыму.** Адначасова з партызанскай барацьбой разгортвалася падпольная антыфашысцкая дзейнасць у гарадах і іншых населеных пунктах. Як і партызанскія фарміраванні, падпольшчыкі здзяйснялі дыверсіі, баявыя аперацыі (знішчэнне жывой сілы і баявой тэхнікі акупантаў), сабатаж, праводзілі агітацыйную работу сярод насельніцтва, вялі разведку.

*Мінскае падполле*, нягледзячы на вялікія страты, якія яно панесла ў сакавіку — красавіку і верасні — кастрычніку 1942 г., працягвала дзейнічаць. У яго складзе змагалася звыш 9 тыс. чалавек, у іх ліку больш за 1 тыс. камуністаў і 2 тыс. камсамольцаў, антыфашысты замежных краін. Сярод



Правообладатель Народная асвета



І. Казінец



І. Кабушкін



М. Кедышка

кіраўнікоў і актыўных дзеячаў Мінскага падполля былі І. Кавалёў, У. Амельянюк, І. Кабушкін, З. Гала, І. Казінец, М. Каржанеўскі, М. Кедышка, Я. Клумаў, С. Ляшчэня і інш.

За час акупацыі ўдзельнікамі падполля было праведзена звыш 1500 дыверсій, у тым ліку быў забіты генеральны камісар Беларусі В. Кубэ. Удзельнікамі замаху на яго жыццё з'яўляліся *А. Мазанік, М. Осіпава, Н. Траян*, кожная з іх за паспяховае выкананне задання была ўдастоена звання Героя Савецкага Саюза. Падпольшчыкі горада накіравалі звыш 450 чалавек у партызанскія атрады. За мужнасць і гераізм у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі Мінску ў 1974 г. было прысвоена ганаровае званне «*Горад-герой*».

У Віцебску ў 1941—1942 гг. дзейнічала 56 падпольных груп. Адной з іх кіравала *В. Харужая*, якая была накіравана сюды Беларускім штабам партызанскага руху. 13 лістапада 1942 г. гітлераўцы схапілі і пасля доўгіх допытаў закатавалі яе і



А. Мазанік



М. Осіпава



Н. Траян



Правообладатель Народная асвета



В. Харужая



К. Заслонаў

іншых падпольшчыкаў. В. Харужай было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Падпольшчыкі Оршы пад кіраўніцтвам *К. Заслонава* з лістапада 1941 па люты 1942 г. вывелі са строю 170 цягнікоў і пусцілі пад адхон дзясяткі варожых саставаў з жывой сілай і тэхнікай (гл. *гістарычны дакумент 2*).

Паспяховыя дзеянні партызанскіх атрадаў і падпольных антыфашысцкіх арганізацый, перамога савецкіх войскаў пад Масквой садзейнічалі таму, што барацьба беларускага народа супраць гітлераўскіх акупантаў набывала такія маштабы, што з ёй нельга было справіцца нават шляхам карных экспедыцый з прыцягненнем вялікай колькасці германскіх войск.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *люты — верасень 1942 г.; Суражскія (Віцебскія) «вароты».*

### Пытанні і заданні

**1.** Якімі былі формы барацьбы беларускага народа супраць германскіх акупантаў? **2.** Ахарактарызуйце ролю Камуністычнай партыі ў арганізацыі барацьбы з гітлераўцамі. (*Выкарыстайце гістарычны дакумент 1.*) Складзіце тэзісны план адказу на гэтае пытанне (гл. *памятку 9*). **3.** Калі на тэрыторыі Беларусі былі створаны першыя партызанскія атрады? Хто ўваходзіў у іх склад? Назавіце кіраўнікоў першых партызанскіх атрадаў на тэрыторыі Беларусі. **4.** Якія задачы ставіліся перад партызанамі? (*Выкарыстайце гістарычныя дакументы 1, 2.*) **5.** Што такое Суражскія (Віцебскія) «вароты»? **6.** Карыстаючыся дадатковай літаратурай, падрыхтуйце паведамленні аб баявой дзейнасці В. Каржа, М. Шмырова, К. Заслонава, В. Харужай, удзельнікаў Мінскага падполля. **7.** Прывядзіце прыклады, якія пацвярджаюць вывад: барацьба супраць германскіх акупантаў на беларускай зямлі была масавай. **8.** Якія падзеі Вялікай Айчыннай вайны адлюстраваны на карцінах У. Сухаверхава «За родную Беларусь», М. Савіцкага «Віцебскія вароты»?



Правообладатель Народная асвета

## Гістарычны дакумент

### 1. З дырэктыўных указанняў ЦК КП(б)Б партыйным, савецкім і камсамольскім арганізацыям (ад 1 ліпеня 1941 г.)

«<…> 2. Все местности Белоруссии, занятые врагом, должны немедленно покрыться густой сетью партизанских отрядов, ведущих непрерывную ожесточенную борьбу на уничтожение врага.

3. В районах и селах создаются подпольные партийные и комсомольские ячейки, главная задача которых — мобилизация народа на беспощадную расправу с врагом. Для этой цели все коммунисты и комсомольцы, способные носить оружие, остаются на территории, занятой врагом.

<…> 6. Задачи партизан: уничтожать всякую связь в тылу врага, взрывать и портить мосты, дороги, поджигать склады горючего и продовольствия, автомашины, самолеты, устраивать крушение поездов. Уничтожать врагов, не давать им покоя ни днем ни ночью, убивать их всюду, где застигнешь, убивать чем попало — топором, косой, ломом, вилами, ножом. Объединить несколько партизанских отрядов, нападать неожиданно на отряды противника и уничтожать. Особенно важно напасть ночью на аэродромы, сжечь самолеты, перебить летчиков <…>

<…> 8. Действуйте смело, решительно, победа за нами. Нет такой силы, которая могла бы покорить советский народ <…>»

### 2. З успамінаў А. Андрэева, камісара партызанскага атрада К. Заслонава

«Мы понимали, что, находясь в тылу врага, на главной железнодорожной артерии, снабжавшей немецкий центральный фронт, можно наносить гитлеровцам большой вред, тормозя продвижение вражеских эшелонов. Основной удар мы решили наносить по паровозному парку. Этому благоприятствовали неподготовленность немецких паровозов к работе в суровую зиму и неумение самих немцев работать в этих сложных условиях.

По заданию Заслонова наши партизаны-подпольщики умело использовали эти обстоятельства. На паровозах, стоявших в ожидании рейса на путях, замораживались и выводились из строя паровоздушные и водяные насосы, воздухораспределители и воздухопроводы, водоприемные трубы, пресс-масленки и т. д. Деповские и станционные пути и стрелки заливались водой из вестовых труб инжекторов и водяных насосов, при наборах воды в тендеры; всё это приводило к намерзанию льда на путях и, как следствие, к аварии паровозов и вагонов.

В дальнейшем для уничтожения паровозов мы широко начали применять и угольные мины. Для их изготовления Петр Шурмин с другим товарищем доставили из Заполья в мешках с картошкой припрятанную там взрывчатку. Таким же образом были доставлены автоматы, боеприпасы…»



Правообладатель Народная асвета

## § 25. РАЗГОРТВАННЕ НАРОДНАЙ БАРАЦЬБЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**Успомніце. 1.** Калі на тэрыторыі Беларусі былі створаны першыя партызанскія атрады? Якія задачы перад імі ставіліся? **2.** Назавіце асноўныя наступальныя аперацыі на савецка-германскім фронце летам 1943 — летам 1944 г.

**Баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў.** У 1942 г. пачаўся новы ўздым партызанскай барацьбы. Яна стала больш арганізаванай і эфектыўнай. Гэтаму спрыяла стварэнне *Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР)* пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання на чале з ***П. Панамарэнкам*** і *Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР)* на чале з ***П. Калініным***.

Шляхам аб'яднання партызанскіх атрадаў у розных мясцінах Беларусі ствараліся занальныя і абласныя *партызанскія злучэнні*. Пры гэтым атрады, якія ўваходзілі ў партызанскія аб'яднанні, не трацілі сваёй самастойнасці. Самай буйной групоўкай партызанскіх сіл у Магілёўскай вобласці было *Клічаўскае партызанскае злучэнне*. У пачатку верасня 1942 г. у ім знаходзілася 17 партызанскіх атрадаў (каля 3 тыс. чалавек).

Характэрнай асаблівасцю **партызанскага руху** ў 1942 г. стала вызваленне ад акупантаў значных тэрыторый і ўтварэнне там **партызанскіх зон**. Першая такая зона ўзнікла ў студзені — лютым 1942 г. у Кастрычніцкім раёне Палескай вобласці. На яе тэрыторыі размяшчаўся партызанскі гарнізон з 13 атрадаў, які налічваў больш за 1300 чалавек.

Усяго на тэрыторыі Беларусі ў розны час дзейнічала некалькі дзясяткаў партызанскіх зон: *Клічаўская, Ушацкая, Полацка-Лепельская, Барысаўска-Бягомльская* і інш. (гл. *карту*, с. 143). Партызанскія зоны ўваходзілі ў больш буйное аб'яднанне — *партызанскі край*. На тэрыторыі партызанскіх зон і краёў была адноўлена савецкая ўлада.



П. Панамарэнка



П. Калінін



Правообладатель Народная асвета

Партызаны ўсё часцей праводзілі буйныя наступальныя аперацыі, наносілі ўдары па камунікацыях, гарнізонах, апорных пунктах, іншых аб’ектах праціўніка (гл. *дадатковы матэрыял*).

У 1943—1944 гг. з удзелам усіх партызанскіх злучэнняў былі праведзены аперацыі, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай **«*рэйкавая вайна*»**.




Партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі. 1942—1944 гг.



Правообладатель Народная асвета

Яе задачай быў зрыў ваенных перавозак праціўніка і садзейнічанне наступленню Чырвонай Арміі. Аперацыя «рэйкавая вайна» ажыццяўлялася ў тры этапы напярэдадні і ў час правядзення наступальных вайсковых аперацый: а) першы этап пачаўся ў ноч на **3 жніўня 1943 г.** і працягваўся да сярэдзіны **верасня 1943 г.**; б) другі этап — з **19 верасня 1943 г.** да **пачатку лістапада 1943 г.** (атрымаў назву *«Канцэрт»*); в) трэці этап пачаўся ноччу **20 чэрвеня 1944 г.** і працягваўся да поўнага вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў.

Вынікам баявой дзейнасці партызан з'яўлялася тое, што пад іх кантролем знаходзілася да 60 % акупіраванай тэрыторыі Беларусі, значная частка якой была цалкам вызвалена ад захопнікаў. Усяго ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі дзейнічалі 213 партызанскіх брыгад, 374 тыс. партызан і 400 тыс. чалавек скрытага партызанскага рэзерву. У склад партызанскага рэзерву ўваходзілі жыхары, якія ў любую хвіліну былі гатовы ўключыцца ва ўзброеную барацьбу з фашыстамі. Іх наўмысна пакінулі ў месцах пражывання для таго, каб яны займаліся гаспадаркай, забяспечвалі партызан вопраткай, абуткам, прадуктамі харчавання, зброяй, інфармацыяй і г. д.

**Падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.** Значную работу па пераўтварэнні партызанскага руху ў масавую народную вайну супраць захопнікаў выконвалі падпольныя органы Кампартыі Беларусі, якія карысталіся аўтарытэтам сярод мясцовага насельніцтва. У тыле ворага ў гады вайны выдавалася каля 170 падпольных газет, тыраж якіх налічваў мільёны экзэмпляраў. За гады вайны было выдадзена і распаўсюджана 28,5 млн лістовак. Падпольны друк заклікаў да ўзброенай барацьбы супраць акупантаў (гл. *гістарычны дакумент*).

Разам з партыйным падполлем дзейнічала і *маладзёжна-камсамольскае падполле*. Падпольная камсамольская арганізацыя *«Юныя мсціўцы»* на чыгуначнай станцыі Обаль Віцебскай вобласці была створана вясной 1942 г. Яе ўзначальвала былая работніца віцебскай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» камсамолка Е. Зянькова. У склад арганізацыі ўваходзіла каля 40 чалавек. Усяго маладыя падпольшчыкі зрабілі 21 дыверсію: спалілі льнозавод, пілараму, электрастанцыю, некалькі мастоў, перадавалі партызанам зброю, медыкаменты, карысныя разведданыя, распаўсюджвалі лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро і інш. Пасля вайны *Е. Зяньковай* і *З. Партновай* прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У ноч на 30 ліпеня 1943 г. падпольшчыкі горада Асіповічы здзейснілі на чыгуначным вузле адну з самых буйных дыверсій Другой сусветнай вайны. Камсамолец *Ф. Крыловіч* узарваў дзвюма магнітнымі мінамі эшалон з гаручым. Пажар працягваўся 10 гадзін. У выніку аперацыі былі поўнасцю знішчаны 4 эшалоны, у тым ліку адзін з танкамі «тыгр», 31 цыстэрна з гаручым, 63 вагоны са снарадамі, авіябомбамі, мінамі.

Патрыятычнае антыфашысцкае падполле дзейнічала ў розных рэгіёнах Беларусі. У Гомелі актыўную барацьбу з ворагам вялі падпольныя групы на чыгуначным вузле, паравозавагонарамонтным заводзе, лесакамбінаце, гарадской электрастанцыі, іншых прадпрыемствах горада — усяго больш за 400 чалавек.



Правообладатель Народная асвета

У акупіраваным Магілёве вясной 1942 г. каля 40 груп (больш за 400 чалавек) аб'ядналіся ў падпольную арганізацыю *«Камітэт садзейнічання Чырвонай Арміі»*, якую ўзначальваў мясцовы настаўнік *К. Мэтэ*. Камітэт каардынаваў дзейнасць груп чыгуначнікаў, настаўнікаў, рабочых хлебазавода, аўтарамонтнага завода, фабрыкі штучнага шоўку, работнікаў абласной бальніцы, былых ваеннаслужачых і інш. Дзякуючы пільнасці, канспірацыі і ўдалай структуры арганізацыі магілёўскаму падполлю доўгі час удавалася пазбягаць масавых правалаў і арыштаў.

На акупіраванай тэрыторыі Беларусі змагаліся звыш 70 тыс. падпольшчыкаў. Большую частку беларускіх патрыётаў складалі юнакі і дзяўчаты. Моладзь да 26-гадовага ўзросту складала звыш 54 % беларускіх партызан. У партызанскім руху ўдзельнічала больш за 7 тыс. настаўнікаў і 34 тыс. навучэнцаў, з якіх каля 5 тыс. з'яўляліся піянерамі.

У барацьбе з ворагам загінулі каля 45 тыс. партызан і нямала падпольшчыкаў. Напрыклад, з 1500 падпольшчыкаў Віцебска загінуў кожны трэці.

**Антыфашысцкая барацьба ў заходніх раёнах Беларусі.** У заходніх раёнах Беларусі таксама дзейнічалі антыфашысцкія арганізацыі. Яны ствараліся па ініцыятыве камуністаў, былых актывістаў КПЗБ, камсамольцаў, іншых патрыётаў. У маі 1942 г. быў створаны *Акруговы беларускі антыфашысцкі камітэт Баранавіцкай вобласці*. Восенню 1942 г. пад кіраўніцтвам гэтага камітэта барацьбу з акупантамі вялі больш за 260 падпольшчыкаў.

Асаблівасцю антыфашысцкай барацьбы ў заходніх раёнах Беларусі з'яўлялася знаходжанне тут адначасова з савецкімі партызанамі і падпольшчыкамі ваенных фарміраванняў польскай ***Арміі Краёвай*** *(акаўцаў)* і *Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў (аўнаўцаў)*. Акаўцы, якіх у народзе называлі «белымі» ці польскімі партызанамі, змагаліся за аднаўленне Польшчы ў межах да верасня 1939 г., калі ў польскую дзяржаву ўваходзілі Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна. Яны вялі барацьбу на два фронты: супраць гітлераўцаў і супраць бальшавікоў, бо, на іх думку, менавіта Германія і СССР знішчылі Польшчу як дзяржаву. Аўнаўцы, якіх у народзе называлі бандэраўцамі, змагаліся супраць гітлераўцаў і бальшавікоў за самастойную Украіну.

У 1943—1944 гг. акаўцы вялі баявыя дзеянні супраць партызан і падпольшчыкаў, часцей Чырвонай Арміі, усіх тых, хто не падтрымліваў ідэю аднаўлення польскай дзяржавы ў межах 1939 г. У 1944 г. атрад акаўцаў спаліў в. Лукашы Заслаўскага раёна Мінскай вобласці разам з жыхарамі. У гэтым жа годзе былі знішчаны таксама вёскі Турэйск і Забор'е Жалудоцкага раёна Баранавіцкай вобласці. Ахвярамі дзейнасці акаўцаў у Беларусі сталі 10 тыс. грамадзян БССР. У асноўным гэта былі мірныя жыхары, партызанскія сем'і, прадстаўнікі нацыянальнай беларускай інтэлігенцыі.

На аснове рашэнняў ЦК КП(б)Б і Беларускага штаба партызанскага руху восенню 1943 г. на тэрыторыю Заходняй Беларусі былі перакінуты з усходніх і цэнтральных раёнаў рэспублікі 9 партызанскіх брыгад і 10 асобных атрадаў, што значна ўзмацніла сілы беларускіх партызан. Іх колькасць узрасла з 11 да амаль 37 тыс. чалавек.



Правообладатель Народная асвета



Вясна ў партызанскай зоне. Мастак С. Раманаў. 1980 г.

Шмат людзей жылі ў партызанскіх зонах пад аховай партызан. Апошнія дапамагалі сялянам сеяць і збіраць ураджай. Партызанскія медыцынскія работнікі лячылі хворых, змагаліся з эпідэміямі. У партызанскіх зонах адкрываліся і працавалі дзясяткі школ, дзейнічала вялікая колькасць гаспадарчых прадпрыемстваў, якія працавалі на патрэбы партызан і мясцовага насельніцтва, знаходзілася 168 радыёстанцый, выдаваліся падпольныя газеты, праводзіліся гутаркі і лекцыі, дэманстраваліся кінафільмы, урачыста адзначаліся святы.

**Дапамога мясцовага насельніцтва партызанам і падпольшчыкам.** Разам з партызанамі і падпольшчыкамі супраць ворага змагалася большасць мірнага насельніцтва. Яно забяспечвала партызан прадуктамі харчавання, адзеннем і абуткам; здабывала медыкаменты; збірала зброю і боепрыпасы і перадавала іх партызанам; прадастаўляла народным мсціўцам інфармацыю аб германскіх гарнізонах, маршрутах руху акупантаў і іх прыспешнікаў; ратавала і лячыла параненых; дапамагала партызанам і падпольшчыкам змагацца са здраднікамі Айчыны.

Большасць беларускага насельніцтва ажыццяўляла сабатаж гаспадарчых мерапрыемстваў акупацыйных улад — прыпыненне здачы прадуктаў харчавання, непрадастаўленне рабочай і цяглавай сілы, неабходнай для будаўніцтва, невыкананне плана лесанарыхтовак і лесавывазак і г. д. Барацьба на акупіраванай тэрыторыі Беларусі супраць германскіх захопнікаў была сапраўды народнай.

Праваслаўная царква, як і іншыя канфесіі, падтрымала гераічную барацьбу беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

На беларускай зямлі ў складзе партызанскіх атрадаў змагаліся з гітлераўцамі каля 4 тыс. замежных антыфашыстаў. Гэта сведчыць аб інтэрнацыянальным характары барацьбы супраць германскага нацызму.



Правообладатель Народная асвета

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *3 жніўня — верасень 1943 г., 19 верасня — лістапад 1943 г., 20 чэрвеня — 29 жніўня 1944 г.; партызанскі рух, партызанская зона, «рэйкавая вайна», падпольная барацьба, Армія Краёва.*

## Пытанні і заданні

**1.** Дайце азначэнне паняццяў *партызанскі рух, падпольная барацьба.* **2.** Што было характэрна для партызанскага руху ў 1942—1943 гг.? Канкрэтызуйце прыкладамі вывад аб тым, што партызанскі рух у гэты перыяд стаў больш арганізаваным. **3.** Што такое партызанская зона, партызанскі край? Якая прыкмета партызанскай зоны адлюстравана на карціне С. Раманава «Вясна ў партызанскай зоне»? **4.** Назавіце этапы «рэйкавай вайны». З якімі падзеямі на савецка-германскім фронце яны былі звязаны? (*Выкарыстайце веды па сусветнай гісторыі.*) **5.** Пакажыце на карце (с. 143) партызанскія зоны на тэрыторыі акупіраванай Беларусі, месцы асноўных баявых аперацый партызан у 1942—1943 гг. (*Выкарыстайце дадатковы матэрыял.*) **6.** Раскажыце пра падпольную барацьбу на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. (*Выкарыстайце дадатковую літаратуру.*) **7.** Назавіце асаблівасці антыфашысцкай барацьбы на тэрыторыі Заходняй Беларусі. **8.** У чым праяўлялася дапамога мірнага насельніцтва Беларусі партызанам і падпольшчыкам?

## Дадатковы матэрыял

У студзені 1942 г. партызанскія атрады разграмілі германскі гарнізон у райцэнтры Капаткевічы, у лютым — у мястэчку Азарычы і на станцыі Муляраўка.

У жніўні 1942 г. партызанскі атрад пад камандаваннем А. Петракова і А. Раманава знішчыў чыгуначны мост праз р. Дрыса. З-за гэтага чыгуначны рух на лініі Полацк — Даўгаўпілс быў прыпынены на 16 дзён, пазней прапускная здольнасць на гэтым участку чыгункі знізілася з 60 да 8 эшалонаў у суткі. Партызанамі Мінскай і Палескай абласцей у ноч на 3 лістапада 1942 г. быў узарваны чыгуначны мост праз р. Пціч. Варожыя перавозкі па чыгунцы Брэст — Гомель былі прыпынены на 18 дзён. Партызанскія атрады Магілёўскай вобласці знішчылі варожы гарнізон і камунікацыі на чыгуначнай станцыі Слаўнае. У ходзе баявой аперацыі былі знішчаны будынак станцыі, нямецкія казармы, 6 складоў з ваеннай маёмасцю і харчаваннем, 2 вайсковыя эшалоны з тэхнікай. Праціўнік страціў каля 120 салдат і афіцэраў забітымі.

У сакавіку 1942 г. быў арганізаваны партызанскі баявы рэйд па тэрыторыі Любанскага, Жыткавіцкага, Ленінскага, Старобінскага, Чырвонаслабодскага і Слуцкага раёнаў з удзелам каля 600 партызан. Падчас рэйду знішчаліся гарнізоны, сельскія і валасныя ўправы, узрываліся масты, праводзілася агітацыйная работа сярод насельніцтва. У выніку была ўтворана Любанская партызанская зона. У красавіку 1942 г. яна аб'ядналася з Кастрычніцкай партызанскай зонай. Гэта прывяло да ўтварэння партызанскага злучэння атрадаў Мінскай і Палескай абласцей, якое ўзначалілі сакратары Мінскага падпольнага абкама КП(б)Б В. Казлоў і Р. Мачульскі.



Правообладатель Народная асвета

## Гістарычны дакумент

**1. З партызанскай лістоўкі ад 4 жніўня 1942 г.**

«Смерть немецким оккупантам!
Прочитай и передай другому.

Товарищи!

Более года народы нашей страны ведут Отечественную войну против озверелого немецкого фашизма. Миллионы немецких солдат и офицеров нашли себе могилу на полях нашей Родины. С каждым днем все более и более растет количество народных мстителей. Партизанским движением охвачены все оккупированные немцами районы.

Товарищи! Поднимайтесь на борьбу против озверелого немецкого фашизма. Организовывайтесь и вступайте в партизанские отряды. Ни грамма хлеба и мяса фашистам. Не платите оккупантам никаких налогов, уничтожайте склады с боеприпасами, горючим и продовольствием. Разрушайте и сжигайте мосты железных и шоссейных дорог, пускайте под откос поезда.

Партизаны и партизанки! Сильнее удары по врагу! Поднимайте народные восстания в тылу немецко-фашистских захватчиков!

Наше дело правое, и мы победим!»

## Гэта цікава

«На развілцы дарогі Салігорск — Хорастава ўзведзены помнік Івану і Міхаілу Цубам. Помнік прысвечаны аднаму з эпізодаў усенароднай барацьбы ў Беларусі супраць германскіх акупантаў.

…Гэта адбылося ў лютым 1943 г. Гітлераўцы праводзілі аперацыю супраць партызан Беларускага Палесся. Пад націскам карнікаў атрады партызан адышлі ў глыб леса. Услед за імі адышло насельніцтва вёсак. У вёсцы Навіна, куды ўварваліся гітлераўцы, заставаліся старыя браты Цубы ды іх малалетні ўнук. Гітлераўцы, пагражаючы зброяй, патрабавалі ад Міхаіла паказаць месца знаходжання партызан. Старэйшы брат Іван бачыў, як акупанты падганялі Міхаіла стваламі аўтаматаў, бачыў, як той адмоўна махнуў рукой, чуў дроб выстралаў.

Ніхто не ведае, што адчуваў і думаў у той момант Іван Цуба. Ён выйшаў з хаты і прапанаваў германскаму афіцэру паказаць партызанскі лагер.

Шлях іх быў доўгім. Іван вёў карнікаў глухімі ляснымі сцежкамі да тых пор, калі пад нагамі не завагалася Грычынаўскае балота, якое не замярзала нават зімой. Толькі тут нацысты зразумелі, што трапілі



С. Селіханаў. Помнік братам Івану і Міхаілу Цубам каля в. Вялікі Лес Салігорскага раёна Мінскай вобласці. 1961 г.



Правообладатель Народная асвета

ў пастку, і ў дзікай злобе зрашэцілі кулямі цела старога. Але і карнікі амаль поўнасцю былі знішчаны падаспеўшымі партызанамі.

Беларускі народ свята захоўвае памяць аб братах Цубах. У гонар іх узведзены помнік, на пастаменце якога высечаны словы: “Браты-патрыёты Іван і Міхаіл Цубы, жыхары в. Цубы, мужна загінулі ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі. Міхаіл адмовіўся паказаць фашыстам месца, дзе знаходзіліся партызаны, Іван паўтарыў подзвіг Сусаніна”».

## Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (кнізе «Памяць») інфармацыю аб дзейнасці партызан і падпольшчыкаў на тэрыторыі вашага краю ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Падрыхтуйце паведамленне.

## § 26. ВЫЗВАЛЕННЕ БССР АД ГЕРМАНСКІХ ЗАХОПНІКАЎ

**Успомніце. 1.** Калі адбыўся карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай вайны? З якімі падзеямі ён быў звязаны? **2.** У чым заключаецца сутнасць карэннага пералому ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны? **3.** Хто такі П. Баграціён? Якое дачыненне ён мае да гісторыі нашай Айчыны?

**Пачатак вызвалення Беларусі.** Разгром гітлераўскіх войскаў на Курскай дузе і паспяховае наступленне Чырвонай Арміі летам — восенню 1943 г. стварылі ўмовы для выгнання акупантаў з Беларусі.

**23 верасня 1943 г.** быў вызвалены першы раённы цэнтр рэспублікі *Камарын* Палескай вобласці. 20 воінам, якія вызначыліся пры фарсіраванні Дняпра ў раёне



Палонных вядуць. Мастак А. Шыбнёў. 1947 г.



Правообладатель Народная асвета



Плакат перыяду Вялікай Айчыннай вайны

Камарына, было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У канцы верасня — пачатку кастрычніка 1943 г. былі вызвалены раённыя цэнтры Церахаўка Гомельскай вобласці, Хоцімск, Мсціслаў, Крычаў, Чэрыкаў і Краснаполле Магілёўскай вобласці.

26 лістапада 1943 г. быў вызвалены першы абласны цэнтр *Гомель*, куды адразу ж пераехалі ЦК КП(б)Б, урад рэспублікі і Беларускі штаб партызанскага руху. У студзені 1944 г. войскі Беларускага фронту правялі Калінкавіцка-Мазырскую аперацыю і з дапамогай партызан вызвалілі абласны цэнтр Мазыр і чыгуначны вузел Калінкавічы. У раёне Азарычаў войскі Чырвонай Арміі выратавалі вязняў трох канцлагераў (больш за 33 тыс. савецкіх грамадзян).

Усяго ў выніку наступлення Чырвонай Арміі восенню — зімой 1943—1944 гг. поўнасцю ці часткова былі вызвалены 36 раёнаў Беларусі, 36 раённых і 2 абласныя цэнтры — Гомель і Мазыр.

**Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён».** У 1944 г. Чырвоная Армія нанесла шэраг удараў па ворагу, у выніку якіх *дзяржаўная граніца СССР была адноўлена на ўсёй адлегласці ад Баранцавага да Чорнага мора*. Гітлераўцы былі выгнаны з Румыніі і Балгарыі, з большасці раёнаў Польшчы і Венгрыі. Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Чэхаславакіі і Югаславіі.

У ліку гэтых удараў быў і разгром гітлераўскіх войскаў на тэрыторыі Беларусі. Ён увайшоў у гісторыю пад кодавай назвай ***аперацыя «Баграціён»***. Гэта адна з буйнейшых наступальных аперацый Чырвонай Арміі супраць групы армій «Цэнтр» у гады Вялікай Айчыннай вайны. Яна працягвалася з **23 чэрвеня да 29 жніўня 1944 г.**

У правядзенні аперацыі «Баграціён» удзельнічалі арміі чатырох франтоў: 1-га Беларускага (камандуючы *К. Ракасоўскі*), 2-га Беларускага (камандуючы *Г. Захараў*), 3-га Беларускага (камандуючы *І. Чарняхоўскі*), 1-га Прыбалтыйскага (камандуючы *І. Баграмян*), сілы Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

Шырыня фронту баявых дзеянняў дасягала 1100 км, глыбіня руху войскаў — 560—600 км. Агульная колькасць савецкіх войскаў складала 2,4 млн чалавек. У ходзе аперацыі было выкарыстана 36 400 гармат і мінамётаў, 5200 танкаў і самаходных артылерыйскіх установак, 5300 самалётаў (без уліку самалётаў далёкага дзеяння). Да таго ж у тыле ворага дзейнічалі 150 партызанскіх брыгад і 49 асобных атрадаў агульнай колькасцю больш за 143 тыс. чалавек.

Чырвонай Арміі супрацьстаяла магутная групоўка армій «Цэнтр», дзве армейскія групоўкі — «Поўнач» і «Паўночная Украіна». Агульная колькасць войскаў



Правообладатель Народная асвета



К. Ракасоўскі



Г. Захараў



І. Чарняхоўскі

праціўніка складала каля 1,2 млн салдат і афіцэраў. На іх узбраенні было 9500 гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат, 1350 баявых самалётаў.

Аперацыя «Баграціён» пачалася раніцай **23 чэрвеня 1944 г.** Пасля артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі на Віцебскім, Аршанскім і Магілёўскім напрамках перайшлі ў наступленне войскі 1-га Прыбалтыйскага, 2-га і 3-га Беларускіх франтоў. На другі дзень на варожыя пазіцыі абрушылі ўдар войскі 1-га Беларускага фронту. Дзеянні франтоў каардынавалі прадстаўнікі Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання маршалы Савецкага Саюза *Г. Жукаў* і *А. Васілеўскі*.

Войскі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў прарвалі абарону праціўніка пад Віцебскам і на трэці дзень правядзення аперацыі, 25 чэрвеня 1944 г., злучыліся каля в. Гняздзілавічы Бешанковіцкага раёна. Варожая групоўка трапіла ў акружэнне. Праціўнік страціў каля 20 тыс. салдат і афіцэраў забітымі, больш за 10 тыс. палоннымі. 26 чэрвеня 1944 г. Віцебск быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Амаль адначасова з падзеямі пад Віцебскам войскі 1-га Беларускага фронту змаглі пераадолець балоцістую мясцовасць Беларускага Палесся і ў ходзе Бабруйскай аперацыі акружылі 6 дывізій нямецкай арміі. 28 чэрвеня 1944 г. варожая групоўка колькасцю 40 тыс. чалавек была ліквідавана. Важную ролю ў гэтым адыграла авіяцыя фронту. Групамі па 25—30 самалётаў яна наносіла ўдары па германскіх войсках, трапіўшых у *Бабруйскі «кацёл»*.



І. Баграмян

Працягваючы наступленне, войскі 3-га Беларускага фронту 3 ліпеня 1944 г. вызвалілі Мінск. Першым у беларускую сталіцу ўварваўся танк малодшага лейтэнанта *Д. Фролікава* 2-га гвардзейскага танкавага корпуса пад



Правообладатель Народная асвета



Д. Фралікаў

камандаваннем генерал-маёра *А. Бурдзейнага*. Услед за танкістамі ў бой за вызваленне Мінска рушылі салдаты і афіцэры агульнавайсковых армій. У другой палове дня 3 ліпеня 1944 г. у Мінску не было ніводнага варожага салдата.

На ўсход ад Мінска ў «кацёл» трапіла 105-тысячная групоўка германскіх войскаў. 11 ліпеня 1944 г. яна перастала існаваць.

Моцныя ўдары па камунікацыях і лініях сувязі акупантаў нанеслі беларускія партызаны. У ноч на 20 чэрвеня 1944 г. пачаўся трэці этап «рэйкавай вайны». За гэту ноч партызаны Беларусі ўзарвалі больш за 40 тыс. рэек.

Першае баявое хрышчэнне каля пасёлка Леніна Магілёўскай вобласці прыняла *польская дывізія імя Т. Касцюшкі*. У баях за вызваленне Беларусі прымалі ўдзел французскія лётчыкі авіяцыйнага палка «Нармандыя — Нёман».

З 5 ліпеня да 29 жніўня 1944 г. ажыццяўляўся другі этап вайсковай аперацыі «Баграціён». Савецкія войскі 16 ліпеня 1944 г. вызвалілі Гродна, а 28 ліпеня — Брэст. Акупанты былі цалкам выгнаны з беларускай зямлі.



Мінск. 3 ліпеня 1944 г. Мастак В. Волкаў. 1946—1953 гг.



Правообладатель Народная асвета




Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён» (23 чэрвеня — 29 жніўня 1944 г.)

У ходзе Беларускай наступальнай аперацыі была разгромлена група армій «Цэнтр» і іншыя вайсковыя групоўкі праціўніка. Да канца жніўня 1944 г. Чырвоная Армія адкінула ворага на захад на 500—600 км у паласе 1100 км. Акрамя Беларусі, была вызвалена ад германскіх акупантаў частка тэрыторый Літоўскай і Латвійскай ССР. Чырвоная Армія ўступіла на землі Польшчы і падышла да меж Усходняй Пру-



Правообладатель Народная асвета

сіі. Германскае камандаванне было вымушана перакінуць з Заходняга фронту ў Еўропе на беларускі тэатр ваенных дзеянняў дзясяткі сваіх дывізій. Гэта садзейнічала больш паспяховаму правядзенню аперацыі войскамі ЗША, Англіі і Канады на тэрыторыі Францыі.

Асаблівасцю правядзення аперацыі «Баграціён» было тое, што на кірунку нанясення галоўнага ўдару па германскай групоўцы савецкіх войскаў было ўдвая больш, чым войскаў праціўніка. Чырвоная Армія мела самалётаў амаль у 4 разы больш, чым германская, танкаў і самаходна-артылерыйскіх установак — амаль у 5 разоў больш, гармат і мінамётаў — у 3,7 раза больш. Буйныя танкавыя злучэнні — танкавыя арміі шырока не выкарыстоўваліся, што было абумоўлена мноствам лясоў, балот, азёр і рэк на тэрыторыі Беларусі. Гэта не дазваляла эфектыўна прымяняць у наступальнай аперацыі танкавыя арміі. Шырока выкарыстоўваліся меншыя па памерах танкавыя злучэнні — брыгады, дывізіі, карпусы. У перыяд падрыхтоўкі і правядзення аперацыі «Баграціён» некалькі савецкіх ударных танкавых армій знаходзіліся на тэрыторыі Паўночнай Украіны. Гэта стварала ў немцаў ілюзію таго, што кірункам галоўнага ўдару летам 1944 г. будзе не Беларусь, а Паўночная Украіна. Тое, што кірункам галоўнага ўдару была выбрана Беларусь, як і тое, што войскі 1-га Беларускага фронту змаглі прайсці праз палескія балоты і нанесці ўдар там, дзе вораг не чакаў, з'яўлялася, на думку нямецкіх генералаў, дзеяннямі «насуперак логіцы здаровага сэнсу». Але на вайне ёсць адна логіка — логіка перамагаць. Хто перамагае, у таго і «больш логікі», больш дасканалая ваенная стратэгія і тактыка.

У баях за Беларусь савецкія воіны паказвалі ўзоры масавага гераізму. Экіпаж танка Т-34 у складзе *П. Рака (камандзір), А. Пятраева, А. Данілава* 17 гадзін вёў няроўны бой у г. Барысаў. Было падбіта 2 варожыя танкі, знішчана камендатура, германскі штаб, вызвалены з няволі 200 савецкіх ваеннапалонных. Экіпаж загінуў у няроўным баі. Танкістам пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Сын удмурцкага народа сяржант *М. Селязнёў* здзейсніў подзвіг 3 чэрвеня 1944 г. у баі за вёску Сычкава Бабруйскага раёна. У крытычны момант бою ён сваім целам закрыў амбразуру варожага дзота, чым забяспечыў выкананне ротай баявой задачы. М. Селязнёву пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Лётчыкі лейтэнанты *М. Кірэеў* і *І. Бярэзін* пад Мінскам свае ахопленыя полымем самалёты накіравалі на калоны варожай тэхнікі. Яны паўтарылі подзвіг, які ў пачатку вайны здзейсніў экіпаж самалёта пад камандаваннем капітана М. Гастэлы.

У баях за Беларусь вызначыліся больш за 402 тыс. воінаў Чырвонай Арміі, якія былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Больш чым 1500 салдатам, афіцэрам і генералам было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. 600 вайсковых часцей і злучэнняў атрымалі ганаровыя імёны па назвах гарадоў і геаграфічных аб'ектаў Беларусі — «Віцебскія», «Барысаўскія», «Магілёўскія» і інш.



Правообладатель Народная асвета

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *23 верасня 1943 г., 23 чэрвеня — 29 жніўня 1944 г., 3 ліпеня 1944 г.; аперацыя «Баграціён».*

## Пытанні і заданні

**1.** Калі пачалося вызваленне БССР ад германскіх захопнікаў? З якімі падзеямі на савецка-германскім фронце гэта было звязана? Якімі былі вынікі першага этапа вызвалення БССР ад акупантаў? **2.** Што такое аперацыя «Баграціён»? Калі яна праводзілася? Якімі былі яе мэты і вынікі? **3.** З дапамогай карты (с. 153) ахарактарызуйце ход Беларускай наступальнай аперацыі. **4.** Якое значэнне мела аперацыя «Баграціён» для далейшага хода ваенных дзеянняў? **5.** Карыстаючыся дадатковай літаратурай, падрыхтуйце паведамленні аб подзвігах савецкіх воінаў у час Беларускай наступальнай аперацыі. **6.** Якая падзея аперацыі «Баграціён» адлюстравана на карціне В. Волкава «Мінск. 3 ліпеня 1944 г.»? Падрыхтуйце паведамленне аб гэтай падзеі.

## Ваша меркаванне

Якія фактары, на ваш погляд, абумовілі паспяховасць дзеянняў Чырвонай Арміі ў час Беларускай наступальнай аперацыі? (*Выкарыстайце гістарычныя дакументы.*)

## Гістарычны дакумент

### 1. З успамінаў Маршала Савецкага Саюза, прадстаўніка Стаўкі па каардынацыі дзеянняў 1, 2 і 3-га Беларускіх франтоў і 1-га Прыбалтыйскага фронту ў Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён» Г. Жукава

«В тылу врага партизанские отряды, части и соединения начали активные операции, заранее увязанные с действиями фронтов. При штабах фронтов действовали отделы по руководству партизанским движением. Они осуществляли большую работу по связи, материально-техническому обеспечению партизанских частей и координации их действий. Надо сказать, что в Белорусской операции партизанские части и отряды развернули исключительно большую активность…»

### 2. З кнігі былога начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху, першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі П. Панамарэнкі «Всенародная борьба в тылу немецко-фашистских захватчиков: 1941—1944»

«В ночь на 20 июня партизаны атаковали железнодорожные коммуникации группы армий “Центр” на всем протяжении от линии фронта до государственной границы и нанесли свой знаменитый рельсовый удар. Всего за одну ночь на 20 июня 1944 г. было перебито 40 775 рельсов. На основной артерии Брест — Барановичи — Минск — Орша было перебито в одну ночь 11 240 рельсов, на линии Брест — Лунинец — Старушки — 3095, на линии Вильнюс — Двинск белорусские



Правообладатель Народная асвета

партизаны совместно с литовскими и латвийскими партизанами перебили 2375 рельсов.

В период рельсовых ударов в июне и начале июля 1944 г. белорусские партизаны взорвали более 60 тыс. рельсов. Только с 26 по 29 июня партизаны захватили, разгромили и спустили под откос 147 вражеских эшелонов. Сотни эшелонов не смогли двигаться, остались на путях и были захвачены Красной Армией. Партизаны дезорганизовали движение, захватили и удерживали до подхода Красной Армии десятки железнодорожных станций — Княгинин, Юратишки, Дегтяны, Парохонск, Гудогай, Ловша и др.».

**3. З успамінаў нямецкага генерала К. Тыпельскірха**

«Между 21 и 23 июня четыре русских фронта начали наступление по обе стороны Витебска, на Оршу и Могилев, а также севернее и южнее Бобруйска с целью сокрушить оборону группы армий "Центр". Русский метод ведения наступления со времени последних наступательных операций стал еще более совершенным… Собственно, наступлению теперь предшествовал более интенсивный по сравнению с предыдущими операциями многочасовой огонь артиллерии на уничтожение, сочетавшийся со столь же необычным по своим масштабам использованием крупных сил авиации. Вероятно, с целью достигнуть предельной мощи ударов с воздуха они наносились с интервалом в один день по каждой из трех немецких армий, оборонявшихся на решающих направлениях русского наступления. Перешедшие в наступление после окончания артиллерийской и авиационной подготовки пехотные соединения поддерживались и прикрывались исключительно эффективными действиями авиации. Это было сделано для того, чтобы нейтрализовать немецкую артиллерию, которой раньше нередко удавалось срывать наступление русских войск. Из-за незначительного количества немецких самолетов — 6-й воздушный флот располагал лишь 40 исправными истребителями — превосходство русских в воздухе было теперь таким же, как и у их западных союзников… После завершения пехотой прорыва в него немедленно вводились танковые силы. Уже в первые дни русского наступления на многих участках возникла критическая обстановка, а резервов было мало. Эффективные действия в наступлении, исключавшие возможность оказания какой-либо действенной помощи [немецко-фашистским войскам], позволили русским молниеносно добиться таких крупных успехов, что исправить положение было уже нельзя…»

## Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (кнізе «Памяць») інфармацыю аб вызваленні тэрыторыі вашага краю ад германскіх захопнікаў. Падрыхтуйце паведамленне.



Правообладатель Народная асвета

# § 27. УКЛАД БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў ПЕРАМОГУ НАД НАЦЫСЦКАЙ ГЕРМАНІЯЙ

**Успомніце. 1.** Прывядзіце прыклады гераічнай барацьбы супраць германскіх захопнікаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. **2.** Што такое рух Супраціўлення? Хто ў ім удзельнічаў?

**Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у партызанскіх атрадах і падполлі.** На франтах Вялікай Айчыннай вайны змагаліся з ворагам больш за 1,3 млн беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі. Сотні тысяч з іх загінулі ў барацьбе з гітлераўскімі захопнікамі.

На фронт нярэдка накіроўваліся цэлымі сем'ямі. Тадора Храбрая з Бялыніч адправіла на фронт шасцярых сваіх сыноў, столькі ж сыноў паслаў у Чырвоную Армію быхаўскі калгаснік Акім Красоўскі. Старэйшы з яго сыноў, Сцяпан, які лятаў на штурмавіку, стаў маршалам авіяцыі. Анастасія Купрыянава з Жодзіна паслала на фронт пяцярых сваіх сыноў. Малодшы з іх, Пётр, паўтарыў подзвіг А. Матросава пры ліквідацыі акружанай групоўкі ворага на тэрыторыі Латвіі. У Жодзіне ўстаноўлены помнік маці-патрыётцы і пяці яе загінуўшым сынам. У хаце, дзе яна жыла, створаны музей.

З сям'і Сцяпана Пляца, жыхара вёскі Азярцы Талачынскага раёна, з ворагам змагаліся 4 сыны і 2 нявесткі. За час вайны на самалётах яны зрабілі 2640 баявых вылетаў, былі ўзнагароджаны 50 ордэнамі і медалямі, а нявесткі Руфіма і Раіса сталі Героямі Савецкага Саюза.



Манумент у гонар маці-патрыёткі ў Жодзіне



Правообладатель Народная асвета



А. Гаравец

Мужна змагаліся з ворагам на заснежаных палях Падмаскоўя ўраджэнец Бешанковіцкага раёна генерал-маёр Л. Даватар, гамяльчане браты-палкоўнікі Аляксандр і Пётр Лізюковы, ураджэнец Міншчыны Д. Гліцэвіч. Першы ў гісторыі вышынны паветраны таран здзейсніў у маскоўскім небе беларус А. Катрыч, першы начны паветраны таран — В. Талаліхін.

Сын селяніна з в. Машканы Сенненскага раёна, лётчык *А. Гаравец* на Курскай дузе прыняў бой з 20 варожымі бамбардзіроўшчыкамі, збіў 9 самалётаў праціўніка. Ён адзіны ў свеце лётчык, які ў адным паветраным баі збіў столькі самалётаў. А. Гаравец загінуў у тым жа баі. Пасмяротна яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

З ліку беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі вызначылася шмат таленавітых военачальнікаў і палкаводцаў. Сярод іх начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР, генерал арміі, кавалер ордэна «Перамога» А. Антонаў; маршалы Савецкага Саюза В. Сакалоўскі і І. Якубоўскі; маршал авіяцыі С. Красоўскі; генералы арміі І. Гусакоўскі, В. Маргелаў, І. Шаўроў; генерал-палкоўнікі А. Бацюня, У. Вашкевіч, І. Камера, Ф. Кузняцоў, М. Паўлоўскі, А. Петрушэўскі; віцэ-адмірал В. Дрозд; контр-адміралы В. Ананіч, А. Гурын і інш. Толькі ў складзе Ваенна-Паветраных Сіл СССР у гады



П. Галавачоў



І. Гусакоўскі



Правообладатель Народная асвета



С. Шутаў



І. Якубоўскі

Вялікай Айчыннай вайны налічвалася 5305 і ў бранятанкавых войсках — 2500 афіцэраў — беларусаў па паходжанні.

Усяго 446 беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі атрымалі званне Героя Савецкага Саюза, чацвёра з іх — П. Галавачоў, І. Гусакоўскі, С. Шутаў, І. Якубоўскі — удастоены гэтага звання двойчы, 67 чалавек сталі кавалерамі ордэна Славы трох ступеняў. Каля 400 тыс. воінаў-беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. За гады вайны каля 400 беларусаў сталі генераламі і адміраламі.

На зямлі Беларусі мужна змагаліся з ворагам 374 тыс. партызан і 70 тыс. падпольшчыкаў. Больш за 140 тыс. партызан і падпольшчыкаў Беларусі былі ўзнага-



Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». Манумент «Мужнасць»



Мемарыяльны комплекс «Буйніцкае поле» пад Магілёвам



Правообладатель Народная асвета



Манумент Перамогі ў горадзе-героі Мінску



Курган Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі

роджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза, а 88 з іх сталі Героямі Савецкага Саюза.

Беларускі народ ушаноўвае памяць тых, хто мужна змагаўся з германскімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У кожным горадзе і ў многіх беларускіх вёсках пастаўлены помнікі змагарам з акупантамі. У сталіцы, горадзе-героі Мінску, у абласных цэнтрах і буйных гарадах створаны манументы Перамогі, мемарыяльныя комплексы, насыпаны курганы славы ў гонар салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, партызан і падпольшчыкаў.



Гродна. Мемарыяльны ансамбль воінам-пагранічнікам Беларускай пагранічнай акругі



Віцебск. Мемарыяльны комплекс у гонар воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў Віцебшчыны



Правообладатель Народная асвета



Архітэктурна-скульптурны комплекс «Мінск — горад-герой»

**Удзел у еўрапейскім руху Супраціўлення.** Нашы землякі прынялі актыўны ўдзел у антыфашысцкім руху Супраціўлення ў заходніх краінах Еўропы, куды занёс іх трагічны лёс вайны. Гэта тычыцца перш за ўсё жыхароў заходніх раёнаў Беларусі, дэпартаваных напярэдадні вайны ў Сібір і адтуль трапіўшых у польскую армію генерала Андэрса, якая была сфарміравана на тэрыторыі Савецкага Саюза, а затым выйшла да саюзнікаў і ўдзельнічала ў цяжкіх баях за вызваленне Італіі.

У італьянскім руху Супраціўлення прымаў удзел адзін з памочнікаў камандзіра 16-й гарыбальдзійскай дывізіі «Вагано» 19-гадовы студэнт з Мінска *Аляксандр*. У памяці партызан засталося толькі яго імя. Аляксандр загінуў у снежні 1944 г. На італьянскай зямлі загінуў таксама *А. Кісялёў*, ураджэнец вёскі Стары Стан Клімавіцкага раёна, які змагаўся ў гарыбальдзійскай партызанскай брыгадзе «Матэоці». 16-гадовым юнаком быў адпраўлены на прымусовыя работы *М. Фралоў* з вёскі Сідаравічы Магілёўскага раёна. Апынуўшыся ў Італіі, ён уцёк да партызан. Пасля вызвалення Італіі атрымаў «пасведчанне патрыёта». Інжынер з Дзяржынска *А. Варанкоў* уцёк у 1943 г. з фашысцкага канцлагера, быў начальнікам штаба партызанскага атрада, а затым брыгады, што дзейнічала на тэрыторыі Бельгіі. Пасля выгнання гітлераўскіх захопнікаў ён у ліку 30 іншых савецкіх партызан быў узнагароджаны вышэйшым ваенным ордэнам Бельгіі.



Правообладатель Народная асвета



Д. Карбышаў

Апынуўшыся ў канцэнтрацыйных лагерах, вязні з нашай рэспублікі наладжвалі кантакты з удзельнікамі антыфашысцкага руху на волі, прымалі ўдзел у стварэнні баявых цэнтраў, якія дзейнічалі ў Асвенцыме, Дахау, Бухенвальдзе, Заксенхаўзене і інш. У Маўтхаўзене пасля генерал-лейтэнанта *Д. Карбышава*, якога закатавалі гітлераўцы, падпольную арганізацыю ўзначаліў ураджэнец Чавусаў Магілёўскай вобласці палкоўнік *Л. Маневіч*. Пад яго кіраўніцтвам быў распрацаваны план паўстання, і да падыходу саюзнікаў паўстанцы захапілі лагер. У гэтым жа лагеры раней гітлераўцы расстралялі аднаго з актыўных удзельнікаў падпольнай арганізацыі, ураджэнца вёскі Цяхцін Бялыніцкага раёна палкоўніка *Д. Цумарава*.

Найбольш моцным і арганізаваным быў рух савецкіх патрыётаў у Францыі. Там у кастрычніку 1943 г. быў створаны *Цэнтральны камітэт былых савецкіх ваеннапалонных*. Добра арганізаваныя атрады з савецкіх ваеннапалонных наносілі гітлераўцам адчувальныя страты.

У руху Супраціўлення актыўна ўдзельнічалі і жанчыны Беларусі. У Францыі яны арганізавалі асобны жаночы атрад *«Радзіма»*, які праславіўся баявымі справамі. Камандзірам атрада была выбрана мінчанка *Н. Лісавец*, а пасля яе хваробы — *Р. Сямёнава-Фрыдзон*. Абедзвюм было прысвоена званне лейтэнанта французскай арміі.

На землях Чэхаславакіі дзейнічала брыгада імя Клімента Готвальда, якую ўзначальваў ураджэнец Лепельскага раёна *В. Квіцінскі*. Толькі ў верасні 1944 г. брыгада ажыццявіла 158 баявых аперацый. Савецкі ўрад прысвоіў яе камандзіру званне Героя Савецкага Саюза.

На беларускай зямлі змагаліся з гітлераўцамі славацкі партызанскі атрад Яна Налепкі, немцы Фрыц Шменкель і Карл Лінке, балгарка Лілія Карастаянава, іспанец Хуста Лопес. Так у гады вайны ўмацоўвалася адзінства народаў свету ў барацьбе супраць нацызму.

**Працоўны гераізм у савецкім тыле.** Разам з эвакуіраванымі прадпрыемствамі ў савецкі тыл — Паволжа, Урал, Заходнюю Сібір і іншыя рэгіёны СССР — былі эвакуіраваны звыш 1,5 млн беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі. Разам з прадстаўнікамі іншых народаў Савецкага Саюза яны самаахвярна працавалі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, забяспечваючы Чырвоную Армію зброяй, боепрыпасамі, прадуктамі харчавання і г. д. Дзясяткі тысяч нашых суайчыннікаў за свой працоўны



Правообладатель Народная асвета

подзвіг у гады Вялікай Айчыннай вайны былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а некаторыя з іх удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы.

Важны ўклад у разгром ворага ўносілі дзеячы беларускай навукі і культуры. У савецкім тыле працавалі каля 100 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР, дактароў і кандыдатаў навук, звыш 400 артыстаў, каля 50 мастакоў, 22 кампазітары, вялікая колькасць работнікаў друку, асветы і аховы здароў'я.

### Пытанні і заданні

**1.** Ахарактарызуйце ўклад беларускага народа ў Перамогу над нацысцкай Германіяй. Прывядзіце прыклады гераічнай барацьбы ўраджэнцаў Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, удзелу беларусаў у еўрапейскім руху Супраціўлення, працоўнага гераізму беларусаў у савецкім тыле. **2.** Падрыхтуйце паведамленні аб укладзе дзеячаў беларускай навукі і культуры ў барацьбу з акупантамі. (*Выкарыстайце дадатковую літаратуру.*) **3.** Чым, на ваш погляд, тлумачыцца гераізм беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны? **4.** Падрыхтуйце прэзентацыю на тэму «Подзвігу народа жыць у вяках». Адлюструйце ў ёй, якім чынам у нашай рэспубліцы (вашым краі) ушаноўваецца памяць аб змагарах супраць гітлераўскіх акупантаў, аб Вялікай Перамозе.

### Ваша меркаванне

Як вы лічыце, чаму СССР здолеў перамагчы ў вайне гітлераўскую Германію?

### Гэта цікава

**Карбышаў Дзмітрый Міхайлавіч (1880—1945).** Савецкі ваенны інжынер, генерал-лейтэнант інжынерных войскаў, Герой Савецкага Саюза. З'яўляўся ўдзельнікам Руска-японскай вайны і Першай сусветнай вайны. У 1911—1914 гг. рэканструяваў Брэсцкую крэпасць. У гады Грамадзянскай вайны арганізоўваў інжынернае забеспячэнне аперацый па разгроме войск Калчака і Врангеля. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў раёне Гродна. Пры выхадзе з акружэння быў паранены і каля Магілёва трапіў у палон. Нацысты прымушалі Д. Карбышава да супрацоўніцтва. На ўсе іх прапановы Д. Карбышаў адказаў: «Мае перакананні не выпадаюць разам з зубамі ад недахопу вітамінаў у лагерным рацыёне. Я — салдат і застаюся верным свайму доўгу. А ён не дазваляе мне працаваць на тую краіну, якая знаходзіцца ў стане вайны з маёй Радзімай».

Власаў доўга ўгаворваў Карбышава ўступіць у так званую Рускую вызваленчую армію, у якую ўступілі многія здраднікі Радзімы. Але Карбышаў выбраў смерць, а не здраду.

18 лютага 1945 г. у канцлагеры Маўтхаўзен нацысты вывелі 65-гадовага Д. Карбышава на мароз і аблівалі вадой да таго часу, пакуль ён не памёр. На месцы яго смерці пастаўлены помнік.

Генерал-лейтэнанту Д. Карбышаву за выключную стойкасць і мужнасць, праяўленыя ў барацьбе з германскімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне, было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Імя Д. Карбышава но-



Правообладатель Народная асвета

сяць вуліцы ў Мінску, Брэсце, Гродна. Яго імем названа таксама малая планета Сонечнай сістэмы. Подзвігу Карбышава прысвечана паэма С. Васільева «Достоинство». У 1975 г. рэжысёр Ю. Чулюкін зняў мастацкі фільм «Родины солдат», які расказвае пра подзвіг Д. Карбышава.

### Да ўрока па тэме «Наш край»

Знайдзіце ў мясцовым краязнаўчым музеі, дадатковай літаратуры, гісторыка-дакументальнай хроніцы свайго раёна (кнізе «Памяць») звесткі аб удзеле вашых землякоў у Вялікай Айчыннай вайне. Падрыхтуйце паведамленні.

Калі ёсць магчымасць, сустрэньцеся са сваімі землякамі, якія прымалі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне. Запішыце іх успаміны.

## § 28. УДЗЕЛ БЕЛАРУСКАЙ ССР У ЗАСНАВАННІ АРГАНІЗАЦЫІ АБ'ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ

**Успомніце. 1.** Што такое Ліга Нацый? Калі і з якой мэтай яна была створана? Якімі былі вынікі яе дзейнасці? **2.** З якой мэтай была створана Арганізацыя Аб'яднаных Нацый?

**Савецкая стратэгія ў адносінах да ААН.** На *Тэгеранскай канферэнцыі* ў лістападзе — снежні 1943 г. кіраўнікі СССР, ЗША і Вялікабрытаніі абмяркоўвалі пытанне аб утварэнні міжнароднай арганізацыі, здольнай вырашаць глабальныя праблемы чалавецтва, быць гарантам міру і бяспекі ва ўсім свеце. Кожная з краін — удзельніц канферэнцыі была заклапочана тым, каб больш эфектыўна абараніць свае інтарэсы, каб у будучай міжнароднай арганізацыі мець найбольшую колькасць галасоў. СССР прапанаваў саюзнікам прадаставіць месцы ў камісіі Аб'яднаных Нацый па ваенных злачынствах сямі савецкім рэспублікам. Вялікабрытанія і ЗША да гэтай прапановы аднесліся адмоўна на той падставе, што савецкія рэспублікі як члены СССР не маюць канстытуцыйнага права для міжнароднай дзейнасці.

У сувязі з гэтым у пачатку 1944 г. у Канстытуцыю СССР было ўнесена палажэнне аб тым, што саюзныя рэспублікі маюць права «ўступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца дыпламатычнымі прадстаўнікамі». У сакавіку 1944 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў *Закон аб стварэнні Народнага камісарыята замежных спраў БССР*. Летам 1944 г. БССР правяла перагаворы з Польшчай адносна змены дзяржаўнай граніцы паміж краінамі-суседзямі. Аднак гэта не вырашала праблему прызнання БССР і іншых савецкіх рэспублік у якасці суб'ектаў міжнароднага права.

26 жніўня 1944 г. кіраўнік дэлегацыі СССР на канферэнцыі ў Думбартан-Оксе (ЗША) ***А. Грамыка*** прапанаваў уключыць усе 16 савецкіх рэспублік у лік засна-



Правообладатель Народная асвета

вальнікаў будучай ААН. Ініцыятыва СССР зноў выклікала адмоўную рэакцыю з боку ЗША і Вялікабрытаніі. Прэзідэнт ЗША Ф. Рузвельт у пасланні І. Сталіну адзначыў, што савецкія прапановы нібыта ставяць пагрозу стварэнню міжнароднай арганізацыі. Савецкі Саюз, у сваю чаргу, адхіліў амерыканскую прапанову звярнуцца да гэтай праблемы пасля стварэння ААН. Ён падкрэсліў, што шэраг савецкіх рэспублік, у першую чаргу УССР і БССР, значна пераўзыходзяць памерамі і колькасцю насельніцтва асобныя краіны, чыё членства ў ААН не выклікае спрэчак.

### Гістарычны партрэт



**Грамыка Андрэй Андрэевіч** (1909—1989) нарадзіўся ў в. Старыя Грамыкі Гомельскага павета Магілёўскай губерні ў сялянскай сям'і. Савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, дыпламат. Двойчы Герой Сацыялістычнай Працы. З 1939 г. на дыпламатычнай рабоце. Загадваў аддзелам амерыканскіх краін Міністэрства замежных спраў СССР, працаваў надзвычайным і паўнамоцным паслом СССР у ЗША і Вялікабрытаніі, быў пастаянным прадстаўніком СССР у Савеце Бяспекі ААН. У 1957—1985 гг. з'яўляўся міністрам замежных спраў СССР. Член Палітбюро ЦК КПСС у 1973—1988 гг. Удзельнік і кіраўнік савецкіх дэлегацый на многіх міжнародных канферэнцыях, на сесіях Генеральнай Асамблеі ААН, на нарадах міністраў замежных спраў розных краін.

Савецкая прапанова аб краінах — заснавальніцах ААН выносілася на абмеркаванне *Крымскай канферэнцыі* кіраўнікоў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі (люты 1945 г.). Пасля напружаных перагавораў Савецкі Саюз адмовіўся ад ранейшай прапановы аб уключэнні ўсіх 16 савецкіх рэспублік у лік краін — заснавальніц будучай ААН. Ён дабіўся ўключэння ў сакрэтны пратакол канферэнцыі членаў ААН *Беларускай ССР і Украінскай ССР*. Гэта абумоўлівалася тым, што гэтыя рэспублікі панеслі выключныя страты ў час германскай агрэсіі і ўнеслі вялікі ўклад у барацьбу з дзяржавамі гітлераўскай кааліцыі.

**Уключэнне Беларускай ССР у склад краін — заснавальніц ААН. Выхад Беларусі на міжнародную арэну.** 27 красавіка 1945 г. Міжнародная канферэнцыя *ў Сан-Францыска*, скліканая для заснавання Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, прыняла *рашэнне аб уключэнні БССР і УССР у лік краін — заснавальніц гэтай арганізацыі*. Дэлегацыі БССР і УССР былі запрошаны на ўстаноўчую канферэнцыю ААН.



Правообладатель Народная асвета



Дэлегацыя Беларускай ССР пры падпісанні Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Статут падпісвае кіраўнік дэлегацыі наркам замежных спраў БССР К. Кісялёў

Дэлегацыя Беларускай ССР на чале з наркамам замежных спраў *К. Кісялёвым* **26 чэрвеня 1945 г.** падпісала Статут Усеагульнай міжнароднай арганізацыі для падтрымкі міру і бяспекі. Беларуская ССР стала паўнамоцным суб'ектам міжнароднага права. Па яе ініцыятыве на I сесіі Генеральнай Асамблеі ААН была прынята рэзалюцыя аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў.

Пазней Беларуская ССР удзельнічала ў рабоце амаль 70 міжнародных арганізацый і іх органаў. Для падтрымання сувязі з імі былі створаны пастаянныя прадстаўніцтвы БССР пры ААН у Нью-Ёрку, Еўрапейскім аддзяленні ААН у Жэневе, міжнародных арганізацыях у Вене. Беларуская ССР сапраўды выйшла на міжнародную арэну.

**Даты і паняцці, якія трэба ведаць:** *26 чэрвеня 1945 г.; Арганізацыя Аб'яднаных Нацый.*

### Пытанні і заданні

**1.** Ахарактарызуйце пазіцыю СССР па пытанні аб краінах — заснавальніцах ААН. Якія меры былі прыняты савецкім кіраўніцтвам для дасягнення сваёй мэты ў гэтым пытанні? **2.** Чым было абумоўлена ўключэнне ў склад краін — заснавальніц ААН Украінскай ССР і Беларускай ССР? **3.** Як вы разумееце наступнае сцвярджэнне: «Беларуская ССР стала паўнамоцным суб'ектам міжнароднага права»? **4.** Карыстаючыся дадатковай літаратурай, падрыхтуйце паведамленне аб жыцці і палітычнай дзейнасці А. Грамыкі.



Правообладатель Народная асвета

## НАШ КРАЙ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВОЙНАЎ

Канкрэтызуйце асноўныя тэндэнцыі развіцця Беларусі ў 1939 — 1945 гг. фактамі з гісторыі вашага краю. Выкарыстайце інфармацыю мясцовага краязнаўчага музея, гісторыка-дакументальную хроніку свайго раёна (кнігу «Памяць»), іншую дадатковую літаратуру.

*Сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны:*

- Ахарактарызуйце развіццё вашага краю напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны (1939—1941): развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі, змены ў сацыяльнай сферы і культурным жыцці.

*Абарончыя баі летам 1941 г.:*

- Якія падзеі адбываліся на тэрыторыі вашага краю летам 1941 г.?
- Калі ваш край быў захоплены германскімі войскамі?

*Устанаўленне германскага акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі:*

- Ахарактарызуйце «новы парадак», устаноўлены гітлераўцамі на тэрыторыі вашага краю.

*Разгортванне народнай барацьбы супраць гітлераўскіх захопнікаў:*

- Якія партызанскія атрады, падпольныя групы дзейнічалі на тэрыторыі вашага краю ў гады Вялікай Айчыннай вайны?
- У чым заключаліся асаблівасці антыфашысцкай барацьбы ў вашым краі?
- Хто з жыхароў вашага краю ўдзельнічаў у партызанскім руху, падпольнай барацьбе супраць германскіх захопнікаў?

*Вызваленне БССР ад германскіх захопнікаў:*

- Калі ваш край быў вызвалены ад гітлераўскіх захопнікаў?
- Хто з вашых землякоў удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне? На якіх франтах яны ваявалі? У якіх ваенных аперацыях прымалі ўдзел?
- Якім чынам увекавечаны подзвіг абаронцаў Айчыны ў вашым краі?



Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ
## па раздзеле III «Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў»

**1.** Назавіце даты наступных падзей:
• падпісанне Дагавора аб ненападзенні паміж Германіяй і СССР;
• пачатак Другой сусветнай вайны;
• паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь;
• Народны сход у Беластоку;
• уз'яднанне беларускага народа ў складзе БССР;
• пачатак Вялікай Айчыннай вайны;
• акупацыя германскімі захопнікамі тэрыторыі БССР;
• аперацыя «Баграціён»;
• падпісанне дэлегацыяй БССР Статута ААН.

**2.** Падбярыце паняцце да кожнага азначэння:

а) наступальная аперацыя Чырвонай Арміі з 23 чэрвеня па 29 жніўня 1944 г., у ходзе якой тэрыторыя БССР была вызвалена ад гітлераўскіх захопнікаў;

б) польскія ваенныя фарміраванні, якія змагаліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі за вызваленне Польшчы і аднаўленне яе ў межах да верасня 1939 г.;

в) знішчэнне асобных груп насельніцтва па расавых, нацыянальных або рэлігійных прыкметах;

г) 40-кіламетровы прарыў у лініі савецка-германскага фронту паміж Веліжам і Усвятамі, праз які ажыццяўлялася сувязь партызанскіх атрадаў з «Вялікай зямлёй»;

д) палітыка супрацоўніцтва з акупантамі;

е) нелегальная дзейнасць органаў і арганізацый, асобных прадстаўнікоў насельніцтва на захопленай ворагам тэрыторыі, накіраваная на зрыў акупацыйнай палітыкі і аднаўленне нацыянальна-дзяржаўнай незалежнасці;

ж) узброеная барацьба шырокіх пластоў насельніцтва, аб'яднанага ў арганізаваныя фарміраванні на акупіраваных тэрыторыях, супраць агрэсара за дзяржаўную незалежнасць;

з) план гітлераўскай Германіі, які прадугледжваў каланізацыю і германізацыю тэрыторыі Усходняй Еўропы, у тым ліку БССР;

і) скаардынаваныя аперацыі савецкіх партызан і падпольшчыкаў па масавым разбурэнні чыгуначных камунікацый (рэек, мастоў, станцый, эшэлонаў) у тыле ворага.

**3.** Канкрэтызуйце асноўныя тэндэнцыі развіцця БССР у 1939—1945 гг. фактамі. Запоўніце табліцу.



Правообладатель Народная асвета

**Асноўныя тэндэнцыі развіцця БССР у 1939—1945 гг.**

| Асноўныя тэндэнцыі развіцця БССР | Падзеі, з'явы, працэсы з гісторыі БССР |
|---|---|
| Уз'яднанне беларускага народа ў складзе БССР | |
| Акупацыя БССР германскімі захопнікамі | |
| Палітыка генацыду на тэрыторыі БССР | |
| Усенародная барацьба супраць гітлераўскіх захопнікаў | |
| Вызваленне БССР ад германскіх захопнікаў | |
| Выхад БССР на міжнародную арэну | |

**4.** Складзіце тэзісны план адказу на пытанне: «Гістарычныя перадумовы перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне» (гл. *памятку 9*).

**5.** Прааналізуйце змест табліцы «Тэрытарыяльныя змены БССР (1919—1939)», якую запаўнялі на папярэдніх уроках. Ахарактарызуйце працэс станаўлення тэрыторыі БССР. (*Выкарыстайце карты.*)

**6.** Сістэматызуйце паняцці, якія характарызуюць асноўныя тэндэнцыі развіцця Беларусі ў 1917 — 1945 гг., па самастойна выбраных крытэрыях. Дайце азначэнне паняццяў.

**7.** Назавіце падзеі, якія былі вызначальнымі ў палітычнай, сацыяльна-эканамічнай гісторыі, гісторыі культуры Беларусі ў 1917—1945 гг. Сваю думку абгрунтуйце (гл. *памятку 8*).

**8.** Назавіце дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў культуры, якія адыгралі вызначальную ролю ў гісторыі Беларусі ў 1917—1945 гг. Сваю думку абгрунтуйце (гл. *памятку 8*).

**9.** Назавіце факты з гісторыі Беларусі 1917—1945 гг., якія атрымалі неаднназначную ацэнку сучасных гісторыкаў. Чым, на ваш погляд, тлумачацца розныя пункты гледжання на адны і тыя ж гістарычныя факты (гл. *памятку 11*)?

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Памяткі «Як вывучаць гісторыю»

### Памятка 1. Як лакалізаваць падзеі айчыннай гісторыі ў часе і прасторы

1. Назавіце дату (храналагічныя рамкі) гістарычнай падзеі. Вызначыце яе працягласць у часе.

2. Калі падзея была працяглай, вызначыце ў ёй асобныя этапы і перыяды. Назавіце храналагічныя рамкі этапаў (перыядаў). Растлумачце, што пакладзена ў аснову перыядызацыі.

3. Суаднясіце вывучаемы факт з ужо вядомымі вам падзеямі айчыннай гісторыі. Вызначыце іх паслядоўнасць адносна адзін аднаго (што было раней, што — пазней).

4. Суаднясіце вывучаемы факт з падзеямі еўрапейскай і сусветнай гісторыі. Устанавіце, якая сувязь існавала паміж падзеямі айчыннай, еўрапейскай і сусветнай гісторыі ў вывучаемы перыяд.

5. Вызначыце месцазнаходжанне вывучаемых аб'ектаў на гістарычнай карце (выкарыстоўвайце карты, якія змешчаны ў вучэбным дапаможніку, атласах, насценныя карты).

6. Калі вы вывучаеце гістарычны працэс (напрыклад, станаўленне тэрыторыі БССР), выявіце змены, якія адбываліся, на гістарычнай карце.

### Памятка 2. Як характарызаваць і ацэньваць гістарычныя факты

1. Агульная характарыстыка гістарычнага факта павінна ўключаць апісанне яго *прычын, сутнасці, наступстваў.*

2. Для таго каб ацаніць значэнне гістарычнага факта, неабходна:

- прааналізаваць уплыў гістарычнага факта на эканамічнае, палітычнае, сацыяльнае, духоўнае развіццё грамадства ў вывучаемы перыяд;
- прасачыць маштаб уздзеяння факта ў прасторы: вызначыць яго ўплыў на працэсы ў рэгіёне, асобных краінах, свеце;
- прасачыць маштаб уздзеяння факта ў часе: вызначыць яго ўплыў на гістарычны перыяд, эпоху;
- даць ацэнку гістарычнага факта з пазіцый маралі вывучаемага перыяду і з пазіцый сучасных уяўленняў аб маралі.

### Памятка 3. Як характарызаваць і ацэньваць дзейнасць гістарычных асоб

1. Пазнаёмцеся з інфармацыяй аб гістарычнай асобе ў рубрыцы «гістарычны партрэт».

2. Суаднясіце гады жыцця асобы з асноўнымі падзеямі адпаведнага гістарычнага перыяду.

3. Знайдзіце ў дадатковай літаратуры інфармацыю пра жыццёвы шлях і дзейнасць асобы.



Правообладатель Народная асвета

4. Ахарактарызуйце ўклад, які асоба ўнесла ў гісторыю. Які ўплыў яна аказала на падзеі айчыннай, еўрапейскай, сусветнай гісторыі? Якую яе спадчыну мы выкарыстоўваем сёння?

5. Вызначыце, якія метады выкарыстоўваліся асобай для дасягнення сваіх мэт. Дайце ім ацэнку.

6. Вызначыце свае ўласныя адносіны да дадзенай асобы.

**Памятка 4. Як раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі**

1. Вызначыце, да якога перыяду і да якіх сфер грамадскага жыцця адносяцца дадзеныя гістарычныя факты.

2. Вызначыце, які з абазначаных гістарычных фактаў з'яўляецца прычынай, які — вынікам.

3. Растлумачце, якім чынам звязаны паміж сабой дадзеныя гістарычныя факты. (*Сувязь паміж гістарычнымі фактамі можа быць храналагічнай і лагічнай.*)

4. Вызначыце, якія фактары абумовілі прычынна-выніковыя сувязі паміж дадзенымі гістарычнымі фактамі.

**Памятка 5. Патрабаванні да вывадаў**

1. Вывад павінен адносіцца да сутнасці выкладзенага матэрыялу, выцякаць толькі з разгледжаных фактаў і сувязей, не перавышаць іх аб'ёму, не пакідаць частку фактаў без увагі.

2. Пры разглядзе вялікай колькасці фактаў і сувязей спачатку робяцца прыватныя вывады, а затым агульныя.

**Памятка 6. Як параўноўваць гістарычныя факты па самастойна вызначаных крытэрыях**

1. Вызначыце план (прыкметы) параўнання, г. зн. пытанні, па якіх будзеце параўноўваць гістарычныя факты.

2. Ахарактарызуйце гістарычныя факты, якія параўноўваеце, па кожным пытанні. Параўнанне зручна выконваць у форме табліцы.

| План параўнання | Гістарычныя факты, якія параўноўваюцца | |
|---|---|---|
| | Факт № 1 | Факт № 2 |
| | | |

3. Выявіце агульныя рысы і адрозненні гістарычных фактаў.

4. Сфармулюйце адпаведныя вывады.



Правообладатель Народная асвета

**Памятка 7. Як даваць азначэнне гістарычных паняццяў**

1. Успомніце ўсе характэрныя прыкметы гістарычнага паняцця.

2. Вызначыце самыя істотныя з іх, без якіх паняцце губляе сэнс.

3. Падбярыце больш шырокае (відавое) паняцце, да якога адносіцца вывучаемае, сфармулюйце азначэнне.

Напрыклад: ***манархія*** — гэта ***форма кіравання***, пры якой улада належыць аднаму чалавеку і перадаецца звычайна ў спадчыну.

***Манархія*** — паняцце, якому даецца азначэнне.

***Форма кіравання*** — відавое паняцце, да якога адносіцца манархія.

***Прыкметы паняцця*** «манархія»:

1) улада належыць аднаму чалавеку;

2) улада перадаецца звычайна ў спадчыну.

**Памятка 8. Як аргументаваць сваё меркаванне па пытанні**

1. Сфармулюйце тэзіс (палажэнне), які будзеце даказваць.

2. Падбярыце гістарычныя факты, якія пацвярджаюць тэзіс.

3. Лагічна пабудуйце свой доказ. Звяжыце гістарычныя факты з тэзісам, які даказваеце.

**Памятка 9. Як складаць тэзісны план**

Тэзісы — гэта асноўныя ідэі, палажэнні без аргументацыі.

1. Уважліва прачытайце тэкст.

2. Раздзяліце яго на лагічныя часткі.

3. Выдзеліце ў кожнай частцы галоўную думку.

4. Коратка сфармулюйце яе і запішыце.

**Памятка 10. Як працаваць з гістарычным дакументам**

1. Прачытайце назву гістарычнага дакумента, звярніце ўвагу на яго аўтара і час напісання.

2. Уважліва прачытайце тэкст гістарычнага дакумента; вызначыце, пра якую гістарычную падзею ў ім ідзе гаворка.

3. Значэнне невядомых вам слоў знайдзіце ў слоўніку.

4. Вызначыце ў тэксце гістарычнага дакумента звесткі пра вывучаемую падзею, раней вам невядомыя. Выкарыстайце іх для характарыстыкі вывучаемых гістарычных фактаў.

**Памятка 11. Як тлумачыць розныя меркаванні аб гістарычных фактах**

1. Сфармулюйце вядомыя вам ацэнкі вывучаемага гістарычнага факта.

2. Вызначыце, якія крытэрыі ляжаць у аснове кожнай з іх (чым кіруюцца аўтары гэтых ацэнак).



Правообладатель Народная асвета

3. Прааналізуйце аргументацыю розных ацэнак гістарычнага факта. Якая з іх вам уяўляецца найбольш аб'ектыўнай? Чаму?

4. Дайце сваю аргументаваную ацэнку гістарычнаму факту.

**Памятка 12. Як пісаць эсэ**

Эсэ — гэта творчая работа, у якой аўтар выкладае свае разважанні, уражанні, пачуцці, адносіны да таго, аб чым піша.

1. Эсэ мае свабодную кампазіцыю і невялікі аб'ём. Думкі аўтара выкладаюцца ў выглядзе кароткіх тэзісаў, якія падмацоўваюцца аргументамі.

2. Эсэ складаецца з уступу, асноўнай часткі, заключэння. Ва ўступе вызначаюцца ключавыя пытанні, на якія будуць дадзены адказы. У асноўнай частцы выкладаюцца факты, аргументы, разважанні. У заключэнні павінен утрымлівацца вывад, які падводзіць вынік разважанням аўтара.

3. Пры напісанні эсэ звярніце ўвагу на граматнае выкарыстанне гістарычных паняццяў, самастойную фармуліроўку і аргументацыю ўласнага меркавання па праблеме.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Слоўнік гістарычных паняццяў

**Анексія** — прымусовае далучэнне адной дзяржавай тэрыторыі другой дзяржавы.

**Акупацыя** — захоп войскамі адной дзяржавы тэрыторыі або часткі тэрыторыі іншай дзяржавы, які суправаджаецца ўсталяваннем уласнай адміністрацыі і законаў.

**Аперацыя «Баграціён»** — наступальная аперацыя Чырвонай Арміі з 23 чэрвеня да 29 жніўня 1944 г., у ходзе якой тэрыторыя БССР была вызвалена ад гітлераўскіх захопнікаў.

**Армія Краёва** — польскія ваенныя фарміраванні, якія змагаліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі за вызваленне Польшчы і аднаўленне яе ў межах да верасня 1939 г.

**Асаднікі** — былыя афіцэры польскай арміі, якім за заслугі ў польска-савецкай вайне 1919—1920 гг. польскія ўлады раздавалі ўчасткі заходнебеларускіх зямель.

**Аўтаномія** — самастойнае ажыццяўленне дзяржаўнай улады або шырокае ўнутранае самакіраванне, якое прадастаўляецца народу, што кампактна пражывае ў межах дзяржавы.

**Аўтакефалія** (ад *грэч.* аўта — сам, кефале — галава) — самакіраванне, незалежнасць царквы. Аўтакефальнай у праваслаўі завецца адміністрацыйна незалежная памесная царква, на чале якой стаіць патрыярх ці мітрапаліт. Аўтакефалія не азначае абсалютнай незалежнасці памеснай царквы. Усе аўтакефальныя цэрквы з'яўляюцца часткамі адзінай Усяленскай Царквы Хрыстовай.

**Бальшавізацыя Саветаў** — рост уплыву бальшавікоў на народныя масы, які суправаджаўся павелічэннем іх прадстаўніцтва ў Саветах рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

**Беларусізацыя** — палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР у 1920-я гг.

**Буферная дзяржава** — дзяржава паміж дзвюма суседнімі краінамі, якая змяншае ці наогул здымае супярэчнасці паміж імі.

**Генацыд** — знішчэнне асобных груп насельніцтва па расавых, нацыянальных або рэлігійных прыкметах.

**Гета** — спецыяльныя кварталы ў гарадах (гарадскія канцэнтрацыйныя лагеры), якія стварaліся гітлераўцамі на акупіраванай тэрыторыі для знішчэння яўрэйскага насельніцтва.

**Грамадзянская вайна** — узброеная барацьба за дзяржаўную ўладу ўнутры адной краіны паміж рознымі сацыяльнымі групамі.

**Індустрыялізацыя** — працэс стварэння буйной машыннай вытворчасці ў прамысловасці і іншых галінах народнай гаспадаркі.



Правообладатель Народная асвета

**Інтэрвенцыя** — гвалтоўнае ўмяшанне адной або некалькіх дзяржаў ва ўнутраныя справы другой дзяржавы.

**Кааперацыя** — добраахвотнае аб'яднанне людзей для сумеснай працы. Напрыклад, таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі, гадлёвы кааператыў і інш. Даход членаў кааператыву залежыць ад укладзенай у агульную справу ўласнасці.

**Калабарацыянізм** — палітыка супрацоўніцтва з акупантамі.

**Калектывізацыя** — аб'яднанне індывідуальных гаспадарак сялян у буйныя калектыўныя гаспадаркі (калгасы).

**Кананічная царква** — агульная назва большай часткі праваслаўных аўтакефальных цэркваў. Кананічная царква — царква, якая адпавядае праваслаўным канонам (законам), г. зн. сапраўдная царква.

**Кантрыбуцыя** — грошы або матэрыяльныя каштоўнасці, якія дзяржава-пераможніца атрымлівае з краіны, якая пацярпела паражэнне ў вайне.

**Карэнізацыя** — адзін з асноўных кірункаў палітыкі беларусізацыі, які прадугледжваў павышэнне ролі асоб карэннай нацыянальнасці ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі; вылучэнне кадраў з карэннага насельніцтва на партыйную, савецкую, гаспадарчую і грамадскую работу.

**«Крэсы ўсходнія»** — афіцыйная назва заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы.

**Мабілізацыя** — перавод узброенных сіл дзяржавы з мірнага стану ў баявую гатоўнасць; масавы прызыў у час вайны ва ўзброеныя сілы ваеннаабавязаных грамадзян, якія знаходзіліся ў запасе; чарговы прызыў на вайсковую службу юнакоў адпаведнага ўзросту.

**Нацыянал-дэмакратызм** — кірунак грамадска-палітычнай думкі, які спалучае агульнадэмакратычныя ідэі і мэты з задачамі сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення прыгнечаных народаў.

**Нацыяналізацыя** — пераход зямлі, прадпрыемстваў, іншых сродкаў вытворчасці з прыватнай уласнасці ў дзяржаўную.

**Народнае апалчэнне** — добраахвотныя ваенныя і ваенізаваныя падраздзяленні (рабочыя атрады, групы самаабароны, атрады партыйна-савецкага актыву і інш.) з грамадзян, якія не падлягалі першачарговаму прызыву да мабілізацыі.

**Остарбайтары** — «усходнія рабочыя»; насельніцтва з акупіраванай тэрыторыі СССР, якое вывозілі на прымусовыя работы ў Германію.

**Падпольная барацьба** — нелегальная дзейнасць органаў і арганізацый, асобных прадстаўнікоў насельніцтва на захопленай ворагам тэрыторыі, накіраваная на зрыў акупацыйнай палітыкі і аднаўленне нацыянальна-дзяржаўнай незалежнасці.

**Палітыка «санацыі» (аздараўлення)** — комплекс сацыяльна-эканамічных і палітычных мерапрыемстваў, якія праводзіліся ў Польшчы, у тым ліку ў Заходняй Беларусі, кіраўніком Польскай дзяржавы Ю. Пілсудскім.



Правообладатель Народная асвета

**Партызанскі рух** — узброеная барацьба шырокіх пластоў насельніцтва, аб'яднанага ў арганізаваныя фарміраванні на акупіраваных тэрыторыях, супраць агрэсара за дзяржаўную незалежнасць.

**Партызанская зона** — тэрыторыя, якая кантралявалася партызанамі.

**План «Ост»** — план гітлераўскай Германіі, які прадугледжваў каланізацыю і германізацыю тэрыторыі Усходняй Еўропы, у тым ліку БССР.

**«Прышчэпаўшчына»** — кірунак у аграрнай палітыцы (па прозвішчы наркама земляробства БССР Д. Прышчэпава), згодна з якім стаўка рабілася на развіццё хутарской сістэмы.

**«Рэйкавая вайна»** — скаардынаваныя аперацыі савецкіх партызан і падпольшчыкаў па масавым разбурэнні чыгуначных камунікацый (рэек, мастоў, станцый, эшалонаў) у тыле ворага.

**Рэквізіцыя** — прымусовае адчужэнне маёмасці ва ўласнасць або ў часовае карыстанне дзяржавы; прымусовыя паборы, якія ўтрымліваюцца з насельніцтва акупацыйнымі ўладамі.

**Сектанцтва (рэлігійнае)** — агульная назва рэлігійных груп, аб'яднанняў, якія адасобіліся ад пануючай царквы (у будызме, ісламе, іўдаізме, хрысціянстве).

**Суражскія (Віцебскія) «вароты»** — 40-кіламетровы прарыў у лініі савецка-германскага фронту паміж Веліжам і Усвятамі, праз які ажыццяўлялася сувязь партызанскіх атрадаў з «Вялікай зямлёй».

**Федэрацыя** — форма дзяржаўнага ўладкавання, пры якой дзяржавы (штаты, землі, рэспублікі і інш.), якія ўтвараюць саюз, падпарадкоўваюцца адзінаму цэнтру і захоўваюць самастойнасць у вырашэнні асобных пытанняў унутранай палітыкі.

**Харчразвёрстка** — элемент палітыкі «ваеннага камунізму», сістэма нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі, згодна з якой сяляне абавязаны былі здаваць дзяржаве ўсе лішкі прадукцыі.

**Харчпадатак** — элемент новай эканамічнай палітыкі, які прыйшоў на змену харчразвёрстцы. Памер харчпадатку вылічваўся з плошчы пасеваў і аб'яўляўся сялянам яшчэ да пачатку сельскагаспадарчых работ.

**Эвакуацыя** — мэтанакіраваны вываз насельніцтва, абсталявання прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, прадуктаў харчавання, маёмасці, матэрыяльных і культурных каштоўнасцей з месцаў, якім пагражае акупацыя.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Храналагічная табліца
## «Асноўныя падзеі гісторыі Беларусі: 1917—1945 гг.»

| | |
|---|---|
| **25 кастрычніка 1917 г.** | Перамога ўзброенага паўстання ў Петраградзе. Пераход улады да Саветаў |
| **25 кастрычніка — 2 лістапада 1917 г.** | Устанаўленне савецкай улады ў Мінску |
| **Кастрычнік — лістапад 1917 г.** | Устанаўленне савецкай улады на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі |
| **20 лістапада 1917 г.** | Ліквідацыя Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве |
| **5—18 снежня 1917 г.** | I Усебеларускі з'езд |
| **21 лютага 1918 г.** | Акупацыя войскамі Германіі г. Мінска. 1-я Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларускага з'езда |
| **3 сакавіка 1918 г.** | Брэсцкі мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй і дзяржавамі германскага блока |
| **9 сакавіка 1918 г.** | 2-я Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларускага з'езда. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) |
| **25 сакавіка 1918 г.** | 3-я Устаўная грамата Рады БНР. Абвяшчэнне незалежнасці БНР |
| **30—31 снежня 1918 г.** | VI Паўночна-Заходняя канферэнцыя РКП(б) у Смаленску; прыняцце пастановы аб утварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) |
| **1 лютага 1919 г.** | Абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) |
| **2—3 лютага 1919 г.** | I Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Прыняцце Канстытуцыі ССРБ. Стварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі (Літбел) |
| **Люты 1919 г. — кастрычнік 1920 г.** | Польска-савецкая вайна |
| **31 ліпеня 1920 г.** | Другое абвяшчэнне ССРБ. Прыняцце Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі |
| **18 сакавіка 1921 г.** | Рыжскі мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй, Украінай і Польшчай |
| **Сакавік 1921 г.** | X з'езд РКП(б). Прыняцце новай эканамічнай палітыкі (нэпа) |
| **1921—1937 гг.** | Дзейнасць Таварыства беларускай школы (ТБШ) у Заходняй Беларусі |
| **1922 г.** | Стварэнне Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта) |
| **14—18 снежня 1922 г.** | IV Усебеларускі з'езд Саветаў |
| **30 снежня 1922 г.** | I з'езд Саветаў СССР. Стварэнне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік |

Народная асвета



Правообладатель Народная асвета

| | |
|---|---|
| **1923—1938 гг.** | Дзейнасць Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) |
| **1925—1927 гг.** | Дзейнасць Беларускай сялянска-рабочай грамады (БСРГ) у Заходняй Беларусі |
| **1924 г., 1926 г.** | Першае і другое ўзбуйненні тэрыторыі БССР |
| **1925 г.** | XIV з'езд ВКП(б). Прыняцце курса на сацыялістычную індустрыялізацыю |
| **1926 г.** | Прыняцце пастановы ЦВК і СНК БССР «Аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання» |
| **1927 г.** | XV з'езд ВКП(б). Прыняцце курса на калектывізацыю сельскай гаспадаркі |
| **11 красавіка 1927 г.** | Прыняцце другой Канстытуцыі Беларускай ССР |
| **1929 г.** | Утварэнне Беларускай акадэміі навук |
| **1928—1932 гг., 1933—1937 гг., 1938—1941 гг.** | Першая, другая, трэцяя пяцігодкі |
| **1937 г.** | Прыняцце трэцяй Канстытуцыі Беларускай ССР |
| **23 жніўня 1939 г.** | Дагавор аб ненападзенні паміж СССР і Германіяй (пакт Молатава—Рыбентропа) |
| **1 верасня 1939 г.** | Напад Германіі на Польшчу. Пачатак Другой сусветнай вайны |
| **17 верасня 1939 г.** | Пачатак паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну |
| **28 верасня 1939 г.** | Дагавор аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй |
| **28—30 кастрычніка 1939 г.** | Народны сход Заходняй Беларусі ў Беластоку |
| **14 лістапада 1939 г.** | Пастанова 3-й (нечарговай) сесіі Вярхоўнага Савета БССР аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад БССР |
| **22 чэрвеня 1941 г.** | Напад Германіі на СССР. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны |
| **Чэрвень — жнівень 1941 г.** | Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі |
| **Восень 1943 — зіма 1944 г.** | Вызваленне ад гітлераўскіх захопнікаў 36 раёнаў і двух абласных цэнтраў — Гомеля і Мазыра |
| **23 чэрвеня — 29 жніўня 1944 г.** | Аперацыя «Баграціён». Вызваленне БССР ад германскіх акупантаў |
| **3 ліпеня 1944 г.** | Вызваленне г. Мінска ад гітлераўскіх захопнікаў |
| **26 чэрвеня 1945 г.** | Падпісанне дэлегацыяй БССР Статута ААН |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# Літаратура для дадатковага чытання


### 1. Дакументальныя матэрыялы

Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918 — 1920 гг. Документы и материалы. Т. 1. Минск, 1968; Т. 2. Минск, 1971.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Документы и материалы: в 3 т. Минск, 1967.

История Беларуси в документах и материалах / Авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. Минск, 2000.

Накануне: Западный особый военный округ (конец 1939—1941 г.): док. и материалы / Сост. В. И. Адамушко [и др.]. Минск, 2007.

Освобожденная Беларусь: документы и материалы. В 2 кн. / Сост. В. И. Адамушко [и др.]. Минск, 2004—2005.

Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944 гг. Минск, 1965.

### 2. Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 11 кл. / Пад рэд. А. А. Каваленi, М. С. Сташкевіча. Мінск, 2004.

Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. Ч. 2. Мінск, 2003.

Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. — 2002 г. Хрэстаматыя: 11 кл.: вучэб. дапам. для вучняў / Аўт.-склад. Я. К. Новік і інш.; пад рэд. Я. К. Новіка. Мінск, 2003.

Гісторыя Беларусі, XIX — XXI стст.: вучэб. дапам. для 11-га кл. / І. І. Коўкель, Э. С. Ярмусік / Пад рэд. А. А. Каваленi. Мінск, 2006.

История Беларуси: учеб. пособие: в 2 ч. / Я. И. Трещенок, А. А. Воробьев, Н. М. Пурышева, М. И. Матюшевская; под ред. Я. И. Трещенка. Ч. 2. Могилев, 2005.

*Юхо, Я. А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам.: у 2 ч. Мінск, 2000—2003.

### 3. Энцыклапедычныя выданні

Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941—1945: энцыклапедыя. Мінск, 1990.

Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: в 3 т. Минск, 1983—1985.

Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Мінск, 1988—1994.

Иллюстрированная хронология истории Беларуси: с древности и до наших дней / Авт.-сост. И. П. Ховратович. Минск, 2002.

Памяць Беларусі: Рэспубліканская кніга. Мінск, 2005.

Памяць. Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Мінск, 1987—2005.

Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2001.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Мінск, 1993—2003.




Правообладатель Народная асвета

### 4. Навуковая і навукова-папулярная літаратура

*Антанович, С.* Петр Машеров. Минск, 1998.

Белорусские остарбайтеры: в 3 кн. Минск, 1996—1998.

*Бергман, А.* Слова пра Браніслава Тарашкевіча: гістарычны жыццяпіс. Мінск, 1996.

*Долготович, Б. Д.* Беларусь в годы Великой Отечественной войны в вопросах и ответах. Минск, 1994.

*Жыгоцкі, М. Р.* Легендарны дзед. Мінск, 1993.

*Ігнаценка, І., Кароль, А.* Усевалад Ігнатоўскі і яго час. Мінск, 1991.

*Каваленя, А. А.* Беларусь у гады Другой сусветнай вайны (1939—1945). Мінск, 1996.

*Лемяшонак, У. І.* Вызваленне — без грыфа «Сакрэтна!». Мінск, 1996.

Наука и техника Советской Белоруссии в 1917—1990 гг.: хроника важнейших событий. Минск, 1991.

Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941—1944). Мінск, 1995.

*Сачанка, Б.* Беларуская эміграцыя. Мінск, 1991.

*Чигринов, П. Г.* Очерки истории Беларуси. Минск, 2000.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# ЗМЕСТ

**Як працаваць з вучэбным дапаможнікам** . . . . . 3

**Раздзел I. КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ. СТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ**

§ 1. Становішча ў Беларусі напярэдадні кастрычніка 1917 г. . . . . . 5
§ 2. Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі і на Заходнім фронце . . . . . 10
§ 3. Беларусь ва ўмовах германскай акупацыі . . . . . 17
§ 4—5. Абвяшчэнне і стварэнне беларускай дзяржаўнасці . . . . . 22
§ 6. Беларусь у польска-савецкай вайне 1919—1920 гг. . . . . . 32
§ 7. Беларуская дзяржаўнасць ва ўмовах Грамадзянскай вайны. Другое абвяшчэнне ССРБ . . . . . 38
**Урок абагульнення па раздзеле I «Кастрычніцкая рэвалюцыя. Стварэнне беларускай дзяржаўнасці»** . . . . . 43

**Раздзел II. БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ СТАНАЎЛЕННЯ САВЕЦКАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ПАД УЛАДАЙ ПОЛЬШЧЫ**

§ 8. Становішча Беларусі ў міжваенны перыяд . . . . . 46
§ 9. БССР у гады новай эканамічнай палітыкі . . . . . 50
§ 10. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1920-я гг. . . . . . 56
§ 11. Палітыка беларусізацыі . . . . . 61
§ 12. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР у 1920-я гг. . . . . . 66
§ 13. Правядзенне індустрыялізацыі ў Беларускай ССР . . . . . 72
§ 14. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў Беларускай ССР . . . . . 76
§ 15. Грамадска-палітычнае жыццё ў канцы 1920-х — 1930-я гг. . . . . . 81
§ 16. Адукацыя і навука ў канцы 1920-х — 1930-я гг. . . . . . 88
§ 17. Развіццё літаратуры і мастацтва ў канцы 1920-х — 1930-я гг. . . . . . 91
§ 18. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы . . . . . 96
§ 19. Становішча культуры ў Заходняй Беларусі . . . . . 102
Наш край у 1917—1939 гг. . . . . . 107
**Урок абагульнення па раздзеле II «Беларусь ва ўмовах станаўлення савецкага сацыялістычнага грамадства. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы»** . . . . . 108

**Раздзел III. БССР У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВОЙНАЎ**

§ 20. Беларусь у гады ваенных выпрабаванняў . . . . . 111
§ 21. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР . . . . . 116
§ 22. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны . . . . . 122
§ 23. Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі . . . . . 127
§ 24. Пачатак масавай барацьбы супраць германскіх акупантаў . . . . . 134



Правообладатель Народная асвета

§ 25. Разгортванне народнай барацьбы на тэрыторыі Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142
§ 26. Вызваленне БССР ад германскіх захопнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149
§ 27. Уклад беларускага народа ў Перамогу над нацысцкай Германіяй . . . . . . . . . . . . . . 157
§ 28. Удзел Беларускай ССР у заснаванні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый . . . . . . . . . . . 164
Наш край у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167
**Урок абагульнення па раздзеле III «Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў»** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 168
**Памяткі «Як вывучаць гісторыю»** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 170
**Слоўнік гістарычных паняццяў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 174
**Храналагічная табліца «Асноўныя падзеі гісторыі Беларусі: 1917—1945 гг.»** . . . . . 177
**Літаратура для дадатковага чытання** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 179

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Вучэбнае выданне

**Новік** Яўген Канстанцінавіч

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
1917—1945 гг.**

Вучэбны дапаможнік для 10 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна*. Рэдактар *А. М. Парахневіч*. Мастацкі рэдактар *А. П. Пратасеня*. Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *Г. А. Дудко*. Карэктары *К. І. Даніленка, В. С. Казіцкая, В. С. Бабеня, Г. В. Алешка*.

Падпісана ў друк 18.09.2012. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 13,46. Ул.-выд. арк. 14. Тыраж 19 408 экз. Заказ .

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае
прадпрыемства «Народная асвета»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494083 ад 03.02.2009.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
ЛП № 02330/0150496 ад 11.03.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

______________________________________________________________________

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча навучэнца | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета